# ЮЗАФ КРАШЭЎСКІ

СКАРБЫ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

# АПОШНЯЯ СА СЛУЦКІХ КНЯЗЁЎ



Аповесць

*Адаму Завадскаму* ў знак сардэчнай дружбы ад аўтара*

Гарадок, 16 траўня 1841 г.

# ТОМ 1

## Паздзел 1

## УСТУП. ЛІТВА І ВІЛЬНЯ Ў 1599 ГОДЗЕ

Здаецца, не было ў Польшчы болей бурлівага ўладарання, чым у часы бяссільнага Жыгімонта III Ваза*. Пакуль не скончылася яго доўгае жыццё, ішла вайна, распачатая яшчэ ў часы Жыгімонта II Аўгуста*, стрыманая дужай рукой Стэфана Баторыя, ледзь не выйграная пры Уладзіславу IV шляхтай, якая дамагалася неабмежаванай і шкоднай для яе вольнасці. Слабасць Жыгімонта III, целам і душой якога валодалі езуіты, садзейнічала вайне: яна рабілася што далей, то болей гарачай, з усё болей невыразна бачным будучым. Краіна распалася і падзялілася на варожыя лагеры, ішла грамадзянская вайна, якая толькі аднойчы змагла стрымаць небяспеку, што пагражала краіне болей, чым усе іншыя небяспекі. Кароль, заўзяты католік, дазволіў духавенству, на чале якога стаялі езуіты,

уцягнуць сябе ў барацьбу з іншаверцамі, павялічыў смуту і ўнутраны разлад у дзяржаве. Рэфармацыя была ўжо ў сіле і магла мець пад сабой грунт, бо пры Аўгусту, які імкнуўся абмежаваць уладу духавенства, яна разгарнулася, умацавалася. Пры Стэфану Баторыю*, які не падтрымліваў ніводзін бок і стаяў за многабожжа, яна не аслабела. Пасля прывілею Жыгімонта III партыя католікаў была ўжо больш моцнай, і прыхільнікі новай веры ледзьве змаглі атрымаць дазвол на тое, каб без перашкод адпраўляць свае абрады, хаця біскуп Салікоўскі ў гарачцы рваў на грудзях кашулю, пагражаў ахвяраваць жыццём і годнасцю, але не даць волі ўсім веравызнанням. Лёгка зразумець, што паколькі ў часы прывілею Жыгімонта III* каталіцкая і новая вера сталі бадай што роўнымі па моцы, прыхільнасць уладара да адной з іх непазбежна рабіла яе мацнейшай і важнейшай. З-за такой магутнай падтрымкі розным верам не давялося доўга паіснаваць у раўнапраўі. Езуіты*, чый уплыў быў такі вялікі, а значэнне такое важнае, з усіх сіл стараліся настроіць караля супраць пратэстантаў і ўрэшце дамагліся гэтага. У выніку Жыгімонт III, прыняты ў іх ордэн, іх пакорлівы слуга, якому яны ўмелі дагадзіць, улагодзіць ці застрашыць, даваў згоду на ўсё, чаго яны хацелі. Нечага было і думаць пра вяртанне рэфарматараў* (хаця і так многія з іх пачалі вяртацца да каталіцкай веры) да прызнання праваслаўя. Неаднойчы, да таго ж без поспеху, унія* падводзіла да думкі пра веру новую і лепшую. Пасылалі ў Рым біскупаў з сабранымі ў Брэсце подпісамі. З усяго гэтага быў вялікі розгалас, а вынікам сталася ўзмацненне уніі, якая да таго існавала толькі на паперы. Вядома і тое, што верхавенства гэтага веравызнання было вельмі моцна настроена супраць уніі, што гнёт, прычынай якога былі езуіты, абудзіў усеагульнае незадавальненне. Пачалося ўзмоцненае праследаванне праваслаўных вернікаў, іх пачалі выжываць, уніяты асаджалі храмы, з дапамогай зброі захоплівалі манастыры, пазбаўлялі грашовай дапамогі, усяляк схілялі да прыняцця уніі. Аднак з таго было мала толку: праследаванне не абуджае веры, уціск не пераконвае. Падобнага праследавання з боку каталіцка-езуіцка-каралеўскага лагера не мінулі і прадстаўнікі іншых веравызнанняў, іх лік апошнім часам памножыўся.

Не адважваючыся на адкрытае змаганне, усе іншаверцы бачылі тое і спрабавалі падаць адзін другому рукі. Гэта была цудоўная ідэя, але толку ад яе было таксама мала: без адзінства веры, хаця іх і злучала агульная небяспека, не магло быць усеагульнай згоды, адзінства намаганняў і нейкай канкрэтнай справы. Нават не дбаючы пра духоўнае адзінства, усе разнаверцы: праваслаўныя, евангелісты*, пратэстанты, арыяне* і іншыя ўсё ж заснавалі ў Вільні ў 1599 годзе канфедэрацыю. Узначалілі яе самыя прадстаўнічыя разнаверцы Польшчы і Літвы. Гэтая канфедэрацыя мела на мэце *junktis viribus* — сумеснымі сіламі — паўстаць супраць пагрозлівага наступу прыхільнікаў каталіцызму; паўстаць супраць жорсткага праследавання, абараняцца ад яго. Канфедэраты абвясцілі, што не дапусцяць злоўжыванняў, што нават выступяць са зброяй у руках супраць нашэсця і прыцяснення з боку каталіцкага духавенства. У гэтым саюзе адкрыліся ўсе раны, ад якіх пакутавалі, заклікалі да ўсеагульнай абароны, прызначылі ўпаўнаважаных для назірання за недатыкальнасцю кірхаў, цэркваў і пратэстанцкіх абшчынных памяшканняў, каб не дапусціць у краіне грамадзянскай вайны. Дзвесце прадстаўнікоў шляхты ўвайшлі ў тую канфедэрацыю: князі Астрожскія, Сангушкі, Вішнявецкія, Карэцкія, Ражынскія, Горскія, Саламарэцкія, Пузыні, Радзівілы, Глебавічы, Галоўчынскія сталі на чале яе; прадстаўнікоў Польшчы было меней, і сярод іх было мала ўплывовых асоб. Зразумела, што канфедэрацыя тая аказалася бяссільнай, амаль нічога не зрабіла для дастойнага адпору каталіцка-каралеўскаму ўціску. У барацьбе за рэлігійныя свабоды гэты саюз шляхты мала што зрабіў, а вось развал у краіне павялічыў і яшчэ больш выразна падзяліў на два варожыя лагеры католікаў і прыхільнікаў іншых веравызнанняў. Радзівілы і князі Астрожскія ўзначалілі адзін з іх, кароль, езуіты, Хадкевічы, Мнішкі, Сапегі — другі.

Варта хоць крыху акрэсліць становішча краю ў той час, каб лепш зразумець тое, пра што будзе гаварыцца далей.

Так і было ў 1599 годзе — шляхта падзялілася на два лагеры: адным кіраваў кароль, другім — уплывовыя прадстаўнікі іншых веравызнанняў. Спачатку ў Літве з прычыны марудлівых дзеянняў Жыгімонта Аўгуста, які

хацеў абмежаваць уладу духавенства і даў больш свабоды іншаверцам, лік іх быў больш значны, а кіраўнікі больш радавітыя. Мела значэнне і немалая колькасць прыхільнікаў праваслаўя, яна павялічвала лагер пакрыўджаных. Некалькі пазней, у часы Жыгімонта III, Сапегі, Радзівілы, Астрожскія і іншыя перайшлі ў каталіцтва. У 1599 годзе больш моцным быў лагер канфедэрацыі, многа слабейшым — лагер каталіцкі, на чале якога стаялі любімыя каралём Хадкевічы.

Вільня, сталіца Літвы, была ў самым вогнішчы гэтай вайны, што распачалася з усталяваннем тут езуітаў. Да іх тут мелі перавагу разнаверцы, але пры Стэфану і ў гэты час, калі толькі пачыналася ўладаранне Жыгімонта III, католікі пад кіраўніцтвам езуітаў набралі сілу і вялі рэй. Хто цяпер не ведае, што для езуітаў была добрая любая зброя, любыя спосабы барацьбы, абы толькі яны прынеслі ім перамогу? Сіла, здрада, нагавор, грошы — усё без разбору дапамагала ім ваяваць, і яны рабіліся ўсё больш моцнымі, усё больш уплывовымі, усё больш небяспечнымі. Калі першыя з іх ордэна з'явіліся ў Вільні, кучы смецця і гною ляжалі каля архіпрэсвітэрыянскага касцёла Святога Яна, а спеў псалмоў у суседняй царкве заглушаў нясмелыя галасы грыгарыянскіх кантаў каталіцкіх ксяндзоў. Прайшло не вельмі шмат часу, і на рыначнай плошчы кат ужо кідаў у агонь кнігі іншаверцаў! Пачаліся нападзенні на цэрквы, у святароў кідалі каменнямі, бо за некалькі гадоў рэфарматары аслаблі і не маглі абараняцца. Уніяты адбіралі цэрквы і манастыры ў праваслаўных, калі ж Трыбунал* па справядлівасці асудзіў іх дзеянні, кароль скасаваў дэкрэт і стаў тым самым на іх бок. Увесь час на вуліцах, цвінтарах, у дзвярах цэркваў ішлі крывавыя сутычкі за памяшканні храмаў, біліся ў прыдзелах цэркваў, прыступкі алтароў былі завалены трупамі, католікі перамагалі. Паступова падупалі друкарні пратэстантаў, паменшалі прыбыткі, разнаверцы паслаблі духам, можа, таму, што адчулі сваё бяссілле перад незлічонымі сіламі і разнастайнымі спосабамі барацьбы езуітаў, якія з дапамогай падману, забойстваў, хітрасці (ды ці мала чаго яшчэ!) упарта ішлі да дасягнення сваёй мэты.

Аднак у 1599 годзе, калі пачынаецца дзеянне нашай аповесці, у той час, калі канфедэрацыя разнаверцаў толькі заснавалася, вайна ў Вільні яшчэ не пачалася, яшчэ ў сіле

былі прадстаўнікі новых веравызнанняў, яшчэ трымаліся ў цэрквах праваслаўныя, яшчэ ў храмах на ўвесь голас спявалі Евангелле і друкавалі кнігі, яшчэ змаганне было ў самым зародку, і, хаця было відаць як на далоні, хто пераможа, слабейшы бок не траціў надзеі. Без надзеі на перамогу няма вайны. Несправядлівасць з боку каталікоў расла, скасаванне прывілеяў, указаў, свабод паддавала імпэту, таму што гвалт, крыўда патрабавалі помсты, давалі надзею на Божую дапамогу. Народ у Вільні быў часткова каталіцкі, часткова — рускі, русіны* хіліліся да канфедэрацыі, і горад адпаведна падзяляўся паводле веры. Нават месцы ў магістраце былі падзеленыя; на чале яго стаяў войт магдэбургскай юрысдыкі* Мацей Барымінскі, сілай навязаны гораду каралём. Выбары прадстаўнікоў магістрата паказвалі, што і тут езуіты карысталіся вялікім уплывам: выбіраліся пераважна католікі, спрабавалі нават зусім не дапусціць іншаверцаў, а праваслаўных, якім розныя прывілеі давалі месцы ў радзе і ў судзе, замянілі уніятамі. Гэта адносілася да цэнтра горада, тут была юрысдыка ратушы, але ж Вільня, як і іншыя гарады, мела не адну ўладу, а гэта заўсёды было не на карысць гораду. Некалі дадзеныя біскупам, капітулу, мніхам кавалкі зямлі і пабудовы надавалі ім і права вольна распараджацца імі, а тым самым падзялялі горад на незлічоныя часткі, кожная з якіх сама па сабе мела сваё кіраўніцтва і свае правы.

Такім чынам, у адным горадзе было некалькі мясцін з рознымі правіламі кіравання. Суддзі ледзьве пагаджаліся на некаторыя агульныя пункты правіл, але яны часцей варагавалі, чым імкнуліся да згоды. Не дзіва, што парадку не было, а злоўжыванні — незлічоныя. Цэхавыя рамеснікі мелі небяспечных канкурэнтаў — тых партачоў, якія не ўваходзілі ў цэхі, не мелі апекі, зямлі, юрысдыкі біскупа, а гандлявалі вольна. Валацугі, зброднікі, баючыся суда, збягалі пад апеку якойсьці з такіх мясцовых юрысдык, карысталіся іх аховай, часам бывала так, што яны былі непадлеглыя суду, калі не жылі ў пэўным месцы, калі ж прыпісваліся і жылі там, то іх мелі права схапіць і судзіць. Штодня ўзнікалі новыя спрэчкі, новыя звады. Магістрат не меў поўнай улады, таму шляхта, ваяводы, старасты, святары чынілі, што ім уздумаецца. Апрача галоўнай

ратушнай юрысдыкі была яшчэ і замкавая, якой кіраваў ваявода, ён меў падваяводаў: біскупскага, капітулавага, манаскага, мітрапаліцкага і іншых. І ўсе як хацелі, так і кіравалі ў сваіх вотчынах, збіралі падаткі, яны мелі свае месцы ў ратушы і суды, сваіх войтаў. Яўрэі падпарадкоўваліся Статуту, і падваяводам, хаця жылі пад уладай гарадской юрысдыкі; відаць, гэта было ім больш выгадна, бо яны ўвесь час спасылаліся на Статут, а бараніліся ад магдэбургскага права.

Магістрат, які быў заснаваны Жыгімонтам Аўгустам і меў многа свабод, не валодаў дастатковай сілай для таго, каб супрацьстаяць бяспраўю. Раз-пораз яму даводзілася апеляваць да караля, звяртацца да яго за дапамогай, часцей за ўсё безвынікова; а ўрэшце ён цярпеў і маўчаў, часцяком аддаючы перавагу ўласнаму спакою, закрываючы вочы на бяспраўе.

Над духавенствам, як мы ўжо згадвалі, верхаводзілі езуіты. З самага свайго з'яўлення яны займалі высокае становішча, а пры Жыгімонту III, які ва ўсім падпарадкоўваўся ім, і зусім сталі на чале каталіцкага духавенства. Віленскі капітул, некалі адзіны заступнік веры, цяпер падпарадкоўваўся ім і займаўся толькі пытаннямі ўнутранага кіравання, справамі каталіцкай адміністрацыі, маёмасці, будынкаў. Ніхто не займаў пасаду біскупа, тут панавала безначалле. Паколькі ліцвіны былі абражаны прызначэннем паляка Маціёўскага, устаноўчы ліст якога быў з пячаццю польскай канцылярыі, то яны, спасылаючыся на свой прывілей, згодна з якім толькі ліцвін мог займаць найвышэйшую пасаду ў літоўскім біскупстве, не прынялі Маціёўскага і заявілі, што калі спатрэбіцца ўзяць у рукі зброю, то яны возьмуцца і за зброю, але будуць стаяць на сваім. Маціёўскі ваяваць не хацеў, біскупства было незанятым, хаця патаемна рабіліся спробы прыняць прызначанага, але толку ад таго не было, і нарэшце ў наступным годзе Маціёўскі, пераканаўшыся ў марнасці сваіх надзей, адступіўся ад пасады. А да таго духоўнае кіраўніцтва епархіяй было ў намесніка з капітула.

Ваяводам быў адзін з самых уплывовых разнаверцаў князь Крыштаф Радзівіл*, кашталянам заўзяты католік Геранім Хадкевіч*, параднёны з ім. Яны як быццам і сябравалі, але іх сяброўства азмрочвалася нейкімі даўнімі фамільнымі спрэчкамі, і паміж імі не было не тое што

даверу, а нават добразычлівасці, толькі ўзаемная халодная ветлівасць.

Такім было становішча ў Вільні ў канцы XVI стагоддзя — знешні выгляд, здавалася, нібы адпавядаў ягонаму ўнутранаму стану, яскрава адбіваючы тыя звады, спрэчкі і адсутнасць згоды, якія былі тады характэрнымі для Вільні.

Гэта быў ужо досыць вялікі горад, з прадмесцем, забудаваным асобнымі домікамі бяднейшых гараджан, падобнымі на літоўскія нумы*, ужо дзе-нідзе аздабляўся і вылучаўся белымі і чырвонымі мураванкамі. Праз Вілію быў перакінуты Зялёны мост, на Лукішках ззяла месяцам татарская мячэць, пабудаваная даўно, яшчэ ў часы Вітаўта. Татары таксама зведалі праследы, іх нішто не абараняла апрача законаў, бо канфедэраты не прынялі іх як не хрысціян і непрыхільнікаў Хрыста. Іх бы проста не зразумелі, калі б яны далучыліся да няверных.

Як мы ўжо згадвалі, горад падзяляўся на некалькі юрысдык. Галоўнейшая з іх — ратушная, яна месцілася ў гмаху ратушнай вежы з гадзіннікам і невялікімі бакавымі вежамі. Ратуша высілася над рынкам галоўнага горада, у самым яго сэрцы, з чатырох бакоў яе абступалі крамы, дзе выстаўляўся на продаж самы розны тавар. Тут былі мясныя лаўкі, лаўкі са стракатымі тканінамі, дарагімі сукнамі, тут прадаваліся вырабы з жалеза, футры, соль, скуры, словам, усё, што прадаецца і купляецца. Тут гандлявалі на разнос, стаялі вазы рамеснікаў, месціліся шаўцы з абуткам, сталяры, прадаваліся крупы, соль, ласункі і іншае. Крамы багатых купцоў былі рассыпаны па горадзе, але самыя заможныя мелі магазіны і пад ратушай. Над крамамі, латкамі, натоўпам гандляроў і пакупнікоў высіліся з абодвух бакоў ратушы як напамінак пра пакаранне і суд, пра ўладу магістрата, слуп ганьбы, які ў народзе называлі Пілатам, і шыбеніца. Калісьці каля іх пахаджваў адмыслова апрануты гарадскі кат або магістр са сваімі слугамі.

На рынку каля ратушы віраваў натоўп гандляроў і пакупнікоў, асабліва тлумна было ў своеасаблівых гарлавінах, цесных і цёмных, якія служылі ўваходамі ў крамы, там цікавалі зладзеі — вочы іх пільна ўзіраліся ў сумку неасцярожнага шляхціца, у скураны кашэль старой матроны, кішэню слугі.

Пад ратушнай вежай сядзелі работнікі, падзёншчыкі з піламі, сякерамі, рыдлёўкамі, тачкамі, чакаючы, ці не нойме іх хто-небудзь на работу. Паблізу вісела шыльда з вялізнымі нажніцамі — там была гарадская цырульня; у розных кутках рынку яшчэ ліпелі прыватныя цырульні, але неўзабаве манаполія адным махам змяла іх. У ніжніх памяшканнях ратушы таксама былі крамы, гарадскі вінны склад і склад тавараў. Тут былі вагі і васкабойня, а ў верхніх пакоях — памяшканні рады і ваяводскага суда, дзе адзінай аздобай служыў партрэт нядобрай памяці Жыгімонта Аўгуста. Там размяшчаліся таксама архіў і гарадская казна пад мноствам замкоў, ключы ад якіх віселі на поясе пана бургамістра. На вежы адбіваў час гадзіннік, ніжэй была жалезная галерэя, спецыяльна для музыкаў, якія ў час вялікіх святаў дзённа і ночна igралі для гарадскога люду вясёлыя народныя мелодыі.

Пры рынку сяліліся купцы; было тут і некалькі праваслаўных храмаў. Злева Пятніцкая царква, пабудаваная на месцы старой камяніцы, справа — царква Святога Мікалая, нябачная з вуліцы, яе засланіла мноства дамоў, толькі яе макаўкі цягнуліся да неба — своеасаблівы знак адносін да тых вернікаў, якія яе наведвалі. Крыху бліжэй стаяў стары запушчаны Евангелічны сабор. За ратушай пачыналася так званая Нямецкая вуліца — адтуль у горад ішлі габрэі, там часцей чым дзе можна было сустрэць тутэйшых сыноў Ізраіля ў чорным і габрэяў-іншаземцаў у белых строях, што цягнуліся аж па зямлі. Там, за ратушай, стаялі дзве камяніцы, якія называлі Рай і Пекла. Вуліца вяла далей, туды, дзе высілася стаўрапігіяльная* Свята-Духаўская царква і пры ёй манастыр. З правага боку ад яго стаялі гасцініца рускіх купцоў і праваслаўны Свята-Троіцкі манастыр, заснаваны некалі вялікім князем Канстанцінам Астрожскім. За царквой Святога Духа вяла ўніз вузенькая вулачка, дзе злева на прадмесці пазней быў пабудаваны манастыр кармелітаў.

На Нямецкай вуліцы, гэтак жа, як і каля ратушы, заўжды было шмат народу, але там быў страшэнны бруд. З расчыненых на вуліцу крам і харчэўняў выглядвалі пажоўклыя твары габрэяў; на сценах дамоў былі відаць пісягі ад памыяў, якія вылівалі на вуліцу; паміж кучамі гною і смецця, што ўзвышаліся аж да першых паверхаў, было ні

прайсці ні праехаць. Пасярод вуліцы разлягалася чорнае смуроднае балота, якое ніколі не прасыхала. Па баках былі пакладзены дошкі, затаптаныя прахожым і праезджым людам, які з цяжкасцю прабіраўся паміж лужын і смецця. Дамы ўздоўж Нямецкай, а таксама Мясной і Шкляной вуліц, дзе жылі габрэі і дзе месцілася больш за ўсё крамаў, былі высокія, чорныя, брудныя, часта з навіслымі над вуліцай балконамі і галерэямі, там вісела доўгімі шэрагамі мокрая бялізна і адтуль на галовы прахожых ліліся смярдзючыя памыі. І ноччу і ў прысмерках ніхто не адважваўся туды хадзіць адзін, кожны імкнуўся абмінуць цёмныя завулкі і вуліцы, на якіх жылі габрэі.

Калі ж ісці ад ратушы да замка, то тут усё выглядала іначай — было святлей, побач з драўлянымі дамамі стаялі палацы, касцёлы, цэрквы, корчмы і пастаялыя двары. Тут было нашмат чысцей і менш габрэяў. Тут праязджалі карэты і павозкі, вершнікі, прыдворныя, наёмнікі і каморнічныя магнатаў, тут хадзілі святары, якіх часцяком зневажаў угневаны іншаверац. З правага боку тут стаяў вялікі палац князёў Астрожскіх, а палац Хадкевічаў, пабудаваны так, што выходзіў на дзве суседнія вуліцы, рэстаўрыраваўся. Недалёка ад яго ў тым самым радзе стаяла старадаўняя царква Багародзіцы, здавалася, што яна вось-вось разваліцца: яе жоўтыя сцены патрэскаліся ад часу, месцамі былі пашкоджаны злой рукой. Далей вуліца развіналася больш шырока, асабліва там, дзе з левага боку высіліся палац Радзівілаў і новы касцёл езуітаў. Адтуль аж да замка з двух бакоў ішлі маленькія домікі капітульнай юрысдыкі, непрыгожыя і брудныя. Адсюль недалёка было ўжо і да замка. Асабліва тлумна і цесна было каля Замкавай брамы. З правага боку грукаталі і шумелі каралеўскія млыны, злева сядзелі прадаўцы рознай жыўнасці на заказ, і так аж да самай Замкавай брамы. Той, хто сюды прыходзіў, мог бачыць разлеглыя сцены Ніжняга замка. Ён быў дужа вялікі, таму не вельмі прыгожы; было відаць, што збудаваны ён не за адзін год і не аднымі рукамі, што ў ім ляжыць камень Аўгуста і шведскі мармур Жыгімонта ІІ. Замак падзяляўся на тры вялікія часткі, кожная з іх абнесена сцяной, з левага боку ўпрытык да адной з іх стаяў кафедральны замкавы касцёл Святога Станіслава з вялікім высокім дахам і

вежамі. Непадалёк ад яго знаходзіліся гарматня і маленькія домікі саміх артылерыстаў. Былі тут і турмы, тут засядаў сам падваявода, спадчыннік замка пасля Жыгімонта Аўгуста. Тут месцілася і замкавая ваяводская юрысдыка. Над сценамі Ніжняга замка на гары ўзвышаліся пацямнелы вялізны касцёл Святога Марціна і вежы Верхняга замка, моцна папсаванага часам. А яшчэ далей на гары былі відаць тры крыжы і невялікая белая вежа на Бекішавай магіле, яна нагадвала труну выгнанца, які не знайшоў супакаення на могілках і разам з Вадашам Панончыкам спаў вечным сном на высокай гары. З боку ракі над замкам узвышалася вежа, якую называлі ліхтарнай. Далей ішла дарога на Антокальскае прадмесце. Амаль пусты і нежылы замак падваявода займаў пад турмы і склады. Тут не было такога руху і ажыўлення, як ля ратушы, бо ў замку з часоў Жыгімонта Аўгуста ніхто не жыў. А пры ім каля гэтых сцен віравала жыццё, яны былі такія новыя, так хораша выглядалі! Ажыўляла замкавы падворак толькі суседства з касцёлам, першым у Вільні па колькасці вернікаў, яго чорныя дахі з крыжамі панавалі над замчышчам.

Вуліца, што пачыналася ад Езуіцкага калегіума, называлася Свята-Духаўская, вяла да Троцкай брамы. На ёй стаялі толькі палацы магнатаў, таму яна мела яшчэ назву Сенатарская. З правага боку, крыху воддаль у садзе, высіўся палац біскупа, ён стаяў каля Езуіцкіх муроў, а за ім — капліца Святога крыжа. Далей — касцёл Святога Духа, а каля яго дзвярэй — будкі бедных жабракоў. З другога боку стаялі шпіталь Святой Тройцы і вялікі палац Сапегаў. За ім — іншыя палацы. Калі ж дайсці да вуліц, якія перасякалі Сенатарскую — Нямецкай і Віленскай, то можна ўбачыць касцёл Святой Марыі на пясках, з вялікім кляштарам, а за імі ўглыбіні была Троцкая брама. Тут сядзелі і бралі плату за ўваход гарадскія стражнікі, з імі лаяліся, а часам нават біліся тыя, хто прыязджаў у горад. Яна нават не выглядала як брама: з невялікімі вежамі, з памяшканнямі на некалькі вокнаў уверсе, але з моцнымі варотамі, набітымі цвікамі. Яна часам зачынялася на ланцуг, як і Зялёны мост.

Каля Зялёнага моста рух і людскі тлум былі не меншымі, чым у самім горадзе. Тут яўрэі ішлі на свае могілкі, тут у горад правозілі збожжа, сена, драўніну. За ўвоз бралася

плата, з-за яе часам усчыналіся спрэчкі. Адсюль з шумам ехала ў горад шляхта, яна звычайна не хацела плаціць, толькі палохаючы стражнікаў злосным выглядам і звонам шаблі. З гэтага боку быў большы напор людзей, а стары мост, які з аднаго боку і пасярод быў абсаджаны дрэвамі, ледзьве вытрымліваў наплыў тых, хто ішоў і ехаў па ім. На ноч мост перагароджвалі ланцугамі. Каля моста некаторыя перапраўляліся на лодках, каб не плаціць пошліну, на лодках жа габрэі перавозілі на могілкі сваіх нябожчыкаў.

Так выглядалі розныя часткі гэтага горада, у якім будзе адбывацца дзеянне большай часткі нашай аповесці. Мы ўжо звярталі ўвагу на тое, што нават сваім выглядам горад нібы даваў зразумець, што ў ім ідзе барацьба: тут стаялі побач касцёл і царква, касцёл і мячэць, пабудовы дзяржаўныя і храмы, халупы і палацы. Габрэі перамешваліся тут з ліцвінамі, ліцвіны з рускімі, шляхта з гараджанамі, хрысціяне з мусульманамі, татары з сялянамі, купцы з панамі і князямі. Як жа было ім тут усім ужыцца, як было не спрачацца?

Мы не далі апісання некаторых частак горада не толькі таму, што вернемся да іх у нашай аповесці далей, але і таму, што ў іх не было нічога асаблівага. Згадаем хіба што пра Антокальскае прадмесце, якое ляжала за замкам і было ў той час не дужа заселена і забудавана. З правага боку там выдзяляўся невялікі палац Вяршупскага і агароджаны Звярынец, а з левага — некалькі невялікіх палацаў Удалечыні віднеўся невялікі драўляны касцёл Святога Пятра, які толькі крыжам вылучаўся сярод іншых пабудоў, здаваўся хутчэй крамай, чым касцёлам. Ён стаяў на тым самым месцы, што і цяперашні, у цені высокіх старых ліп. За ім бялеў вялікі палац Пацаў, а далей — прыгожыя палацы Сапегаў з агароджамі і купкай дробных дамкоў каля іх. У прадмесці было зусім ціха, спакойна. І наадварот, больш за ўсё крыку і тлуму было каля Троцкай брамы, Рудніцкіх варот і Зялёнага моста. Пры Вострым канцы на гасцінцы, які называўся Медніцкім, было зусім іншае жыццё. У гэтым месцы жылі пераважна рускія, іх лёгка было адрозніць ад усіх іншых па адзенні; тут блукалі сонныя мніхі і чарняцы*, хадзілі купцы з Масквы і Цверы. Іх гасцініца, пра якую мы ўжо ўспаміналі, стаяла нібы на варце непадалёк ад двух прыгожых гмахаў — царквы і манастыра.

У самай гушчыні горада, у яго цесных завулках, панаваў яшчэ большы беспарадак, чым на вялікіх вуліцах. Там ужо амаль што нельга было не тое што прайсці, але нават праціснуцца каля куч гною і смецця, наваленых з двух бакоў у варотах кожнай камяніцы, трэба было асцерагаючыся хадзіць каля дамоў з балконамі, адтуль часта вылівалі брудную ваду і памыі. На такіх вулачках і жыла пераважная большасць гараджан — у старых мураваных дамах, у драўляных клетках, што туліліся часта пры шыкоўных палацах. Тут можна было ўбачыць жабракоў з брацтва міласэрнасці, валацуг, зброднікаў, падшывальцаў, гультаёў, вельмі своеасабліва апранутых, з розных мясцін, тут ашываліся абшарпаныя жанчыны, якія насміхаліся з прахожых, лаяліся з імі. Ноч тут бывала сведкай рабункаў і таемных забойстваў. Тут панавалі распуста і разбой, прычынай іх часта былі беднасць, нястача.

На ўсіх вуліцах, побач з густа рассыпанымі крамамі, пад бокам у палацаў і касцёлаў, адчынялі свае дзверы пад шыльдамі шынкі і пастаялыя двары. Гх усюды было мноства, лёгка было знайсці іх па тлуме каля дзвярэй, па вывешаных у акне мерах, па выстаўленых абаранках і белым хлебе. Каля варот больш багатых пастаялых двароў можна было ўбачыць вершнікаў, падарожных з конямі на повадзе, дробную шляхту. Панства рэдка калі спынялася нанач на пастаялых дварах, бо мела або свае палацы ў гарадах, або карысталася гасціннасцю сваіх даўжнікоў ці сяброў. Дробныя шынкі, з якіх на вуліцу даносіліся крыкі, сварка, тужлівы голас скрыпкі або піскліві гук кобзы, спеў заезнага татарына, былі любімым месцам адпачынку самых нізкіх слаёў грамадства. Большасць шынкоў трымалі габрэі. У іх прадавалі піва і гарэлку, рэдка дзе мёд. Адной з самых прыстойных лічылася гасцініца маскоўскіх паслоў, пры ёй быў вялікі шынок; калі паслоў не было, тут спыняліся і падарожныя. Усе пастаялыя двары адрозніваліся адзін ад другога шыльдамі, імёнамі гаспадароў, малюнкамі на аканіцах. Яны былі рассыпаны па ўсім горадзе, і гэта было вельмі зручна для прыезджага люду. Самым распаўсюджаным знакам, які паказваў, што ў тым ці іншым месцы знаходзіцца карчма, шынок або пастаялы двор, была шыльда з галінкай зялёнай сасны на даху ці над дзвярыма. На пастаялых дварах звычайна былі закусачныя, трымалі іх і асобныя гаспадары

на Скопавай вуліцы, у іншых месцах, лепшыя і горшыя, але заходзілі туды паесці хіба толькі жабракі, больш-менш заможная шляхта ў тыя часы паўсюднай гасціннасці заўсёды знаходзіла стол, накрыты для яе амаль у кожным доме. Месцамі агульнага адпачынку былі таксама лазні, самыя прыстойныя з іх трымаў горад. У лазнях прадавалі і пачастункі; тут жа была і цырульня, у яе акне блішчэлі медныя талеркі, сюды заходзілі пагаварыць, пабрыць галаву і бараду.

Рамеснікі вывешвалі на сваіх майстэрнях не малюнкі, а прылады сваёй працы або вырабы: кравец — нож, шавец — боты, сталяр — маленькую труну. Шыльды шынкоў трапляліся так часта, што часам не мінеш і двух дамоў, як натрапіш на малюнак зялёнай галінкі. Менш было вінных лавак, ды яны і служылі для больш заможных грамадзян.

У прадмесцях, за гарадскімі сценамі, рэдка можна было сустрэць прыстойнага, багата апранутага гараджаніна, там жыла бедната ў напаўзакапаных у зямлю халупах, палову месца ў якіх займала скаціна, а ў другой курэў смуродны дым. Адсюль ішлі абшарпаныя жанчыны, мужчыны ў чорным ці шэрым адзенні з сякерай або пілой на плячах. Адсюль малочніцы неслі ў горад сыр, масла, малако. Тут жылі бедныя гандляры. На вуліцах прадмесця блукала многа скаціны — кароў, свіней. Пры хатах там і сям квітнелі сады, буялі рознай расліннасцю агароды — яны забяспечвалі жыхароў Вільні гароднінай. У прадмесцях Вільні і Трокаў жылі пераважна бедныя татары — яны таксама займаліся агародніцтвам і жывёлагадоўляй для патрэб горада.

Аднак даволі апісанняў, надышоў час пачаць нашу аповесць.

## Паздзел 2

## У КАМЯНІЦЫ ЖМУДСКАГА СТАРАСТЫ

Вечар у адзін з апошніх дзён 1599 года. Снег ахінуў белым зімовым плашчом дахі касцёлаў і дамоў Вільні, зацерусіў вуліцы, толькі там-сям на іх чарнелі незамёрзлыя лужыны. На ратушы адзванілі і адбілі час тушэння агнёў, слугі і начныя стражнікі збіраліся рабіць абход, але агні

яшчэ ззялі амаль ва ўсіх вокнах камяніц і палацаў, былі адчынены шынкі, і каля іх усё нешта крычала кампанія выпівох; на вуліцах было шматлюдна, у горадзе поўным ходам яшчэ віравала жыццё. Аднак крамы пад ратушай, мясныя лаўкі і магазіны былі ўжо даўно замкнутыя, разышліся з ратушнай плошчы рамеснікі і гандляры — гандаль скончыўся. Просты люд бавіў час у шынках, паны — у палацах, у ціхіх дамах гараджане вольна гутарылі, змаўкалі толькі тады, калі чулі стук у вароты: можа, гэта стукае гарадавы — ён часта правяраў дамы гараджан ці прыводзіў на пастой пасланцоў, дзяржаўных служачых або паслоў. З манастыроў даносіліся хоры вячэрніх малебнаў. І ўжо што хвіля, то болей радзелі шэрагі прахожых, аціхалі галасы, адзін за адным замыкаліся шынкі, закусачныя, лазні, гасла святло, рух спыняўся, горад заплюшчваў свае бліскучыя вочы і засынаў.

У гарадскіх брамах нацягвалі ланцугі, зачынялі вялізныя вароты, выходзіла начная варта. Вартаўнікі з алебардамі абыходзілі вуліцы, спяваючы сваю адвечную, добра знаёмую песеньку:

Гараджане-васпане,
Сем гадзін наступае,
Бойся агню і злодзея!

І сапраўды, пачынаўся самы час злодзеяў, — ужо выбіраліся з падазроных шынкоў каля зладзейскага рынку спрытныя прайдзісветы з акаванымі жалезам дубінкамі, кіямі з насечкамі і пільнавалі ў завулках каля брудных дамоў запозненых прахожых.

Снег перастаў церусіць, і на неба выплыў месяц. Таму на вуліцах, нягледзячы на позні час, яшчэ было не цёмна.

На Замкавай вуліцы ўзвышаўся цёмны палац Хадкевічаў, толькі ў адным акенцы свяцілася жоўтым агнём свечка — яе святло прабівалася праз апраўленыя ў свінец шкляныя шыбкі на вуліцу; вароты палаца, як і ва ўсіх багатых дамах, былі ўжо даўно замкнутыя на вісячыя замкі і акутыя жалезам засаўкі. Ішла восьмая гадзіна, калі на вуліцы пачуўся тупат конскіх капытоў і ў вароты пастукалі. Вароты былі зачыненыя, прарэзаная ў тоўстай сцяне фортка — таксама. Некалькі вершнікаў у плашчах стаялі каля варот, адзін з іх злез з каня і настойліва стукаў у вароты, крычучы:

— Ёсць тут хто? Гэй! Адчыняй! Вартаўнік! Памёр, ці што? Гэй! Адгукніцеся хоць хто-небудзь! Чуеце?

З вокнаў дома насупраць высунулася некалькі галоў і знікла, а ў палацы ўсё маўчала, ніхто не азваўся.

— Ці то ўсе заснулі, ці п'юць у шынку. Хоць ты сам адчыняй, — сказаў другі вершнік. — Бадай, варта абысці палац і пагрукаць у другія вароты, можа, з таго боку хто-небудзь яшчэ не спіць. Канчайце стукаць!

Сказана — зроблена. Вершнікі паехалі да старой царквы Багародзіцы, завярнулі ўправа на невялічкую плошчу і падаліся ўздоўж сцяны па правым баку цеснай вулачкі, заязджаючы з другога боку палаца. Тут яны і ўбачылі святло ў акне, а той самы незнаёмец, што стукаўся ў вароты з таго боку, заняўся гэтым і тут. У асветленым акне з'явіўся цень чалавека, ён глядзеў на вуліцу, пачуўся голас:

— Хто там?

— Хто, хто! Ужо з гадзіну дастукацца не можам! Свае. Пан Барберы і слугі ягамосця, прыбылі па яго загаду.

Цень знік з акна, за сцяной пачуўся шум, які падаваў добрую надзею, пасля гэтага была адсунута засаўка, адамкнуты замкі, праз шчыліны ў варотах паказалася святло, а самі вароты цяжка зарыпелі на завесах. Госці заехалі на дварышча, вароты за імі зноў зачыніліся.

Жмудскі стараста Ян Караль — гаспадар палаца якраз адсутнічаў, таму ў доме і было так ціха. Па яго загаду прыехаў Барберы, або Гійаме Барб'е, француз, інжынер, апалячаны іншаземец. З ім было больш дзесятка прыдворных старасты і некалькі маладых шляхціцаў, якія таксама адносіліся да двара Хадкевічаў, былі даўнімі сябрамі іх сям'і. Па тым, як ціха іх прынялі, можна было вызначыць, што ў палацы гасцюе нехта знакаміты, хаця сам Ян Караль быў у ад'ездзе. Вершнікі злезлі з коней, аддалі іх гайдукам і канюшым, загадалі зняць паклажу і пайшлі за домакіраўніком, які спусціўся да іх са звязкай ключоў, а цяпер па высокай лесвіцы праводзіў іх наверх у вызначаныя ім для начлегу пакоі.

Уперадзе ішоў са свечкай у ліхтары малады хлопец-слуга, за ім цяжка ступаў домакіраўнік, а за ім паднімаліся ўгору пан Барберы і іншыя прыдворныя.

— Дзе мой пакой? — нецярпліва спытаў з акцэнтам стомлены дарогай француз. — Так высока?

Домакіраўнік павярнуўся да яго, паднёс руку да абшытай лісінай шкурай шапкі і адказаў:

— Больш нічога няма, усе пакоі занятыя або падрыхтаваныя для тых, хто павінен прыехаць, для сяброў пана старасты, а некаторыя занятыя складзенай там зброяй і амуніцыяй, толькі вось гэтыя і засталіся для вашай мосці. Я думаю, што вам спадабаецца — адтуль зверху відаць увесь палац.

Урэшце яны падышлі да дзвярэй, што вялі ў пакоі, і сталі на галерэі, якая акружала пяціканцовы выступ у левым крыле палаца. Выступ гэты выглядаў як невялічкая вежа ці ліхтар. Домакіраўнік пачаў падбіраць ключ да замка і ўрэшце адчыніў дубовыя, акутыя жалезам дзверы, потым прапусціў уперад хлопца са свечкай.

Падарожныя ўціснуліся ў першы пакой, за ім былі бачны другі і трэці — такія ж самыя цесныя і пустыя. Голыя белыя сцены, пры сценах дубовыя лавы, пасярод — сталы, адна печ на ўсе тры пакоі, вялікі камін з высокім верхам, вокны з апраўленымі ў свінец шыбамі — вось і ўсё, што яны там убачылі. Падлога была цагляная. З даўно неапальваных, нежылых пакояў цягнула холадам.

— Ты, відаць, хочаш памарозіць нас, пан Бурчак, Богам клянуся! — усклікнуў француз. — Я тут не тое што ночы, гадзіны не вытрываю, пайду начаваць на пастаялы двор!

— Я ж казаў вам, што іншага жытла няма ва ўсім палацы, — апраўдваўся пан Бурчак, збіраючыся выходзіць.

— Але ж, можа, ёсць тут дзе-небудзь хоць адзін цёплы пакой, дзе можна было б адагрэцца? — спытаў Барберы.

— Пойдзем, хіба ў мяне сагрэецеся, — прапанаў пан Бурчак, — а я тым часам загадаю тут зацепліць і перанесці вашы рэчы, ім холад не зашкодзіць.

— Пойдзем, пане, і з вялікай ахвотай, — узрадаваўся маладзейшы, — бо мы зусім змерзлі, ды яшчэ галодныя, а тут і падсілкавацца няма чым, хіба што з голаду пачаць грызці сталы і лавы.

— Не! Не! Хадзем са мной, вашамосці!

— Відаць, мне ніколі не выспацца, — мармытаў, спускаючыся ўніз па прыступках, пан Бурчак, — ніколі не ўдаецца выспацца за гэтым праклятым абавязкам, ад яго ніякага спакою няма. Ці табе дзень, ці ноч, адно бегай з

ключамі ад варот да варот, ад пакоя да пакоя. Таму дроў, таму ежы, таму лаўку, таму стол. Так пад старасць і галаву скруціць можна.

— А ўсё ж нездарма пан староста выбраў вас, — заўважыў нехта з маладзейшых, — бо вы спраўляецеся з гэтым абавязкам лепей за ўсіх, хоць ён і цяжкі, і нудны. А за нашым гаспадаром служба не прападзе.

— Панская ласка на пярэстым кані ездзіць, — усміхнуўся Бурчак, спускаючыся па прыступках. За ім, спатыкаючыся ў цемры, караскаліся прыдворныя. — Ужо валасы ссівелі, а я ўсё яшчэ нашу ключы і працую прыбрамнікам. Хіба што ў стрыя пана старасты і маю ласку, а тут кім быў, тым і застаўся. Што за жыццё, васпане, што гэта за жыццё...

— Што зробіш, — азваўся хтосьці, — у кожнага свой чарвяк, які яго точыць.

— Не так ужо і ў кожнага, — прамармытаў Бурчак, ведучы падарожных далей. — А хіба вы, панове, як і пан староста, самі сабе тых чарвякоў не заводзіце? Вось і зараз. Чуў я, што справа ідзе да вайны!

— Бадай што, да вайны, — пацвердзіў Барберы.

— Ну вось! А навошта яна нам?

— А навошта нам пра гэта думаць, пане Бурчак?

Праваднік змоўк. Тым часам яны зноў выйшлі на дварышча, і ён па сцежцы павёў іх да другой галерэі, а па ёй да свайго пакоя, у якім мы бачылі святло праз акно з вуліцы. Тут нашы падарожныя, адчуўшы цяпло, пачалі распранацца. Пакой пана Бурчака знаходзіўся недалёка ад варот на вуліцы Савіч, вялікі, з вокнамі ў розныя бакі, гасцям ён падаўся досыць прасторным, хоць і скляпеністым, невысокім. Адно акно выходзіла на вуліцу, другое, бакавое, на суседні падворак. Было яно, праўда, меншае і закратаванае, а ўсё ж заўжды глядзела на суседні дом. Сусед, аднак, маўчаў, можа, і таму, што яно выходзіла з палаца Хадкевічаў. У куце стаяў ложак пана Бурчака, дакладней, тапчан, накрыты выцертай мядзведжай шкурай, над ім вісела распяцце, абвітае пасвенчанымі галінкамі, жоўтая грамнічная свечка, перавязаная стужкай, абразок святога, галінка вербніцы і шабля на невялікім дыване, прыбітым цвікамі. Пры сценах стаялі простыя лаўкі, пасярод — такі самы просты дубовы стол, на ім некалькі пустых жбанкоў

і кубкаў. На століку гарэла ў вялікім латунным ліхтары жоўтая васковая свечка, у каміне дагараў чырвоны агонь.

Падарожныя нарэшце адагрэліся. Пан Барберы, ён жа Гійаме Барб'е, або, як прасцей яго тут называлі — Вільгельм, іх начальнік, быў высокі худы мужчына, бледны, з твару жаўтаваты, вочы, бровы і валасы цёмныя. Доўгія валасы, прыгожыя вусы і вострая бародка на белым жабо, скамечаным і брудным пасля дарогі, суконны кафтан, скураныя штаны, боты з доўгімі шпорамі, капялюш з пёрамі, ласіныя пальчаткі, доўгія, ледзь не па самы локаць, — увесь яго выгляд і рыштунак, хоць і не польскага ладу, гаварылі аб тым, што ён чалавек мужны, бесшабашны ваяка, які да ўсяго адносіцца весела, з усяго смяецца, любіць вінцо, заляцанкі, росказні, не баіцца небяспекі і не надта паважае чуллівых людзей, якія ахвотна выварочваюць душу наросхрыст. Скінуўшы плашч, ён падышоў да каміна і, паціраючы рукі, грэўся каля вуголля, а ногі засунуў ледзь не ў самы жар.

Абодва ягоныя таварышы былі палякі, маладыя, прыгожыя з твару, апранутыя ў кунтушы і жупаны, пры палашах, у абодвух былі паголеныя галовы, доўгія вусы. Хаця з першага позірку ў іх тварах заўважалася нешта падобнае, аднак, калі прыгледзіцца, нельга было не адзначыць, што выраз іх быў розны. У малодшага быў высокі лоб, блакітныя вочы, рымскі нос, амаль белыя вусы, чуб, пагляд смелы, насмешлівы. У другога ж лоб быў нізкі, упалыя шэрыя вочы, нос непрыгожы, шырокі рот, тоўстыя вусны, адзенне вісела на ім, як на калку. Першага называлі пан Сумінскі, другога — пан Брожак. Яны абодва былі прыдворнымі пана старасты і памочнікамі пана Барб'е.

— Дык, можа, у вас знойдзецца і што-кольвечы перакусіць і выпіць? — спытаў Барберы ў Бурчака, які ўсё нешта незадаволена мармытаў.

— Такой парой? Усе ж спяць! Адкуль я магу што ўзяць, вашамосці?

— Вы ж не захочаце, каб я паскардзіўся пану старасту, што вы марылі мяне голадам? — настойваў Барб'е.

— Ад мяне гэта не залежыць, — адказаў Бурчак і замахаў рукамі, — а паскардзіцца вы можаце маршалку двара, які бачыць ужо дзесяты сон, яго ніхто не дабудзіцца, і прачнецца ён раніцой, калі сам захоча есці.

— Але ж пан дасць нам што-небудзь хоць на адзін зуб? — ласкава спытаў Сумінскі. — Напэўна ж, у вас ёсць нейкія прыпасы ў шафе?

— Я і не кажу, што не маю і што не дам, — адказаў Бурчак, — але калі ўжо дам, то не па абавязку перад вашамосцямі, *a proprio motu* — са сваёй ласкі і добрай волі.

— У кожнага з нас толькі адзін рот і адзін шлунак, — смеючыся, прамовіў Сумінскі, — і нам без розніцы, як яны напоўняцца: па абавязку ці з ласкі.

— Але ж цяпер пост, панове.

— А што вашамосць трымае ў сваёй шафе? — спытаў Барберы, падкладаючы ў агонь паленні.

— Што? Ну, трохі смажанай на алеі рыбкі, крыху грэнак з часнаком, збаночак піўка.

— Што зробіш, хопіць і гэтага! — згадзіліся падарожныя. — Дайце нам з вашае ласкі тое, што ёсць.

Яны селі за стол, а Бурчак з ключамі пайшоў да шафы, адамкнуў яе, потым расставіў на стале медныя міскі і расклаў па іх ежу.

Як бы мала яе ні было, елі са смакам, бо ўсе былі галодныя; пан Бурчак ужо збіраўся паставіць ім піва, калі ў вароты зноў пастукалі, а з вуліцы пачуўся нечы голас:

— Гэй! Ёсць там хто? Гэй! Адчыніце! Адчыняйце, я вам кажу!

— Ну вось, зноў, — незадаволена прамовіў Бурчак і падбег да акна. — Ці то насланнё якое, ці то Радзівілы збіраюцца браць нас прыступам. Хто гэта зноў? — Ён глянуў і тут жа, ні слова не кажучы, збег па лесвіцы, і падарожныя зноў пачулі скрып завесаў і тупат коней на брукаваным дварышчы.

— Хто б гэта мог быць? — зацікавіўся Барберы.

— Спытаем, калі вернецца пан Бурчак.

Пры гэтых словах адчыніліся дзверы пакоя, і ўвайшоў высокі мужчына са шпагай на баку, проста апрануты. На ім быў раменны пояс, шыты срэбрам, цёмны плашч, запярушаны снегам. Ягоныя боты былі ўсе ў гразі.

— У мяне ўжо няма ніводнага вольнага пакоя, — звярнуўся да яго Бурчак, — дык, можа, вашамосць згадзіцца пераначаваць з панам Барберы?

— Мне ўсё роўна, дзе начаваць, — з акцэнтам сказаў новы госць, — я прывык спаць дзе прыйдзецца!

Усе, хто сядзеў за сталом, пачалі прыглядацца да яго, а пан Барберы ўстаў і падышоў да госця.

— Вітаю, пане Станіславе! Што здарылася? Так хутка вярнуўся?

— А, гэта вы, пан Барб'е! Рады вас бачыць. Вярнуўся, але не так хутка.

— А што прывяло цябе сюды?

— Што? Загад пана старасты, які мяне раней адправіў, а зараз паклікаў назад дзеля нейкай патрэбы.

— А! — усклікнуў Барберы. — Я ўсё зразумеў. Ты тут дзеля таго, што і мы. А куды ты ездзіў?

— Ды я ўжо быў выбраўся за мяжу, каб агледзець лепшыя крэпасці і замкі, як нечакана ўжо недалёка ад аўстрыйскай Вены атрымаў ліст ад пана старасты. У ім ён загадваў мне вярнуцца і абяцаў, што зноў адпусціць мяне, як толькі міне патрэба, дзеля якой ён мяне выклікае. І яшчэ загадваў спяшацца. Ну, дык я і спяшаўся, можна сказаць, без сну і адпачынку.

— Відаць, мы тут усе сабраліся дзеля аднаго, — прамовіў Барб'е. — Так яно і ёсць!

— А ў чым справа, пан Вільгельм?

— Хіба ты не ведаеш?

— Нічагусенькі не ведаю! Якая-небудзь вайна? Далёкі паход? Вораг напаў?

— Самае дзівоснае, што толькі можа быць. Але не той час і месца, каб цяпер гаварыць пра гэта. Пакуль што сядай і еш.

Запрошаны без цырымоній сеў да стала.

Падарожныя моўчкі елі, Бурчак тым часам хадзіў, мармычучы, па пакоі, быццам парадкуючы нешта. Калі сціх бразгат нажоў і місак, першы загаварыў пан Станіслаў, звяртаючыся да Барберы:

— Я паміраю ад цікавасці, дык скажыце мне, калі ласка, дзеля чаго мяне выклікалі? Па ўсім відаць, што чакаецца нешта важнае.

— Важнае, аж занадта, — адказаў француз, — ды калі пачынаць гаварыць пра гэта, то можна і да світання не скончыць, а ўжо ноч. Але ж ты чалавек разумны, дык, можа, і па дарозе нешта ўляцела ў вуха. Няўжо зусім нічога не чуў?

— Як вам сказаць, і чуў, і не чуў, — жвава адгукнуўся Станіслаў. — Вашай мосці вядома, што пан староста — мой ласкавы апякун, ён хоча вывесці мяне ў людзі, таму за свой кошт адправіў мяне за мяжу, каб я пры іншаземных дварах павучыўся ваеннай справе, пабачыў свет. Я і паехаў, але неспадзявана атрымаў пасланне, загад паспяшаць назад, адкласці падарожжа на потым, бо я цяпер болын патрэбны дома. Я з вялікім шкадаваннем згарнуў клункі і павярнуў назад, заспяшаўся сюды. У сваім лісце пан староста загадаў мне вяртацца як найхутчэй, і я так гнаў каня, што па шляху не меў часу некага распытаць, таму нічога і не ўведаў. Але па ўсім бачу, што, мабыць, ладзіцца другі інфляндскі* паход.

— Які там, да чорта, інфляндскі! — абарваў яго Барберы. — Многа горш, дзіўней — не інакш як грамадзянская вайна!

— Ды ну? А з кім? З іншаверцамі?

— З іншаверцамі! Яшчэ толкам нічога не вядома, але кажу табе, што грамадзянская вайна, — запэўніў Барберы. — Пачакай, я ўсё табе раскажу, што ведаю сам, бо бачу, што ты, пане, як кажуць, ні сном ні духам пра тое, што ў нас дзеецца, не ведаеш. Ты ж перад падарожжам быў тут?

— Пакуль я тут быў, мяне чужыя справы не цікавілі, — адказаў Станіслаў. — Нечаму дзівіцца: праціраў штаны на езуіцкіх лавах, вывучаў метафізіку, рыторыку і філасофію, акрамя таго, туляўся па лагерах; як толькі дзе страляюць, там і я порах нюхаю, а што там людзі гаварылі, я ўсё прапускаў міма вушэй.

— Тады мне трэба табе, пане, усё *ab owo* — з самага пачатку — талкаваць, цэлую казань казаць, — паківаўшы галавой, прамовіў Барберы. — Але бачу, што ў пана Бурчака зліпаюцца вочы, пара і нам ісці ў свой пакой.

Пан Брожак адарваўся ад збанка, з якога спрабаваў здабыць апошнія кроплі піва, і пайшоў. Бурчак пазбіраў міскі, кубкі і збан, саставіў іх зноў у шафе, потым узяў ружанец і сабраўся маліцца.

— Вы вельмі выразна паказваеце нам, што мы тут ужо затрымаліся, — заўважыў Барберы.

— Дык жа даўно пара спаць, — адказаў стары.

Тут увайшоў Брожак, замахаў рукамі.

— Не ўздумайце туды ісці, — спяшаўся папярэдзіць ён. — Печ так напалілі, што па пакоях пайшоў жудасны чад, якога не вытрымае і конь, не тое што чалавек. Усе слугі павыскоквалі на лесвіцу.

— Што ж нам рабіць? Дзе мы будзем спаць? — ускліknуў Барб'е.

— А дзе сабе хочаце! — адрэзаў Бурчак.

— Дык, можа, мы тут застанемся? — зноў спытаў француз.

Бурчак нічога не адказаў.

— Каб у нас быў хоць бы яшчэ адзін збан або пляшка віна, то мы б яшчэ неяк час прабавілі, — сказаў Барберы, — але ж ноч такая позняя ды такая доўгая!

— Хай вашамосць папросіць пана Бурчака адчыніць вароты, — нахіліўшыся, прашаптаў Брожак на вуха французу. — Я ведаю, дзе тут недалёка прадаецца піва, і схаджу са збанком.

— Але ж усе шынкі і корчмы даўно пазачыняліся.

— Нічога, мне адчыняць, я тут усюды свой. Ды там, напэўна, не спяць яшчэ. Хаця на ратушы празванілі гасіць агні, яны ўсё роўна паляць яго, — запэўніў Брожак.

— Каб хаця хто-небудзь не абакраў, такой парой, напэўна, швэндаецца нямала злодзееў.

— О! Не бойцеся, вашамосць, а лепей папрасіце пана Бурчака адчыніць вароты і запрасіце яго на віно. Хай толькі адчыніць, я абавязкова знайду віна.

— Ведаеце што, пане Бурчак, — ужо ўголас прамовіў Барб'е, — здаецца мне, што нам нідзе не ўдасца заснуць, а трэба ж неяк скаратаць ноч. Дазвольце пану Брожаку схадзіць прынесці нам збан віна. Толькі дайце яму ключ ад варот.

— Што? Што? Ён прынясе віна? — спытаў стары.

— Прынясе, — запэўніў яго Барб'е.

— Дзе ён яго возьме такой парой?

— Паверце мне, вашамосць, — пераконваў Брожак, — я вам прынясу самага лепшага, ад Мальхера, з-пад шыльды.

— У Мальхера ўжо зачынена.

— Мне адчыняць, толькі вы ключ дайце.

Стары пакорпаўся на століку і выбраў адзін ключ, адвязаў яго ад раменьчыка.

— Ідзіце, вашамосць, — сказаў ён, — да варот ад Замкавай вуліцы, там злева ёсць дзверцы, каля варот, якраз на-

супраць крамы Мальхера, вам застанецца толькі перайсці вуліцу, і вы на яе парозе. Але, я прашу вас, замыкайце за сабой, бо нехта залезе, тады будзе мне бяды.

— Будзьце пэўнымі, вашамосць, — адказаў Брожак. — Дайце мне грошай, пане пэлкоўнік, — звярнуўся ён да Барб'е, — а вы, пане Бурчак, пазычце збан.

Сказаўшы гэта, ён заткнуў адно і другое крысо за пояс, насунуў па самыя вушы шапку, кіўнуў галавой Сумінскаму і зачыніў за сабой дзверы.

## Паздзел 3

## ЗБАН ВІНА

— Даўно я не бачыў віленскіх вуліц ноччу, — сказаў сам сабе пан Брожак, спускаючыся па лесвіцы на дварышча, — але і ўбачу нямнога, калі толькі перайду праз вуліцу да дома, дзе жыве Мальхер! І то добра.

Апынуўшыся на дварышчы, ён прабраўся да варот з боку Вялікай (Замкавай) вуліцы, папацёмку намацаў дзверцы, адкрыў унутраную папярэчную засаўку і паспрабаваў адкрыць замок ключом. Калі гэта яму ўдалося, ён праціснуўся на вуліцу, замкнуў за сабой дзверы, праверыў, ці замкнуліся, і зірнуў на вокны Мальхера, якія сапраўды аказаліся якраз насупраць.

— Што за халера! У яго цёмна! — здзівіўся Брожак, не ўбачыўшы святла. — Хіба ён адвучыў п'янтосаў заседжвацца ў яго? Ды не! Гэта яны, напэўна, хаваюцца, сядзяць з другога боку.

Падумаўшы так, ён падбег да варот камяніцы, прытуліў да яе вуха, потым стукнуў нагой адзін раз, другі, трэці.

— Гэй! Гэй! Ёсць там хто? Адчыніце!

Але ніхто не азваўся.

"Хай я месяц пасціцца буду, але ўсё роўна дабуджуся", — падумаў ён і зноў пачаў стукацца. І зноў без толку.

— Тут нешта не так! — сказаў ён праз хвіліну. — Але што ж здарылася? Паспрабую яшчэ.

Тут каля яго нешта зашамацела. Пан Брожак, які ад нечаканасці ледзь не ўціснуўся ў браму, павярнуўся.

Ззаду стаялі два мужчыны, глядзелі на яго і шапталіся.

Брожак убачыў іх і, нядоўга думаючы, запытаў:

— Панове ягамосці! Ці не маглі б вы сказаць мне, што гэта здарылася з Мальхерам, што яго нельга дабудзіцца?

Ягамосці нічога не адказалі, толькі зноў зашапталіся.

Пан Брожак падумаў, ці не хочуць яго абакрасці, таму парашыў за лепшае не грукаць болей у вароты, каб на яго не напалі ззаду. Ён адышоўся ад іх і пабрыў далей, раз-пораз азіраючыся. Тыя двое, якіх ён убачыў, таксама павольна пайшлі за ім. Гэта насцярожыла хлопца, але ён не разгубіўся і адважна падаўся па вуліцы ў бок ратушы. Там ён спадзяваўся лягчэй дастукацца і пад якой-небудзь шыльдай усё ж купіць віна.

Вуліцы ўжо апусцелі, церусіў снег, недзе ўдалечыні пераклікаліся начныя вартаўнікі, здалёку даляталі ціхія гукі касцельных званоў. Навокал — нікога, ні ў адным акне няма святла.

"Відаць, ужо болын позна, чым мне здавалася, — падумаў Брожак, — але я не такі, каб вяртацца з пустымі рукамі".

Ён рашуча павярнуў направа да Пятніцкай царквы, глянуў угору на дом з ганкам, які выходзіў фасадам на рынак, убачыў на шыльдзе сасновую галінку, прыпарушаную снегам, і заспяшаўся да варот. І тут пачуў нарэшце гучныя гукі п'янай бяседы, дужа знаёмыя яму гукі, стук кубкаў, звон шклянак.

— Нарэшце! — узрадаваўся ён. — Дастану віна тут або нідзе!

І ён пастукаў у вароты раз, другі і закрычаў:

— Добрыя людзі, прашу вас, адчыніце!

Толькі ён змоўк, як зноў убачыў тых двух, што ішлі за ім, яны стаялі блізка і нібыта цікавалі за ім.

— І вы, ягамосці, хочаце трапіць на пастаялы двор? — спытаў ён, злёгку пакланіўшыся.

Адзін з іх азваўся:

— І мы? А вы, васпан, дзеля чаго тут?

— Хачу расстарацца вінца, — прызнаўся Брожак.

— Вы не дастукаецеся, — сказаў другі, наблізіўшыся. — Хіба што мы паможам.

— Ды я і сам дам рады, — запэўніў яго Брожак.

— О не! — запярэчыў першы незнаёмец. — Хоць сабе да самага ранку стукайцеся, ніхто вам не адчыніць. Але пачакайце крыху, я вам дапамагу.

Сказаўшы так, ён мінуў вароты, падышоў да камяніцы, праз шчыліны якой прабівалася святло, прасунуў руку ў выразанае пасярод сэрца і тройчы пастукаў у шыбіну.

— Хто там? — спытаў голас знутры.

— Свой, з кардыналіі*, адчыніце з вуліцы.

— Зараз.

Пачуліся крокі, стук, бразгат ключоў, нарэшце адсунулася засаўка, адчыніліся дзверцы. Першы зайшоў Брожак, услед за ім прасунуліся і яго новыя сябры.

— Хай вам Бог заплаціць за гэту паслугу, бачу, што я дарэмна аббегаў бы ўвесь горад і толькі біўся б ілбом у вароты, — дзякаваў незнаёмцам Брожак.

— Няма за што, — коратка адказаў адзін з іх.

Злева ад варот у тоўстай сцяне адчыніліся дзверкі, з іх выбухнула святло і цёплае паветра, запахла ежай. Пан Брожак увайшоў у доўгі і вузкі скляпеністы пакой, уздоўж якога стаяў стол, памаляваны ў чырвоны колер, абстаўлены лавамі і засланы тоўстым абрусам у плямах. Пасярод стала стаялі цяжкія латунныя ліхтары з запаленымі свечкамі. На абрусе валяліся абгрызеныя косткі, хлебныя крошкі, розныя недаедкі, стаялі пустыя медныя міскі, паліваныя збанкі і медныя і шкляныя кубкі. За сталом сядзелі толькі два мужчыны, дужа п'яныя, яны нахіляліся праз стол адзін да аднаго, стукаліся кубкамі і крычалі:

— За здароўе вашэці! За здароўе вашай жонкі пані Кацярыны і вашай цудоўнай дзяўчыны Настассі, усяго вашага роду! Прыспарай, Божа!

Гараджане былі ў дужа добрым гуморы.

Каля акна, што выходзіла на вуліцу, спаў, узлёгшы на стол, яшчэ адзін п'яніца, на ягонай галаве была нізка насунута шапка, і толькі з-пад рукі, на якую ён абапіраўся, былі бачны доўгія канапляна-шафраністыя вусы. Гаспадар, што адчыняў дзверы, выглядаў чалавекам дужым, румяным, невысокім, у сініх панчохах з воўны, у начным каўпаку на лысай галаве, у расхрыстаным суконным кафтане, з чырвоным тварам і пурпурным носам. У пакоі была яшчэ адна асоба: дзяўчына, надта ж брудная, худая і непрыгожая,

нейкая зжаўцелая, у лахманах, заспаная. Валюхаючы з кута ў кут, яна збірала са стала міскі, кубкі, талеркі, лыжкі і, мармычучы нешта, пазяхаючы, выносіла іх у суседні пакой.

Тыя двое, да якіх толькі цяпер, пры святле, прыгледзеўся Брожак, былі маладыя хлопцы — упэўненыя ў сабе, добра апранутыя, яны зусім не былі падобныя на начных валацуг, якімі яны напачатку здаліся яму. Брожак, схамянуўшыся, пачціва і ветліва схіліў перад імі галаву і сказаў:

— Ды тут, мусіць, толькі харчэўня, можа, у іх я і не разжывуся віном.

— Не разжыцца віном! — адгукнуўся гаспадар, які падышоў з ключамі. — Не разжыцца віном! Нішто сабе! Хіба ж вашамосць не ведае новай харчэўні пана Супейкі, гараджаніна і купца горада Вільні? Разжывецеся, вашамосць, нават найлепшага — Канара! А ў што пану наліць?

— Вось у гэты збан.

Пан Брожак працягнуў яму двухгарнцовы* збан, гаспадар кіўнуў галавой і сказаў:

— Ідзіце за мной, вашамосць. А ці ёсць у вас чым заплаціць?

Брожак растуліў далонь і паказаў вышмараваны талер.

— Прашу за мной, — дадаў гаспадар, забраў ліхтар ад п'яных і шуснуў у глыб пакоя да дзвярэй, што вялі ў каморку.

Пан Брожак пайшоў услед за ім, а два "ягамосці" засталіся.

Гаспадар прывёў яго спярша ў цёмную каморку, тут панаваў страшэнны вэрхал, што можна было заўважыць нават пры водбліску свечкі, якая дагарала каля сцяны. У беспарадку грамаздзіліся карыты, кацялкі, пустыя бочкі, вялікія бутлі, міскі, віселі абрусы, валяліся мётлы, а на кучы бялізны і рознага іншага дабра ўладкавалася тая самая дзяўчына-служка, яна ўжо моцна спала, закрыўшы твар фартухом. З каморкі яны з гаспадаром выйшлі ў сенцы.

— З дазволу вашай мосці, — сказаў пан Супейка, — я схаджу па ключы ад склепа.

— Але ж вы там, вашамосць, дзеля ўсяго святога, не забаўцеся і не пакіньце мяне ўпацёмку.

— Я пакіну вашай мосці свечку, — адказаў гаспадар і заспяшаўся да напаўшкляных дзвярэй злева, праз іх можна

было ўбачыць пры святле лампады, запаленай перад абразом Прасвятой Дзевы, чысты пакой, дзе за занавескай у кветкі было раскідана і развешана living рознае жаночае начынне.

Гаспадар адчыніў дзверы, пачулася невыразнае мармытанне, бразгат ключоў, потым пан Супейка выйшаў. На ім ужо быў зялёны кубрак. Ён узяў з рук пана Брожака ліхтар і павёў яго па калідоры ўглыб, да дзвярэй склепа.

Пакуль пан Брожак чакае віна, мы вернемся ў першы пакой, дзе засталіся два незнаёмцы.

Гэта былі, як мы ўжо ўпаміналі, маладыя хлопцы, добра апранутыя, наколькі можна было меркаваць па іх абліччах і абыходжанні — прыдворныя нейкага пана, дваране, адзетыя на адзін манер у цёмнае, захутаныя ў багатыя плашчы. Яны знялі шапкі і прыселі на лаўкі каля акон ад вуліцы, насупраць гараджаніна, які спаў, разлёгшыся на стале.

— Ну, што скажаш? — спытаў адзін з іх. — Паспрабуем што-небудзь зрабіць?

— Небяспечная рэч, — адказаў другі. — Пра гэта трэба было падумаць загадзя.

— Але пакуль мы будзем думаць, хлопец уцячэ. Ну, дык што?

— У яго ёсць ключ ад дзверцаў, — прамовіў другі, — а нам бы ён вельмі прынагадзіўся. Ваяводзіч добра заплаціў бы нам, калі б мы займелі такі лёгкі доступ у палац Хадкевіча ды яшчэ і сувязь са служанкамі маладой княжны. Яна і хацела б нам дапамагчы, але не можа, бо яе пільна вартуюць.

— Але як мы вывудзім у яго той ключ? — спытаў другі.

— Вядома, ні ў якім разе нельга яго адбіраць, але ці не пашукаць якога спосабу абдурыць гэтага сысунка?

— Што ж прыдумаць?

— Мне здаецца, лепш за ўсё добра напаіць яго, — разважаў першы, — ключ выкрасці і адціснуць копію з яго. Я чуў, што якраз так падрабляюць ключы зладзеі.

— Як бы нам гэта не выйшла бокам, — занепакоіўся другі, — тут пахне шыбеніцай!

— А хто пра тое ўведае? Да таго ж хіба мы робім гэта дзеля нечага благога?

— А я думаю, што красці ключ няма сэнсу, яны ж гэтак, як і ўсюды, знутры зачыняюць дзверы на засаўку.

Вось каб знайшоўся хто-небудзь ды адчыніў бы нам засаўку, тады і ключ спатрэбіўся б.

— Гэта так.

— Вось вернецца наш сысун, тады паглядзім, ці можна яго спаіць. Заадно паспрабуем што-кольвечы выведаць ад яго, пане Адаме.

Толькі ён сказаў гэта, як увайшоў, закрываючы збан крысом, пан Брожак. Хлопец збіраўся ўжо выйсці праз другія дзверы, як адзін з незнаёмцаў спытаў яго:

— Як відаць, вашамосць некуды нясе віно. А ці хацелі б вы распіць па кубачку з намі?

— Дзякую вам, панове, за прапанову, — адказаў пан Брожак, у якога пры згадцы пра кубак ледзь слінкі не пацяклі, — і рад быў бы выпіць з вамі, але не маю часу, бо мяне чакаюць у палацы Хадкевіча.

— Ды што там, усяго нейкая хвілінка, — сказаў першы незнаёмец і падаў знак гаспадару, каб прынёс віна. — І ў нас часу няма, каб доўга сядзець тут, бо і нас гэтаксама паслалі, і нам трэба вяртацца, але ў такую халадзіну грэх будзе не сагрэцца хоць кубачкам.

— Ну, калі ўжо вы, панове, так хочаце, — адказаў Брожак і сеў, паставіўшы збан пад стол, — то і вып'ем. Скажу пану Барберы, што доўга цягаўся, пакуль здабыў віна. Хай пачакае.

— Цяпер, пры святле, я вас хоць лепей разгледзеў, — дадаў Брожак, — а то вы мяне каля Мальхера напалохалі. Даруйце, але я падумаў, ці не зладзеі вы, іх такой парой хапае на вуліцах.

— Гэта так, апоўначы не варта выходзіць з дому, — падхапіў ягоныя словы другі незнаёмец, — але яшчэ, мусіць, не здаралася так, каб нехта напаў на адной з галоўных вуліц, ды яшчэ каля ратушы, там пільна сочаць вартавыя. Вось у завулку дык можна атрымаць палкай па лбе.

Тут гаспадар падаў пляшку віна і тры кубкі. Старэйшы з незнаёмцаў наліў поўны кубак пану Брожаку, той тут жа асушыў яго, выцер вусны і прашаптаў:

— Нейкае моцнае віно, баюся, як бы не ўдарыла ў галаву.

— Ды слабенькае, не будзь я Супейка! — запэўніў гаспадар. — Яго можна піць як ваду! Так-то яно пячэ, але толькі ў шлунку, а ў галаву не дае.

— Ну, пад другую нагу, — абвясціў новы сябар і выпіў.

Пан Брожак выпіў таксама.

— Што ж, Бог Тройцу любіць, — усміхнуўшыся, прамовіў другі.

Пры гэтых словах пан Брожак пабялеў, нібы ўбачыў перад сабой ерэтыка, і сказаў:

— Што гэта вы, вашамосць, успамінаеце за кубкам пра Святую Тройцу? Можа, вы, даруйце, з канфедэратаў?

— Не, не! — запэўніў незнаёмец, зірнуўшы на таварыша. — Што вы! Так, выскачыла знячэўку. Вы ж ведаеце выслоўе: *Omne trinum perfektum* — Усё добрае — тройчы.

І яны зноў выпілі, кланяючыся адзін аднаму. Потым загаварыў старэйшы:

— Дык, значыць, вы з палаца Хадкевіча?

— Так, — пацвердзіў Брожак, — я прыехаў з панам Барберы, які будзе перарабляць палац на крэпасць, ці нешта падобнае.

— А навошта? — спытаў другі.

— А хто ж яго ведае! — прабурчаў Брожак. — Можа, пан староста хоча з некім ваяваць.

Незнаёмцы пераглянуліся, а Брожак лыпаў вачыма, праціраў іх, адчуваючы, што віно ўсё ж ударыла ў галаву.

— А хіба вы адны прыехалі? І нікога больш няма?

— Не! Яшчэ і пан Станіслаў прыехаў з-за мяжы дапамагаць пану Барберы ў гэтай справе.

— Хто ён такі, той Станіслаў?

— Выхаванец пана старасты, з яго рыхтавалі ваяра, пасылалі за мяжу вучыцца вайсковай мудрасці.

Брожак гаварыў і адчуваў, што ён нібы заблытваецца ў нейкай сеці, таму выцягнуў з-пад стала збан і пачаў уставаць.

— Мне трэба вяртацца, бо здаецца, што я перапіў.

— Вось-вось, менавіта здаецца, — сказаў незнаёмец. — Нам трэба выпіць яшчэ па кубачку, каб у пару было.

Ён зноў выпіў, тое самае зрабіў і пан Брожак, які ўжо ледзь трымаўся на нагах, а ўсё чакаў, калі яму нальюць яшчэ. Другі незнаёмец неўпрыкмет засунуў руку яму ў кішэню, выцягнуў ключ ад дзверцаў і хуценька пабег у каморку.

— Што гэта з вамі? — павярнуўшыся, спытаў Брожак.

— Ды кроў пайшла з носа, — адказаў той.

Тым часам другі як мог забаўляў Брожака, піў з ім, пакуль у пляшцы было віно, і хаця хлопец увесь час парываўся пайсці і баяўся выпіць звыш меры, аднак як толькі бачыў поўны кубак, нават не спрабаваў адмовіцца, спрацоўвала прывычка, і Брожак асушаў яго. Так з угаворамі, паддаючы сабе духу і адвагі, яны добра падвыпілі. Неўзабаве з бакоўкі выйшаў, выціраючы сабе нос, другі хлопец, ён абняў і перахрысціў Брожака, а сам неўпрыкмет зноў паклаў яму ключ у кішэню.

— Калі будзеце мець час, — звярнуўся ён да Брожака, — то прыходзьце да Мальхера, і мы зноў разам крыху вып'ем.

— З радасцю, — адказваў ім Брожак, хістаючыся і выплюхваючы віно са збана, які ён схаваў пад крысо. — Але ж вы, панове, так мяне напаілі, што я не ведаю, як мне патрапіць назад, да палаца Хадкевіча, хаця мне і не ўпершыню хадзіць ноччу па вуліцах.

— А нам з вамі ў адну дарогу, — супакоіў яго незнаёмец. — Адчыніце нам, пан Супейка.

Яны выйшлі з варот, якія ім адамкнуў гаспадар. На развітанне ён перахрысціў іх. Усе трое зноў апынуліся на вуліцы.

Разгледзеўшыся і дыхнуўшы свежага паветра, пан Брожак адчуў вялікі цяжар у галаве, яму здавалася, што ўсё навокал кружылася і шумела. Ён ледзьве распазнаў перад сабой ратушу з правага боку і пайшоў улева ў бок замка. Абодва ягоныя таварышы вялі яго, распытвалі пра многія рэчы, і ён, наколькі мог сабрацца з думкамі, адказваў, не задумваючыся над тым, чаму яго так распытваюць і што да таго гэтым незнаёмцам, якія нават не сказалі яму, хто яны. Нарэшце яны развіталіся з ім, паказалі дзверцы, якія Брожак з вялікай цяжкасцю адамкнуў, потым замкнуў за сабой, але засаўку ўжо не змог зачыніць. Потым доўга блукаў па дварышчы, аж пакуль не патрапіў на лесвіцу, што вяла да пакоя пана Бурчака. Калі яму адчынілі дзверы, ён застаў пана Барб'е, які хадзіў па пакоі, трывожачыся за знесены ключ, і пана Станіслава — той ужо спаў за сталом.

Брожак увайшоў, хістаючыся, і хаця ледзь трымаўся на нагах, але паставіў збан пасярод стала; пан Барб'е заўважыў перамену ў ягоным твары і зразумеў усё астатняе.

— Ты недзе ўжо добра дзюбнуў, — папракнуў ён Брожака.

— Хто? Я? — адгаворваўся той. — Я? Ды гэта чыстая мана, у мяне апрача снегу макулінкі ў роце не было.

— Давай ключ, дзе падзеў ключ?! — перапыніў яго Бурчак. — І дзе так доўга бадзяўся?

— Што? Ды ўсюды было пазачыняна. Да таго ж мяне хацелі абрабаваць зладзеі, ледзь жывы вярнуўся.

— Хіба на цябе напалі?

— Яшчэ як напалі, — жаліўся Брожак, аддаючы рэшту грошай фальшывымі жалязякамі, — ледзьве выкруціўся.

Ён адступіў ад стала і захістаўся.

— О! Ды цябе чэрці ў бакі водзяць! — усклікнуў Барб'е.

— Таму што нехта з'ехаў мне чаканам* па лбе.

— Дзе? Дзе? Пакажы! — Усе падхапіліся і падбеглі да яго, нават пан Станіслаў ачомаўся і пачаў азірацца.

— У нас ёсць віно, — паведаміў яму Барб'е, — але наш нешчаслівы пасланец атрымаў за яго па лбе!

Усе пачалі шукаць на галаве след ад удару, але пан Брожак захінаўся, прытвараючыся, што дужа баліць, потым уцёк у другі пакой, падаслаў сабе плашч і лёг на ім спаць. А тым часам пан Барб'е і Станіслаў дасталі кубкі, запрасілі пана Бурчака, які, адклаўшы ружанец, ахвотна сеў за стол.

— Вы збіраліся, вашамосць, расказаць мне, што тут у вас дзеецца, што за грамадзянская вайна вось-вось распачнецца, — напомніў пан Станіслаў. — Раз вы мне абяцалі, то раскажыце, віно якраз і язык развязвае, і паддае ахвоты да гутаркі.

— Ды і я не ўсё ведаю, — ціха вымавіў пан Бурчак, — але раскажу, калі цікава.

Барб'е як фундатар віна першым наліў кубак і выпіў да Бурчака, Бурчак да пана Станіслава, той, у сваю чаргу, да пана Сумінскага, а потым яны селі кожны са сваім кубкам, і пачалася няспешная гамонка.

## Паздзел 4

## РАДЗІВІЛЫ І ХАДКЕВІЧЫ

— Вашай мосці трэба ведаць, — пачаў пан Барб'е, смакуючы віно, — што наш пан стараста і ўся сям'я Хадкевічаў здаўна родняцца між сабой, хаця і не дужа сябруюць.

— Так, гэта праўда, — перапыніў яго Бурчак. — Я вырас і памру ў гэтым доме, а таму як ніхто ведаю пра ўсе абставіны. Напачатку дзядзька яго панскай мосці пана старасты нябожчык Юрый, таксама жмудскі стараста, узяў сабе ваяводзіху навагрудскую Радзіваўну, а сам быў сынам княгіні Слуцкай з роду Алелькавічаў* — гэта таксама лучыць іх з Радзівіламі. Ён быў дужа даспадобы Радзівілам, хаця мы ўсе гаварылі, што з гэтага нічога добрага не атрымаецца: арол з грыфам не паладзяць.

— Вашай мосці трэба ведаць, што Алелькавічы таксама родзічы і Радзівілам, і Хадкевічам.

— І што тыя Алелькавічы — яблык разладу паміж імі.

— А хіба ўся справа ў Радзівілах? — спытаў пан Станіслаў.

— І ні ў кім іншым, — запэўніў француз, — але ты слухай далей, бо яшчэ пачуеш пра многія дзіўныя рэчы.

— Дазвольце мне спачатку расказаць пра гэтыя лучнасці, бо без іх нічога не зразумець, — стараўся растлумачыць Бурчак. — Паўтараю: Радзівілы родняцца з Хадкевічамі, а абодва гэтыя роды — са слуцкімі Алелькавічамі. Каб лепш уявіць, якім чынам, сачыце за маёй думкай: нябожчык дзядзька цяперашняга пана старасты Геранімa, у свой час таксама жмудскі стараста, парадніўся з Соф'яй Алелькавічавай, слуцкай князёўнай, а тая Соф'я была сястрой князя Сымона, бацькі князя Юрыя, які з'яўляецца бацькам нашай Соф'і Юр'еўны Алелькавічавай, слуцкай князёўны. З гэтага вы, вашамосць, выразна бачыце, што пан Юрый быў дзядзькам нашай панны. Трэба вам ведаць таксама, што гэта быў дужа набожны і пачцівы пан, хай Гасподзь дасць вечны спачын душы ягонай, і быў ён таксама жмудскім старастам. Пяць гадоў таму ўсе плакалі, калі яго хавалі ў Брэсце, і я праліў нямала слёз, бо ён мне дужа спрыяў і заўжды памятаў пра мяне. Аднак вы,ваша-

мосць, яшчэ не бачыце, у чым тут тое радство Радзівілаў з Алелькавічамі, дык я вам зараз пра гэта і раскажу. Бо цяперашні віленскі ваявода пан Радзівіл, які мае сына Януша, пабраўся з дачкой князя Канстанціна Васільевіча Астрожскага, кіеўскага ваяводы, а яна дачка Аляксандры Алелькавіч са Слуцка. Вось вам і крэўнае радство.

— Я так думаю, — перапыніў Барб'е, — што з усёй гэтай генеалогіі пану Станіславу зусім не зразумела, як гэта звязана з цяперашняй іхняй звадай, і хачу яму патлумачыць. А таму вяртаюся да свайго: Хадкевічы з Радзівіламі ў радстве, але тым не менш не дужа ладзяць між сабой. Аднак жа нябожчык Юрый, жмудскі стараста, так-сяк патрапляў у тон свайму цесцю, цяперашняму ваяводзе, бываў у яго ў доме, і жылі яны душа ў душу. Тая дружба была б яшчэ мацнейшай, калі б яны былі адной веры, але нябожчык Юрый быў дужа набожны і заядлы каталік, а ваявода, як вядома, ерэтык, знаецца з разнаверцамі, а нядаўна запісаўся ў канфедэраты разам з князямі Астрожскімі і іншым панствам з Русі. Аднак жа між сабой яны былі ў добрай згодзе. А тым часам, ужо даўно тое было, яшчэ ў 1595 годзе, памёр бацька нашай маладой князёўны Соф'і Слуцкай і перад смерцю даверыў апеку над ёй у сваім завяшчанні пану Юрыю Хадкевічу.

— Яна апошняя прадстаўніца гэтага слаўнага роду, — дадаў Бурчак, — які некалі меў сваё месца ў сенаце пры князю-біскупе віленскім. У яе багаты пасаг — Слуцкае і Капыльскае княствы.

— Калі тое сталася і князёўна Соф'я дасталася ў апеку пану Юрыю, жмудскаму старасту, Радзівілы пачалі яго абхаджваць з надзеяй схіліць яго на свой бок, каб прыдбаць Соф'ю і яе ўладанні. І яны так добра справіліся з гэтым, так улашчылі добрага жмудскага старасту, што яшчэ ў 1594 годзе, якраз за год да ягонай смерці, дамовіліся, што Соф'я выйдзе замуж за князя Януша Радзівіла, сына цяперашняга пана ваяводы і князёўны Астрожскай.

— Як магло такое здарыцца? — здзівіўся пан Станіслаў.

— Як? — перапытаў Бурчак, падстаўляючы свой кубак, каб у яго налілі віна. — Пра гэта лепей раскажу я, таму што сам быў сведкам усяго. Было ўсё гэта ў Брэсце, калі там будаваўся на старастаўы грошы прыгожы касцёл,

а сам ён праводзіў шмат часу ў малітвах, за некалькі гадоў да смерці дзень у дзень хадзіў на ўсе малебны і нават мала знаўся з людзьмі, так улягаў у набажэнствы. Радзівілы даўно хацелі мець пэўнасць у тым, што атрымаюць князёўну Соф'ю, якой у той час (а было гэта ў 1594 годзе) ішоў дзесяты год. Зусім дзіця! Дужа яны вакол яго віліся, улашчвалі яго, але ніводзін з Хадкевічаў і думаць не думаў пра шлюб багатай дзяўчыны з блізкім родзічам, нават калі б была пэўнасць, што Папа Рымскі дазволіць яго па просьбе караля, які добра адносіўся да паноў Хадкевічаў. Аднак яны не хацелі таго, таму што бачылі ў такім шлюбе парушэнне боскіх законаў. А вось габрэі-хрысціяне — тыя уступаюць у шлюб і з родзічамі. І вось тады...

— Нешта вы дужа падрабязна ўсё разводзіце, — не стрымаўся Барб'е.

— Нічога, нічога, нас ніхто ў шыю не гоніць, лепей распавесці ўсё як ёсць, — не адступаў ад свайго Бурчак, — толькі, пане, набярыцеся цярпення. Дык пра што гэта я?

— Пра тое, як хацелі аддаць князёўну за Януша.

— Ага, так. Вядома ж, хацелі і ўсяляк улашчвалі пана старасту, а пан стараста, каб пазбавіцца ад іх націску, даў слова шляхціца, што як падрасце князёўна і захоча сама выйсці замуж за князя Януша, то ён яе выдасць. Але ваяводу Радзівілу мала было гэтага слова, ён хацеў мець поўную ўпэўненасць у тым, што ягоны сын стане ўладаром Слуцкага і Капыльскага княстваў. Як зараз памятаю: быў я аднойчы ў Брэсце, і пайшлі мы бадай што ўсе ў касцёл. А было гэта, помніцца, у суботу перад Белым тыднем*. Раптам падбягае да нас дворны слуга і кажа, што конна прыехаў васал пана ваяводы, а неўзабаве будзе і ён сам. Маршалак падышоў да лаўкі пана старасты, паведаміў яму пра госця, а нябожчык стараста гэтак строга адказвае: "Ты ідзі і прымі яго, а ў мяне на першым месцы — Бог, а ўжо за ім усе на свеце князі і нават каралі. Вось скончыцца служба, тады я і вярнуся ў замак". Ён даслухаў да канца службу, пасля вярнуўся ў замак, а там ужо стаяць карэта, коні пана ваяводы і яго асабістая ахова. Павіталіся сардэчна і зычліва, а потым было там вялікае баляванне. Добра прынялі і людзей ваяводы — для іх выкацілі бочкі, ежы было напоўніцу, стол накрыты цэлы дзень, пры ім

і я, быццам зараз памятаю, слугаваў ваяводскай чэлядзі. Потым ужо пры двары даведаліся, што пан ваявода прыязджаў да старасты па нейкую паперыну.

З ім быў малады ваяводаў сын, князь Януш, пачцівы хлопец і шчодры, але ўжо тады, як і цяпер, у ягоных вачах праглядвала вялікая гордасць. Ён нікому слова добрага не сказаў, калі што не па ім было, адразу ж адсылаў чорту на рогі. Было там шмат паноў, сярод іх і пляменнік пана ваяводы — князь, староста мазырскі, многа сяброў. І яны зноў пачалі завіхацца каля пана старасты, многа чаго яму наабяцалі, напаміналі пра параднёнасць. Назаўтра мы даведаліся, што князёўну Соф'ю сасваталі князю Янушу пад заклад, і гэта засведчана дакументам.

— Як гэта — пад заклад? — зноў здзівіўся пан Станіслаў.

— Пан староста даў паперу пану ваяводу, у якой засведчыў, што пад заклад вялікай сумы грошай абяцае выдаць князёўну толькі за князя Януша, калі яна стане паўналетняй. Калі ж не споўніць таго, то сам заплаціць вялікі заклад. Я ўжо не ведаю, чаму пан староста гэтак зрабіў, але дзе ж ты дзенешся, калі і просяць, і ўгаворваюць, і клянуцца ў вечнай дружбе. Як тут не згадзіцца? Пасля гэтага былі зноў вялікія гулянні і віваты, выпіта многа віна, нарэшце ўсе раз'ехаліся. Пан староста быў дужа рады, што нарэшце выправіў іх, адразу ж загадаў прыбраць у пакоях і нанава асвяціць іх пасля гэтых ерэтыкоў, як пасля пракажоных.

— З гэтай пары, — падхапіў Барб'е, — хоць князёўна была яшчэ дзіцём, да яе стаў учашчаць князь Януш, прысылаў падарункі, каб спадабацца ёй; ваявода таксама час ад часу заязджаў пагасцяваць да бацькі, а ён хоць быў і цярплівы, і дабрачынны, але не любіў гэтых раптоўных наездаў і не раз казаў: "Ох, не падумаў я добра, калі даваў тую паперу, але будзь што будзе, справа зроблена. Раз слова даў, яго трэба трымаць". Але наш староста раптоўна памёр.

— О, хай яму будзе вечная памяць, — усклікнуў Бурчак, малітоўна склаўшы рукі. — Гэта быў чалавек, якіх мала на свеце, мілы людзям і Богу, не было ні адной жывой душы, якая мела б на яго крыўду.

— Памёр ён у Брэсце ў чэрвені 1595 года, вось ужо чатыры гады прайшло з таго часу, палова пятага мінула

нават. Пасля яго смерці Радзівілы вельмі ўстрывожыліся, не ведалі, з чаго пачаць, як зноў наладзіць парваныя сувязі, таму што апека перайшла да брата нябожчыка старасты — Гераніма, віленскага кашталяна, брэсцкага старасты, які не быў у такой дружбе з Радзівіламі, як Юры. Кашталян даведаўся пра смерць брата і паспяшаўся ў Брэст, бо Хадкевічы хацелі як належыць справіць хаўтуры і ўшанаваць яго памяць. На пахаванне прыехала многа ўплывовых людзей — сенатары, святары, — усе яны сказалі многа добрых слоў пра нябожчыка, а ксёндз Брандт, езуіт, выступіў з прачулай прамовай, якая ўсіх кранула. Пазней яна была надрукавана ў мясцовай езуіцкай акадэміі. Але гэта было аж у лістападзе, а вестка пра смерць дайшла да Радзівілаў адразу, і яны нібыта дзеля хаўтураў (хоць і ерэтыкі), а на самай справе дзеля пацвярджэння дамоўленасці паспяшаліся ўслед за віленскім кашталянам.

— І я там быў, — працягваў Бурчак. — Усе мы плакалі каля труны нашага дабрадзея, чакалі дня пахавання, і тут якраз Радзівілы *in magno comitatu* — з вялікай світай — знатных паноў і чыноўнікаў прыехалі ў замак. У першы дзень яны, шануючы памяць нябожчыка пана старасты і жалобу пана кашталяна, нічога не гаварылі, але назаўтра ж пачалі напамінаць пра тыя паперы, настойвалі на тым, каб аднавіць іх, згадвалі пра сваяцтва і сяброўскія сувязі, якія здавён існавалі паміж іх родамі. Спачатку кашталян не ішоў ні на якія ўступкі, адгаворваўся, што будзе дастаткова той першай дамовы з братам, але паны Радзівілы настойвалі, каб зноў дагаварыцца на ранейшых умовах з закладам, бо ім хацелася дамагчыся свайго. Я вам забыўся сказаць, што віленскі кашталян у час першай дамоўленасці таксама прысутнічаў, больш таго — ён сам пісаў яе, таму мусіў абнавіць паперы, раз ужо апека перайшла да яго. Пасля доўгіх угавораў быў складзены новы акт, які пісаў і аформіў складней, чым першы, маршалак яго каралеўскай вялікасці Андрэй Юндзіл. Падпісалі яго русін Аляксандр Галаўчынскі, які падтрымліваў Радзівілаў і прыехаў з імі, Ян Трызна і Пётр Страбоўскі, трайдзенскі староста. У тым новым акце занатавана, калі верыць чуткам, што віленскі кашталян абяцае аддаць маладую князёўну замуж за князя Януша Радзівіла, калі ёй споўніцца пятнаццаць гадоў,

тут, у Вільні, у гэтай вось камяніцы, дзе мы зараз сядзім, 6 лютага 1600 года, калі яна сама таго захоча і не будзе супраць. На гэты раз Радзівілы былі вельмі задаволены, князь быў дужа рады, бо ўсе яны ўжо не адзін год дамагаліся гэтага. І ўсё ж яны дужа баяліся, каб хто-небудзь не сапсаваў іхнія планы. Якраз з нашым панам старастам яны былі не ў дужа добрых стасунках, у іх цягнуцца нейкія даўнія родавыя спрэчкі. Таму яны пабойваліся, як бы ён не падбухторыў пана кашталяна супраць дамовы, а магчыма, іх непакоіла і іншае — многія літоўскія роды хацелі б парадніцца з Хадкевічамі праз князёўну. Праўда, засцерагаючыся ад гэтага, ваявода дапісаў у тым акце, што кашталян не будзе патаемна чыніць ніякіх перашкод, і ўсё гэта пад закладам у тысячу літоўскіх коп. Вялікія, скажу вам, грошы!

Калі ж неабачлівы кашталян пайшоў на такую ўмову і падпісаў акт, то Радзівілы нават не сталі чакаць пахавання, паехалі з Брэста радасныя і задаволеныя тым, што ім удалося абхітрыць Хадкевічаў. А князь Януш па волі свайго бацькі ваяводы яшчэ больш стараўся ўвайсці ў фавор, заваяваць прыхільнасць князёўны — праведваў яе, слаў падарункі, каб спадабацца ёй. Людзі кажуць, што яна яго ўпадабала, і гэта так і ёсць.

Дзеялася тое ў 1595 годзе, як я ўжо вам казаў, увесь гэты час князь Януш усё гэтак жа ўвіхаўся каля князёўны аж да гэтых дзён, а яна падрасла, стала дужа прыгожай. Вы бачылі яе хоць раз?

— Не, ніколі, — адказаў пан Станіслаў, — бо мне даводзілася больш бываць пры войску, чым аціраціца пры дварах. Як я мог бачыць яе, калі яна жыве то ў Гродне, то ў Брэсце, то тут, у вас, у Вільні, у кашталяна ў кляштары бернардзінцаў. А я тут бадай што і не бываю.

— Цяпер яна жыве ў нашым палацы, — сказаў Бурчак, — разам з ахмістрыняй нашага пана Влодскай. А падбор прыдворных дзяўчат проста каралеўскі — з самых лепшых, шляхетных паненак. Калі вы яе не бачылі, то вельмі шкада: на яе прыемна глядзець, нібы на касцельныя роспісы. Пакуль вы тут будзеце, вам, напэўна, удасца ўбачыць яе. Глянуць на яе — ніколі не скажаш, што гэтая дзяўчына расла, гора не ведаючы, што ёй усяго хапала, такая яна худая і слабая. Здаецца, ветрык дзьмухне і яна

паваліцца. Затое з твару прыгожая, хаця ўвесь час дужа засмучаная, нібы нядаўна плакала ці хварэла. Убачыш яе, і такая туга падступіць, што сам вось-вось, здаецца, заплачаш. Я ніколі не бачыў і не ведаю, ці смяецца яна, хіба толькі калі прыязджае князь Януш. А ён, ці праўда, ці не, дужа ўлягае за князёўнаю, моцна кахае яе, ва ўсім слухаецца.

— І ўсё ж вы, пане, многае апусцілі, — заўважыў Барб'е, разліваючы віно па кубках, — бо трэба ведаць і тое, што Радзівіл узяў за сваёй жонкай, Астрожскай, добры пасаг і сярод усяго іншага некалькі маёнткаў пад Оршай, якія яшчэ пры Жыгімонту Аўгусту пад заклад у пяць тысяч злотых былі перададзены Хадкевічам.

Невядома, што за злы дух падбухторыў ваяводу Радзівіла праз суд дамагацца тых маёнткаў. Хадкевічы былі настолькі ўражаны гэтым, што, нягледзячы на ўсе абяцанні ў Брэсце, на клятвы ў вечнай дружбе, праз пару гадоў скасавалі ўсе пагадненні. Радзівілы ўзнялі страшэнны крык і парвалі ўсе сувязі. Яны настолькі заеліся між сабой, што нават перасталі бачыцца, а пан Аляксандр і пан стараста затаілі вялікую крыўду на ваяводу. Яны судзіліся, пагражалі Радзівілам, што тыя маёнткі і Копысь адгукнуцца на лёсе князёўны Соф'і. З гэтай пары яны рабілі ўсё для таго, каб не дапусціць таго шлюбу. Неўзабаве пасля тых цяжбаў за Копысь наш пан стараста з братам Аляксандрам паехалі ў Брэст, туды ж прыехаў і іх дзядзька, апякун князёўны, віленскі кашталян Геранім. Вы туды яшчэ раз не ездзілі? — спытаў у канцы Барб'е ў пана Бурчака, які ўважліва слухаў.

— Не, не быў, але добра ведаю пра ўсё, — упэўнена адказаў Бурчак. — Яны прыехалі да дзядзькі, скардзіліся і крычалі, што ён заеўся з Радзівіламі, што тыя ўсё робяць дзеля згубы іх роду, цягнуць іх у суд, хочуць адабраць маёнткі.

Яны так расхвалявалі пана кашталяна, што і ён, ахоплены злосцю, пачаў разам з імі пагражаць Радзівілам. Яны ўзяліся даводзіць, што дамова з імі наконт шлюбу несапраўдная, таму што князь Януш і князёўна Соф'я блізкія родзічы, што яна яму амаль сястра; пазней давялі гэта і да вушэй караля, які быў заўжды прыязны да Хадкевічаў. Каралю не падабалася, што ерэтыкі могуць увайсці ў еднасць з імі і, нягледзячы на прадпісанні святога каталіцкага касцёла, ажэняць свайго сына з князёўнай. Яны так

угневаліся на Радзівілаў, што князь Аляксандр Галаўчынскі, які нагадаў пра апошнюю ўмову, змацаваную пячаццю, вывеў іх з цярпення і сам, раззлаваны, пакінуў Брэст. А наш пан Аляксандр і пан староста пачалі тым часам пераконваць дзядзьку, што ён, калі хоча аддаць князёўну Соф'ю Радзівілам, то хай хаця б памятае пра сваіх і нічога не робіць без іх ведама, каб яны не без выгады для сябе прыйшлі да згоды адносна Копыся. Нарэшце яны дамагліся таго, чаго хацелі, і ён на паперы, пад вялікімі зарокамі і закладамі, засведчыў, што без іх ведама не выдасць князёўну ў вызначаны тэрмін. Радзівілы даведаліся пра тое, што рыхтавалася, але ваявода пакінуў маёнткі сабе, бо ў яго была папера ад кашталяна, на пагрозы ён не адказваў, быў упэўнены, што даможацца свайго. А наш пан староста з братам Аляксандрам запрасілі пана кашталяна ў наваградскі земскі суд, каб разабрацца ў сваяцтве князя Януша з князёўнай Соф'яй, выклікалі і віленскага ваяводу па гэтай справе. Яны даводзілі, што, паводле Літоўскага статута, а таксама каталіцкіх устанаўленняў, не можа быць шлюбу паміж блізкімі родзічамі.

Ваявода з гэтага толькі пасмяяўся, бо ўжо аб тым пісалася, што земскі суд не мае дачынення да шлюбных спраў. Раззлаваўшыся на нашых паноў, а яшчэ больш на кашталяна за тое, што даў сябе ўгаварыць і падпісаў новы дагавор, ваявода таксама пачаў паграджаць. А вы ж ведаеце, што ён можа!

Так усё і цягнулася да гэтага года. Але ж я яшчэ не расказаў вам, як абышліся Хадкевічы з князем Янушам, які па-ранейшаму часта бываў у князёўны Соф'і, не забываўся пра яе. Два гады таму, памятаю, паехаў ён да яе ў Брэст, а вярнуўся адтуль дужа злосны, праклінаючы нашых паноў за тое, што дрэнна прымалі яго, далі пабачыцца з князёўнай усяго раз ці два, ды і то нядоўга, у іхняй прысутнасці. Потым ужо, зусім нядаўна, пан кашталян папрасіў пана старасту, каб ён дазволіў пажыць ёй у нашым нядаўна адрэстаўрыраваным доме, і перавёз князёўну з усім яе дваром у Вільню. Тут князю Янушу стала яшчэ цяжэй бачыцца з ёю.

Ужо хутка год, як усё гэта здарылася, і за гэты час адносіны паміж іх мосцямі не палепшыліся. Як цяпер памятаю, што тады было. Якраз у аўторак, перад днём

Божага Цела*, прыехаў князь Януш да гэтай камяніцы, хацеў пабачыцца з князёўнай, якая ўбачыла яго на вуліцы праз акно і, як заўжды, радасна прывітала. Пан стараста быў дома і праз маршалка загадаў паведаміць князю Янушу, што князёўна не прыме яго, таму што ён як апякун не дазваляе. Князь Януш узняў вялікі крык, пагражаў яму, злаваўся, але нішто не дапамагло.

Праз некалькі дзён князь Януш прыслаў пасланца з лістом і нейкім падарункам, але і гэтага наш стараста не дапусціў: падсцярог і адправіў назад з тым самым, ды яшчэ наказаў перадаць, што з усяго гэтага нічога не будзе, пакуль ён жывы, што Радзівілы ўжо шмат у чым паказалі сваю непрыхільнасць да роду Хадкевічаў, таму хай лепш пакінуць іх у спакоі. Князь Януш спрабаваў падкупіць слуг, але гэта раскрылася, слуг прагналі, на тым усё і скончылася. Князёўне было строга загадана, каб яна не спрабавала патаемна звязвацца з князем, інакш пасадзяць пад замок у манастыры. Князёўна плакала, але нішто не дапамагло. А князі Радзівілы, помсцячы за Яна Караля і Аляксандра віленскаму кашталяну, у тым годзе пацягнулі яго ў Трыбунал, дзе суддзя, князь Юрый Радзівіл, троцкі кашталян, абвінаваціў яго ў парушэнні дамовы, згодна з якой ён не меў права ўступаць у патаемныя змовы супраць ваяводы. Суддзя абвінаваціў яго ў тым, што ўступіў у змову са сваімі пляменнікамі, з-за чаго паўсталі цяжкасці ў выкананні дамоўленасці. Лёгка здагадацца, што кашталян прайграў справу і павінен быў заплаціць залог — тысячу коп. Але той, нават пад пагрозай баніцыі, не заплаціў.

— Ну, наш кароль ніколі не дапусціць такога, — заўважыў Барб'е, — мы ж усе добра ведаем, што ён любіць і падтрымлівае ўсіх шчырых каталікаў, у тым ліку і Хадкевічаў, а ўсіх ерэтыкоў і схізматыкаў, на чале якіх стаяць Радзівілы і Астрожскія, дужа ненавідзіць. Гэта проста немагчыма, каб выйгралі яны, а не мы. Вам, пане Станіслаў, трэба ведаць, — дадаў ён, — што ў іх шэрагах сёлета пачаўся вялікі рух, што яны ідуць супраць караля і каталікаў, як ільвы, і што кароль нам дапамагае. Ён зноў ажыўляе справу уніі з яе моцнай пагрозай праваслаўю. Тры гады назад яна пачалася, цяпер жа кароль хоча давесці яе да канца. Летась перад Трыбуналам тут быў вялікі з'езд, на які прыехалі

князі з рускіх зямель, Астрожскія, а таксама рэфарматары з Польшчы. Яны хацелі стварыць нейкую унію праваслаўя з іншымі ерэтыкамі, каб супрацьстаяць каталікам, езуітам і каралю, абараняцца ад іх. Тады адбыўся і слаўны дыспут, на якім супраць трыццаці іх правадыроў выступіў ксёндз-езуіт Сміглецкі, многіх з іх пераканаў, на вялікі іх сорам, але іх гэта не стрымала, яны хадзілі па горадзе і гаварылі, што выйгралі, хаця ёсць нямала сведкаў адваротнага.

— Але ж вы, пане, яшчэ не сказалі, калі, дзе і паміж кім будзе тая вайна, — нагадаў пан Станіслаў, — няўжо будуць біцца за князёўну Соф'ю?

— Ва ўсякім разе, я так думаю, — сказаў Бурчак, — бо Хадкевічы збіраюцца абараняцца не на жыццё, а на смерць. Праўда, кароль пісаў і да пана старасты, і да пана ваяводы, каб суняліся, каб дазволілі рассудзіць іх і разгледзець іх узаемныя прэтэнзіі на сейме, але — як гарохам аб сцяну. Не згадзіліся!

— Што ж будзе? Няўжо сапраўды пачнуць ваяваць?

— Відаць, што так, — адказаў Барб'е. — А пакуль не наступіць вызначаны дзень выдання князёўны замуж — шостага лютага наступнага года, дай нам Бог спакойна дачакацца тут, у камяніцы пана старасты, калі яна пачнецца, тая вайна.

— А да яе ўжо мы паціху рыхтуемся, — дадаў Бурчак. — Наш пан староста адусюль склікае і збірае людзей, але дарэмна ён падстаўляе свой лоб гэтым брыдотным ерэтыкам, ім жа дапамагаюць дужа магутныя Астрожскія і ўсе, колькі іх ёсць, ерэтыкі і русіны. Але ж і яго каралеўскай вялікасці не спадабаецца, калі марна загінуць ягоныя найбліжэйшыя і найадданейшыя прыхільнікі. Дзякуй Богу, наш кароль вельмі заклапочаны гэтым і, вядома ж, зробіць усё, каб не дапусціць вайны, калі ж да таго дойдзе, то пан староста выставіць не меней чым дзве тысячы войска на абарону камяніцы ды яшчэ тры дзесяткі гармат.

— А што ж Радзівілы? — спытаў Станіслаў.

— Ого! У іх людзей — да халеры, ім дапамагаюць усе сённяшнія канфедэраты, усе яны на іх баку 3 імі тры князі Астрожскія, кракаўскі кашталян, кіеўскі і валынскі ваяводы, і ўсе яны могуць выставіць многа людзей. А яшчэ з імі і князь курляндскі, бо і ён ерэтык.

— А таксама Абрамовіч з Варнян і смаленскі ваявода, а з ім ягоны швагра Нарушэвіч, пляменнік — мазырскі стараста, ды хто іх там зараз злічыць, — дадаў Барб'е. — Яны могуць сабраць каля пяці, а то, можа, і шасці тысяч войска. Але там, дзе шэсць атакуюць, дзве могуць лёгка абараняцца.

— Будзем спадзявацца, што Бог нам дапаможа, не паддамося, — прамовіў пан Станіслаў.

— Вы, вашамосць, быццам бы казалі, што і Замойскі з імі, супраць нас?

— Хто яго зразумее? — зазначыў пан Станіслаў. — Мы пра яго наслухаліся падчас элекцыйнага сейма*, як быццам нармальны хлопец, але на яго глядзяць як на нейкае дзіва. Раскажыце мне, хто за нас?

— Усе католікі, але магнатаў мала, шляхты больш, напэўна, давядзецца браць у войска салдатню, бо ўсе баяцца зачапіць ваяводу і канфедэратаў — кожны пачціва адказвае, што і рады быў бы дапамагчы, ды нешта замінае. Толькі сандамірскі ваявода Мнішак па старой дружбе і па веры з намі, але і ён не абяцае прыслаць людзей, толькі сам прыедзе.

— Але ж усё гэта — жудасная рэч, можа скончыцца дужа кепска! — усклікнуў пан Станіслаў і ўстаў. — Хадкевічы ж нават і не думаюць аддаваць князёўну, а Радзівілы намерыліся ўзяць яе сілай, як крэпасць.

— Так яно і ёсць, — пацвердзіў Барб'е.

— А што думае пра гэта сама князёўна?

— Толькі Бог можа чытаць у яе сэрцы, — прамовіў Бурчак. — Я штодня бачу Соф'ю, многа чуў пра яе, але ведаю не лепей, чым вы, панове, прыехаўшы здалёку. Мне здаецца, што яна ўсёй душой хінецца да князя Януша, што яна кахае яго. А з выгляду — спакойная, маўклівая, нібы яе ўсё гэта не абыходзіць. Калі пан кашталян і наш пан стараста сказалі ёй, каб ніякіх сувязей, ніякага ліставання (бо і гэта бывала) з князем Янушам не мела, не прымала ад яго пасланцоў, то яна ім адказала: "Хай будзе ваша воля". Але мне ўсё ж думаецца, што яна шукае спосабу ўбачыцца, сустрэцца з князем Янушам. Таму што калі князь едзе па вуліцы (а ён досыць часта праязджае пад нашымі вокнамі), яна заўжды стаіць і глядзіць, часам па-

дае яму знак белай хусцінкай. Яна, бядачка, і галавой яму ківала. Я не раз бачыў такое. Вось праведае пан кашталян ды пераселіць яе ў другі пакой, бо гэтая пагроза баніцыі страшэнна раззлавала яго. Як толькі даведаўся, што яны хочуць чыніць, то гатовы быў уступіць хутчэй чорту, чым Радзівілу. Ён ведае, што ўсе католікі супраць яго, што князь рэктар калегіума Святога Яна праз сваіх людзей даў знаць пра тое каралю і прасіў, каб ён не дапусціў вайны. Але тут, у Вільні, ерэтыкі трымаюць усё ў сваіх руках. Каб супраць іх не былі езуіты, то яны б тут па галовах хадзілі, бо сваю цяперашнюю канфедэрацыю яны дужа цэняць.

— А вось і днець пачынае! — усклікнуў пан Барб'е, паглядзеўшы ў акно. — Пойдзем у наш пакой, бо і збанок ужо сухі, і галава цяжкая.

— А мне трэба працаваць пасля бяссоннай ночы, — дадаў Бурчак. — Як толькі бразне ў дзвярах, трэба адчыняць, ды яшчэ давядзецца наводзіць парадак у камяніцы, бо пан староста можа вось-вось прыехаць.

Яны пачалі разыходзіцца. Ужо добра развіднела, калі пан Барб'е і пан Station Станіслаў ляглі спаць на сене.

## Паздзел 5

## У КАРДЫНАЛІІ

У горадзе наступіў ранак і адразу напоўніўся рухам і жыццём. У лічаныя хвіліны жвава, шпарка абудзілася ўсё, заварушылася, пайшло, зажыло, адчула сябе часцінкай вялікага жыцця. Як толькі ледзь-ледзь заружавела на ўсходзе, уся Вільня няспешна пачала абуджацца ад сну; першы падаў голас і паклікаў на малебен звон на касцёле бернардзінцаў, на другім канцы горада адгукнуўся звон францысканскага касцёла, а потым загучаў зладжаны хор усіх гарадскіх касцёлаў і цэркваў. Вуліцы пачалі напаўняцца гандлярамі, вяскоўцамі з сенам, дрывамі, рознай жыўнасцю. Усё болей шырыліся шум і гоман. Разгарнулі свой нядоўгі ранішні гандаль малочніцы, адкрыліся вінныя лаўкі і харчэўні, пярэстыя слупы дыму пацягнуліся

ўгору з комінаў. Каля ратушы пачалі тоўпіцца габрэі, купцы ў бекешах з футра ішлі адчыняць свае крамы, на хаду паўтараючы словы малітваў; старыя пані ў чорных аксамітавых чаравіках, з тоўстымі кнігамі пад пахамі брылі ў касцёлы, хаваючы рукі ў лісіных і рысіных муфтах. Цырульні і памяшканні для брыцця запаўняліся людзьмі, ледзь не ў кожныш акне, над якім вісела шыльда з выявай талеркі, можна было ўбачыць намылены твар — толькі вусы тырчалі з-пад пены.

Там і сям па горадзе брылі габрэі ў доўгіх белых апранахах, якія цягнуліся па зямлі. Усюды адпіраліся брамы і вароты дамоў, палацаў, расчыняліся дзверы касцёлаў, на ганках там сядзелі жабракі і ціха шапталі малітвы.

У палацы Радзівілаў, што стаяў недалёка ад замка, побач з касцёлам Святога Яна, таксама ўсе прачнуліся; слугі і варта пайпглі ў горад, праз вароты туды-сюды ўжо бегалі прыдворныя. Гайдукі ў пярэстым адзенні, са зброяй у руках сталі на варту на падворку. Тое, што тут жыве ваявода, пазнавалася па пышнасці палаца, па мностcovу рознага люду, які ішоў сюды па сваіх справах і цярпліва чакаў прыёму. Палац Радзівілаў складаўся з некалькіх асобных пабудоў, заснаваных пры кардынале Радзівілу, які к таму часу, калі пачынаецца наша аповесць, ужо тры ці чатыры разы надоўга з'язджаў у Рым, а потым быў абраны кракаўскім біскупам, больш не жыў тут і саступіў свой палац ваяводу. Гэты палац не ўражваў прыгажосцю і цэласнасцю. Але штосьці ўсё ж надавала яму велічнасці, да таго ж усюды падтрымлівалася чысціня, што таксама паказвала: тут жыве важная асоба. Тут не было тых куч смецця, якія ўзвышаліся не так далёка ад палаца, каля дамоў гараджан, і дзе шнырылі галодныя сабакі, шукаючы спажыву. У адным з дамоў, вокны якога выходзілі на пляц перад касцёлам Святога Яна і збоку — на Замкавую вуліцу, жылі віленскі ваявода і ягоны сын Януш. Княгіня, чацвёртая жонка Крыштафа Радзівіла, у Вільні ў гэты час не жыла, не было і ніводнага з ягоных дзяцей.

Мы ўжо расказвалі пра ваяводу і ягоны характар. Ён быў горды багаты пан, стаяў у апазіцыі да караля, узначальваў спулку рэфарматараў, што былі ў канфедэрацыі з праваслаўнымі, зайздросціў католікам, бо іх любіў кароль, яго высока цанілі прыхільнікі. Ваявода быў звязаны спра-

вай і роднасцю з князямі Астрожскімі, іншымі радавітымі людзьмі з Русі, а па-сямейнаму — з Замойскім і славутым Львом Сапегам*. Ён хацеў быць на чале магнатаў у Літве і прадстаўніком тых сіл, якія не любілі караля за ягоную прыхільнасць да католікаў і Хацкевічаў і таму спадзяваліся толькі самі на сябе. Такім жа ваявода выхаваў і свайго сына Януша, які потым так нешчасліва праславіўся ў паўстанні, калі найболыш выявілася ягоная непрыхільнасць да Хадкевічаў (ці не найпершая прычына бунту), нянавісць да каталіцкай партыі, пагарда да пануючай рэлігіі, жаданне прынізіць іх і адпомсціць.

Князь Януш якраз толькі што прачнуўся, устаў з пасцелі, засланай мяккімі скурамі (як тады было ў звычаі), паклікаў слуг. Пакой, у якім ён спаў, быў прасторны, скляпеністымі вокнамі звернуты да касцёла Святога Яна, амаль увесь абабіты дыванамі.

На сценах пакоя было развешана многа зброі — яна блішчала, нібы толькі што выйшла з-пад рук збройніка. Каля ложка князя стаялі сярэбраная з пазалотай чаша, медны жбан і кубак.

Ледзь толькі хлопец прахапіўся і расплюшчыў вочы, адразу ж тупнуў нагой, пляснуў у далоні, клічучы слуг. Адчыніліся дзверы, адхінулася заслона, якой яны былі завешаны, увайшлі двое слуг у адзенні, якое вылучала ўсіх Радзівілаў. Яны прынеслі халодную ваду для мыцця і ручнік, каб выцерціся. Князь моўчкі абліў сябе халоднай вадой, выцерся, потым расчасаў свае доўгія (па тагачаснай модзе) валасы. Не завіваў іх, як цяпер, не душыў, толькі абліў сцюдзёнай вадой і прыгладзіў далонню. Потым падкруціў маладыя вусы, апрануў простае чорнае адзенне, але шытае з лепшага сукна, нацягнуў боты з прыгожай жоўтай скуры і атласу, камізэльку са шнуроўкай і арнаментам, пояс з пазалочанымі палоскамі. Спытаў у слугі:

— Пан ваявода ўжо не спіць?

— Так, яснавяльможны пане, — адказаў слуга, — да яго толькі што зайшоў міністр...

— Падайце мне поліўкі і паклічце Тамілу Таміловіча.

Слуга выйшаў, некалькі хвілін князь пастаяў каля акна, што выходзіла да касцёла, паглядзеў на багамольцаў, якія ішлі па вуліцы, незадаволена прабурчаў:

— Вечна я павінен глядзець на гэтых паганых папістаў!

Ён адвярнуўся, сеў за мармуровы столік, падпёр галаву рукой, разгладзіў вусы. Нейкая думка неадступна круцілася ў ягонай галаве, ён строга моршчыў лоб.

Тут унеслі поліўку ў срэбнай місе на срэбным падносе, потым зайшоў мажны прыдворны, давераная асоба маладога князя — Таміла Таміловіч, якому пры двары далі мянушку Дубіна, бо ён і сапраўды быў магутны і дужы, як дуб, нават нечым з постаці падобны на гэтае дрэва, да таго ж — тугадум.

Слугі выйшлі.

Князь адставіў убок поліўку і спытаў:

— Што ты зрабіў, Таміла? Што бачыў? Што чуў? Кажы.

— Усю ноч, яснавяльможны пане, хадзілі каля камяніцы Хадкевічаў, там пачаўся нейкі рух, мітусня.

— Што гэта значыць? Ты з кім-небудзь бачыўся?

— Ноччу прыбылі туды дзве групы вершнікаў.

— Дзве групы? А колькі іх?

— Ды мала, усяго некалькі чалавек.

— Што за яны? Ты што-небудзь праведаў?

— Я не змог бы даведацца, бо яшчэ не прыдумаў, як патрапіць у камяніцу, — сказаў Таміла, — але, на шчасце, нехта ноччу паслаў прыдворнага па віно, ад яго я тое-сёе выведаў.

— І што ж?

— Нічога асабліва важнага, бо ён сам толькі што прыехаў, — адказаў Таміла. — На чале першай групы пан Барб'е, нейкі француз, быццам бы служыў у войску ў крэпасцях і ў баявых шэрагах, а другіх прывёў пан Станіслаў аж з-за мяжы, ён — выхаванец старасты, быў пасланы вучыцца ваеннай справе.

— Мабыць, яны думаюць абараняцца ў камяніцы, — усклікнуў князь Януш, — і сюды з'едзецца цэлая плойма папістаў, праклятых лаёльцаў! Ды хай сабе яны збудуюць крэпасць, вышэйшую, чым іхнія касцёлы. Усё роўна мы іх дастанем і там, хай нават давядзецца разбурыць увесь горад!

Тут ён ударыў кулаком па стале, аж падскочыў кубак, і ўстаў.

— Што яшчэ? Вы не спрабавалі падкупіць гэтага дваравіна?

— Мы з панам Адамам учора спаілі яго, запрасілі і сёння на віно, можа быць, нешта ўдасца выцягнуць з яго.

— Паспрабуй, — прамовіў князь Януш, — можа, удасца з яго дапамогай адчыніць камяніцу Хадкевічаў і сустрэцца з князёўнай.

— Мне здаецца, што можна будзе, — адказаў Таміла, — але я яшчэ не ўпэўнены.

— Я добра аддзячыў бы яму, каб гэта ўдалося.

— Я тут адну рэч задумаў, не ведаю толькі, ці пахваліце вы мяне за гэта.

— Што ты там прыдумаў?

— Калі мы ўчора добра падпаілі яго, то я выцягнуў у яго ключ ад малых дзверцаў на Замкавай вуліцы ад камяніцы Хадкевічаў, а потым зрабіў з яго васковы злепак. Можа, спатрэбіцца.

— Добра зрабіў, малайчына, дужа добра зрабіў! — пахваліў князь Януш. — З імі падыходзяць любыя спосабы, як яны ваююць, так і мы. Закажы зрабіць такі ключ. Заўтра дасі яго мне. Ідзі і не спускай вачэй з камяніцы Хадкевічаў. Нам трэба ведаць пра ўсё, што ў ёй будзе рабіцца.

Таміла пакланіўся і выйшаў. Князь узяў шаблю, прычапіў яе збоку, надзеў шапку з пяром, насунуў яе на адно вуха і пайшоў па калідоры да бацькавых пакояў. У тым куце палаца панавала ціша, многа слуг, прыдворных, лёкаяў, гусараў чакалі пры зачыненых дзвярах у глыбокім маўчанні. Калі яны ўбачылі князя Януша, то тыя, хто сядзеў, ускочылі, каб прывітаць яго, але князь не звярнуў на іх увагі. Ён падышоў да дзвярэй, адхінуў заслону і пастукаў у дзверы. Здалёку пачуўся голас:

— Хто?

— *Janussius,* — пачуў ён у адказ.

— Зайдзі.

Атрымаўшы дазвол, князь адчыніў дзверы і ўвайшоў у вялікі багаты пакой, падобны на той, які мы ўжо апісалі, але яшчэ прыгажэйшы. Падлога была заслана цудоўным персідскім дыванам, сцены абабіты парчой, лавы і крэслы да самай падлогі пакрываў пурпуровы аксаміт з пазалотай. Тут было меней зброі на сценах, затое вялікі стол, які стаяў каля акна, быў увесь завалены кнігамі, рознымі паперамі. Стаяў на ім і вялікі пазалочаны гадзіннік.

Князь-ваявода сядзеў у крэсле. Ён быў у аксамітным адзенні, з залатым ланцугом на шыі, непадпяразаны. У яго быў сур'ёзны бледны твар, у чорных вачах свяціўся магутны дух. Чорныя вусы, канцы якіх звешваліся ўніз, і чорная барада — прыкмета іх роду — дапаўнялі ягоны воблік. На твары ў яго таксама адбіваліся мужнасць, упэўненасць у сваіх сілах, нават адценне пагарды і пыхі, здавалася, што такі чалавек не можа быць лагодным, чулым. Але калі ўвайшоў сын, твар яго пасвятлеў. Ён працягнуў руку, сын пацалаваў яе і моўчкі стаў за бацькавым крэслам.

— Ну, што новага, князь? — спытаў бацька (ён заўсёды так тытулаваў сына).

— Нічога або амаль нічога.

— А ў мяне ёсць навіны, — прамовіў князь і паказаў рукой на паперы.

— Я магу спытацца ў свайго добрага бацькі, што гэта за навіны?

— Адказы паноў сенатараў, якіх я прасіў быць пасрэднікамі паміж намі і гэтымі папістамі ў справе паміж табой і князёўнай Соф'яй, раз ужо яны адмовіліся ад усіх сваіх абяцанняў і дамоў, не пускаюць цябе да яе. Усе, каго я прасіў, абяцалі заўтра прыйсці да мяне, а потым яны пойдуць да кашталяна і будуць прасіць яго, даказваць, што ён павінен адступіцца ад сваіх не прыстойных для магната паводзін. Калі ж ён хоча вайны, то будзе вайна, і, Бог бачыць, зацятая будзе вайна!

Ваявода ўстаў і працягваў:

— Гэта будзе вайна, з якой Хадкевічы не выйдуць жывымі! Што ты на гэта скажаш?

— Цалую рукі майму бацьку і гаспадару, дзякую за клопаты пра мяне.

— Як мне здаецца, — дадаў ваявода, — убачыць кашталян майго канцлера Льва Сапегу ды яшчэ ваяводу смаленскага, старасту мазырскага, кашталяна жмудзінскага, кашталяна кракаўскага, іншых сенатараў і задумаецца, зразумее, што дарэмна слухаецца сваіх дзядзькоў-малакасосаў, а таксама розных там езуітаў, што толькі сам сабе наробіць шкоды і сораму. Перамагчы мяне ён не здолее, хай яму памагаюць хоць сотні езуітаў і хоць два нягеглыя каралі, бо за Радзівіламі ўся краіна!

— Я даведаўся, — сказаў князь Януш, — што Хадкевічы ўжо выклікалі з-за мяжы людзей, дасведчаных у фартыфікацыйных справах, для абароны сваёй камяніцы. Якраз учора прыехалі.

Ваявода засмяяўся.

— Няўжо яны думаюць, што могуць зраўняцца са мной! — усклікнуў ён. — Са мной і з усімі Радзівіламі! Хадкевічы — са мной! Ды мы іх шапкамі закідаем, похвамі ад палашоў паб'ём! Гэта ж трэба дадумацца! Не, яны робяць гэта, відаць, толькі каб напалохаць нас, паказаць, што не хочуць прыйсці да згоды. Яны хочуць вытаргаваць у нас і Копысь, і згоду. Гэтаму навучылі іх хітрыя езуіты, але ж і мы не не лыкам шытыя! Не, гэта ж трэба!

Ваявода ў абурэнні пакруціў галавой. Калі паспакайнеў, спытаў:

— Можа, ёсць якія навіны ад Соф'і?

— Ніякіх, князь пільнуе яе, як Аргус*, толькі часам бачу яе ў акне, калі праязджаю па вуліцы. Але я спадзяюся, што Таміла здолее прабрацца ў камяніцу Хадкевічаў, ён ужо тое-сёе пачаў рабіць для гэтага.

— Глядзі толькі, — папярэдзіў ваявода, — каб гэты дубалом цябе не ўблытаў у штосьці. Хай ён усё робіць сам, свой карак падстаўляе, нібыта робіць свае справы не па загаду, бо гэтыя папісты адразу ж наладзяць афронт, звінавацяць нас у тым, што мы дзейнічаем падманам. А для Радзівілаў само падазрэнне ў гэтым — ужо ганьба.

— Не хвалюйцеся. Я яго добра навучыў, а ён хлопец спраўны, кемлівы і адданы мне.

— Ці ўдасца мне гэтае заўтрашняе пасольства, адзін Бог ведае, — прамовіў ваявода, гледзячы на сына, які ўсё яшчэ стаяў за крэслам, — але я крыху спадзяюся, што толк будзе; калі дванаццаць паважаных і ўплывовых сенатараў завядуць гаворку пра нашы справы, то папісты нікуды не дзенуцца, зразумеюць, што нельга рабіць так, як яны робяць, не варта парушаць дагавор. Пан кашталян і так на валаску ад баніцыі, і то з маёй ласкі, хоць ён думае, што яго гэта не абыходзіць.

Толькі ён прамовіў тыя словы, як пачуліся званы з касцёла Святога Яна.

— Вечна ён б'е ў вушы, гэты звон да малебнаў спадчыннікаў Лаёлы, ідалапаклоннікаў, якія прыкрываюцца

лісіным хвастом сваіх лізаблюдаў езуітаў. Ужо ў горадзе і месца няма, дзе б вочы нашы іх не бачылі, вушы нашы іх не чулі.

Святар, пратэстанцкі пастар, які стаяў і моўчкі слухаў размову бацькі з сынам, заўважыў:

— Доўга Бог цярпліва чакае, але будзем спадзявацца, што сапраўдная вера, вера чыстага Святога Пісання, пераможа ідалапаклоннікаў.

— Дарагі ойча, — адказваў яму пан ваявода, — я ўсім сэрцам гатовы паверыць вам, але ўжо колькі гадоў запар нашы намаганні не даюць плёну, бо кароль са сваімі езуітамі дужа нам шкодзіць. Усё тое, што мы мелі за нябожчыкам каралём Аўгустам, цяпер губляем.

— Нічога, — супакойваў святар, — не адразу праўда даходзіць да людскіх сэрцаў. Хай яны растрацяць усе свае сілы, а потым мы іх, бяссільных, возьмем. Наша вера не згіне, яна распаўсюджваецца па ўсім свеце і заваёўвае ўсё новых прыхільнікаў, нягледзячы на моцны націск Рыма. Наступіць час, і гэты няшчасны край адчуе Боскую ласку і, нягледзячы на нягоды, уведае праўду.

Ваявода ўздыхнуў і стаў пазіраць у акно, а князь Януш падцяў губы. Па тварах іх абодвух было бачна, што веры ім не стае, як і надзеі, — такія пачуцці валодалі ў той час і іншымі пратэстантамі. Некаторыя з іх нават пераходзілі ў другую веру. У самім родзе Радзівілаў ужо былі такія прыклады, узяць хаця б таго ж Сіротку*, які стаў вельмі заядлым католікам і паборцам каталіцкай веры.

— Шаноўны ойча, — князь павярнуў гаворку на ранейшую тэму, — калі ўбачыце смаленскага ваяводу, перадайце, што я заўтра чакаю яго, спадзяюся на яго ўсім сэрцам.

Гэта азначала, што ваявода развітваецца з ім. Святар пакланіўся і выйшаў Бацька з сынам засталіся адны, яны перакінуліся яшчэ парай слоў, потым ваявода паклікаў свайго пісца і засеў за паперы, а князь Януш зноў пацалаваў бацьку руку, выйшаў з пакоя, загадаў падаць сабе каня і выехаў у горад.

## Паздзел 6

## КАШТАЛЯН І КНЯЗЁЎНА

Раніцай таго самага дня ў камяніцы Хадкевічаў была вялікая мітусня. Чакалі, што вось-вось прыедзе жмудскі староста, і ваявода прысылаў сваіх слуг, каб даведацца, прыехаў ён ці не. Барб'е і Станіслаў абышлі і агледзелі камяніцу, каб папрыкінуць, што можна зрабіць дзеля яе ўмацавання і падрыхтоўкі да абароны ў час магчымай аблогі. Яны паказалі мулярам і чэлядзі, дзе трэба прабіць адтуліны ў сценах для гармат і марцір. Прыслуга з цікавасцю прыглядалася да гэтай падрыхтоўкі — усё пацвярджала чуткі пра магчымую вайну, якім, праўда, пакуль ніхто не верыў, настолькі гэта было дзіўна. У горадзе добра ведалі пра сварку Радзівілаў з Хадкевічамі, ведалі пра збор войска і ўзаемныя пагрозы, але ніхто і думаць не думаў, што можа дайсці справа да вайны, да праліцця братняй крыві. Толькі ў гэты дзень па Вільні разнеслася вестка пра тое, што камяніца жмудскага старасты ўмацоўваецца як крэпасць: прабіваюцца байніцы для гармат, замуроўваюцца лёгкадаступныя месцы, дзе можна было б праламаць сцяну. Гараджане, якія праходзілі па Замкавай вуліцы, спыняліся, пазіралі на муляраў у фартухах, што стаялі на сценах з кельнямі ў руках, ківалі галовамі і казалі адзін аднаму:

— Дрэнь, мусіць, нашы справы, пане Мацей, калі ўжо ў горадзе, у самым цэнтры, робіцца крэпасць.

— Так, Базыль Іванавіч, трэба, відаць, уцякаць з горада, бо тут будзе вайна...

І прахожыя ішлі далей, разносячы па горадзе пострах. Больш за ўсё непакоіліся тыя, хто жыў блізка каля камяніцы Хадкевічаў — яны баяліся стаць нявіннымі ахвярамі грамадзянскай вайны. Бледныя, маўклівыя, яны са страхам пазіралі на тыя прыгатаванні, распытвалі пра колькасць войска, а яна ў вуснах палахліўцаў расла і расла, гаравалі, былі гатовы танна прадаць свае дамы, калі б толькі нехта адважыўся купіць іх.

Тым часам пан Барб'е, начапіўшы доўгую шпагу, у капелюшы з пёрамі, чорным плашчы хадзіў па камяніцы, пакручваючы вус, усё аглядаў, караскаўся аж на дах,

задаваў работу мулярам. Перш за ўсё ён загадаў падвоіць сцяну з боку царквы Багародзіцы, якая выходзіла на чужы падворак. Адтуль лёгка можна было прабіць яе, зрабіць пралом і прарвацца ў камяніцу. Ён вызначыў месцы, з якіх можна было адбіць напад пры дапамозе гармат і марцір, паказаў, дзе дабавіць кладкі, дзе збіць, а дзе прабіць вузкія шчыліны-байніцы, якія знізу расшыраліся так, каб магла змясціцца гармата. Работа ішла поўным ходам, але рабілася ўсё ціха, спакойна, у маўчанні. Пакуль усё гэта чынілася ў камяніцы Хадкевічаў на Замкавай вуліцы, кашталян спакойна маліўся ў сваім палацы каля манастыра бернардзінцаў. На той час ён яшчэ не аддаў яго ордэну францысканцаў, ягоны палац з садам стаяў упрытык да іх кляштара, з другога ж — да невялічкага доміка бернардзінак; крыжык над ім нагадваў хутчэй не пра манастыр, а пра шпіталь — так убога ён выглядаў.

Сядзіба кашталяна, якую ў той час у народзе называлі кашталянііяй, не была ні вялікай, ні шыкоўнай — гэта быў хутчэй звычайны вясковы мураваны дом. Такі вясковы выгляд яму надаваў сад. Тут панавала цішыня, якая парушалася толькі хорам манашак, што далятаў ад кляштара. Двор кашталяна не быў такі пышны, як ваяводскі, тут было больш свабоды і менш строгасці. І хоць вялікага пастраху не было, але захоўваўся парадак. Палац быў чысты, яго сцежкі былі пасыпаны белым пяском, на сценах пакояў віселі партрэты продкаў, пачынаючы з таго Ходкі Барэйкі, ад якога вялі свой род Хадкевічы, а паміж імі — абразы і карціны з гісторыі касцёла і краіны. Каля кожных дзвярэй там стаялі паводле звычаю сярэбраныя чашы са свянцонай вадой. Кожны, хто заходзіў, хрысціўся.

Слугі не хавалі тут пад крысо прылад для гульні ў косці, як у калідорах у Радзівілаў, бо ў кашталяна азартныя гульні былі строга забаронены; яны бавілі час за кніжкамі з жыцця святых або ў размовах. Сам кашталян раніцой звычайна сядзеў у сваім пакоі, абабітым чорнай тканінай. У гэтым доме сведчанні набожнасці гаспадара пераважалі над раскошай і ўпрыгожаннямі. Каля сціплага ложа віселі крыж, драцяная плётка, побач — шабля і шлем; на стале ляжалі кнігі: хроніка Бельскага* (у той час забароненая, аднак католікі яе чыталі), хроніка Мацея Стрыйкоўскага*,

жыціі святых, пропаведзі Скаргі*, запіс дыспуту ксяндза Сміглецкага з ерэтыкамі, а таксама мноства езуіцкіх панегірыкаў і розных звіткаў — зброя ў вайне за веру, якая ішла паміж католікамі і іншаверцамі. Кашталян толькі што вярнуўся з ранняй імшы ад бернардзінцаў і ў задуменні снедаў.

У дзверы пастукалі.

— Хто там?

— *Servus tuus Domine, Joannes.* — Вітаю цябе, пане, гэта я — Ян.

— Калі ласка, вашамосць, заходзьце.

Кашталян устаў і зрабіў некалькі крокаў насустрач госцю.

Гэта быў езуіт, яго можна было пазнаць па чорным вузкім адзенні, па схіленай пакорліва постаці і хітрым паглядзе, па складзеных на грудзях руках. На ягонай галаве свяцілася, нібы добрая талерка, танзура*. На фоне цёмнага адзення яго бледны выцягнуты твар з вострай сківіцай і зморшчанай скурай, упалымі вачыма, худым доўгім носам, бледнымі шчокамі і тонкімі вуснамі здаваўся зусім старэчым.

Езуіт, айцец Ян, увайшоў, пакланіўся, малітоўна склаў рукі, ступіў крок і зноў пакланіўся, потым яшчэ раз, аж пакуль кашталян не сціснуў яго аберуч і не пасадзіў у крэсла, дзе той прыстроіўся з краю, трымаючы пад пахай шапачку.

— Што ў вас новага, ойча? — спытаў кашталян.

— У нас у калегіуме нічога новага, — адказаў айцец Ян. — Выйшаў у горад з Соцыюшам, які меў справу да бернардзінцаў: хацеў паглядзець на нашу касцельную капэлу. І, карыстаючыся выпадкам, рашыў прынесці сваё шанаванне яснавяльможнаму пану.

— Шчыра дзякую вам, — прыязна адказаў кашталян. — Можа, вып'еце чаго, а то і паешце.

Езуіт пакланіўся, ягоны язык міжволі аблізнуў сасмяглыя вусны.

— Як вам вядома, яснавяльможны пане, — адказаў ён, — законы нашага ордэна забараняюць нам піць і есці ў свецкіх асоб.

— Гэта для моладзі, — запярэчыў кашталян, — а вам, ойча, які не паддаецца спакусам, можна. Дазвольце, я загадаю.

— Не, не, яснавяльможны пане, — паспяшаўся адмовіцца езуіт, — мы прывыклі шанаваць законы ордэна, асабліва пасты.

Кашталян больш не настойваў

— Як пажывае ваш шаноўны рэктар калегіума, айцец Гарсія Альбіян?

— Дзякуем Богу, які падтрымлівае яго ў добрым настроі і здароўі, бо цяпер цяжкія часы, глава ордэна можа спатрэбіцца для вайны.

— Ваша праўда, ойча, ваша праўда, — адказаў кашталян. — Касцёл ваюе, даўно ваюе з ерэтыкамі.

— Нам найбольш непрыемна іх суседства з нашым касцёлам Святога Яна, праз гэта мы церпім знявагу з нашых святынь. Ніводзін з нас не можа паказацца на вуліцы, каб не спаткацца з касымі паглядамі, не быць абражаным, каб яму не кінулі граззю ў твар. Здаецца, што яны знарок падпільноўваюць нас, нават моладзь, якая ідзе ў акадэмію, не мінаюць. А болын за ўсё шкада, — уздыхнуўшы, дадаў езуіт, — што гэтае месца, якое цяпер апаганена ерэтыкамі, было некалі жытлом нашага шаноўнага апекуна, ягамосці ксяндза-кардынала Святога Сікста (Юрыя Радзівіла), вялікага заступніка нашага ордэна; пра ўсё гэта можна сказаць словамі Святога Пісання: "Гэта быў дом для малітваў, а яны зрабілі з яго логава разбойнікаў".

Пры адной згадцы пра Радзівілаў кашталян пазмрачнеў і сказаў:

— Што зробіш, ойча, не вам адным даліся яны ў знакі. І мне яны нарабілі шмат злога, але я спадзяюся, што Бог пакарае іх, а сам выцерплю ўсё.

Кашталян правёў далонню па сівой галаве і такіх жа вусах.

— Яны рыхтуюць для вас, яснавяльможны пане, штосьці новае. Мы бачылі, што ў іх палацы пачаўся нейкі незвычайны рух, — паведаміў ксёндз Ян.

— Мабыць, рыхтуюцца да вайны! — усклікнуў Геранім Хадкевіч.

— Не ведаю, — адказаў езуіт. — Хто зразумее, што яны вытвараюць? Але яны рассылаюць многа ганцоў ва ўсе бакі, і да іх многа пасланцоў прыбывае, усё прыносяць і

адносяць лісты. Відаць, рыхтуюцца да нечага. Я чуў, нібыта яны склікаюць у Вільню многіх сенатараў.

— Я пра гэта ведаю, — сказаў кашталян. — Мабыць, спрабуюць зладзіць нейкі хаўрус, але ж не той цяпер час.

— І я так думаю, што рыхтуецца нешта накшталт змовы, бо прыдворныя Радзівіла кажуць, што ён дужа ўстрывожаны. А некаторыя з ягоных прыхільнікаў застрашваюць яго вайной, таму ён пабойваецца, як бы чаго не здарылася, як бы не пачалася міжусобіца — яму ж не хочацца, каб ён стаў таму прычынай. Сёння раніцой да нас прыходзіў адзін з нашых тайных прыхільнікаў з двара ваяводы і сказаў, нібыта збіраюцца адправіць нейкае пасольства да яснавяльможнага пана.

— Да мяне? Ад каго? — спытаў кашталян, ажывіўшыся.

— Ад ваяводы.

— Дзеля чаго?

— Гэтага яшчэ ніхто не ведае. Ён сказаў, што заўтра будзе ведаць.

— Заўтра! Мне трэба сёння. Але я да ўсяго гатовы.

Аднак жа лёгка было заўважыць, што гэтая навіна ўстрывожыла кашталяна. Ён прайшоўся па пакоі перад езуітам і спытаўся:

— Каго ж яны да мяне пашлюць?

— Напэўна, тых сенатараў, што, як нам паведамляюць, прыязджаюць з усіх канцоў.

— Так-так! Хадкевічу — сенатараў? Гэткіх жа, як і ён, ерэтыкоў, адшчапенцаў, цяперашніх канфедэратаў, падбухторшчыкаў, якія прысягалі і падпісваліся супраць нас, супраць права, супраць караля, супраць парадку! Добра, што сёння прыязджае мой пляменнік, стараста, ён пасведчыць супраць іх і дапаможа мне.

Езуіт устаў, раз, другі і трэці пакланіўся, за трэцім разам развітаўся:

— *Laudetur Jesus Christus.* — Слава Ісусу Хрысту.

І выйшаў.

Кашталян загадаў падаць каляску, апрануў сабалінае футра з доўгімі, да пят, рукавамі, пакрытае ярка-чырвоным аксамітам, і ў хваляванні пачаў чакаць. Праз дзве-тры хвіліны пачуўся тупат коней, зайшоў прыдворны і сказаў,

што можна ехаць. Кашталян выйшаў Каля варот чакала каляска, абабітая пазалочанай скурай, цвікамі з пазалочанымі галоўкамі. У яе былі невысокія колы і не вельмі зручныя сядзенні.

Кашталян сеў у каляску, фурман — наперадзе, на козлах, два гайдукі сталі ззаду, некалькі прыдворных ехалі конна побач, а для таго, каб пракладваць шлях, уперадзе ехалі некалькі казакаў.

Кашталян загадаў:

— Да камяніцы пана старасты!

Коні з пукамі пунсовых пёраў шпарка кранулі з месца, мінулі палац канцлера Льва Сапегі, праехалі па Бернардзінскім завулку і павярнулі на Замкавую вуліцу, а адтуль — каля палаца Радзівілаў — да камяніцы Хадкевічаў.

Праязджаючы каля палаца ваяводы, кашталян знарок адвярнуўся ад царквы, слугі высыпалі з варот паглядзець на яго, шапталіся і строілі кепікі. Світа кашталяна захоўвала важнасць і не звяртала на іх увагі. Калі яны ўжо міналі палац, адчынілася акно, паказалася чорная барада ваяводы, на вуліцу данеслася абразлівае слова *bannita**.

Кашталян не павярнуўся, але пачырванеў, рука моцна сціснула рукаяць шаблі, а ўслых ён набожна прамовіў:

— Даруй ім, Божа, а мне дай сіл вытрымаць.

Каляска шпарка праехала паўз муры кардыналіі і спынілася каля варот камяніцы.

Кашталян выйшаў.

Ледзь толькі здалёк пачуўся тупат коней кашталяна, як у акне палаца Хадкевічаў раптам паказалася дзявочая постаць — бледная, з распушчанымі валасамі, — яна мільганула і знікла. Кашталян увайшоў праз вароты і ўбачыў на падворку каля іх маршалка двара і некалькіх прыдворных, усе стаялі з непакрытымі галовамі. Быў там і пан Барб'е, ён таксама зняў свой капялюш, але трымаўся больш вольна.

— Дзень добры вашым мосцям! Пана старасты яшчэ няма? — спытаў Хадкевіч.

— Пакуль што няма, — адказаў маршалак, — чакаем з хвіліны на хвіліну, толькі нешта яго не відаць.

— Скажыце князёўне, што я хачу бачыць яе. — Ён падняў руку, і тут жа адзін з прыдворных пабег уверх па лесвіцы выконваць ягоны загад.

— Пан Барб'е! Вітаю вас. Калі прыехалі? — загаварыў кашталян да француза.

— Толькі ўчора ўвечары, а вось сёння адразу ж узяўся за работу.

— За якую работу?

— Па ўмацаванні камяніцы, — адказаў француз.

Кашталян у нецярплівасці тупнуў нагой.

— Што вы кажаце?

— Такі быў загад пана старасты.

— І вы ўжо распачалі работы.

Барб'е паказаў рукой на людзей, што працавалі на рыштаваннях, снавалі туды-сюды, на катлы з гарачай вадой, якую мусілі ліць на сцяну з-за холаду.

— Дрэнна, што вы робіце ўсё так адкрыта, — буркнуў Хадкевіч. — З вуліцы гэта бачаць, могуць падумаць невядома што. Палову муляраў лепей зняць, часу яшчэ хапае, а пакуль трэба рабіць выгляд, што нешта падпраўляецца. Не паказвайце, што вы тут займаецеся фартыфікацыяй. Навошта даваць *assumpt* — пацвярджэнне — злым людскім языкам, і так здольным на ўсё. І не прабівайце ў сценах байніц. З гэтым можна пачакаць.

— Некалькі прабілі ўжо, — сказаў Барб'е. — Ды нам і не загадвалі рабіць гэта ўсё патаемна.

— Я вас не вінавачу, але навошта пану старасту такая спешка?

Пасланы прыдворны вярнуўся і паведаміў:

— Панна князёўна чакае яснавяльможнага пана. Яна наверсе.

Кашталян кіўнуў галавой і, незадаволены, пайшоў наверх. Падаў знак свіце, каб заставалася ўнізе, а сам узышоў па лесвіцы і адчыніў дзверы ў вялікую залу, у якой яго чакала слуцкая князёўна Соф'я Алелькавіч.

Гэтая зала выходзіла вокнамі на Замкавую вуліцу, усе сцены тут былі ўвешаны партрэтамі і абразамі. Пакой аздаблялі некалькі венецыянскіх люстраў у сярэбраных рамах і гадзіннік вышынёй у некалькі локцяў, у дэкаратыўнай шкляной скрынцы. Крэслы з белымі пазалочанымі кручанымі ножкамі доўгім радам стаялі перад мармуровым сталом у пазументах, ножкі яго былі выразаны ў выглядзе грыфаў, дэльфінаў і крылатых сфінксаў.

13. Зак. 2198.

Калі ўвайшоў кашталян, князёўна стаяла пасярод пакоя. Яна была бледнай хударлявай бландзінкай, са светлымі вачыма, невясёлым тварам, бледнымі вуснамі. На ёй было плацце з тоўстай цёмнай хвалістай матэрыі, абшытай фальбонамі, з хвастом, што цягнуўся па зямлі. Валасы на яе галаве былі сабраны ўверсе і зашпілены дарагой заколкай. Яна здавалася больш высокай, чым была, таму што плацце на ёй было доўгае і хвалістае, а чаравікі з высокімі абцасамі. Да таго ж князёўна Соф'я была хударлявай, што выглядала непрывычна рэдка ў тыя часы. Па яе твары быў разліты смутак, які, здавалася, быў у яе ад самага нараджэння, не пакідаў яе ні на хвіліну. І не дзіва.

Яна была сіратой. Таму выраз глыбокага смутку дапаўняўся станам прымірэння з лёсам, цярплівасці, але ў ясных блакітных вачах свяціліся жыццё і пачуццё.

Як толькі ўвайшоў кашталян, князёўна пачціва пацалавала яму руку, ён нахіліў галаву дзяўчыны і пацалаваў яе ў лоб. Потым запрасіў яе сесці, падсунуў да яе крэсла і хацеў загаварыць, але тут убачыў у левых дзвярах нерухомую постаць пані ахмістрыні.

Гэта была асоба паважнага ўжо веку, але яшчэ надзвычай стройная, яна стаяла, нібы кол праглынуўшы, а вочы вытарашчвала, не раўнуючы, як жаба. Плацце яе мела столькі складак, што нават выглядала смешным, грудзі непрыемна аголены, хаця ўвогуле там не было на што глядзець. А што рабілася на яе галаве — пяром не апісаць! Чаго толькі не было на ёй! Перш за ўсё там былі валасы свае і чужыя, натапыраныя, зачасаныя ўгору, як свечкі, і, што горш за ўсё — здавалася, нібы яны выраслі не з аднаго месца, бо мелі розны колер. Там былі і грабяні, і заколкі, і шпількі, і кветкі, і пёркі, і шкельцы. Пачварны французскі чуб узносіўся ўгору на цэлы локаць, у дзверы менш багатага дома ён мог бы і не пралезці.

Пані ахмістрыня чакала позірку кашталяна, нібы каня дажджу, калі ж урэшце дачакалася, то пакланілася, забыўшыся пра свой выдатнейшы чуб, так нізка, што ледзь не пашкодзіла яго. Кашталян прывітаў яе, сказаў некалькі ветлівых слоў і тут жа адпусціў. Яна выйшла, але не было ўпэўненасці, што не засталася слухаць пры дзвярах.

Ледзь толькі за ёй зачыніліся дзверы, кашталян павярнуўся да князёўны, у позірку якой чыталася пытанне, і сказаў:

— Шаноўная паненка, вы хутка расстанецеся з дзяцінствам, дзякуй Богу, у лютым наступіць шчаслівы для вас шаснаццаты год. Есць за што падзякаваць Богу.

— І вам, — падхапіла князёўна, — за тое, што вы апекаваліся сіратой.

— Мы рабілі ўсё, аб чым мяне і майго нябожчыка брата старасту прасіў ваш шаноўны бацька. Прычым рабілі з душой і сэрцам, клапоцячыся пра ваша шчасце.

— Я разумею гэта і пастараюся аддзякаваць вам, як бацьку, — адказала князёўна.

— Спадзеючыся на вашу ўдзячнасць, ваша добрае сэрца, я звяртаюся да вас, — казаў далей кашталян, — як да дарослай дзяўчыны, якая неўзабаве стане паўналетняй. Паслухайце, што я вам скажу. Я ніколі яшчэ не гаварыў з вамі пра важныя справы, бо вы былі ў шчаслівым дзіцячым узросце, які не варта азмрочваць і засмучаць. Таму, калі я скажу нешта непрыемнае вам, палічыце гэта як пачатак жыцця, якое будзе не заўжды такім бязвоблачным, як у дзяцінстве, а Бог вучыць нас быць цярплівымі.

— Усё, што вы мне скажаце, я прыму з пакорлівасцю і ўдзячнасцю, — спакойна і пачціва, толькі злёгку пачырванеўшы, прамовіла князёўна.

— Я не сумняваюся ў гэтым, — працягваў кашталян. — Вы ведаеце, што князь-ваявода віленскі прасіў вашай рукі для свайго сына князя Януша.

Кашталян зірнуў на Соф'ю, яна выглядала спакойнай, толькі пры ўпамінанні імені Януша ўспыхнула, пабляднела і збянтэжылася, кашталян спахмурнеў, але загаварыў зноў:

— І я, і мой брат, нябожчык, ахвотна згаджаліся на гэты шлюб, таму што бачылі князя як роўнага вам у родзе, багацці, спадзяваліся на ваша шчаслівае жыццё замужам. З нашага дазволу ў вас бываў князь Януш, ён стараўся выклікаць вашу прыхільнасць.

Тут кашталян спыніўся, Соф'я маўчала.

— Скажыце мне шчыра, скажыце адкрыта як апекуну, як бацьку, ці спадабаўся ён вам?

— Воля апекуноў будзе маёй воляй, — адказала князёўна.

— Я пытаюся ў вас не пра гэта, — патлумачыў кашталян, — я не хачу ведаць, паслухаецеся вы мяне або не, я ў гэтым не сумняваюся, я хачу...

— Што вы хочаце пачуць?

— Ці спадабаўся вам князь Януш?

Князёўна маўчала.

— Не ведаеце, што адказаць? — дапытваўся кашталян. — Мне здаецца, што вы не хочаце мяне пакрыўдзіць, таму што чулі пра размовы, нібыта князёўна мае прыхільнасць да сына ваяводы. Дык скажыце мне, скажыце шчыра.

Князёўна ўсё яшчэ маўчала.

— Хіба ты мне нічога не скажаш? — зноў спытаў кашталян.

Князёўна Соф'я ўстала, яе твар зачырванеўся, ажывіўся, вочы заблішчалі.

— Вы чакаеце майго прызнання, — сказала яна. — А навошта яно вам? Усё рашае не мая воля, а ваша.

— Я хачу, каб вы мелі пэўнасць, што прымусам, сілай мы нічога не будзем рабіць, калі ж я пытаюся пра вашы пачуцці, то толькі для таго, каб мець іх на ўвазе.

— Вы ведаеце мяне, вы ведаеце ўсё, таму вам і не патрэбна ні пра што пытацца, — адказала князёўна Соф'я.

— Чаму вы лічыце, што я вас добра ведаю? Я хачу ведаць вас яшчэ лепей, — даводзіў кашталян, — лепей, чым па чутках і плётках. Я хачу, каб вы пра ўсё расказалі мне самі.

— Вы хочаце гэтага? — перапытала князёўна. — Тады не вініце мяне за тое, што вы пачуеце, бо вы захацелі пачуць. Я паслухмяная, ведаю свой абавязак перад вамі, ведаю, што ўсё жыццё буду ўдзячнай вам. Я вас паважаю і цаню, ведаю, што вы супраць князя Януша, але я — я адношуся да яго *прыхільна*.

— Прыхільна! — усклікнуў кашталян, нібыта баяўся такога адказу і не спадзяваўся яго пачуць. — Гэта праўда, гэта на самай справе? Так?

— Так! — смела адказала князёўна.

— І хочаце стаць ягонай жонкай? — спытаў ён яшчэ.

— Я ўсё сказала, — ціха прамовіла князёўна.

— А цяпер паслухайце, што я вам скажу, — пачаў кашталян. — Вы прыхільныя да *яго,* ён *нас* ненавідзіць, вы выказваеце ўдзячнасць *нам,* ён *нас* праследуе. *Вы* за Радзівілаў, а Радзівілы *нашы* ворагі, яны мне, мне, кажу я

вам, пагражаюць баніцыяй, нашай веры (праўда, не вашай) яны варожыя, супраць нас, супраць яе, супраць караля стаяць; яны б нас, каб маглі, у лыжцы вады ўтапілі б. І вы ім выказваеце прыхільнасць?

— Яшчэ раз паўтараю, — адказала Соф'я спакойным голасам, — што я ведаю пра вашу нада мной уладу і буду паслухмянай вам.

— Справа не ў тым, што вы будзеце паслухмянай, я ў гэтым упэўнены, я хацеў адкрыць вам вочы на тое, хто яны такія!

— Не мая то справа, і не на дзяціны розум разбірацца ў ёй.

— Гэта справа любога розуму. Не трэба, князёўна, прыніжаць сябе. Лепей выслухайце мяне. Калі князь-ваявода прасіў вашай рукі для сына, мы з нябожчыкам братам далі на гэта згоду, і вы ведаеце, чым ён нам сплаціў?

— Не ведаю.

— Ён выклікаў нас у суд, каб выжыць з маёнтка. А цяпер праследуе і пагражае вайной, збірае войска, хоча паслаць яго на нас. Дык скажыце, калі маеце да нас хоць крыху дабрыні, калі да нас горнецца ваша дзіцячае сэрца, скажыце, ці можаце вы быць жонкай князя Януша?

— Не, — холадна і цвёрда адказала князёўна. — Не. Я гэта бачу.

— Хай Бог аддзячыць вам за гэтыя словы, яны мяне ажывілі, — сказаў Хадкевіч, устаў і пачаў хадзіць па пакоі, — бачу, што вы адчуваеце ў сабе павагу і ўдзячнасць да нас. Паверце мне, гэтая вашая прыхільнасць лёгка пакіне ваша сэрца.

— Ніколі, — ціха адказала Соф'я.

— Ніколі? — перапытаў кашталян. — Ніколі? Але ж вы самі прызналі, што не можаце быць жонкай князя Януша!

— Я магу толькі захоўваць маю прыязнасць да яго, павагу — да самай смерці, і я так і зраблю.

Кашталян паціснуў плячыма.

— Вам трэба пазбыцца таго, што вы называеце прыхільнасцю да князя Януша, дзеля вас самой. Выйсці за яго замуж — рэч для вас немагчымая. І чым болей ён будзе дамагацца вас, тым больш немагчымай яна будзе. Чым больш зацята ён будзе настойваць, тым болей разззлуе

нас, а таму лепей пазбаўцеся ад таго, што можа толькі азмрочыць вашы маладыя гады.

— Ніколі! — адказала князёўна. — Але не думайце, што з-за гэтага я не буду вам паслухмянай. І тое *ніколі* — і гэта *ніколі*.

— І як жа вы здолееце так патрапіць?

— На ўсё воля Божая, я сама не ведаю. Будзе так, як Ён загадае і вырашыць.

— Я хачу сказаць вам яшчэ, — прамовіў кашталян, — што не спадзяюся на нейкія перамены. Я толькі прашу вас, князёўна, зразумець тое, што вы ўжо самі прызналі справядлівым. Зразумейце, што ў такім становішчы для нас было б найвялікшай знявагай, прыніжэннем, радасцю для нашых ворагаў, калі б мы адцалі вас яму. Так, толькі Бог бачыць усё і ведае, чым яно скончыцца, Бог можа ўсё перайначыць. Аднак у нашым дагаворы запісана, што *без вашай волі і згоды,* князёўна, мы вас аддаць не можам. Трэба, каб толькі вы, вы самі, калі гэта будзе патрэбна, сказалі князю Янушу, што вы не можаце стаць ягонай жонкай, не можаце, не хочаце...

— Хто? Я? — усклікнула слуцкая князёўна, падхапіўшыся з крэсла. — Каб я яму сказала гэта ў той час, калі я думаю іначай? Навошта? Дзеля чаго? Хіба вы не мой апякун, хіба не маеце нада мной улады, каб вырашыць гэта без мяне? Навошта ж я павінна гэта казаць?

Кашталян, уражаны словамі дзяўчыны, стаяў і маўчаў. Яму не было чаго адказаць ёй, да таго ж ён разумеў яе становішча і не хацеў настойваць на сваім, бачыў, што яна і так выказала многа пачцівасці і пакорлівасці.

— Падумайце, — сказаў ён пасля хвіліннага маўчання. — Гэтая справа можа не скончыцца без вас, калі Радзівілы будуць дзейнічаць згодна з дагаворам, не супакояцца і пойдуць да вас. І тады мы будзем вымушаны паставіць вас перад імі, і вы сваімі вуснамі скажаце князю Янушу: "Не".

— Але ж князь Януш будзе ведаць, што гэта хлусня, — усклікнула князёўна.

— Адкуль? — сурова спытаў кашталян. — Хіба часовая прыхільнасць дае заруку на будучае? А можа, вы яму ўжо сказалі?

— Пакуль што — не; без вашай волі я гэтага не зрабіла б.

— Нават калі б вы гэта ўжо зрабілі, — заўважыў кашталян, — дзіцячыя абяцанні не маюць ніякай сілы, і толькі цяпер вы маеце права абяцаць і трымацца свайго слова.

Князёўна маўчала і слухала.

— Дарагі дзядзька і апякун мой, — сказала яна, устаючы, — не прымушайце мяне маніць праз сілу, мне гэта брыдка. Я не скажу, я не магу сказаць гэтага князю Янушу; ён ведае, ён адчувае, што ён неабыякавы мне. Навошта ж мне маніць, нават дзеля патрэбнай справы? Я не зманю, не ўчыняйце нада мной такога, я гэтага не зраблю, бо гэта не для маіх гадоў і вышэй маіх сіл.

— Вам гэта пад сілу, — адказаў кашталян, — бо вы, бачу я, маеце волю і недзіцячую стойкасць. У гэтым для вас не было б нічога цяжкага, каб вы толькі захацелі.

— Я згаджуся на ўсё, чаго толькі вы ад мяне не запатрабуеце, — запэўніла князёўна Соф'я, укленчыўшы і цалуючы руку кашталяну, якую ён паспешліва схаваў, — але не рабіце так, каб я сама ўсё гаварыла князю Янушу. Хопіць таго, што вы скажаце ўсё ад майго імя.

— Але вы ўвайдзіце ў наша і сваё становішча, — даводзіў стары, — падумайце, што будзе тады, калі яны, паводле дамовы, будуць пытацца ў вас, а вы забраўшы сабе ў галаў нейкае дзіўнае жаданне праўдзіва сказаць князю Янушу, што ён вам даспадобы. Падумайце, памяркуйце, у якім становішчы акажамся мы? Так, мы мусім пакорліва аддаць вас яму, маўчаць, набраўшыся сораму.

— Вось і пастарайцеся зрабіць так, каб да таго не дайшло, — прамовіла князёўна Соф'я. — Гэта залежыць ад вас, гэта ў вашых сілах, толькі не ўмешвайце мяне, адказвайце самі, рабіце, што хочаце. А я слова не скажу, буду паслухмянай.

— Вы не хочаце ісці супраць свайго сумлення, не хочаце маніць?

Кашталян спытаў так, бо не мог вытлумачыць паводзін князёўны нічым іншым, апроч яе думак і пачуццяў.

— Не, — адказала князёўна, — аднак гэта звыш маіх сіл, я не змагу гэтага зрабіць.

— Нават дзеля таго, каб выратаваць нас ад сораму? — спытаў кашталян.

— Нават дзеля выратавання жыцця, — пацвердзіла Соф'я.

Кашталян спыніў яе, узяў шапку, наморшчыў лоб і сказаў:

— Вы не па гадах разумная, і воля ў вас не па гадах; рабіце тое, што вам падабаецца, а мы будзем старацца, каб не дайшло да таго, што вам спатрэбіцца даваць адказ па гэтай справе.

Князёўна пацалавала кашталяну руку, перахрысціла яго, памаўчала, а потым ціха спытала:

— А што, няма ніякай надзеі на прымірэнне?

— Ніякай, Бог бачыць, ніякай надзеі, ані блізка! Радзівілы збіраюць супраць нас войска, да іх далучаюцца ўсе ерэтыкі. Усе ворагі католікаў і караля, усе рыхтуюцца да вайны, якая нам няўхільна пагражае. Уся Літва бярэцца за зброю — або з намі, або супраць нас, супраць *вас*...

— Супраць мяне! Няўжо я так многа значу для князя Януша? — спытала Соф'я.

— О не! Нават і не думайце так! — усклікнуў кашталян, ён падхапіў і выказаў думку, якая раптам прыйшла яму ў галаў: — Вы яшчэ дзіцём былі, калі была зладавана гэтая дамова. Справа зусім не ў вас, а ў княствах Слуцкім і Капыльскім, у вашых сядзібах, у вашых маёнтках. Не вас яны любяць, а ваша багацце!

— Не мяне! Не мяне! Гэта ваявода мог думаць так і рабіць так, але не Януш, ён на такое не здатны! — упэўнена запярэчыла князёўна.

— Паверце мне, дарагая паненка, яблык ад яблыні недалёка коціцца, — прамовіў кашталян. — Урэшце, гэта не мая справа пераконваць вас, час пакажа. Бывайце здаровы і нікому не пераказвайце таго, пра што мы тут размаўлялі.

Кашталян зноў пацалаваў князёўну ў лоб, яна яго — у руку, на тым яны і развіталіся. Ледзь толькі за кашталянам зачыніліся дзверы, як у залу ўвайшла ахмістрыня, але паспела ўбачыць толькі ягоную спіну і не дачакалася тых слоў захаплення ёю, на якія спадзявалася.

— А вось і наш пан стараста едзе! — усклікнула яна, зірнуўшы ў акно.

Соф'я не чула яе слоў, бо павольнымі крокамі пайшла ў свае пакоі, а за ёй паспяшалася і незадаволеная пані ахмістрыня, папраўляючы на галаве ўбор, які ціснуў на яе сваёй вагой.

Якраз у гэты час світа пана старасты Яна Караля Хадкевіча праехала па вуліцы і доўгім ланцугом расцягнулася да варот камяніцы пад прывітальныя воклічы прыдворных і ўсіх жыхароў віленскага палаца. У канцы світы паказаўся і сам пан староста, ён ехаў конна, а ў ягонай калясцы сядзеў князь езуіт, яго спавядальнік. Віленскі кашталян, дзядзька старасты стаяў на апошняй прыступцы лесвіцы і першы прывітаў пана Яна, як толькі той злез з каня.

## Пасляслоўе

На наступны дзень перад палацам Радзівілаў быў страшэнны гармідар: пляц перад ім і дзядзінец запаланіліся людзьмі і коньмі світы, гусарамі, гайдукамі, слугамі, казакамі паноў сенатараў, якія сюды з'ехаліся. Гэтая мешаніна людзей, коней і павозак уяўляла сабой пярэстую карціну, якой цікаўныя віленскія жыхары любаваліся, стоячы ў варотах сваіх дамоў, каля вокнаў і на кучах гною і смецця, якія ў тыя часы нібы валам акружалі частку дамоў. У тым натоўпе былі самыя розныя фарбы і ўборы: яркія гусары, шыракаплечыя казакі з доўгімі чубамі, валатоўскія гайдукі, маленькія пажы ў вузкім адзенні, мноства прыдворнай шляхты, разадзетай на розны манер, пры крывых парадных шаблях, што называліся карабелямі, на конях. Уся гэтая процьма прыдворнай чэлядзі ўзняла вялікі галас. А ў гэты час у ваяводы паны снедалі і таксама вялі ажыўленыя размовы, перш чым ад імя ваяводы адправіцца з пасольствам да віленскага кашталяна. Не было яшчэ толькі канцлера Льва Сапегі, зяця ваяводы, ён нешта спазняўся. Але неўзабаве і ён са світай паявіўся на Замкавай вуліцы. Сам канцлер ехаў у калясцы, з сабой узяў толькі некалькі слуг. З цяжкасцю праціснулася каляска Сапегі да варот палаца, абмінаючы коней, людзей, павозкі тых, хто прыбыў раней. І вось каля ганка выйшаў з каляскі Леў Сапега — высокага росту, мужны, прыгожы, стройны, твар упрыгожвалі вусы і невялікая бародка; негустыя валасы на галаве былі акуратна падстрыжаны. Канцлер падаўся прама ў залу, у якой ужо сабраліся ўсе сенатары. Гэта быў вялікі высокі пакой з дзесяткам доўгіх вокнаў; на сценах яго, абабітых

14. Зак. 2198.

пунсовым аксамітам, была развешана зброя. У зале панавалі шум і гоман, бо ўсе госці ажыўлена размаўлялі. Князь-ваявода з сынам гасцінна прымалі ўсіх.

Пасярод пакоя стаяў стол, засланы вышытым узорамі абрусам, які звісаў амаль да самай падлогі. На ім ужо дыміліся на сярэбраных місках і паўмісках разнастайныя стравы. За другім сталом маршалак двара гаспадарыў каля стугораў сярэбранага посуду, каля каўшоў, жбаноў і пляшак віна, кубкаў, бочачак і іншага начыння. Прыдворныя слугавалі. Калі ўвайшоў Леў Сапега, снеданне ўжо з паўгадзіны як пачалося — гэта было бачна па вясёлых тварах і па больш ажыўленай, чым звычайна, размове. Пан ваявода і князь Януш віталі яго абдымкамі, сенатары — паклонамі, некаторыя падавалі руку. Яму вызвалілі месца каля стала, на хвіліну аціх гоман.

— Я крыху спазніўся, — звярнуўся канцлер да ваяводы, — але ў гэтым вінаваты не я, а мой гадзіннік — ён паказваў, што яшчэ не так позна.

— Ды яшчэ і на самай справе не позна, — адказаў ваявода, — а да нашага пасольства, у якое мы запрасілі шаноўнае панства, яшчэ многа часу.

— Я ведаю, што кашталян дома, — паведаміў Леў. — Ён, відаць, гатовы прыняць нас, бо і пан жмудскі стараста гадзіну назад прыбыў да яго і пан Аляксандр Хадкевіч таксама збіраецца туды.

— Напэўна, выклікаў родзічаў параіцца, — з усмешкай прамовіў князь. — Хоць бы яны зноў не нараілі яму такога, як раней, калі яны падбілі яго на парушэнне дадзенага слова. Не спадзяюся я, што будзе толк з нашага пасольства, — дадаў ён, — бо Хадкевічы ўжо ўсур'ёз ці толькі дзеля постраху рыхтуюць сваю камяніцу да абароны і, як мне казалі, сапраўды збіраюцца ваяваць. Не інакш як пан жмудскі стараста хоча паказаць свае ваенныя таленты.

— Сумняваюся я, што справа дойдзе да вайны, — заначыў Леў, — і спадзяюся, што панам Хадкевічам больш даспадобы мір і згода. Я маю на гэта вялікую надзею.

Леў Сапега быў у свой час славутым чалавекам, ён заўсёды памяркоўна вырашаў справы, кожны раз шукаў спосабы для прымірэння і трымаўся гэтага, не станавіўся ні на чый бок, выступаў за згоду і паразуменне; ён быў нібы створаны для ролі пасрэдніка.

Пакуль ён размаўляў з Радзівілам, смаленскі ваявода Абрамовіч зірнуў на Сапегу і ціха загаварыў з мазырскім старастам, завяршаючы распачатую размову на тэму рэлігіі:

— Скончым, а то канцлер слухае нас і пачуе ўсё, што мы тут гаворым пра папістаў і супастатаў, ён жа падтрымлівае і тых, і другіх.

Яны змоўклі, за сталом усталявалася агульная размова аб усім і ні аб чым. Калі снеданне скончылася, віленскі ваявода запрасіў да акна сенатараў і пачаў сцісла і памяркоўна выказваць ім сваю просьбу, ведаючы, што большасць дасведчана ў яе акалічнасцях.

— Я вельмі ўдзячны вам, панове, — загаварыў ён, — што вы ласкава адгукнуліся на маю просьбу і згадзіліся дапамагчы мне ў гэтай невясёлай справе з віленскім кашталянам. Я не буду тут многа гаварыць пра мае няшчасці, бо вам усе яны добра вядомыя, ды і не толькі вам, а ўсёй Кароне, усяму Вялікаму Княству Літоўскаму яны зразумелыя. Для таго каб гэтая справа скончылася, а я спадзяюся, што яна скончыцца па-добраму, па-справядліваму, трэба толькі, каб пан кашталян пакуль што дазволіў князю Янушу хаця б мець магчымасць заваяваць прыхільнасць і добразычлівасць ягонай будучай жонкі. Некалькі гадоў таму ён свабодна бачыўся з ёю; яму было дазволена аказваць ёй паслугі; але з тае пары, як паміж намі пачаліся гэтыя няшчасныя спрэчкі, яго адлучылі ад дому Хадкевічаў, разлучылі з князёўнай Соф'яй ды не толькі замкнулі перад ім дзверы, не дазволілі бачыцца, але ж не пускаюць пасланцоў адсылаюць назад лісты, адным словам, забараняюць усе спробы неяк звязацца з ёю. Калі пан Хадкевіч будзе і надалей чыніць такое, то справа, відавочна, дойдзе не да добрай згоды, як ён гаворыць, а да разладу і вайны. Будзьце так ласкавы, панове, выкажыце яму мае просьбы, пераканайце ў чыннасці і слушнасці маіх жаданняў, споўніць якія пану Хадкевічу вельмі лёгка, тым болын што гэта ні да чаго не абавязвае яго. Абы толькі князь Януш змог прыходзіць да князёўны ў любы час, большага я пакуль што не прашу. Я спадзяюся на паспяховы зыход вашай місіі, васпане, мілыя брацці, на тое, што яна вам удасца, і яшчэ раз дзякую вам, што вы ласкава згадзіліся ўзяць на сябе гэтае пасольства.

Сенатары дружна адгукнуліся на ягоную просьбу, ад іх імя трымаў слова смаленскі ваявода:

— Вы, ваша княская мосць, можаце быць упэўненым, што, як вы таго справядліва жадаеце, так і зробіцца. Раз ужо кашталян ухіляецца ад выканання дагавору, то нельга ж даходзіць да такіх крайнасцей — ён павінен сам адчуваць, што гэта справа святая і непарушная. Таму можна спадзявацца, што перш, чым дойдуць да згоды і канца ўсе вашы спрэчкі, ён хаця б не адмовіць князю Янушу без перашкод бачыцца са сваёй будучай жонкай.

Пасля гэтага сенатары сабраліся рушыць у палац віленскага кашталяна, вырашылі, параіўшыся між сабой, што гаварыць з ім будзе канцлер Сапега. Мы ўжо згадвалі, што гэты чалавек быў міратворцам па сваім характары і як найлепш падыходзіў для тых выпадкаў, калі патрэбна было пamірыць ворагаў, улагодзіць тых, хто пасварыўся. Пасля таго сенатары пакінулі ваяводу — павінен быў чакаць іх вяртання дома — і пайшлі па Замкавай вуліцы да палаца кашталяна ў бок касцёла бернардзінцаў.

Кашталян быў гатовы прыняць іх. Яшчэ напярэдадні яму пра пасольства расказаў, што ведаў, езуіт Ян, потым іншыя з блізкіх да сенатараў людзей паведамілі не толькі аб гэтым, але і аб тым, пра што пойдзе гаворка. Ён параіўся з усімі, хто прыехаў, а найперш са жмудскім старастам і ягоным братам Аляксандрам. Як сам кашталян, так і яны былі супраць любых крокаў да паразумення і ўступак Радзівілам. Абражаныя, і не без падставы, больш слабыя, чым крыўдзіцелі, яны горда і цвёрда трымаліся свайго, пагражалі вайной, каб не паказаць, што яны баяцца. Абодва пляменнікі кашталяна вырашылі аднесціся да паслоў прыхільна, а дзеля гэтага яны загадзя дамовіліся з дзядзькам, што не будуць у гэтай справе нічога распачынаць без яго. Яны пагадзіліся, што ні ў чым не ўступяць, не дадуць сябе ўгаварыць, ад сябе нічога не будуць ім абяцаць, адбудуць двухсэнсоўнымі словамі. Яны хацелі паказаць, што мала дбаюць пра дагавор, бачаць яго ў іншым святле і што гэтым сваім крокам пан ваявода якраз і даводзіў тое, што заўжды стаяў на сваім і трымаўся таго, не жадаючы саступіць.

Калі паны сенатары падышлі да палаца Хадкевічаў, то не заўважылі ніякай адзнакі таго, што іх тут чакаюць.

Спаткаць іх выйшла ўсяго некалькі прыдворных, не было відаць, каб наводзілі парадак, рыхтаваліся, чакалі, не было здзіўлення і тады, калі яны ўвайшлі. Кашталян зайшоў у вялікую залу са сваімі пляменнікамі Янам Каралем і Аляксандрам, з імі былі яшчэ некалькі сяброў. Паслоў холадна прывіталі, і Леў Сапега адразу ж пачаў размову:

— Мы прыйшлі да вас, пане кашталян віленскі, з пасрэдніцтвам і сяброўскім пасольствам ад віленскага ваяводы, князя Радзівіла.

— Я сумняваюся, ці ёсць паміж мной і панам ваяводам нешта сяброўскае, — холадна і важна прамовіў кашталян.

— Мне не хацелася б пачынаць з дрэннага, — адказаў Леў Сапега. — Можа быць, вы зазлавалі на пана ваяводу і не хочаце мець справу з ім, але я спадзяюся, што вы яшчэ, дасць Бог, дамовіцеся з ім па-сяброўску, памірыцеся, і ўсё скончыцца ўзаемнай згодай. Сам пан ваявода засмучаны і пакутуе ад таго, што, на жаль, гэтая спрэчка разлучыла яго з панам кашталянам і ягонай слаўнай раднёй, але ў яго ў сэрцы ёсць спадзяванне, што ён здолее вырашыць спрэчкі з выгадай для абодвух бакоў. Мы ведаем, — казаў далей канцлер, — пра дамову вашага нябожчыка брата з вамі наконт таго, каб выдаць вашу гадаванку князёўну слуцкую за князя Януша, сына пана ваяводы.

Леў Сапега не паспеў скончыць свой павольны і падрабязны пераказ справы, як раптам Ян Караль з уласцівай яму салдацкай запальчывасцю перапыніў яго:

— Пан ваявода дарэмна настойвае на тых дамовах, яны супярэчаць законам нашай веры і законам Вялікага Княства Літоўскага, а таму мы не можам прыйсці да згоды, не павінны. І не прыйдзем! — дадаў ён, міжволі паклаўшы руку на рукаяць шаблі.

— Каталіцкія законы неабавязковыя для ўсіх, — запярэчыў Абрамовіч.

— Але, я думаю, для ўсіх абавязковыя законы Літвы, — горда прамовіў Ян Караль, — якія забараняюць шлюб паміж блізкімі родзічамі пад пагрозай пазбаўлення дзяцей права на спадчыну і адабрання маёмасці.

— Аднак жа гэта быў бы не першы выпадак такога шлюбу, — зазначыў Сапега, — ранейшыя прыклады дазваляюць паўтараць іх; заўсёды ёсць надзея, што можна

неяк уладкаваць гэтую недарэчнасць. Але перш чым гэтыя спрэчкі скончацца і вырашацца (у чым мы не сумняваемся), пан ваявода просіць праз нас і мы ўсе таксама звяртаемся да вас, пане кашталян, каб вы пакуль што выканалі хаця б адну частку вашых дамоўленасцей: не перашкаджалі князю Янушу бачыцца з князёўнай Соф'яй, каб заваяваць яе сімпатыі.

— А навошта гэта? — холадна спытаў кашталян. — Для таго каб выставіць князёўну Соф'ю на пасмешышча, прымусіць яе пайсці на супрацьзаконны шлюб?

— Ваявода так не думае, — працягваў Сапега, — у гэтым яго не варта папракаць, але віленскі ваявода гатовы свята прытрымлівацца сваіх абяцанняў і, нягледзячы на сваркі і спрэчкі, спадзяецца, што вашамосць пан кашталян будзе са свайго боку трымацца таго ж. Ён быў бы рады, каб гэты шлюб зладзіўся і каб князь Януш не быў чужым для сваёй жонкі. У дагаворы ж запісана, і зусім справядліва, што князёўна будзе выдадзена замуж не сілай, не пад прымусам, а па сваім жаданні і добрай згодзе, дык чаму ж не дазволіць князю Янушу старацца дабіцца яе прыхільнасці.

Кашталян холадна выслухаў Льва Сапегу, які гаварыў, як заўсёды, павольна, плаўна, а потым сказаў:

— Ніяк не магу зразумець вас, пане канцлер, мы нібыта гаворым пра розныя рэчы. Вы настойваеце на выкананні дагавора?

— Вы ж яго падпісвалі.

— Я зрабіў гэта неабачліва і не па праве, паддаўся на ўгаворы і просьбы, а найперш хацеў выканаць волю брата, — прамовіў кашталян. — У гэтым я мушу прызнацца, так, я вінаваты. Гэты дагавор несапраўдны.

— Хіба вы прызнаеце несапраўдным увесь дагавор? — спытаў Леў Сапега. — Вы не хочаце выконваць таго, што засведчана вашым шляхецкім подпісам?

Пры гэтых словах звычайна цярплівы і стрыманы кашталян наліўся крывёй. Калі ён пачуў пра парушэнне шляхецкага слова, а Сапега сказаў гэтак сумысля, бо спадзяваўся пераканаць яго гэтым важкім у тыя часы довадам, то нават адступіў на крок і то чырванеў, то бялеў, аж дрыжаў ад гневу.

— Не месца і не час цяпер, — рэзка сказаў ён, — дабівацца выканання дагавора; калі ж потым на гэта будзе час

і месца, то я патлумачу, як хто выконвае свае абавязацельствы і абяцанні.

Сказаўшы так, кашталян пакланіўся і ступіў яшчэ некалькі крокаў назад, нібы ўнікаючы далейшай размовы, просьбаў, угавораў. Для сенатараў гэта стала знакам сканчэння іх пасольскай місіі, яны былі ўражаны халоднымі і пагардлівымі адносінамі да яе кашталяна, суровымі позіркамі Аляксандра і Яна Караля, не захацелі настойваць далей, у душы прыпісалі няўдачу папрокам Льва Сапегі і звалілі на яго ўсю віну. Так яны і пайшлі ні з чым, каб неўзабаве моўчкі вярнуцца ў палац Радзівіла.

— Канцлер сапсаваў усё, — перашэптваліся яны па шляху, — хай цяпер сам і апраўдваецца перад ваяводам, а наша хата з краю.

Князь-ваявода з сынам чакаў іх, ён хваляваўся, надзея на поспех змянялася адчаем, калі ж убачыў з акна, што ўся кампанія так хутка вяртаецца, то спачатку падумаў, што, магчыма, кашталяна не аказалася дома.

Сын гэтак жа, а можа, яшчэ нават болей занепакоены, маўчаў, баючыся парушыць злавесную цішыню, пазіраў на сенатараў, якіх убачыў на вуліцы, нічога не разумеючы.

Сенатары прыехалі да варот палаца Радзівіла, ціха падняліся па лесвіцы, перамаўляючыся, як бы згладзіць для ваяводы сваё няўдачнае пасольства.

— Вам, пане канцлер, трэба самому расказаць ваяводу пра ўсё, — параіў мазырскі староста. — Паспрабуйце хоць неяк змякчыць адмову Хадкевічаў.

Ваявода чакаў іх на парозе, зірнуў і па тварах зразумеў, што яго чакаюць непрыемныя навіны.

— Што вы нам скажаце, пан канцлер? — спытаў ён. — Кашталяна не было дома або ён не прыняў вас?

— Не, ён пачціва прыняў нас, — сказаў канцлер, уваходзячы ў сваю ролю міратворцы.

— І што ён адказаў? — не цярпелася ваяводу.

Канцлер крыху задумаўся, як адказаць больш тонка і мякка, але ваявода ўжо ўсё зразумеў, ён зачырванеўся і ў гневе закрычаў:

— Пане канцлер! Няўжо ён зняважыў нас, не даў дазволу?

— Зусім не, наадварот... — пачаў Сапега.

— Няўжо згадзіўся? — наступаў на яго ваявода. — Быць таго не можа! Занадта добра я ведаю яго і ягоных езуітаў-пляменнікаў! Што ён адказаў? Што сказаў?

— Слова ў слова, — перапыніў мазырскі стараста, які зразумеў, што канцлер знарок марудзіць з адказам, а ваявода ўсё болей перапаўняецца злосцю, — слова ў слова, дзядзька: ён адкажа потым, калі будзе месца і час, хто і як выконвае свае абавязацельствы і абяцанні.

— Што гэта азначае? — крыкнуў ваявода. — Выклік?

— Ды не! Не! — перапыніў яго Сапега. — Гэта было сказана зусім у іншым сэнсе. Кашталян пакрыўджаны, прычым справядліва, трэба яго зразумець.

— Значыць, адмовіў! — усклікнуў ваявода. — Адмовіў вашым панскім мосцям і мне, адмовіў у тым, аб чым я прасіў, адмовіўся даць дазвол князю Янушу бачыцца з князёўнай.

— Ён не сказаў гэта так пэўна, але я думаю... — пачаў Сапега.

— А я думаю, — абарваў яго Радзівіл, — што гэта не скончыцца іначай як са зброяй у руках. Відаць, ён хоча, каб я пайшоў з войскам дамагацца выканання дагавора! Што ж, чаго ён хоча, тое і будзе мець! Я знайду сяброў, знайду прыхільнікаў як ён караля і езуітаў. Ён хоча вайны, хоча вайны...

— Не рабіце такіх паспешлівых высноў, княжа, — перапыніў яго Леў Сапега. — Ён і не гаварыў, не думаў пра вайну...

— Тады што ўсё гэта азначае, пане канцлер, — горача запярэчыў ваявода, — калі не тое? Што гэта азначае? Што ён не лічыцца з дагаворам, што не выконвае яго, не пайшоў нават на невялікую ўступку пры вашым пасрэдніцтве, на маю просьбу не адгукнуўся! Папракае, што я не выконваю дагавор? Але ж, Богам клянуся, я выконваю яго! Я трымаюся яго, строга трымаюся! Перапрашаю вашых мосцяў і маіх мілых братоў, што падгаварыў усіх вас на гэтае непрыемнае пасольства. Прабачце мне, але я нават не спадзяваўся, што ўсё так скончыцца. Бог таму сведка! Але я знайду іншы, надзейнейшы, сродак на паноў Хадкевічаў, я не дазволю кепікі нада мной строіць! Бяру ўсіх вас, панове, у сведкі, што не я першы адступіў ад дагавора, што не я парушаю яго, што я яго шаную, і калі ўжо не па добрай волі, то зброяй прымушу яго выканаць.

Ваявода скончыў і, стомлены, упаў у крэсла, дрыжучы ад гневу. Ён зірнуў на князя Януша, які таксама быў увесь чырвоны, пляснуў рукой па калене і сказаў:

— Вайна! Значыць, вайна! Што ж, я гатовы і да яе! Калі не саступіць, то, Богам клянуся, не жыць яму! Атрымаеш, Хадкевіч, вайну, калі ты хочаш яе і выклікаеш мяне! І хай пралітая кроў будзе на тваім сумленні!

Канец 1-га тома

# ТОМ 2

## Паздзел 1

## ВЕСЦІ. НАРАДА ПАД РАТУШАЙ<br>ВОЙТ У РЭКТАРА

Пры тых акалічнасцях, аб якіх мы пісалі, не было ўжо не толькі надзеі, а нават намёку на згоду — абодва бакі рыхтаваліся да вайны: Радзівілы да нападу, Хадкевічы да абароны; а паколькі, як мы ўжо згадвалі, тэрмін выдання князёўны замуж быў вызначаны — 6 лютага 1600 года, то якраз к гэтаму часу ў Вільні, у палацы Хадкевічаў, і павінна была пачацца тая зацятая вайна.

Але сілы былі няроўныя, бо хаця ў Хадкевічаў і была вядомасць у краіне, многа магутных прыхільнікаў, але намнога болей было ў Радзівілаў. Ваявода, крэўны родзіч князёў Астрожскіх, узначальваючы суполку пратэстантаў і праваслаўных, меў магутную падтрымку ў рускіх праваслаўных і рэфарматараў як у братоў па веры. Гэтай сіле Хадкевічы нічога не маглі супрацьпаставіць. Акрамя таго, Радзівілы добра разумелі, якой апорай ім магла быць дробная шляхта краю, таму заваблівалі яе да свайго двара, дапамагалі, чым маглі, уладкоўвалі на пасады, абаранялі, сваталі, жанілі, у выніку ў іх было шмат прыхільнікаў, нечым абавязаных ім, а яны не толькі тварылі, што хацелі на сейміках ва ўгоду сваім апекунам, але і былі гатовымі па першым закліку сесці на каня з шабляй у руцэ, нават

не пытаючыся, дзеля чаго тое патрэбна. Такой шляхты, адданай роду Радзівілаў, у Літве было дужа многа; яна не цікавілася сутнасцю справы, а слепа падпарадкоўвалася загадам: наехаць, разграміць, не дапусціць да дэпутацыі на сейміках, узняць крык, адлупцаваць — усё для іх было законнай і лёгкай справай. Шляхта ўвогуле была маральна сапсаванай. Бадай што ўся яна стала абыякавай да маральнай ацэнкі сваіх учынкаў, не служыла таму, да чаго яна была заклікана, а слепа ішла за гаспадарамі, якія яе паілі, кармілі і выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах. Радзівілы называлі шляхту *czapkq i papkq* — шапка і кашка, што азначала братэрскае сяброўства і багаты стол; вось такая шляхта і пакінула прыкметны след у гісторыі іх роду. Князь Мікалай Радзівіл, празваны Сіроткам, увесь час паўтараў, што ён называе Радзівілаў не інакш як Рад-жывілы. Такой была палітыка, разлікі і ў іншых прадстаўнікоў гэтага роду. Дадамо, што і розніца ў веры была ім выгаднай, бо за Радзівіламі ішлі тыя, хто ненавідзеў католікаў, быў рады войнам з імі. Таму не дзіўна, што і на гэты раз яны звярнуліся да шляхты, каму напісалі, да каго адправілі пасланцоў. Сябры іх роду (так называлі іх Радзівілы) без вагання адгукнуліся на гэты заклік да бою. Пан ваявода разаслаў ва ўсе бакі позвы, з імі разнеслася і вестка пра пачатак новай грамадзянскай вайны. І ў Кароне, і ў Літве ніхто з тых, хто меў хоць нейкае дачыненне да роду Радзівілаў, не адмовіўся дапамагчы; выходзіла, што ўсе былі не супраць таго, каб распачаць у Літве грамадзянскую вайну.

Галоўнымі кіраўнікамі пратэстанцкай партыі былі перш-наперш тры князі Астрожскія: кракаўскі кашталян, кіеўскі і валынскі ваяводы. Яны былі аднымі з самых уплывовых магнатаў на Літоўскай Русі, у іх было многа народу пры дварах, і яны абяцалі моцную падмогу. Кожны з іх мог прывесці шэсцьсот вершнікаў і семдзесят гайдукоў*, а гэта налічвала, калі ўзяць усіх разам, тры тысячы дзевяцьсот чалавек. Менш значным і не такім багатым лічыўся смаленскі ваявода Абрамовіч, які быў пратэстантам і трымаўся Радзівілаў, залежаў ад іх, таму ішоў за імі па абавязку; ён менеі абяцаў, але хацеў хоць нечым дапамагчы агульнай справе, якую лічыў справай барацьбы за веру, і дакляраваў прыслаць ад свайго двара пяцьдзесят

вершнікаў. Ваяводаў швагра Мікалай Нарушэвіч, жмудскі кашталян, выстаўляў сто вершнікаў і сто гайдукоў. Замойскі таксама без развaжанняў быў гатовы прыслаць людзей з Падолля. Князь курляндскі адказаў на пасланне ваяводы, што прышле яму атрад сваіх рэйтараў*. Князь Юрый Радзівіл паабяцаў даць некалькі дзесяткаў конных, ды і іншыя хоць што-небудзь ды ахвяроўвалі дзеля гэтай справы. Леў Сапега, хоць быў і родзічам ваяводы і добра адносіўся да яго, але тым не менш даць людзей не абяцаў. Гэта было, як мы ўжо згадвалі, у ягоным характары — ён не любіў ні ўва што ўвязвацца, як каталік і як вялікі прыхільнік караля, ён не хацеў рашуча выступіць супраць Хадкевічаў, бо яны былі ў пашане ў Жыгімонта III, стаялі на чале католікаў Літвы.

Што ж да Хадкевічаў, то іх сілы па колькасці не ішлі ні ў якае параўнанне з сіламі Радзівілаў. Хаця іх падтрымлівалі ўсе каталікі, але ніхто ім не абяцаў такой дапамогі. Для таго каб выставіць хоць што-небудзь на абарону супраць Радзівілаў, яны мусілі спадзявацца ў асноўным на грошы, прычым на вялікія грошы: запісваць людзей у войска, наймаць, аплочваць, збіраць іх у Літве і за яе межамі. Дайшло да таго, што з-за інтрыг Радзівілаў ім даводзілася шукаць салдат у замежных краінах, а яны ішлі толькі тады, калі ім добра плацілі. Калі ж да гэтага дадаць, што на той час у іх не было такіх багатых і вялікіх уладанняў ды і ўвогуле багацця, то зразумела, у якое цяжкае становішча яны трапілі. Ім даводзілася закладваць і аддаваць у арэнду свае маёнткі, абы толькі раздабыць грошай на аплату сцягнутага з усіх бакоў войска. Жмудскі стараста Ян Караль, які стаяў на чале сваёй групоўкі, спадзяваўся такім спосабам сабраць тысячу шэсцьсот конных наёмнікаў і яшчэ шэсцьсот пехацінцаў. Пастараўся ён разжыцца і гарматамі для ўмацавання абароны сваёй камяніцы.

Вестка пра гэтую падрыхтоўку, з якой ніхто не рабіў таямніцы, хутка дайшла да караля. І не дзіва: уся краіна гаварыла пра гэта, была занятая падрыхтоўкай да вайны; і ўсе гэтаксама параўноўвалі сілы бакоў, прадказвалі, што прайграюць вайну Хадкевічы, а разам з імі і ўсе каталікі. Яны баяліся, што ваявода, маючы такое войска, лёгка пераможа і не спыніцца перад тым, каб скарыстаць сваю

перамогу для забеспячэння сабе і сваім прыхільнікам рашаючай перавагі ў Літве. Гэта непакоіла католікаў і самога караля, да якога ўсё часцей пачалі даходзіць просьбы ўмяшацца ў гэтую справу. Але кароль не дужа верыў у тое, пра што яму даносілі, лічыў становішча не такім ужо страшным, а можа, нават і адчуваў, нягледзячы на сваю недальнабачнасць, што Радзівілы не будуць надта лічыцца з ягоным пасрэдніцтвам.

Ваявода быў дужа раззлаваны зыходам свайго нядаўняга пасольства, яшчэ больш узненавідзеў Хадкевічаў і ўжо не думаў пра новыя перамовы і пра прымірэнне. Абодва бакі з нецярплівасцю і трывогай чакалі 6 лютага.

Паколькі ваявода быў мацнейшым і перакананым у сваёй перамозе, то і адчуваў сябе больш упэўнена.

Прайшлі апошнія месяцы 1599 года, новы, 1600 год пачаўся ў трывозе, і вось нарэшце наступіў люты.

Тым часам, устрывожаны блізкай развязкай гэтай гісторыі і чуткамі пра вялікую падрыхтоўку да грамадзянскай вайны, што даходзілі да яго, кароль Жыгімонт нарэшце паслаў чатырох сваіх сенатараў, перадаў з імі лісты да абодвух варагуючых бакоў, у якіх забараняў брацца за зброю і пачынаць вайну, і наказаў ім, каб рабілі ўсё, што ў іх сілах, для таго каб спыніць згубнае праліццё крыві. Сенатары выправіліся ў Вільню ў студзені 1600 года, але пакуль яны не прыбылі і не распачалі сваю дзейнасць, нам варта вярнуцца да апісання далейшага развіцця падзей у самой Вільні.

Гараджане былі ў трывозе: яны адчувалі, што стануць першымі, хто пацерпіць у гэтай вайне, бо яна абавязкова пачнецца на рыначнай плошчы, на вуліцах. Некаторыя ўжо намерыліся ўцякаць — яны не хацелі аказацца ў шэрагах тысяч салдат абедзвюх груповак. Дарэмна з болем і жалем гаварылі яны пра тое, што будзе з горадам, на гэта ніхто не зважаў, таму яны мусілі напомніць пра сябе тым, хто збіраўся ваяваць.

Дух гарадской грамады быў больш спрыяльны для партыі католікаў, таму што большая частка горада была каталіцкай; русіны, якія ў 1599 годзе ўвайшлі ў канфедэрацыю і якімі апекаваўся ваявода, абараняючы іх ад езуітаў, ішлі за ім, але іх было нямнога. На чале магістрата ў той час стаяў віленскі войт, якога незаконна прызначыў кароль, заўзяты католік і найлепшы слуга езуітаў Мацей

Барымінскі, былы сакратар караля. У самім магістраце палова засядацеляў была праваслаўнымі, палова — каталікі, але сярод праваслаўных засядацеляў было ўжо больш уніятаў, чым тых, хто прытрымліваўся ранейшай веры. Тое самае дзеялася паміж бургамістрамі і радцамі — там таксама пераважалі каталікі; адчуваўся і вялікі ўплыў езуітаў, хаця яго падрывалі частыя спрэчкі з магістратам. Войт Барымінскі быў членам брацтва Божага цела і міласэрнасці Ісуса, акрамя таго, яшчэ і служкай ордэна — гэта яскрава сведчыць, на чый бок ён схіляўся. У пачатку 1600 года, калі ўвесь горад поўніўся чуткамі пра блізкую вайну, халодным студзеньскім ранкам ратушная плошча пачала запаўняцца людзьмі. Адны з іх ішлі адчыняць свае магазіны, іншыя спяшаліся ў ратушу, хто меўся вяршыць суд у магістраце, каго цікавіла скарбніца, каго вагі, цырульня ці штосьці яшчэ. Бурмістры, радцы, члены магістрата, пісар — усе стоўпіліся каля вялікіх дзвярэй ратушы, калі гадзіннік на вежы адбіў дзевяць. Размова якраз і зайшла пра падзеі, якія набліжаліся; некаторыя загаварылі пра тое, якія наступствы гэта можа мець для горада. Найбольш хвалявалiся багатыя, яны баяліся за сваю маёмасць, любілі спакой, трывожыліся, што ім давядзецца браць на пастой тых, хто будзе выступаць на тым ці іншым баку. Пераказвалі адзін аднаму розныя чуткі.

— Я, пане Базыль, — казаў тоўсты і чырвоны шляхціц, — чуў ад прыдворнага пана старасты, а той пачуў ад палкоўніка, а палкоўнік — ад самога ягамосці старасты, што будуць ваяваць не ў полі, а толькі на гарадскіх вуліцах; як вам, пане, гэта падабаецца?

— А навошта б яны тады ўмацоўвалі камяніцу? — пытаўся другі.

— Усе ведаюць, што там ужо ёсць восемдзесят (!) гармат, яны ляжаць па ўсіх кутках; і хто ведае, колькі іх яшчэ прывязуць. Кажуць, што гарматы паставілі нават у вокнах, якія выходзяць на вуліцу, у парадных пакоях.

— А што да ваяводы, — казаў трэці, — то мы ведаем: як толькі ён навядзе сюды войска, ерэтыкі тут жа сатруць каталікаў у пыл, знішчаць касцёлы, ксяндзоў задушаць. Пра крамы і склады і думаць няма чаго. А таму трэба своечасова падумаць пра сябе. Беражонага Бог беражэ.

— Так, так! Усё можа быць. Але няўжо наш кароль дазволіць ваяваць?

— Не можа ж кароль стаць паміж імі, — прамовіў яшчэ адзін гараджанін, — хай сабе ён і хацеў бы дапамагчы Хадкевічам, усё роўна не зможа. Можа толькі забараніць брацца за зброю, іншага не прыдумаць.

— Так яго ваявода і паслухаецца, — даводзіў другі шляхціц, — ён пасмяецца над ягоным загадам, як толькі пакліча войска з Русі, Курляндыі ці мала адкуль яшчэ. Кажуць, што ён пад заклад каталіцкай маёмасці склікае нават татар і паганых туркаў.

— А таму, — гнуў сваё трэці, — кожны, хто мае розум, хай адным духам вымятаецца з Вільні напярэдадні таго тэрміну, і хай ім застануцца толькі голыя сцены, нават абіўку трэба садраць. Я дык так і зраблю.

— У мяне пастаялы двор, — сказаў маленькі гарбун, — і я не магу пакінуць яго. Наадварот, я магу пажывіцца.

— Цябе аб'ядуць і абап'юць, а потым пакажуць дулю, — усміхнуўся пан Базыль, — вось і ўся будзе твая пажыва.

— Можа, не такі страшны чорт, як яго малююць, — разважаў першы. — Ксяндзы-езуіты чамусьці ж не выязджаюць, капітул таксама, ніхто не едзе. Каб было так ужо небяспечна, то ўсе даўно б выехалі.

— Праўду кажаце, — падтрымаў яго гараджанін, які стаяў збоку, — як толькі яны пачнуць высяляцца, то і мы рушым за імі. Будзем напагатове, але пакуль што не варта кранацца з месца; а да вайны не дойдзе, можа ж стацца і такое, тады мы хоць нешта ўтаргуем, раз наедзе столькі народу. І за пастой атрымаем.

— А вы ведаеце, што з-за гэтага, даруй Божа, паганскага ваяводы, — зноў умяшаўся трэці, — у нас столькі гадоў няма біскупа. Ён ні ў грош не ставіць ксяндза Маціёўскага і настройвае супраць яго іншых, каб не зацвярджалі яго на біскупства, а ўсё таму, што той на баку караля.

— Можа, гэта і праўда, — прамовіў Базыль, — але ж ксяндза не пускаюць на біскупства яшчэ і таму, што ён не ліцвін, ёсць жа нейкі закон, які забараняе не ліцвіну займаць віленскае біскупства. Вось чаму яго не дапускаюць.

— Зусім не таму, — запярэчыў трэці, — мне братчык-кравец з ордэна езуітаў казаў, што прывілей на біскупства выдадзены ксяндзу канцылярыяй Кароны і з яе пячаццю.

— А хоць бы і так, каго гэта абыходзіць? Некалі нябожчык кароль Стэфан запячатваў прывілеі рукаяццю шаблі, і нічога, усё выконвалася, што там было запісана.

— Тое і ёсць, што наш кароль глухі і нямы, адно ведае — маліцца ды маліцца, а ў каралеўстве ўсё пайшло наперакасяк. Але трасца іх бяры, усе гэтыя справы, нам трэба падумаць пра сябе, самы час. Нам пара нешта вырашыць наконт гэтай вайны.

У гэтую хвіліну падышоў войт Мацей Барымінскі. Усе пакланіліся яму, а пан Базыль Яновіч спытаў:

— Ці праўда, што хутка пачнецца вайна паміж Хадкевічамі і ваяводам?

— Адзін Бог можа гэта ведаць, — адказаў худы і высокі мужчына, якога ўсе віталі як войта, — але *probabiliter* — вельмі можа быць.

— Дык, можа, калі гэта так, нам самы час падумаць пра сябе, — сказаў пан Дурнік, той самы трэці шляхціц.

— Напэўна, так, — адказаў войт, — падумайце, вашамосць, з чаго пачынаць.

— А што сам пан думае рабіць? — спытаў Більдзюкевіч.

— Буду пакуль што сядзець, — адказаў войт, — бо не магу пакінуць сваю пасаду.

— І я, — сказаў адзін з членаў магістрата, — але краму замкну, а тавары вывезу ў вясковы фальварак.

— Так трэба зрабіць і нам, — прамовіў яшчэ адзін удзельнік гутаркі, пан Дубовіч, — але ці не лепей было б адправіць дэпутацыю віленскага магістрата да іх мосцяў кашталяна і ваяводы з просьбай не рабіць шкоды гораду яго каралеўскай вялікасці?

— Супакойцеся вы з вашымі хаджэннямі! — усклікнуў Дурнік. — Хочаце, каб нас там паднялі на смех? Хіба яны паслухаюцца нас, калі там ужо ўмешваўся не адзін сенатар, і яны ўсім падцерлі насы.

— Гэта так, — засведчыў войт, — але ж нешта значым і мы, як-ніяк — *brachium reqium* — правая рука ўлады — у гэтым горадзе. І нашы прапановы яны не могуць праігнараваць, бо каму, як не нам, дбаць пра захаванне і *securitas* — бяспеку — горада? Таму парада пана Дубовіча наконт дэпутацыі *ratione* — слушная, я ўхваляю яе.

— І я, — далучыўся Базыль Більдзюкевіч. — Сёння ж параімся і адправім пасла з паперай.

— Навошта такія цырымоніі, — запярэчыў Дубовіч, — трэба, каб пайшоў увесь магістрат, а інакш будзе поўны афронт.

— Напэўна, так будзе лепей, — згадзіўся войт, — толькі, перш чым ісці, трэба знайсці кагосьці талковага, хто мог бы даць добрую параду, падказаць, што і як гаварыць.

— І каго б вы параілі? — спытаў Дубовіч.

— Мне здаецца, — адказаў войт, — лепш за ўсё папрасіць рэктара Акадэмічнага калегіума.

— Вашамосць кажа чыстую праўду, — пацвердзіў Дурнік. — Схадзіце вы, пане, да яго самі і распытайцеся, што ён думае пра ўсё гэта.

— А што ж, сапраўды *stante pede* — схадзіце самі, гэта не зашкодзіць, — дадаў Дубовіч. — На сёння важных спраў пакуль няма і не прадбачыцца, таму вы, пане, можаце схадзіць у калегіум, а тут застануцца члены магістрата, бурмістры і наш шаноўны пан пісар.

— Добра, добра. Я і так збіраўся схадзіць у калегіум па судовых справах, — сказаў войт, — а раз вы ўжо так хочаце, то пайду зараз жа.

Войт пакланіўся і ў задуменні пайшоў па вуліцы ў бок калегіума Святога Яна.

У той час калегіум займаў вялікую плошчу, месціўся ў некалькіх дамах, купленых яшчэ біскупам Валяр'янам Пратасовічам, і ў заснаваных яшчэ раней, нават з перабудаванай колішняй Святаянскай плябаніі (у якой славуты Ройзій Маро, апошні архіпрэсвітэр, пісаў свае "Пастановы"); а таксама ў дакупленых і ахвяраваных камяніцах. У цэнтры ўсіх пабудоў стаяў касцёл Святога Яна, абноўлены некалькі гадоў таму, з высокай вежай, ганкамі. Каля варот калегіума сабраліся маладыя навучэнцы, чакаючы, калі зазвоніць падвешаны ў браме звон. Апрануты яны былі вельмі пярэста, з чарніліцамі пры поясе, кніжкамі пад пахамі, у паплямленым і часта ў дужа паношаным адзенні. Некалькі свецкіх навучэнцаў і ксяндзоў з касцёла Святога Яна ў чорным адзенні ішлі па дзядзінцы з ключамі або з кніжкамі. Пан Барымінскі ведаў некаторых з іх і вітаўся з імі. Ён мінуў дзядзінец, прайшоў па калідорах, дзе снавала

яшчэ больш моладзі і ксяндзоў, нідзе асабліва не спыняўся, бо спяшаўся хутчэй трапіць у рэктарскую келлю.

Каля дзвярэй сталоўкі сабраўся цэлы натоўп — звон якраз абвясціў час снедання. А з глыбіні ўжо чуўся голас святара — ён, як тут вялося, чытаў статут ордэна перад тым, як пачаць есці. Было чуваць, як уголас каюцца некалькі брацціяў — яны ў час чытання статута павінны былі адбываць пакаранне за правіну.

Войт працерабіўся праз натоўп і нарэшце аказаўся перад келляй рэктара. Яна была больш багатай, чым другая, на Правінцыяльнай вуліцы, бо ў ёй ксёндз-рэктар прымаў толькі саноўных гасцей, якія не хацелі праходзіць праз усе заведзеныя тут цырымоніі з абавязковым мыццём ног каля ўвахода. Над дзвярыма келлі вісеў абраз Святога Ксаверыя, ці не асабістага апекуна рэктара.

Войт пастукаў і адразу ж увайшоў, бо вучань-езуіт адчыніў яму. Ксёндз-рэктар стаяў у дзвярах першага пакоя і якраз заканчваў размову з братчыкам:

— Хай пасадзяць яго на тры дні на хлеб і ваду паводле статута, а пра астатняе пагаворым потым.

Братчык пакланіўся са складзенымі на грудзях рукамі і выйшаў, а войт павітаўся з рэктарам. Келля, у якой яны стаялі, была сціплая, нічым не аздобленая, апрача партрэта ксяндза Варшавіцкага. Каля дзвярэй вісела крапідла, побач — драўляны крыж, лаўкі, каля сцен шафкі. Больш урачыста выглядала другая, гэткая ж скляпеністая, як і першая, сюды рэктар і правёў Барымінскага. Гэтая келля выглядала значна большай, у ёй былі два акны. Сцены — нічым не абабітыя, на іх віселі абразы святога Ігнацыя Лаёлы і першых дзевяці брацціяў ордэна езуітаў, а таксама выявы некаторых папярэднікаў рэктара ў віленскім калегіуме.

Тут стаяла шафа з кнігамі, побач просты цвёрды ложак, а над ім — плётка і крыж, галінка вярбы і грамнічная свечка. І больш нічога такога, што магло б служыць упрыгожаннем, воку не было за што зачапіцца.

— Важная справа прывяла мяне да вас, літасцівы ксёнжа, — прамовіў войт пасля прывітання. — У горадзе неспакойна, людзі баяцца. Я хацеў бы параіцца з вамі, што можна зрабіць.

— А чаму неспакойна? — спытаў Гарсія Алабянус, павярнуўшы да войта лысую галаву і глянуўшы на яго жывымі чорнымі вачыма.

— Ды ўсё з-за гэтай няшчаснай вайны, да якой рыхтуюцца Хадкевічы і Радзівілы, — патлумачыў войт. — Увесь горад устрывожаны, людзі непакояцца, не ведаюць, што і як рабіць. Ці ўцякаць, выбірацца з горада, ці сядзець і чакаць, спадзеючыся на Божую ласку.

— Што ж я магу вам параіць? — адказаў рэктар, не хаваючы сваёй поўнай абыякавасці. — Рабіце так, як падказвае вам розум.

— Але ж тут нашага розуму не стае, — пажаліўся войт, — і мы былі б рады пачуць параду, як нам сябе паводзіць, на што спадзявацца. Ёсць нам чаго баяцца альбо не?

— Я ведаю гэта не лепей, чым вы, — адказаў рэктар. — Так, падобна на тое, што пахне вайной, але наш кароль ужо выслаў паноў сенатараў з інгібіцыяй* да ваяводы і кашталяна.

— З інгібіцыяй! — усклікнуў войт. — Але ці прыслухаюцца яны да яе?

— Гэтага я не ведаю, — асцярожна сказаў рэктар, бо не хацеў паказаць, наколькі добра ён дасведчаны ва ўсім, што дзеялася ў горадзе.

— Мы хацелі б прапанаваць магістрату выступіць з прадстаўніцтвам ад горада да паноў кашталяна і ваяводы, каб яны не парушалі спакою і не шкодзілі *sekuritatem Metropolis* — бяспекі горада.

— Гэта было б не лішнім, — сказаў рэктар, — але я вашым мосцям і не раю, і не адгаворваю.

Прычыну такой асцярожнасці ксяндза-рэктара ў ягонай размове з войтам трэба было шукаць ва ўсім вядомай балбатлівасці пана Барымінскага, менавіта з-за яе рэктар баяўся сказаць лішняе слова; ён не хацеў, каб увесь горад даведаўся пра нейкі там ягоны ўдзел у тым, што наспявала. Таму ён стараўся захаваць хаця б вонкавы *neutralitat* — нейтралітэт — у гэтай справе; і так пратэстанты ўжо ўскідвалі на вочы езуітам усе грахі, былі яны ў іх вінаватыя ці не.

— А ці будзе які плён, калі мы гэта зробім? — дапытваўся войт. — Мы спадзяёмся на вашы розум і дасведчанасць, пане рэктар, дык парайце што-небудзь.

— Благога нічога быць не павінна, — прамовіў рэктар, — але зноў жа і вялікіх вынікаў чакаць не варта. Зрабіце так, як вы ўжо вырашылі між сабой, а я загадаю адправіць імшу за поспех вашай місіі. Трэба толькі не забыцца паслаць распараджэнне ў капліцу Божага цела.

Рэктар прамовіў гэта і ўстаў, нечым заклапочаны, а пан войт, рады ці не, павінен быў развітацца з ім. Праходзячы паўз браму калегіума, ён зірнуў на вывешаныя там аб'явы, прабег іх вачыма. Гэта былі аб'явы пра заказаныя малебны ў дзень нейкага святога, пра дыспут з нагоды атрымання вучонай ступені, а таксама пра пазбаўленне ад інтэрната трох навучэнцаў за якіясьці дрэнныя ўчынкі.

## Паздзел 2

## ДЭПУТАЦЫЯ МАГІСТРАТА

Назаўтра яшчэ гадзіннік на ратушы не прабіў дванаццаці, а з яе дзвярэй ужо выходзіла дэпутацыя магістрата. Узначальваў яе паважаны пан войт Мацей Барымінскі, за ім ішлі двое суддзяў з магістрата, двое з рады, два бурмістры і гарадскі пісар. Усе яны былі шыкоўна апрануты, нібыта збіраліся ісці ў працэсіі або на прагляд цэхавых вучэнняў: у новым яркіх колераў адзенні, новым абутку з найлепшай скуры, а яшчэ, паколькі па новым прывілеі Найяснейшага Жыгімонта Аўгуста (так яго тады называлі), магістрат быў прыраўняны да шляхты, усе чыноўнікі ў знак свайго шляхецтва папрычаплялі шаблі, якія бразджэлі на камянях.

Па шляху ім нізка кланяліся гараджане і нават купцы; гледзячы, як важна і стройна яны выступалі, збочвалі з дарогі, каб не замінаць ім, бо ўсе адчувалі, што ішлі яны не проста так, на пагулянку, а заклапочаныя нейкай важнай справай, якая мела дачыненне да ўсяго горада. Гэтак яны прайшлі ў ганаровым маўчанні па галоўнай вуліцы, а потым, каб не звяртаць на сябе лішняй увагі, збочылі ў завулак на Рыбным канцы, астатнюю частку шляху *unanimitate* — аднадушна — вырашылі прайсці нацянькі, прадмесцем да самага палаца віленскага кашталяна.

Тут яны спыніліся і папрасілі паведаміць пра свой прыход. Праз хвіліну іх правялі ў залу, а неўзабаве да іх выйшаў і сам кашталян. Пасля нізкіх паклонаў і прывітання пан войт адкашляўся і ўрачыста пачаў свае слова:

— Яснавяльможны віленскі кашталян! Пане наш і дабрадзею! З пэўнага часу страх і неспакой апанавалі жыхароў Вільні, слаўнага горада яго каралеўскай вялікасці, і ўсё з нагоды нейкіх чутак і пагалосак, якія пайшлі, нібыта знарок, каб парушыць спакой гэтага горада і *sekuritas* — бяспеку — яго. Нейкія нядобрыя людзі садзейнічаюць парушэнню спакою жыхароў нашага сталічнага горада, разносячы падобныя плёткі і вымысел, аднак жа для гэтага маюцца некаторыя падставы. Кожны дзень народ бачыць, як вы, пане, праводзіце нейкія фартыфікацыйныя работы ў самым сэрцы горада, робіце нейкія прыгатаванні, якія могуць парушыць спакой гараджан. Абдумаўшы ўсё гэта, мы, войт і гарадская рада яго каралеўскай вялікасці горада Вільні, прыйшлі да вас сюды, *ad illustrissmum* — да вашай светласці — пакорліва прасіць вас, каб у тым выпадку, калі вы і сапраўды рыхтуецеся да вайны (хай вас Бог бароніць ад гэтага!), то каб хаця горад Вільня не стаў тэатрам ваенных дзеянняў. Мы маем прывілей, па якім ставіць войскі ў самім горадзе забараняецца, а гасцям, якія прыбываюць штодня, адводзяцца ў горадзе пастаялыя двары, *in visceris* — пасярод — яго метраполіі, гэта запісана ў юрысдыцы ратушы, чаго ніколі раней не было. Калі ж, не дай бог, дойдзе да вайны і баёў, то гэта будзе пагібель для горада Вільні, яго гандлю і росквіту. Таму што нават зараз ужо іншаземныя купцы і госці, да якіх пачалі даходзіць гэтыя чуткі, зачыняюць крамы, пастаялыя двары і гасцініцы пусцеюць, плата за пражыванне не паступае, усе жывуць у нейкім страху і чаканні. Таму мы ўсе пакорліва просім *Illustrissimum* ад імя магістрата, *Communitatis* — таварыства — купцоў і ўсяго паспалітага віленскага люду, каб вы, калі можаце, не распачыналі гэтай вайны, якая прывядзе да знішчэння гандлю і спакою ў горадзе, галечы і няшчасцяў яго жыхароў.

Пан Барымінскі збіраўся працягваць, але кашталян нецярпліва перапыніў ягоную казань:

— Даражэнькі пане войце! Вы дарэмна прыйшлі да мяне з гэтым пасольствам. Я тут ніякай вайны не распа-

чынаю, я не хачу яе і не рыхтуюся да яе. Ідзіце да пана віленскага ваяводы і прасіце яго, каб ён добра падумаў і, калі што якое, каб не забываўся пра горад. Гэта ён, а не я думае пра вайну. Я ж мушу толькі бараніцца, калі нехта зачэпіць мяне, а бараніцца мае права кожны і ўсюды, ці ж не так, пане войце?

— Так, гэта кардынальнае права, — пакорліва пацвердзіў войт, — але ж...

— Але што? — спытаў кашталян.

— Але ж войска збіраецца, — прамовіў войт, — і ў ваколіцах, і ў самім горадзе яго ўжо многа, а кажуць, што прыбудзе яшчэ больш!

— Ідзіце да ваяводы! — зноў перапыніў яго кашталян. — Ідзіце! Гэта не мая справа. Я не буду страляць першы. Калі ён будзе пытацца ў вас, ці былі вы ў мяне, то можаце сказаць тое, што я гаварыў вам: я ніякай вайны не пачынаю. Усяго вам найлепшага, панове.

Дэпутацыя нізка пакланілася, потым гэткім жа няспешным крокам моўчкі пайшла да пана ваяводы, але на тварах чыноўнікаў магістрата можна было прачытаць, што гэтае другое пасольства ім зусім не па душы, таму што яны ішлі да ваяводы, якога баяліся як ерэтыка і якога ўсім ім распісвалі як жудаснага монстра. Хаця яны былі ў пэўнасці, што ён не павінен абразіць такую прадстаўнічую дэпутацыю магістрата, аднак ім было крыху ніякавата. Пан войт занепакоена пазіраў на пісара, пісар — на магістрацкіх засядацеляў, яны — на бурмістраў. Чым бліжэй яны падыходзілі да палаца, тым болей запавольвалі крок. Тут войт прапанаваў:

— Звярніцеся да яго вы, пане бурмістр.

— Хто? Я? — спалохана спытаў бурмістр. — Я? Але ж гэта будзе вялікай абразай для вас, пане войт, вы ж — галава горада і гэтай дэпутацыі! Я нізавошта так не зраблю.

— І я.

— І я, — ціха адгукнуліся іншыя. — Належыць гаварыць пану войту.

А войт сам не ведаў, як яму быць, бо ў яго язык нібы прысох. Але было ўжо занадта позна разважаць, бо яны прайшлі праз вароты і сталі ў калідоры.

Слуга абвясціў:

— Дэпутацыя магістрата!

Ваявода сядзеў у сваім пакоі з панам Абрамовічам, пачуўшы пра дэпутацыю, загадаў:

— Упусціць іх. Напэўна, прыйшлі з вечнай скаргай на падваяводу альбо пачнуць дурыць галаву пра гандаль, гандляроў ды партачоў.

Не паспеў ён скончыць, як увайшоў і схіліўся ў яшчэ большым, чым у кашталяна, паклоне пан войт, а за ім на дыбачках увайшлі і ўсе астатнія. Ваявода не ўстаў, змерыў іх паглядам і павярнуўся да іх, чакаючы, што яны скажуць.

Такі прыём не дужа цешыў, войт ледзь не страціў прытомнасць ад страху, камячыў шапку, кланяўся, не мог вымавіць нейкага слова, з якога можна было б пачаць. Нарэшце, калі маўчанне занадта зацягнулася, ён пачаў гаварыць амаль тое самае, што казаў у кашталяна, толькі прамаўляў сваю казань на гэты раз дужа ціха і невыразна, дрыжачым голасам.

Ваявода перапыніў яго яшчэ на сярэдзіне:

— Вы што ж гэта, панове, думаеце мяне вучыць ці запалохаць? Мяне? Рабіце тое, што належыць вам, а не сенатарам і рыцарству! Сядзіце ў сваіх крамах, узважвайце тавары ў ратушы, збірайце падушныя, падымныя і іншыя падаткі, але не совайце свой нос туды, куды вас не просяць! Чуеце, ягамосці?!

Войт змоўк і пабялеў, як сцяна.

— Аднак жа, яснавяльможны князь, — заікаючыся, прамовіў ён, — *securitas* горада яго каралеўскай вялікасці, даверанага...

— Ахоўвайце горад ад злодзеяў і прайдзісветаў, пане войце, і не турбуйцеся аб нашых справах! — крыкнуў ваявода. — Нечуванае нахабства! Вас варта было б усіх пасадзіць за гэта на тыдзень у замкавую турму! — дадаў ён, усё болей распаляючыся злосцю.

— У магістрата яго каралеўскай вялікасці горада Вільні і ў думках не было абразіць яснавяльможнага пана, але ж *zelus* — клопат — пра дабро, даверанае нам...

— А я вам кажу, — загрымеў ваявода, — накіруйце ваш zelus на іншае, і вам будзе што рабіць і да чаго прыкласці яго! Не ўмешвайцеся ў тое, што вас не абыходзіць, збірайце падаткі, судзіце сваіх гараджан і гасцей, падтрымлівайце парадак і сядзіце спакойна.

Войт адступіў да дзвярэй, напалоханы напамінкам пра турму і грубасцю ваяводы. Калі князь вымавіў апошнія словы, адчыніліся дзверы і ўся дэпутацыя моўчкі пасунулася назад, а ваявода ў пакоі ўсё яшчэ бушаваў. З невясёлымі тварамі, як жаб праглынуўшы, паны радцы, бурмістры і магістрацкія засядацелі на чале са слаўным войтам пайшлі ў ратушу.

Яны здалёку ўбачылі, што каля варот ратушы іх чакала купка цікаўных гараджан і купцоў.

— Што мы ім скажам? — спытаў войт.

— Што? — перапытаў пісар. — Зусім няма патрэбы расказваць ім пра візіт да ваяводы, бо гэта прынізіла б нашу годнасць у іх вачах. Лепей скажам, што кашталян і ваявода абавязалі нас дбаць пра парадак у горадзе.

— А што, як яны даведаюцца пра ўсё?

— Лепш самі пераканаем іх, што мы кажам праўду, а ўсё іншае — гэта адны плёткі і чуткі, — настойваў пісар. — Інакш мы страцім давер нашых падуладных, ад чаго ахавай нас, Божа, бо з намі і так мала лічацца, а праз гэта і зусім даверу не будзе.

— Што добрага скажаце? — спыталі тыя, хто чакаў.

— Каб мы былі спакойнымі і цярплівымі, — адказаў войт. — Усё добра.

— Нас прынялі з належнай пашанай, — бадзёра дадаў пісар.

— Горад можа спадзявацца на памяркоўнасць ваяводы і кашталяна, — запэўніў войт.

— А вайны не будзе?

— Калі і будзе (гэтага нельга прадбачыць), то нам паабяцалі не рабіць вялікай шкоды гораду.

— Ну, вядома! — з'едліва сказаў, паківаўшы галавой, адзін з гараджан. — Абрабуюць і папросяць прабачэння, спаляць і будуць праліваць слёзы.

## Паздзел 3

## ТАМІЛА

Ужо цямнела, але на ратушы яшчэ не званілі, каб тушылі агні, яшчэ былі перапоўнены корчмы, харчэўні і шынкі, а не надта смелыя гараджане з ліхтарамі ў руках, узброеныя палкамі з шыпамі, пахаджвалі па вуліцах. У касцёлах званілі да малітвы Божага анёла*, самыя набожныя ў гэты час станавіліся на калені нават пасярод вуліцы. Бомканне званоў змешвалася з рыпеннем вазоў і карэт, галасамі прахожых. У акне палаца Хадкевічаў на Замкавай вуліцы сядзела князёўна Соф'я і глядзела на вуліцу невідушчымі вачыма. Яна была невясёлая, задуменная, хацела хоць неяк развеяць сябе відам вулічнага гармідару, але думкі яе былі далёка.

Аднак жа князёўна сядзела і пазірала на вуліцу не толькі дзеля гэтага — яна нібыта некага выглядала, некага чакала. А вуліца тым часам пусцела; акрамя некалькіх наведвальнікаў шынка Мальхера пад шыльдай з Бахусам — адны з іх спяшаліся туды, другія выходзілі — болей нікога не было відаць. Вароты камяніцы Хадкевічаў яшчэ былі шырока расчыненыя, каля іх стаяў толькі стары служка, ён таксама маліўся анёлам за душы памерлых — да гэтага заклікаў жывых голас званоў. Раптам побач з замкам нехта зашлэпаў па гразі, а неўзабаве паказалася старая жабрачка ў падраных лахманах, яна запавольвала крок і ўрэшце зусім спынілася пад акном князёўны. Зірнула на яго, як быццам прыкмеціла нешта незвычайнае, і замармытала. Гэта яна заўважыла бледны твар князёўны, які бялеў паміж шыбкамі.

— Падайце шэлег убогай, — папрасіла яна, — а Бог вас суцешыць.

Яна малітоўна склала рукі, працягнуўшы іх угору, сама ж пазірала на служку, а ён, заняты малітвай, не звяртаў на яе ўвагі. Яна паўтарыла:

— Падайце шэлег убогай! А Бог вас суцешыць.

У акне расчынілася фортка, з яе вылецела і ўпала на вуліцу манета, загорнутая ў паперку. Жабрачка прагна схапіла яе, узняла вочы ўгору і пачала дзякаваць:

— Бог вам заплаціць за вашу ласку, яснавяльможная панна! Бог заплаціць!

Князёўна тут жа зачыніла фортку, а жабрачка яшчэ раз азірнулася і пашыбавала назад па Замкавай вуліцы, ды так хутка, нібыта яна і не была згорбленай старой. Як толькі яна адышлася далей ад камяніцы, адразу развінула паперчыну і сама сабе сказала:

— Ого! Цэлы талер! Але намнога даражэй каштуе паперка, чым гэтая манета, хай бы яна была нават партугальская!

Жабрачка прамармытала гэта, старанна склала паперку і накіравалася ў бок палаца Радзівіла. Наблізіўшыся да яго, адчыніла дзверцы, што выходзілі на вуліцу, зайшла ў іх і падалася напрасткі да галерэі, на якую вяла лесвіца.

Смела і прывычна яна ўзышла па лесвіцы, пастукала ў дзверы, адчыніла іх і ўвайшла.

Яе заўважыў прыдворны, што сядзеў у пярэднім пакоі, і папярэдзіў:

— Ідзі распранацца ў каморку, бо тут зайшоў нехта чужы. Зрабіў, што трэба?

— Усё цудоўна! — адказала мужчынскім голасам фальшывая жабрачка і пайшла ў бакоўку.

Там яна зняла лахманы, памылася і апранула мужчынскае адзенне. Гэта быў Таміла Таміловіч, давераная асоба князя, які такім спосабам здабыў ліст ад князёўны. Пераапрануўшыся, ён зноў зайшоў у пакой і спытаў:

— А хто там прыйшоў?

— Ды пан Адам прывёў нейкага прыдворнага з палаца Хадкевічаў, поіць яго, улашчвае, толькі што мух ад яго не адганяе.

Таміла выслухаў гэта і пайшоў у другі пакой, дзе некалькі ягоных сяброў шчыравалі над збанком, а пасярод сядзеў на добрым падпітку ўжо знаёмы нам пан Брожак і пра штосьці прастарэкваў.

Ён убачыў Тамілу, якога ўжо сустракаў раней, хоць і не ведаў ягонага імя, ускочыў з лаўкі і сардэчна абняў яго.

— А, і ты тут!

— І я тут, — адказаў Таміла.

— А што ты тут робіш? — запытаўся Брожак.

— Зайшоў выпіць, — адказаў Таміла і падміргнуў прыяцелям.

— Тады сядай, госцем будзеш, — сказаў адзін з іх і наліў яму кубак віна.

Яны пачалі піць па чарзе адзін да аднаго, беручы кубак з рук і кланяючыся.

Таміловіч шэптам спытаў у свайго сябра:

— Што-небудзь выцягнулі з яго?

— Яшчэ не, — адказаў той, — але яго пара ўжо выганяць, бо ён падпіў яшчэ ў Мальхера, і мы прывялі яго сюды; ён нават не здагадваецца, што сядзіць у Радзівілаў.

— П'ю да вашай мосці, пане Брожак! — усклікнуў Таміла. — Што ў вас там чуваць?

— А, што там можна пачуць, усё тое самае: ладзім крэпасць, купляем і прывозім гарматы, наймаем войска, вострым шаблі, падшываем скурай панцыры. Спляжым гэтых Радзівілаў к чортавай матары, дамо ім рады!

— Абавязкова! — згадзіўся прыяцель. — І многа там тых войскаў?

— Чорт іх злічыць! — махнуў рукой пан Брожак. — Стараста збірае іх па ўсім свеце. А цяпер яшчэ маршалак паехаў дабіраць рэшту ў Прусію.

— Хто ён такі, ваш маршалак? — запытаў Таміла.

— Ды хіба вы яго не ведаеце? Ну! Мікола Хамец. Не простага роду чалавек! Кажуць, што ўся літоўская шляхта яшчэ пасвіла скаціну і хадзіла ў скураных лапцях, а ягоныя продкі ўжо былі князямі.

— Ну, цяпер такіх князёў у кожнай кішэні па жмені, — усміхнуўся Таміла, — і шляхта ўжо не пасе скаціну. Так што яны цяпер роўныя. А якой дарогай ён паехаў?

— А бог яго ведае!

— А што, у вас хіба мала гармат, што вы іх яшчэ звозіце?

— Мне здаецца, што іх будзе намнога больш, чым у апошнім паходзе, бо нават калі падлічыць, колькі падрыхтавана месца для іх і ў камяніцы, і на дахах, і на сценах...

— Парабілі ўжо?

— О! Засталося толькі паставіць! — запэўніў Брожак. — Пан Барб'е працуе без стомы, ён кажа, што нам будзе зручней абараняцца, чым Радзівілам нападаць: нават калі ў ерэтыкоў будзе шмат войска, яно ўсё роўна не памесціцца ў вуліцах. Падыдзе хто на стрэл, а мы яго — ядром, аскалепкамі ў вочы!

Таміла Таміловіч кіўнуў галавой, глянуў на сваіх і пачаў зноў выпытваць пра колькасць войска:

— А ўсё ж, ці многа ў вас людзей?

— Кажу ж вам, што добра не ведаю, але я кожны дзень чую, як яго тысячамі лічаць пан Барберы з панам старастам і панам Аляксандрам.

— Адкуль вы яго бераце?

— Па ўсім свеце збіраем, як тыя грыбы, адзін тут, другі там, — балбатаў пан Брожак. — Нямала такіх, каго вабяць добрыя грошы! Не шкадуем сіл, шукаем дзе толькі можна. Рух вялікі, стараста ездзіць і ездзіць.

— Мабыць, яго і зараз няма ў Вільні?

— Няма, вернецца да паўналецця княжны з гарматамі і з войскам, так, не іначай як за месяц перад тым.

— І хто ж будзе імі кіраваць?

— Як хто? Сам стараста, — сказаў Брожак. — І Мікалай Хамец. Таксама, кажуць, хвацкі ваяка. Ну, а кожны атрад будзе мець свайго ротмістра.

Яны доўга яшчэ пілі віно, смяяліся, жартавалі, але Таміла неўзабаве знік. Ён пабег да маладога князя. Непрыкметна ўвайшоў да яго і стаў у дзвярах. У пакоі гарэла некалькі жоўтых свечак. Князь Януш выпрабоўваў зброю, згінаў шаблі, разглядаў і адбіраў лепшае, кладучы на вялікі стол.

— Таміла? — спытаў ён, падняўшы галаву. — З чым прыйшоў?

— Прынёс ліст! — адказаў прыдворны.

Князь паклаў шаблю і схапіў паперчыну, падбег да святла, прачытаў яе, наморшчыў лоб і кіўнуў галавой.

— Што яшчэ?

— Толькі што мы адправілі аднаго лайдака з Хадкевічавай псярні, папіст многае расказаў.

— А што? — пацікавіўся князь Януш.

— Што стараста сабраў шмат гармат, што выпісвае войска аж з-за граніцы.

— Гэта не сакрэт, — зазначыў князь.

— І што сам стараста будзе кіраваць...

— І гэта не навіна, — раздражнёна адказаў Януш.

— Што ў камяніцы ўсё гатова, падрыхтаваны месцы для ўстаноўкі гармат.

— Адкуль яны іх узялі?

— Гэтага я не ведаю. Але ён сказаў, што іхні Барб'е, нейкі там француз, запэўніў, што ім будзе ў сто разоў лацвей абараняцца ў камяніцы, чым нам нападаць і браць яе штурмам, бо наша войска не змесціцца ўсё ў вуліцах, а па чарзе яго будзе лёгка перабіць з гармат.

— Хіба гэтаму нельга даць рады? — запярэчыў князь. — Пакуль яны зноў зарадзяць тыя гарматы, мы выламаем вароты.

Ён пагардліва перасмыкнуў плячыма і спытаў:

— А ці ведаеш ты, Таміла, колькі Хадкевічы расстараліся ў купцоў пораху, свінцу і грошай?

— Колькі пораху і свінцу, я дакладна не ведаю, а грошай ім нядаўна даставілі пяцьсот коп. І ўсе пайшлі на войска.

— Усё роўна яны не перамогуць, — усклікнуў Януш, — хай ім нават усе дапамагаюць! Нават калі будзе патаемна дапамагаць кароль ці спадцішка — палякі езуіты. Мы зруйнуем усе іх палацы і касцёлы і пераможам. Там, дзе іх дзесятак, нас — тысячы!

— На, — сказаў ён Таміла, — вазьмі гэту шаблю і загадай збройніку моцна і трывала насадзіць рукаяць. Хай таксама падрамантуе лёгкія даспехі, можа, яны і не спатрэбяцца, але хай будуць у спраўнасці, а то і рамяні абарваныя, і не хапае некалькіх пласцін на грудзях.

Таміла Таміловіч забраў усё, Януш у задуменні маўчаў.

— Бачыў князёўну? — спытаў ён.

— Бачыў. Яна, як заўжды, сядзела ля акна.

— Цябе ніхто не заўважыў?

— Я думаю, што не, хаця каля варот стаяў слуга.

— Заўтра я сам пайду замест цябе, — сказаў князь пасля хвіліннага роздуму.

— Вы, князь? — здзівіўся Таміла.

— А што тут такога? Пайду сам. Змог жа некалі князь Сямён слуцкі прыйсці ў Львоў да сваёй каханкі Гальшкі ў жабрачай вопратцы, паспрабую і я выкінуць гэткі ж фокус.

— А што, як вас зловяць?

— Ну, не павесяць жа...

— Але могуць зняважыць.

— У мяне будзе пад лахманамі кінжал. Значыць, старасты няма, кашталян у сябе, а ў камяніцы адны бабы?

— Але там процьма прыдворных, шмат вачэй, вы ж гэта добра ведаеце, — папярэдзіў Таміла. — Навошта вы туды пойдзеце?

— Ваявода нічога не павінен ведаць, — усхвалявана загаварыў Януш, — а ты, Таміла, маўчы, нікому ні слова, а то вырву язык! Як ты думаеш, можна патрапіць унутр?

— Слугі могуць выгнаць ды яшчэ ў каршэнь надаюць.

— Няўжо не пусцяць жабрачку?

— Гэтага я не ведаю, — сказаў Таміла, — сам я ніколі ўнутр не заходзіў.

— Бо ты баязлівец.

— Я, князь? Я? Калі я паказаў сябе баязліўцам?

— Ды вось зараз, калі ты адгаворваў мяне ад адзінага спосабу ўбачыцца з князёўнай, а мне гэта дужа трэба.

— Дык я ж не за сябе баюся, а за вас.

— Ці за мяне, ці за сябе, хопіць таго, што ты баішся, — упікнуў князь. — Ідзі да збройніка. А раніцой прынясі мне жабрачыя лахманы!

## Паздзел 4

## КНЯЗЬ ЯНУШ У ПАЛАЦЫ ХАДКЕВІЧАЎ

Назаўтра позна ўвечары дзверы ў пакой князя Януша былі зачынены з сярэдзіны на засаўку, а сам ён у жабрачым адзенні сабраўся пранікнуць да князёўны. Смелы хлопец з агідай пазіраў на рызманы, якія дапамагаў яму надзяваць Таміла, і падсмейваўся над сабой.

— Вось бы смяяліся, напэўна, мае ворагі, — мармытаў ён, — калі б убачылі мяне ў гэтай апранасе, злавіўшы мяне. Але можна смела ісці ў заклад, што ім будзе вельмі цяжка здагадацца!

Князь надзеў бруднае плацце, на свае чорныя валасы накінуў хустку, чорную бародку таксама прыкрыў кавалкам нейкай палапленай тканіны. Потым Таміла падаў яму кій і навучыў, як трэба ісці, як горбіцца, якім голасам гаварыць. Яшчэ раз паўтарыў свае парады, як лепей пракрасціся да князёўны:

— Такой парой яна заўсёды адна ў сваім пакоі, таму што пані ахмістрыня якраз моліцца з жанчынамі. А Соф'я моліцца асобна і ў іншы час, таму што яна іншай веры. Вы ведаеце, дзе дзверы пакоя князёўны, але набярыцеся цярпення і памаліцеся перад ім і не ідзіце, пакуль не пераканаецеся, што ў калідоры нікога няма. Пакой ахмістрыні тут жа збоку, таму не раю гучна гаварыць. Стораж каля варот не любіць пускаць жабракоў у палац, мяне ён заўжды без літасці праганяў. Вам трэба ўлучыць момант і праціснуцца праз дзверцы тады, калі ён загледзіцца і не будзе бачыць. І не баўцеся там доўга, а як пойдзеце назад, папрасіце князёўну, каб яна загадала слузе адвесці вас да варот, інакш там могуць абшукаць, баючыся, што жабрачка што-небудзь украла. І ўсё тут жа раскрыецца.

Калі Таміла скончыў, князь ужо ўсё апрануў, надзеў торбу, прычапіў да пояса гаршчочак і пайшоў да дзвярэй.

— Пачакайце, пане, — крыкнуў Таміла, — спачатку трэба паглядзець, ці няма там каго на падворку, а то яшчэ трапіцца хто-небудзь на вочы дый пазнае вас у гэтых лахманах.

Ён выбег, паглядзеў, вярнуўся.

— Ідзіце, пане, з Богам, і дай вам Бог шчасце!

Князь выслізнуў з пакоя і шпарка збег па лесвіцы.

Таміла глянуў яму ўслед, падбег і даў яшчэ адну параду:

— Дзеля ўсяго святога, пане, не ідзіце так хутка і выпрастаўшыся! Так усе пазнаюць, што вы не той, за каго выдаеце сябе. Ісці трэба павольна, згорбіўшыся, апусціўшы долу вочы і галаву.

Князь Януш так і зрабіў. Ён выйшаў на вуліцу. Але тут жа забыўся пра ўсё, падняў галаву і пайшоў хутчэй. Калі яго зачапіў нехта з прахожых, ён ледзь не выдаў сябе, заўважыўшы асуджальны позірк, але ўрэшце ён пачаў адчуваць, што інакш апрануты, своечасова схамянуўся і пасунуўся далей, да камяніцы Хадкевічаў, болып павольна, пакорліва.

На дварэ ўжо змяркалася, стораж зноў прамаўляў малітву "Анёл Божы", у акне бледна свяціўся твар князёўны. Прытворная жабрачка ўзняла вочы ўгору і падалася да варот. Вартаўнік быў заняты малітвай і не заўважыў, як скрыпнула брамка і князь праслізнуў у камяніцу. Там

было ціха. Усе ў доме маліліся або паразыходзіліся па пакоях, пуста было і на лесвіцы. Князь азірнуўся і пайшоў да добра знаёмага яму пакоя. Але яго міжволі ахоплівала трывога, кожны гук, кожны рып дзвярэй, кожны трэск адгукаліся ў ім. Сэрца забілася мацней, калі ён падышоў да дзвярэй, тут ён спыніўся і пачаў мармытаць нешта пад нос, нібы молячыся.

Хвілінку пастаяў, але яму ніхто не адчыняў. Ён пачаў маліцца гучней, зазірнуў у пакой. Князёўна ўсё яшчэ стаяла каля акна. Каб звярнуць на сябе ўвагу, Януш прамовіў:

— Дзеля Бога літасцівага, падайце шэлег няшчаснай.

Соф'я шпарка павярнулася, глянула ў пакой і пайшла да дзвярэй.

— Навошта ты зайшоў? — сказала яна, думаючы, што гэта быў Таміла Таміловіч. — Ідзі! Ідзі назад, бо цябе зловяць і пазнаюць! Ідзі!

Тут Януш адхінуў з твару сваю хустку, якой закрываўся, і паказаўся ёй. Хаця ў пакоі быў паўзмрок, князёўна пазнала, а хутчэй адчула, хто ён, закрыла твар рукамі і ступіла колькі крокаў назад.

— Дык вы гэтак мяне вітаеце? — ціха прамовіў князь Януш.

— Навошта ты зайшоў? — загаварыла Соф'я. — Ідзі! Ідзі! За мной сочаць, віжуюць, убачаць цябе, і ты наробіш шкоды і сабе, і мне. Ідзі, князь, ідзі!

— Я так проста не пайду, — сказаў князь, — і не затым я прыйшоў, каб ні з чым пайсці. Я хачу пагаварыць з табой, князёўна, таму што твае лісты ўсё болей трывожаць мяне. Няўжо нашы ворагі так напалохалі і настроілі цябе, што ты выракаешся мяне?

— Тут не час і не месца гаварыць, — адказала Соф'я, — і няма калі тлумачыць. Я дала слова кашталяну, што не буду бачыцца з табой. Ідзі, князь, заклінаю цябе, ідзі хутчэй! Ідзі адсюль!

— Я не пайду, — адказаў Януш, — а застануся тут, хай сабе Хадкевічы і загадаюць выкінуць мяне за вароты. Мне трэба з табой пагаварыць, Соф'я. Я так даўно не бачыў цябе, хачу ўпэўніцца, што ты на мяне яшчэ не забылася, не забылася пра свае ранейшыя абяцанні.

— О, я ўсё памятаю, — усклікнула князёўна ўстрывожаным голасам, — але дзеля Бога літасцівага, дзеля

Святой Тройцы, дзеля ўсяго святога заклінаю цябе, ідзі адсюль, ідзі! Пазнаюць цябе, і тады, ты толькі падумай, князь, што будуць гаварыць пра цябе, пра мяне, як толькі ўбачаць цябе тут. Тады быць мне самай разняшчаснай, бо мяне запруць у манастыры, мяне акружаць вартай, я стану нявольніцай! Злітуйся нада мной, ідзі, ідзі!

Князь не адступаўся.

— Адно толькі слова, і я пайду, — сказаў ён. — Будзеш ты маёй, як была, Соф'я, ці не?

— Душой я заўжды твая, — адказала князёўна, — але тваёй ніколі не буду.

— Як гэта? Што гэта значыць?

— Я дала клятву і буду трымаць слова, дадзенае майму дзядзьку, кашталяну, што не буду думаць і спадзявацца. Не віні мяне, князь, не лай мяне, бо гэта не мая віна. Гэта зрабілі іншыя, і не ты, князь, а твой бацька.

— Мой бацька? Цябе, князёўна, ужо навучылі глядзець на нас як на ворагаў, але чым жа, дзеля ўсяго святога, вінаваты мой бацька? Тым, што напомніў Хадкевічам пра дадзенае імі слова, што паклікаў іх у суд, калі не захацелі стрымаць яго? Ці ёсць большая правіннасць, чым нежаданне трымаць слова, парушэнне абяцанняў? Яны ж ганебна разарвалі дамову.

— Нічога не кажы пра іх, князь, — упрошвала Соф'я, — я не буду гэтага слухаць, бо я павінна ім аддзячыць. Ідзі, ідзі! Можа, Бог усё пераменіць. Калі ўсё перайначыцца, калі ўсе прыйдуць да згоды, ты знойдзеш мяне такой, як была тады, калі мы ў дзяцінстве гулялі з табой у Брэсце!

Пры гэтых словах князёўну апанавалі ўспаміны пра даўнія дзіцячыя гады, яна міжволі задумалася і змоўкла, так жыва яны паўсталі перад яе вачыма.

— І гэта ўсё, што ты можаш сказаць мне, Соф'я?

— Толькі гэта я і магу сказаць, бо я не належу сабе, не магу зрабіць тое, што хачу сама, я нічога не магу, толькі плакаць і цярпець.

Князь Януш тупнуў нагой і горда выпрастаўся пад сваімі жабрацкімі лахманамі, паглядзеў на прыгожы бледны твар князёўны і ўзгарэўся гневам, успомніўшы свой цяперашні стан і тыя надзеі, якія ў яго яшчэ зусім нядаўна былі.

— Вось што яны зрабілі! — усклікнуў ён.

— Не яны, — старалася пераканаць князя Соф'я, — не яны зрабілі няшчаснымі нас абодвух. Навошта было злаваць іх, навошта было даводзіць да апошняй мяжы цярпення?

— Не маглі ж мы ўніжацца перад імі. Мы! Мы! — кіпяціўся Януш.

— Хіба нельга было зрабіць гэтага дзеля мяне?

— Ні для кога, нізавошта і ніколі! — горда прамовіў Януш.

Князёўна адступіла на колькі крокаў.

— Ідзі, — хвалявалася яна, — і так ужо ты тут стаіш надта доўга; зараз скончыцца малебен, людзі пойдуць па калідорах, могуць напаткаць цябе. Ідзі, ідзі, Богам прашу!

— Яшчэ адно слова, толькі слова, — прамовіў Януш, — мне так непрывычна гаварыць з табой крадком, рэдка бачыцца. О, даўней бывала не так! Соф'я, я вымушаны дабівацца цябе зброяй, вайной, ведай пра гэта! Калі табе будзе можна адным словам вырашыць гэтую справу, успомні пра наша дзяцінства, пра ўсё ранейшае. Дык ты зробіш гэта дзеля мяне? Калі цябе спытаюць, ці хочаш ты выйсці замуж за мяне, ты не прамаўчыш, не адштурхнеш мяне? Я магу спадзявацца на гэта? Соф'я!

Князь чакаў адказу. Соф'я моўчкі глядзела на яго.

— Некалькі месяцаў таму пра гэта ў мяне пытаўся кашталян, такія самыя пытанні задаваў, і я адказала яму, што я твая, што ніколі не адракуся ад цябе, але і паабяцала яму, што ніколі не буду тваёй без яго дазволу. Ён ведае мяне, ён не дапусціць, каб я стала паміж вамі, бо ўпэўнены, што, калі б не гэтая сварка, я не адраклася б ад цябе.

— Не адраклася б ад мяне! — усклікнуў Януш. — Дзякуй табе за гэтыя словы! Ты дала мне новыя сілы для барацьбы за цябе! Калі так, то я мушу настойваць на сваім, я даб'юся таго, што ты вырашыш усё сама, ты будзеш маёй! Так, так, — дадаў ён, — будзь спакойнай, дарэмна Хадкевічы ўпіраюцца, яны ўступяць нам, нідзе не дзенуцца, бо ім не па сіле раўняцца з намі. Калі б давялося разбурыць увесь горад і здабыць цябе, то мы яго разбурылі б, зруйнавалі, разнеслі па цаглінцы! Нічога не бойся, Соф'я, не губляй надзеі, калі ты за мяне, то мы дамажамся свайго. Ты будзеш маёй!

Калі князь дагаварыў, Соф'я нецярпліва павярнулася і дала яму знак ісці, але тут нечакана пачулася рыпенне

дзвярэй, і ледзь паспеў князь захінуць твар, як паказалася ахмістрыня ва ўсім сваім пярэстым уборы. Яна здзіўлена стала на парозе.

— Што такое? Хто гэта? Хто пасмеў увайсці сюды?

Князёўна хуценька падбегла да яе:

— Даражэнькая пані Влодская, не крычыце і не сварыцеся на мяне. Я хацела падаць гэтай беднай жанчыне міласціну і паклікала яе сюды з вуліцы. Што ў гэтым дрэннага?

— Што дрэннага? — усхапілася ахмістрыня. — Ды гэта ж чорт ведае што! Ці ж гэта добра, што вы водзіцеся з рознымі жабрачкамі? Што сказаў бы на гэта пан кашталян, калі б убачыў? Усе ведаюць, якія зладзейкі гэтыя жабрачкі.

— Але ж яна заўжды моліцца ў нашай царкве, я некалькі разоў бачыла яе, — адказала князёўна.

— Яна толькі разносіць па горадзе заразу і хваробы, — рэзка запярэчыла ахмістрыня, — яшчэ, крый божа, і табе паддасць якой трасцы! Прэч! Прэч! Я яе правучу, другі раз не асмеліцца цягацца па палацах!

— Дзеля ўсяго святога, пані Влодская, не рабіце гэтага, не рабіце! — закрычала князёўна. — Гэта нядобра, мне будзе сорамна, бо я сама запрасіла яе зайсці, і вы пакрыўдзіце яе, гэта падзейнічае на маё сумленне, дарагая пані. Не чапайце яе!

Потым яна павярнулася да князя:

— Ідзі сабе, ідзі, пачцівая жанчына. Ідзі, бог з табой, ідзі, чаго стаіш.

Князь пайшоў да дзвярэй, а Соф'я схапіла за руку ахмістрыню і зноў пачала ўгаворваць яе. Тая спрабавала вырвацца, хацела паклікаць слуг, каб яны скінулі жабрачку з лесвіцы. Тым часам князь збег з прыступак і паспяшаўся да варот, але неспадзявана яму насустрач трапіліся некалькі прыдворных, якія размаўлялі з вартаўнікам. Яны заступілі яму шлях. Князь хацеў праціснуцца між імі, але пабаяўся рызыкаваць, таму ён скурчыўся як мог і затаіўся ў цёмным кутку. Цемра ўсё болей ахутвала камяніцу, прыдворныя пагаварылі і пачалі разыходзіцца. Князь Януш падаўся да варот, але тут вартаўнік падсцярог яго і затрымаў.

— Чаму ты тут адна? Чаго прыходзіла? Зладзейка! — крыкнуў ён. — Гэй! Ёсць там хто? Цябе трэба абшукаць і добра адхвастаць! Як ты сюды трапіла? Як? — на ўсё горла крычаў вартаўнік, а на ягоны крык ужо беглі з другога боку людзі. Князь Януш адчуў, што можа папасціся, вырваўся ад вартаўніка і пабег да другіх варот, спадзеючыся, што іх яшчэ не зачынілі. Але яны былі ўжо замкнутыя і на засаўцы. Адтуль ён пабег уздоўж сцяны да стайняў, убачыў там нейкае сена, зашыўся ў яго і зноў стаіўся.

А вартаўнік усё крычаў: "Злодзей! Злодзей!"

На ягоны крык збегліся людзі.

— Дзе? Што? — пыталіся яны.

— Вось тут, тут быў, я трымаў яго за каршэнь, — крычаў вартаўнік, — але ён вырваўся і пабег вунь у той бок! Ліхтары нясіце! Ліхтары!

Пабеглі па ліхтары. Усё гэта князь Януш чуў і не ведаў, што яму рабіць. Ён намацаў кінжал пад лахманамі і ў трывозе чакаў, што будзе далей. У палацы пачалася мітусня, яго шукалі. Зазіралі ва ўсе куткі, шукалі на дварышчы і ў палацы, адчынялі дзверы. Галасы наблізіліся да стайні, але чамусьці тут шукаць злодзея ніхто не падумаў... Так прайшла доўгая гадзіна, урэшце вартаўнік замкнуў вароты і сказаў:

— Хай наступіць дзень, тады мы яго і знойдзем. Праз сцены ён не пераскочыць, калі ж дзе схаваўся, то я яго падпільную, калі адчыню вароты.

Пакуль усе разышліся, князь Януш чакаў у сене на стайні. Нарэшце ўсё сцішылася. Па часе, па крыках начных вартаўнікоў можна было меркаваць, што набліжалася поўнач. Князь не задумваўся над тым, як выйсці, бо ў яго, на шчасце, быў з сабой той самы ключ з адбітку на воску, які ён загадаў зрабіць Тамілу. Вось толькі ён забыўся, ад якіх ён дзверцаў. Але ён смела выйшаў са стайні і ў цемры пайшоў уздоўж сцяны да дзверцаў на вуліцу Савіч, выцягнуў засаўку, уставіў ключ, але ён не падыходзіў.

Князю трэба было прабрацца праз усё дварышча, каб знайсці другія дзверы. На шчасце, двор ён прайшоў незаўважаным. Але як толькі ён наблізіўся да патрэбных яму маленькіх дзверцаў, намацваючы іх у цемры, пачуў, што нехта

ідзе за ім. Ён спыніўся. Так, нехта таксама ішоў да дзверцаў. А князь тым часам ужо адамкнуў іх і збіраўся выйсці.

— Хто там? — пачулася з цемры.

Князь Януш успомніў, якім спосабам Таміла Таміловіч расстараўся гэты ключ, і адказаў:

— Свой, іду па віно для пана Барб'е.

— Што? — усклікнуў той, хто падышоў. — І вы? А хто вам даў ключ?

— Хто? А вам якая справа?

— Вось такая, — сказаў, наблізіўшыся, пан Брожак, а гэта быў ён, — бо і ў мяне ёсць ключ ад гэтых дзверцаў, мне яго даў пан Бурчак, і я таксама іду па віно для пана Барб'е.

Пакуль Брожак гаварыў гэта, князь ужо знік у цемры і пашыбаваў па вуліцы да свайго палаца. Там князя ўжо чакаў каля варот Таміла Таміловіч, устрывожаны, што яго доўга няма. Ён не ведаў, што рабіць, баяўся гневу ваяводы, непакоіўся, як бы той не даведаўся пра ўсё.

— Гэта вы! — закрычаў ён. — Дзякуй Богу! Я тут ужо некалькі гадзін трасуся ад страху.

— Я ж казаў, што ты баязлівец, Таміла Таміловіч, — адгукнуўся князь. — Каб ты пабыў на маім месцы і ў маёй скуры, калі мяне схапілі, як злодзея, то нябось памёр бы ад страху.

— Як злодзея! — усклікнуў Таміла. — І каго — вас!

— Гэта шчасце, што ў мяне быў з сабой твой ключ, Таміла, а іначай мне далі б добрую прачуханку! — расказваў Януш, заходзячы ў палац. — А так я выслізнуў з іх рук.

І са смехам дадаў:

— А твой прыдворны зноў пайшоў па віно, я якраз спаткаў яго каля дзверцаў са збанком. Калі ён спытаўся ў мяне, хто я такі, я адказаў, што іду па віно для пана Барб'е. Там будуць з гэтага дужа дзівіцца.

— Гэта нічога, — супакоіўся Таміла, — абы толькі вас ніхто не пазнаў, а што яны там будуць думаць, ліха з імі!

Ён адчыніў дзверы кардыналіі і правёў князя Януша да ягонага пакоя па другой лесвіцы.

## Паздзел 5

## ВОСТРАЯ БРАМА

Недалёка ад манастыра і царквы Святога Духа з аднаго боку, а з другога — ад гасціннага двара рускіх купцоў на Вострым канцы высіцца адна з пяці гарадскіх брам, змураваных за сто гадоў таму, калі страх перад татарамі прымусіў задумацца караля, ваяводу і біскупа Войцаха пра ўмацаванне і абарону горада ад нападу дзікіх паганцаў. Гэтая брама была надточана зубцамі і дзвюма вежамі, у якіх, калі прыгледзецца, можна заўважыць пустыя чорныя байніцы; мінулі гады страху, і гарматы зноў ляжалі і ржавелі ў гарадскім цэйхсгаузе. Цяжкія, дубовыя, абабітыя жалезнымі цвікамі вароты трымаліся на магутных завесах, зверху апускаліся густыя жалезныя краты, каб засланіць уваход. Навокал не было ніякіх жылых будынкаў, толькі з боку горада ў неглыбокай нішы можна было ўбачыць абраз Вастрабрамскай Маці Божай*, ахаваны пафарбаванымі аканіцамі, перад ім гарэла кволым агеньчыкам лампада. Абапал нішы ішла невялікая жалезная галерэя, да якой вернікі маглі падымацца па вузкай лесвіцы, што прымыкала да ўнутранай сцяны. Ужо ў тыя часы абраз Вастрабрамскай Божай Маці быў у вялікай пашане ў людзей, якія штодня маліліся тут, ішлі сюды са сваімі бедамі і горам. Але перад іконай не было алтара, і ў нішы гарэла толькі адна лампада, запаленая стараннямі вернікаў, а вузкая галерэйка, што вяла да іконы, магла змясціць толькі некалькі чалавек. Калі не хапала ахвяраванняў, магістрат паліў лампаду перад іконай за свой кошт, так ён стаў апекуном і ахоўнікам Вастрабрамскай Маці Божай, лагоднае аблічча якой са скрыжаванымі на грудзях рукамі ўзвышалася над галовамі гараджан і, здавалася, туліла да сябе пакрыўджаных і плакала над імі. Праходзячы пад брамай, гараджане і прыезджыя ў знак ушанавання здымалі перад іконай шапкі і капюшоны, а рускія купцы, стоячы ў дзвярах свайго гасціннага двара, ганялі габрэяў, якія праходзілі пад Вострай Брамай і не здымалі шапак, а таму габрэі рэдка, хіба што ноччу, адважваліся хадзіць там.

У браме сядзелі вартаўнік і гарадскі стражнік — яны бралі ў сялян, што прыязджалі на рынак, грошы з кожнага

воза, а таксама камяні, якія напачатку таксама давалі права на ўезд у горад.

Крыху воддаль ад брамы сядзелі некалькі гандлярак — адны прадавалі тое, што купляюць набожныя людзі: крыжыкі, абразкі, пярсцёнкі, ладанкі, а другія гандлявалі пернікамі. Яны часам яшчэ разносілі ласункі і гародніну ў кошыках па горадзе. Першыя з іх былі пераважна ўбогія жанчыны, якія саромеліся жабраваць, і такім спосабам зараблялі сабе на хлеб надзённы. Тыя, хто прадаваў ласункі і гародніну, былі найчасцей жыхаркамі прадмесця, яны хадзілі са сваім таварам па горадзе або сядзелі на зэдлях за драўлянымі сталамі, на якіх раскладваліся па місках і талерках ласункі, пернікі, макоўнікі і гародніну.

У гэты вечар яны ўжо збіраліся разыходзіцца, складвалі свой тавар, ужо і гарадскі стражнік тупаў у варотах, чакаючы хвіліны, калі можна будзе з чыстым сумленнем замкнуць іх і пайсці грэцца ў свой цёплы кут. Але раптам з боку горада здалёку на вуліцы пачуліся шпаркія крокі па бруку — гэта малады высокі мужчына з пустым збанком у руцэ подбегам кіраваўся да брамы. Ён быў нібы не ў сабе, нейкі дужа расхваляваны, і ўсе са здзіўленнем глядзелі на яго. Ён узабраўся па лесвіцы, што вяла да іконы, і ўпаў перад ёй на калені. Паставіў збан і, ні на кога не зважаючы, пачаў горача маліцца, нават плакаў, аж захліпаўся. Лампада мігцела перад іконай, а ён плакаў і маліўся.

— Гляньце, — звярнулася гандлярка Марыся да брамнага вартаўніка, — нейкі бедны маладзён моліцца перад нашай Маці Божай і плача! Відаць, нешта яго добра дапякло!

Стражнік выйшаў з варот, глянуў угору, паківаў галавой і сказаў:

— Горача ж ён моліцца, ці не чэрці за ім гналіся.

Старая гандлярка Іванова з Лукішак таксама павярнулася, важна выцерла без дапамогі фартуха свой нос, потым прамовіла:

— Нейкі небарака, відаць, прыдворны, бо добра апрануты. Можа, баіцца кары за нейкую правіннасць і просіць Маці Божую заступіцца.

А на галерэі, укленчыўшы, з плачам маліўся пан Брожак (гэта зноў быў ён).

— Цудатворная Маці Божая! — прамаўляў ён, узняўшы ўгору вочы і рукі. — Што ж я такога нарабіў, што мне трэба паміраць? Ды хіба мне пара паміраць?

— Гаворыць пра смерць! — ціха сказала Іванова Марысі. — Мусіць, нешта натварыў!

— Пра смерць? — пытаў зацікаўлены стражнік. — Значыць, трэба паведаміць у ратушу, можа, гэта нейкі разбойнік, яшчэ, чаго добрага, наложыць на сябе рукі. Узяць бы яго ды пасадзіць у турму, дапытаць, каб выдаў усё.

— Як бы ён сапраўды чаго не нарабіў! — дадала Іванова.

А пан Брожак усё маліўся:

— Цудатворная Маці Божая, абарані мяне ад смерці! Злітуйся над маёй маладосцю, я пачну жыць іначай, уступлю ў манастыр!

Стражнік прыслухаўся да малітвы Брожака.

— Гэта няйначай нейкі збеглы злачынца, — прашаптаў ён, — яго трэба злавіць, ён, відаць, вырваўся з турмы і цяпер хоча ўступіць у манастыр, каб яго не адшукалі.

Пакуль пан Брожак маліўся, а стражнік выдумляў тое, чаго не было, з другога боку ад Вострага прадмесця па Медніцкім гасцінцы да брамы пад'ехалі некалькі вершнікаў. Стражнік павярнуўся да іх, зацікаўлены. Было іх чалавек пятнаццаць, яны ехалі рыссю на дужых стаенніках і вельмі спяшаліся, бо баяліся, каб перад імі не зачынілі вароты. Як толькі яны ўбачылі стражніка, пачалі крычаць:

— Гэй! Стражнік! Не замыкай варот!

— А што такое? — спытаў стражнік, падносячы руку да шапкі, бо ўгадваў у вершніках прыдворных нейкага важнага пана.

— Зараз услед за намі прыедуць паслы яго каралеўскай вялікасці! Сенатары з Варшавы!

Стражнік пакланіўся, яны праехалі пад брамай, паздымалі шапкі перад іконай, а потым спыніліся на вуліцы, пазіраючы па баках.

Стражнік быў цікаўны, ён зняў шапку і з лагоднай мінай падышоў да вершнікаў:

— А ці нельга даведацца, што гэта за паны сенатары?

— А што табе з таго, калі ты нават даведаешся? — спытаў адзін з конных.

— Трэба ж разнесці навіну па горадзе, — усміхнуўся Другі.

— А што ж, простаму чалавеку нельга ўжо нічым пацікавіцца і нічога ведаць нельга? — спытаў стражнік з ліслівай усмешкай. — Кожнаму хочацца ведаць крышку больш, чым іншыя. А каб я прынёс навіну ў ратушу, то нешта атрымаў бы ад паноў-радцаў.

Коннікі на гэта нічога не адказалі, яны ўсё пазіралі на вароты, а тым часам да іх падышла гандлярка Марыся са сваім кошыкам і пачала частаваць іх ласункамі, да якіх яны аказаліся дужа ахвочымі, бо ўзяліся таргавацца адзін перад адным.

Удзячная гараджанка, усміхаючыся сенатарскім прыдворным, пачала пакрысе распытваць іх. Калі пытаецца мужчына — адно, калі жанчына — зусім іншае. Ды яшчэ калі жанчына маладая і прыгожая, як тут прыдворным не развязаць языкі. Так яно і здарылася.

Гандлярка, паправіўшы сваю чорную грыўку і зірнуўшы на іх блакітнымі вачыма, спыталася:

— І многа іх, гэтых паслоў? Куды яны едуць?

— Сюды едуць, — адказаў прыгожай паненцы бліжэйшы коннік, хаваючы пернікі ў кішэню кафтана. — Едуць у Вільню, адмыслова да вас, да пана ваяводы і пана кашталяна, каб памірыць іх і не дапусціць вайны паміж імі.

— А! Дзякуй богу! — усклікнула гараджанка. — Значыць, вайны не будзе?

— Напэўна, не будзе, — супакоіў яе другі.

— І ў горадзе будзе спакойна! Хвала табе, Божа! — узрадаваўся стражнік.

— А хто яны, гэтыя сенатары? — працягвала выпытваць гандлярка.

— Ксёндз, біскуп жмудскі, — сказаў адзін з коннікаў, — мой пан.

— Віцебскі ваявода, — азваўся другі.

— Літоўскі маршалак, — дадаў трэці.

— І пан падскарбій, — завяршыў першы. — Але ціха! Прэч з дарогі! Яны ўжо едуць!

Толькі ён сказаў гэта, як на вуліцы прадмесця паказаўся доўгі картэж і пачаў набліжацца да брамы. Калі ён уехаў у браму, усе саступілі набок і моўчкі глядзелі. Паўз іх праехалі шыкоўныя каляскі, вершнікі, сярод іх

прыдворныя і слугі, а ззаду ехалі вялікія вазы, накрытыя шкурамі, — на іх везлі паклажу і харч. Два сенатары ехалі конна, іх можна было пазнаць па багатым убранні і важных тварах; двое ехалі ў калясках. Картэж мінуў браму і паўз ратушу рушыў да замка.

Пакуль усё гэта адбывалася, пан Брожак маліўся на галерэі, калі ж памаліўся, падабраў збан і ў глыбокім задуменні паволі падаўся назад. Ён бачыў, як праехалі сенатары, таму спяшаўся дадому з важнай навіной. Малітва крыху супакоіла хлопца, таму ён спачатку напоўніў збан у Мальхера, а потым, схаваўшы яго пад крысо, падаўся ў палац Хадкевіча. Прайшоў па дварышчы, узбег па лесвіцы, а там яго ўжо даўно чакалі Барб'е, Станіслаў, Бурчак і яшчэ некалькі паноў.

— Дзе ты столькі часу бадзяўся, пане Брожак? — спытаўся француз, забіраючы з ягоных рук збан. — Мы ж цябе не так далёка пасылалі. Цябе, як тут кажуць, толькі па смерць пасылаць, а не па віно.

— Якраз смерць я сабе і выхадзіў, — сказаў Брожак невясёлым голасам.

— Што? — аж спалохаўся Барб'е. — Што ты сказаў? Якая смерць? Ты з учарашняга дня нейкі як у ваду апушчаны.

— Гэта ўчора і сталася, — пацвердзіў Брожак.

— І што ж учора сталася? — пачалі распытваць у яго.

— Навошта гаварыць?

— Ну, ты ўсё ж раскажы нам, у чым справа, — настойваў француз, — а то я заўважыў яшчэ ўчора, што ты вярнуўся нібы з крыжа зняты і нічога нікому не сказаў. Што з табой здарылася? Можа, гэта ўсё ж не таямніца? Што ты ўсё заладзіў пра нейкую смерць?

— Мне пара паміраць! — бубнеў сваё Брожак.

— Чаму гэта? Што з табой, расказвай хутчэй! — пачалі пытацца ў яго ўсе астатнія. — Што здарылася? Табе нехта пагражаў ці што яшчэ?

— Каб жа толькі пагражаў! Тут іншае...

— Дык што?

— Было ўсё так, — неахвотна пачаў нарэшце Брожак. — Учора вы паслалі мяне па віно, было позна, думаю, што ўжо добра за поўнач, а гэта самая пара для духаў і прывідаў.

— І што табе здалося? — спытаў француз. — Дзе ты ўбачыў нейкі прывід?

— Я падышоў да дзверцаў у камяніцы, каб адчыніць іх, як раптам убачыў...

— Што ўбачыў?

— Другога такога ж пасланца, як я, з ключом і збанком. Ён ішоў перада мной. Я спытаў: "Хто там?" А ён мне моцным такім голасам адказвае: "Іду па віно для пана Барб'е". Я не спужаўся яшчэ і кажу: "Гэта я іду па віно". "І я", — адказаў дух і адчыніў дзверцы.

— Дзверцы! Адчыніў! — крыкнуў пан Бурчак. — Чым жа ён іх адчыніў, калі ключ быў у вашай мосці?

— Гэта быў дух, — адказаў Брожак. — Я ж сам бачыў: адчыніў, выйшаў перада мной і знік.

Усе, хто слухаў, аслупянелі.

— Можа, табе гэта саснілася? — усумніўся Барб'е.

— Каб жа саснілася! — ледзь не плачучы, адказаў Брожак. — Але гэта святая праўда, магу прысягнуць! Я яшчэ ўчора дзеля гэтага хадзіў распытваць разумных людзей і старых жанчын, яны і сказалі мне, што гэта быў дух, які прадракае маю смерць, прычым яе не пазбегнуць, хіба толькі ўступіць у манастыр.

— Лухта! — адрэзаў Барб'е. — Усё гэта табе здалося. Такога не можа быць!

— Калі кажу, значыць, было, — не адступаўся ад свайго Брожак. — Я ж не сляпы, там было адчынена, потым я сам замкнуў, хоць і не адмыкаў. Хоць і цёмна было, але я згледзеў, што гэта быў акурат *alter ego* — другі я — ну проста выліты!

— Яму ўдарыла ў галаў віно, — запэўніў Барб'е. — Давайце вып'ем!

Ён напоўніў кубкі, а потым зноў звярнуўся да Брожака:

— Скажы мне, хіба ты ў той час ужо не быў п'яны?

— Клянуся Святой Тройцай, што нават і не нюхаў! — запэўніў Брожак, малітоўна склаўшы рукі. — Быў я такі цвярозы, як і зараз, бачыў усё на свае вочы.

— Дзіўная рэч, — перапыніў яго пан Бурчак. — Але самае дзіўнае, як ён адчыніў дзверцы без ключа. Ключ жа быў толькі ў вашай мосці.

— Як на споведзі кажу, так і было: адчыніў і на маіх вачах выйшаў.

Усе змоўклі.

— А дзе ты сёння так доўга цягаўся? — спытаў Барб'е. — Гэта ж было ўчора.

— Хадзіў маліцца, — сумна адказаў Брожак, — маліўся Маці Божай у Вострай Браме, прасіў, каб абараніла мяне. І якраз убачыў там, як прыехалі сенатары.

— Якія сенатары?

— Ад караля, пасланыя да кашталяна і ваяводы, каб памірыць іх.

— Прыехалі?! — здзіўлена ўсклікнуў Барб'е.

— Толькі што.

— Чаму ж ты маўчаў? Трэба бегчы сказаць кашталяну, — вырашыў Барб'е. Ён паставіў збан, схапіў плашч і шпагу. — Дайце мне ключ, — папрасіў ён Бурчака, — я хутка вярнуся.

І подбегам рушыў у кашталянію.

## Паздзел 6

## АЙЦЫ ЕЗУІТЫ

Сенатары, пасланыя каралём, прыехалі ў Вільню 30 студзеня 1600 года. А перад гэтым увесь час толькі і гаворкі было пра чуткі, што войска Радзівілаў вялікімі атрадамі падцягваецца да Вільні, ідзе з усіх бакоў, збіраецца разам. Прыхільнікі ваяводы не ўтойвалі ні яго кольkасці, ні таго, хто яго прыслаў. Ды і каталікі расказвалі цікаўным, што Ян Караль, жмудскі стараста, ідзе з некалькімі тысячамі войска і з дзесяткам гармат у Вільню, дні праз чатыры ўжо будзе ў горадзе. Абодва бакі ў маўчанні і знешне абыякава рыхтаваліся сустрэцца і вырашыць справу зброяй, абодва бакі паўтаралі: "Мы яшчэ пабачым!"

Тым часам па горадзе разнеслася ўжо іншая вестка — пра прыезд сенатараў. Усе лічылі, што гэта важная падзея, ад якой будзе многае залежаць. Кожны па-свойму тлумачыў іх пасольства, дадзеныя ім даручэнні; некаторыя лічылі, што па загаду караля вайна будзе ўвогуле забаронена, а ворагаў прымусяць памірыцца. Іншыя ж, хто

глядзеў далей, бачылі ў сенатарах толькі дарадцаў, якія нічога не даб'юцца, не маюць такой сілы, каб скончыць гэтую справу. Усе з нецярплівасцю чакалі, што будзе далей, на сенатараў спадзяваліся, пра іх думалі ва ўсёй дзяржаве. Што б ні здарылася, а заўсёды цікава паглядзець, як будзе ўспрынята пасрэдніцтва караля, да якіх вынікаў яно прывядзе. Шапталі адзін аднаму на вуха: "Сенатары прыехалі!" Адзін аднаму пераказвалі, як прынялі пасланцоў, самыя смелыя рабілі высновы, астатнія бачылі ў гэтым знак згоды, вестку аб прымірэнні.

Ледзь толькі сенатары мінулі Вострую Браму і раз'ехаліся ў горадзе па дамах і палацах сваіх родных ці сяброў, а таксама па гасцінных дварах, а ўжо ўсе ў горадзе ведалі пра іх. Пан Барб'е пабег паведаміць навіну кашталяну, Таміла Таміловіч — ваяводу, езуіцкі братчык асцярожна ўвайшоў з паведамленнем у келлю рэктара, дзе айцец Гарсія Алабянус ціха размаўляў з Янам Брандтам.

Айцы змоўклі, калі пачулі ягоныя крокі, і павярнуліся да яго. Братчык малітоўна склаў рукі на грудзях, апусціў галаву і вочы, тройчы пакланіўся, пацалаваў руку рэктару і толькі тады ціха прамовіў:

— Прыбылі сенатары ад караля.

— Калі? — удакладніў рэктар.

— Толькі што.

— Добра, — адгукнуўся айцец Гарсія і знакам загадаў братчыку выйсці.

Той зноў тройчы пакланіўся, адступіў на колькі крокаў, павярнуўся і выйшаў. Айцы засталіся сам-насам.

Ледзь толькі зачыніліся дзверы, Гарсія ўстаў і, пазіраючы на сцены келлі, звярнуўся да Яна Брандта:

— А цяпер да справы, ойча. Я ўжо гаварыў вам, паўтараць не патрэбна, што мір ерэтыкоў з нашымі — гэта смерць для нас. Лепш было б выбраць вайну, у ёй мы, па нашых разліках, можам спадзявацца на згубу нававерцаў. Трэба зважаць і на тое, што вайна распаліць злосць, прымусіць ненавідзець тых, каго збліжаюць фамільнае радство, еднасць становішча, сяброўскія сувязі. Калі ж яны памірацца, калі Хадкевічы пададуць руку Радзівілам і ерэтыкам, то яны падпарадкуюць сабе і нас, а значыць, стане цяжка нам самім. Тут трэба рабіць усё, прычым з усіх сіл — праз рэлігію, праз ордэн, каб сенатары іх *не па-*

*мірылі.* Нам выгадней, каб доўжыліся і пашыраліся толькі сваркі і звады.

— У гэтым няма ніякага сумнення, — згадзіўся Брандт. — Я магу засведчыць, што Хадкевічы далёкія ад таго, каб мірыцца.

— Далёкія! Вы так думаеце, ойча? — спытаў рэктар. — А вось я думаю іначай. Я апасаюся лістоў караля, яго загаду, баюся, што Хадкевічы, зважаючы на ўсе намаганні ерэтыкоў, іх моц, пабаяцца ваяваць, пойдуць на прымірэнне.

— Нікога яны не баяцца, я гэта ведаю. Асабліва Ян Караль, — даводзіў Брандт, — ён разлічвае толькі на адпор і не згодны на іншае.

— Наша задача цяпер, — развіваў сваю думку рэктар, — падтрымліваць іх нязгоду, раздзьмухваць агонь, бо мір паміж імі, я гэта казаў ужо і зноў кажу вам, нашле вайну на нас саміх, забярэ ў нас моцных прыхільнікаў, мір прынясе спакой у іхнія помыслы, для іх спакой небяспечны, таму трэба трымаць іх у пастаяннай нянавісці да ерэтыкоў. Нам трэба не дапусціць ні сутыкнення, ні міру, бо нам непажаданая і сутычка. Хто ведае, на чыім баку акажацца перамога і ці не прывядзе яна пераможцу да адчування сваёй сілы, і ўвогуле могуць быць самыя непрадказальныя наступствы. Таму трэба рабіць так, каб не даць ім памірыцца і не дапусціць да сутычкі. Вы згодны са мной, ойча?

— Цалкам, — адказаў Брандт. — Я думаю гэтак жа, як і вы.

— Пастарайцеся спачатку дамагчыся першага, — раіў рэктар, — а дзеля гэтага паспрабуйце падрыхтаваць паноў Хадкевічаў да таго, каб не прымалі ніякай згоды, лічылі яе абразлівай. Скажыце ім, што кароль не мае права ўмешвацца ў прыватныя спрэчкі, што Радзівілы прагнуць міру, яны пакажуць сваю слабасць, калі пададуць руку. Хай смела стаяць на сваім і будуць упэўненыя, што мы дапаможам ім, бо ўсе католікі з імі і з намі.

— Я ўсё гэта скажу ім, — запэўніў Брандт, — а яшчэ дадам вось што. Я ведаю Хадкевічаў, ім непрыемна, што Радзівілы мацнейшыя, яны недаацэньваюць іх. Я паспрабую падагрэць гэтыя думкі, паспрабую даказаць ім, што прымірэнне прынізіць іх, што вайны няма чаго баяцца. Вось якраз князь-ваявода нядаўна пасылаў да іх канцлера Сапегу і іншых паноў з пасольствам. А гэта значыць,

скажу я ім, што іх баяцца. Яшчэ я разлічваю на вялікую абразу кашталяна за той дэкрэт, які закрануў яго за жывое.

— Было б нядрэнна, — сказаў рэктар, — неяк дастацца перш за ўсё да сенатараў, якія прыехалі. Я неаднойчы заўважаў, што той, хто не спадзяецца дасягнуць нейкага выніку, не так стараецца, не мае надзеі на поспех. Было б добра, каб сенатары адразу адчулі, што ў іх таксама мала надзеі што-небудзь змяніць у гэтай прыкрай сітуацыі. Яны менш стараліся б, не бралі б усёй гэтай гісторыі дужа да сэрца.

— Трэба перш за ўсё праведаць жмудскага біскупа, мне здаецца, ён самы слабы з іх, і да яго будзе лягчэй падступіцца. А потым было б няблага праз каго-небудзь пазнаёміцца і з панамі Завішамі, — прапанаваў Брандт.

— Знойдзем, праз каго, і паспеем у час, а ты, ойча, думай перш за ўсё пра Хадкевічаў, не дай ім прыйсці да згоды, — перапыніў яго рэктар. — Я вазьму на сябе жмудскага біскупа і іншых, паспрабую знайсці да іх сцежку. А вы займіцеся Хадкевічамі.

— З ахвотай, — адказаў Брандт.

— У мяне ёсць чалавек, — павольна працягваў рэктар, — які загадзя яшчэ і гордасць Радзівілаў падагрэе, каб і яны не адступаліся ад свайго намеру. Бо, паўтараю, мір для нас страшней, ён згубны для нашай веры. Пара ўжо ваяваць, вайной мы крыху прыціснем ерэтыкоў, вайной і даб'ём іх. Нас стане больш, мы будзем мець вялікі ўплыў. Яны могуць крычаць, утвараць канфедэрацыі, але што ім дапаможа, калі кожны з іх, як *exul* — нарыў — у краіне, чужы ёй.

— Адно палохае мяне, — ціха азваўся Брандт, — становішча кашталяна, які ва ўсім залежыць ад Радзівіла з-за гэтага несправядлівага суда...

Рэктар не даў закончыць, перапыніў яго:

— А навошта ж тады Ян Караль і Аляксандр? Яны не дадуць яму памірыцца. Вы толькі старайцеся ўвесці яму ў вушы, нібыта ім будуць пагарджаць, калі ён надумае памірыцца, і што згода з ерэтыкамі — рэч немагчымая і шкодная, што нават жаніцьба князя Януша паводле законаў, не толькі дзяржаўных, але і рэлігійных, немагчымая...

— Пра ўсё гэта кашталян ведае, я ўжо яму вушы прадудзеў, на прымірэнне ён не пойдзе. Але ж бывае, што ў любога чалавека можа стацца нейкі паварот у думках...

— Калі вы адчуеце, што такі паварот блізка, што ён схіляецца да яго, будзе самы час нагадаць яму пра ўсё, што ён перанёс і выцерпеў ад Радзівілаў, і нарэшце...

— Нарэшце?

— У самым канцы, — ціха сказаў езуіт, нахіліўшыся да Брандта, — можна яму намякнуць на тое, што ён знойдзе сяброў, якія дапамогуць яму так выйсці са становішча, што ягоны гонар не будзе абражаны.

— А што мне сказаць? — спытаў Брандт. — Патрэбны вялікія грошы.

— Зразумейце мяне, — ціха шаптаў рэктар, — раз і назаўжды: калі ордэн будзе ўпэўнены ў згодзе і канчатковым поспеху і спатрэбіцца нейкае ахвяраванне, то кашталян можа *indirecte* — патаемна — узяць грошы і даць распіску. Апрача таго, такі крок можа зрабіць уражанне і на іншых.

— Разумею, — прамовіў Брандт.

— Гэта такая справа, пра якую не трэба было б ведаць усім, ойча. На завяршэнне, ды і то здалёку, асцярожна, бо не трэба апераджаць час, гаварыць, ад каго гэта зыходзіць, а рабіць усё праз другія рукі — можна паспрабаваць.

Брандт устаў з крэсла і кіўнуў галавой.

— Хопіць, хопіць, — сказаў ён, — я так думаю, што ў гэтым не будзе патрэбы.

— І я хачу таго самага і спадзяюся, што абыдзецца без вялікіх ахвяраванняў.

— Зараз жа іду да кашталяна, — дадаў Брандт.

— Хай Бог дапаможа вам, — прамовіў айцец Гарсія, ведучы яго да дзвярэй. — Як праведаеце яго, зайдзіце да мяне і раскажыце, што вам удалося.

З тым і падаўся айцец Ян Брандт з рэктарскай келлі, прайшоў па калідоры і пакрочыў па вуліцы каля касцёла Святога Яна.

Пачынаў насоўвацца змрок, калі слугі Радзівілаў, што стаялі каля варот кардыналіі, насупраць архіпрэсвітэрыянскага касцёла, заўважылі чорную езуіцкую сутану, якая рухалася ўздоўж белай касцельнай сцяны. Слугі пачалі кідаць жарты, вострыя слоўцы, пацвельвацца. Езуіт нават не павярнуў галавы, упэўнена ішоў далей, аж пакуль не павярнуў на Замкавую вуліцу, дзе да яго ўжо не даляталі іхнія галасы, і ён спакойна дайшоў да жытла кашталяна.

Але Ян Брандт завітаў да кашталяна не ў пару. Якраз быў час вячэрняй малітвы. Набожны стары маліўся, ходзячы па вялікім пакоі з ружанцам і кнігай, апраўленай у скуру, з вялікімі сярэбранымі зашчапкамі. Езуіт доўга стукаўся, пакуль яго ўпусцілі. Кашталян перастаў маліцца, пеpажагнаўся, паклаў ружанец і кнігу, загадаў падаць ксяндзу крэсла і сам сеў насупраць яго.

— Ну што чуваць, ойча? — спытаў ён. — Напэўна, нічога новага?

— Не зусім так, — адказаў Брандт. — Ёсць навіна, і дужа важная.

— Што такое? І каго датычыць асабіста?

— Вас, пане кашталян, больш, чым каго іншага, — ціха прамовіў езуіт.

— Чаму? Што такое?

— Прыехалі сенатары, пасланыя каралём, для таго каб устанавіць тут мір.

— Прыехалі... — з відавочнай занепакоенасцю прамовіў кашталян.

— Толькі што. Гадзіну таму. Вы, напэўна, ужо чулі пра гэта.

— Так, я ведаю пра іхні прыезд і, можа, нават пра тое, аб чым просіць нас у сваіх лістах яго вялікасць кароль, — адказаў кашталян.

— Дзякуй Богу, можа, іх візіт прынясе доўгачаканае прымірэнне.

Кашталян падазрона паглядзеў у вочы езуіту і нічога не адказаў.

— Згода — заўжды рэч жаданая, — дадаў айцец Ян, — а тым болей паміж жыхарамі адной краіны, славутымі людзьмі, непаразуменні паміж якімі могуць быць дужа шкоднымі для ўсіх.

— Напэўна, так, — адказаў кашталян, — але я вам шчыра скажу, ойча, што не дужа я веру ў гэтае прымірэнне.

— А чаму? — з добра разыграным здзіўленнем усклікнуў езуіт. — Вы не верыце, што яно адбудзецца?

— Я вельмі сумняваюся ў гэтым.

— Вось яно што! — Езуіт зноў разыграў, нібы на сцэне, здзіўленне.

— Пра гэта можна было б доўга гаварыць, — працягваў кашталян, — але навошта, вы ўсё ведаеце і так, ведаеце, што нас абразілі, што...

— Пра абразу я ведаю, — перапыніў яго езуіт. — Яны і цяпер яшчэ штодня памнажаюць яе і словамі, і пагрозамі.

— А потым, — дадаў кашталян, — нават калі Радзівіл згодзіцца з *нашымі* ўмовамі, мы ад свайго не адступімся.

Езуіт з цікаўнасцю глянуў у вочы кашталяну, нібы пра нешта хацеў спытаць, але знайшоў у іх толькі пацвярджэнне сказанаму і супакоіўся.

— Мусібыць, так, — згадзіўся ён. — Я сам не вельмі спадзяваўся, што з гэтага будзе толк. З ерэтыкамі згода можа быць нават небяспечнай.

— Сапраўды, — адгукнуўся кашталян, — я мог бы дзеля згоды ўспомніць пра сяброўскія сувязі, але як каталік я іх баюся, бо хворы на заразу небяспечны, ён сам можа заразіць іншых.

— Святая праўда, — пацвердзіў езуіт і набожна ўзняў вочы ўгору. — Аднак жа павага да караля, угаворы сенатараў таксама могуць нешта значыць, — дадаў ён, яшчэ раз спрабуючы пераканацца ў цвёрдых намерах кашталяна.

— Нічога ў іх не выйдзе, — жвава адказаў кашталян, — з намі ў іх нічога не выйдзе. Мы паважаем яго каралеўскую вялікасць, але тое, што датычыць гонару і сямейных адносін, нельга вырашыць загадам. Гэта ж не сварка паміж дзецьмі, якім бацькі загадваюць пацалавацца і памірыцца. У нас гэтая недаравальная абраза глыбока застрэмілася ў сэрцах.

— Сапраўды, цяжка слухаць пра такое і жыць у такі час! — сказаў езуіт. — І да гэтага дайшло з-за адной вялікай памылкі Жыгімонта Аўгуста, які даў волю людзям розных веравызнанняў і розным верам. Яны ўгнездзіліся ў нашай краіне. Ён быў павінен, як некалі Ягайла, трымаць іх у страху. Вось ён, вынік адной хвіліны папушчэння...

— Праўду кажаце, ойча, — у задуменні прамовіў кашталян, — усё пайшло ад таго, што мы не адной веры. Паны Радзівілы не асмеліліся б пайсці на гэты шлюб, не маглі б учыніць таго, што ўчынілі, каб нас яднала адзінства веры. І згода была б, і лепшае паразуменне з іх боку. А цяпер уся краіна падзялілася, і шляхта, і панства, а ці ж

гэта добра? Ці можна радавацца дзвюм партыям у краіне і варожасці паміж братамі?

— Што тут скажаш, — падтрымаў яго езуіт, — хіба з ерэтыкамі можна жыць мірна і дружна? Ды ніколі, аж пакуль яны не пяройдуць у нашу веру. Браты-то яны браты, гэта так, але ж у цемры жывуць і да цемры цягнуцца. Ці ж можна чакаць ад іх добрых спраў?

— Пашлю я да паноў сенатараў майго прыдворнага з паклонам ад мяне, — падумаўшы хвіліну, сказаў кашталян.

Ён пазваніў. Увайшоў старшы слуга, атрымаў загад, і тут жа адзін з прыдворных паехаў у горад да сенатараў.

— Толькі не падумайце, — звярнуўся ён да езуіта, — што гэта азначае падрыхтоўку да прымірэння. Так патрабуе ветлівасць, а чаго патрабуюць сумленне і гонар, тое яшчэ ўбачыце.

Яны гутарылі яшчэ з паўгадзіны, і толькі позні час прымусіў айца Брандта развітацца, да таго ж і касцельныя вароты павінны былі вось-вось замкнуць.

Вярнуўшыся ў манастыр, ён падаўся наўпрост да келлі рэктара.

— Пахвалёны Ісус Хрыстос!

— На векі вякоў! Што чуваць?

— Кашталян не хоча ніякага міру.

— Цудоўна! А я раніцой сустракаюся са жмудскім біскупам! Дабранач, ойча! Зайдзіце да мяне заўтра раніцой — нам патрэбна параіцца.

## Паздзел 7

## ПАСЛЫ ЯГО ВЯЛІКАСЦІ КАРАЛЯ

А цяпер вернемся да каралеўскіх паслоў і пазнаёмімся з імі бліжэй: хто яны такія, чаму яны мелі самы значны ўплыў у тыя змрочныя часы.

Узначальваў пасольства ксёндз Мельхіор Гедройц, жмудскі біскуп, дасведчаны чалавек, лагоднага характару, спакойны, ён гэтак жа, як і Леў Сапега, найлепш падыходзіў на ролю пасрэдніка. Ён ужо неаднойчы прымаў удзел у падобных падзеях, заўжды выходзіў пераможцам

у складаных спрэчках. Цяпер, пасля смерці Жыгімонта Аўгуста ў 1574 годзе, ён быў яшчэ і віленскім кафедральным кусташам (захавальнікам), ездзіў у складзе пасольства ў Францыю, да Генрыха*. Генрых параіў ягоную кандыдатуру Папе на жмудскае біскупства, і Гедройц быў прызначаны біскупам, прыязна прыняты дзякуючы ўстаноўчаму лісту Папы. У яго быў сапернік, нейкі ваяводскі пробашч Гераноўскі, які таксама заручаўся падтрымкай і хацеў заняць гэтую пасаду, але ён быў нетутэйшым, абапіраўся толькі на здабытае хітрасцю заступніцтва каралеўскага пасла. Аднак ён страціў надзею на біскупства, а ксёндз Гедройц, наадварот, сцвердзіўся на гэтай пасадзе. Потым біскуп неаднаразова выконваў розныя даручэнні, у 1580 годзе прымаў удзел у віленскім фіскальным трыбунале, а ў 1600-м пасланы пасрэднікам у справе Радзівілаў і Хадкевічаў. Ён быў набожны, вельмі сімпатызаваў ордэну езуітаў, быў пад іх уплывам. Лёгка зразумець, якую ролю ён быў прызначаны сыграць тут і каму спрыяў.

Вялікі літоўскі маршалак Дарагастайскі*, нашчадак Манівідаў, зноў жа, стольнік, надворны маршалак, ваўкавыскі, мсцібоўскі, шарашоўскі стараста, мужны ваяр, фехтавальшчык і славуты знаўца конегадоўлі; быў у сваяцтве з Радзівіламі і Хадкевічамі, відаць, таму і выбраны каралём для пасрэдніцтва між імі. Дарагастайскі быў жанаты на Соф'і, дачцэ навагрудскага ваяводы Мікалая Радзівіла, удаве жмудскага старасты Юрыя Хадкевіча. Гэта давала яму магчымасць як родзічу бываць у абодвух дамах. Але, папраўдзе, роля пасрэдніка — не ягоная роля, бо па натуры ён быў хутчэй салдат. Адкрыты, задзірысты, захоплены ваеннай справай і коньмі, кнігамі і паляваннем, ён адчуваў сябе вальней там, дзе патрабаваліся адвага і мужнасць, чым там, дзе аддавалася перавага разважлівасці і хітрасці. А ў ролі пасрэдніка ён аказаўся, як мы ўжо згадвалі, дзякуючы сваім сямейным сувязям, якія лучылі яго з абодвума бакамі. У рэлігійных і філасофскіх матэрыях ён зусім не разбіраўся, у душы быў прыхільнікам рэфарматараў.

Ян Завіша раней быў мсціслаўскім, потым стаў віцебскім ваяводам. Заўзяты каталік, спрытны і вопытны чалавек, усё жыццё ён выконваў розныя даручэнні: то вызначаў памежжа Курляндыі і Брачыслаўскай зямлі, то

выбіраў зручныя месцы для памежных крэпасцей, то быў у ролі пасла, то яшчэ нешта рабіў.

Ён выдатна ведаў людзей і жыццё, мог вырашыць, дзе і як трэба было дзейнічаць, умеў скарыстоўваць людскія слабасці, спагадаў ім, калі было патрэбна.

Ягоны брат, літоўскі падскарбій Андрэй, таксама быў заўзяты каталік і таксама спрытны і вопытны. На іх абодвух і ўскладалася асаблівая надзея, менавіта яны павінны былі дамагчыся паспяховага выніку пасольства; Дарагастайскі быў дадзены ім толькі для суправаджэння, Гедройц — для вагі. Тым больш што ні першы з іх, ні другі не маглі як след дапамагчы ў гэтай справе, проста не здолелі б. Усё залежала ад Завішаў, а біскуп і маршалак хоць і прыехалі, але карысці з іх было мала.

Жмудскі біскуп у Вільні спыніўся ў сваім палацы каля замка, Дарагастайскі заняў памяшканне ў кардыналіі — яно было загадзя падрыхтавана для яго, а Завішы пасяліліся ў сваіх камяніцах на Бакшце.

Назаўтра з самага рання ад паслоў і да паслоў пачалі ўчашчаць пешыя і конныя наведвальнікі, па вуліцах туды-сюды снавалі экіпажы і пешыя працэсіі. Ішлі прывітаць, павіншаваць, параіцца, але пра галоўную справу пакуль яшчэ ніхто не загаворваў. Перш за ўсіх пастараўся трапіць да біскупа айцец Гарсія Алабянус, ён спяшаўся апярэдзіць усіх іншых. Рэктар хацеў, каб яго ніхто не ўбачыў, хаця цікаўнаму ён мог бы лёгка растлумачыць свой візіт вядомай усім прыхільнасцю біскупа да іх ордэна ды справамі, якія хацелі вырашыць з ім езуіты.

Але рэктар ужо не застаў біскупа дома — набожны старац падаўся на імшу ў кафедральны касцёл, які быў зусім недалёка. Пайшоў туды і рэктар, каб першаму прывітаць яго, калі будзе выходзіць, але сустрэў яго ўжо на парозе.

Біскуп быў зусім сівым старым, гадоў пад восемдзесят, але яшчэ даволі рухавы і чырванатвары — здаровы румянец толькі ярчэй выдзяляўся ў абрамленні сівых валасоў. Гады не гнялі яго, праўда, твар быў зморшчаны ды постаць трохі сутулаватая. Шэрыя вочы з-пад навіслых броваў яшчэ палалі агнём нерастрачанай маладосці, румяныя вусны лагодна ўсміхаліся; на твары чыталіся толькі зычлі-

васць і дабрыня душы. Яго вялі пад рукі два жмудскія канонікі, ззаду вікарый нёс трэбнік і службоўнік. Рэктар павітаўся з ім і са святарамі, потым моўчкі праводзіў яго дадому.

Толькі тут, калі ксёндз сеў у сваё крэсла, а святары выйшлі, завязалася шчырая размова.

— Святы айцец, — пачаў рэктар, — вы прыбылі сюды на чале хрысціянскай місіі, з пасрэдніцкім пасольствам, з аліўкавай галінкай. О, як яна патрэбна нам, спакутаваным прадчуваннем вайны, як горача мы яе вітаем!

— Хто ж не жадае міру і згоды, — адказаў біскуп, — абы толькі мы да іх прыйшлі!

Ён зірнуў на рэктара; айцец Гарсія кіўнуў галавой і апусціў вочы долу.

— Як вы думаеце, ойча, удасца нам нешта зрабіць?

— Да каралеўскіх лістоў ва ўсіх вялікая павага, на выбраных пасрэдніках адбіваецца святло асобы яго каралеўскай вялікасці. Хіба можна было выбраць лепшага правадыра місіі, чым ваша святая мосць? Але...

— Ёсць нейкае "але"?

— Як і ва ўсіх чалавечых справах.

— Цяжкасці? Мала надзеі?

— Цяжкасці вялікія, калі шчыра сказаць вам, а надзея заўжды ў руках Бога!

— Як вы думаеце, чый бок найбольш схільны да прымірэння?

— Яны ўсе дужа раззлаваныя, і тыя і другія палаюць нянавісцю. Калі хто і не хоча мірыцца, то гэта Хадкевічы! Віленскі кашталян закрануты за жывое, абражаны. Ян Караль, жмудскі стараста, дужа горды, ён не даруе ніколі і нікому, акрамя таго, вельмі набожны, ён вельмі паважае хрысціянскую веру і не схільны да міру.

— Ну а Радзівілы? — спытаў біскуп.

— Ваяводу ўсе ведаюць: нязломная душа, надзвычайная гордасць; не вельмі шануе караля і каралеўскую ўладу. Адчувае сябе моцным, мала зважае на вышэйшую ўладу, але знешне дзеля прыстойнасці падтрымлівае караля. Самы вялікі вораг католікаў, запальчывы, незгаворлівы. Ці можна такога чалавека схіліць да паразумення, ці можна паверыць, што ён пабратаецца з Хадкевічамі, калі ён

нядаўна насуперак ім і ўсяму каталіцтву ў краіне запісаўся ў канфедэраты?

— Гэта праўда, — сказаў біскуп, — але невясёлая праўда! І ўсё ж, бог з імі, не будзем мы дагаджаць ім; выходзіць, сапраўды мала надзеі на добры вынік, у нас ёсць толькі добрыя пажаданні і каралеўскі загад — забарона заганнай вайны паміж сваімі, ганебнага праліцця крыві, горшага, чым паміж братамі! Хай бы лепей гэтую справу разглядалі сейм і кароль!

— А вы, ваша пастырская мосць, ведаеце пра падрыхтоўку да вайны?

— Чуў і вельмі баюся гэтага, — адказаў біскуп. — *Horrenda* — жах! Ледзь не шэсць тысяч войска сабралі толькі дзеля таго, каб вырашыць спрэчку, у той час як для абароны краіны і палову гэтага было б цяжка выпрасіць з дапамогай універсалаў*!

— Ды і ў Хадкевічаў даволі многа добрага войска. Яны змогуць абараняцца.

— Лепей бы гэтага не спатрэбілася. Я ўсё ж спадзяюся, што, нягледзячы на грозныя падрыхтаванні абодвух бакоў, да сутычкі не дойдзе. Радзівіл зразумее ўсё мярзоцце нападу, мярзоцце, якога яшчэ не было, і задумаецца над тым, наколькі непрыхільна ўспрынялі бы ва ўсёй краіне вестку пра вайну!

— Але ж з усіх бакоў прыбываюць войскі!

— Гэта яшчэ нічога не значыць, ойча, — разважаў біскуп. — За некалькі дзён усё можа перамяніцца. Будзем спадзявацца на Бога, на тое, што ў нас такога яшчэ не было, што не пойдзе брат на брата, нешта здрыганецца ў ягоным сэрцы, як у таго Каіна. Перад самым пачаткам, можа, размякчыцца сэрца і хопіць рашучасці спыніцца; трэба спадзявацца да апошняга.

— Спадзявацца на мір? — перапытаў Гарсія. — На мір з ерэтыкамі?

— Паразуменне ў гэтай справе і прыпыненне яе *ad decisionem Regiam* — вырашыцца ўладай, — адказаў біскуп. — А што да згоды з ерэтыкамі, то гэта зусім іншая справа.

— Тут усе справы так перамяшаліся, што цяжка разабраць, — зазначыў рэктар. — На баку ваяводы ўся канфедэ-

рацыя, Хадкевічаў падтрымліваюць каталікі. Справа зусім не ў Соф'і Слуцкай, а ў свабодзе сумлення.

— Гэтага, ойча, не змог бы разблытаць і прывесці да ладу нават сам кароль, калі б ён сюды прыехаў. На жаль, дрэннае насенне дужа глыбока ўрасло, пусціла глыбокія карані, яго нельга так хутка прапалоць. Даверымся ў гэтай справе Богу! Прадстаўнікі розных вер яшчэ доўга будуць ваяваць за свабоду сумлення, як яны яе называюць, ці за справу паляпшэння людскіх нораваў. Наша задача — не даць перарасці спрэчкам у крывавую бойню.

— Вырашыць бы хаця б гэтую спрэчку, — уздыхнуў рэктар. — Калі вы думаеце распачаць сваю місію?

— Пастараемся як мага хутчэй. Нам самім не церпіцца, на нас ляжыць святы абавязак. Але мне здаецца, пакуль не прыедзе жмудскі стараста Ян Караль, мы не зможам зрабіць ніводнага кроку наперад. Ён — правая рука кашталяна, таму ўсё тое, што будзе зроблена без яго, можа потым пайсці прахам. Я нават сумняваюся, ці распачаў бы кашталян перамовы, звязаны дагаворам з родзічамі, калі б гэта рабілася без іх. А мы тым часам разгледзімся, прыслухаемся, падумаем.

Айцец Гарсія зірнуў у акно, убачыў, што сонца ўжо высока паднялося, і развітаўся з біскупам, а той зноў узяў у рукі ружанец і пачаў маліцца.

Усё гэта дзеялася ў палацы жмудскага біскупа ў замку, а ў гэты час літоўскі маршалак Дарагастайскі снедаў у кардыналії сам-насам з ваяводам.

Перад імі стаяў сярэбраны збан з падагрэтым вінам і пазалочаныя кубкі. Сядзелі яны ў крэслах, адзін насупраць другога; ваявода ў задуменні моршчыў лоб, маршалак трымаўся, як заўжды ў жыцці, — вольна, весела, зухавата. Сама ягоная пастава выдавала ў ім ваяра, які інача не разумее і не ўяўляе жыццё як толькі пастаянны рух, дзеянне, нястомная дзейнасць. Высокі, каржакаваты, лысаваты, румяны, з блакітнымі вачыма, рымскім носам, шыракаватымі вусамі, высокім ілбом, Дарагастайскі меў усе звычкі салдата, з ягонага твару не сыходзіў выраз нязломнай адвагі.

— Вы прыехалі, каб памірыць нас пад прымусам? — спытаў Радзівіл пасля таго, як ужо аб многім было пераговорана.

— Пад прымусам ці не, але памірыць абавязкова, — адказаў Дарагастайскі, прыгладжваючы чуб на макаўцы, — бо на якога чорта трэба праліваць хрысціянскую кроў братам, сынам адной маці, калі трэба даць добрую прачуханку няверным, ды і суседзям нашым! Гэта ж увесь свет будзе паказваць на нас пальцамі, як на дурняў, прабачце, ды і нашых ворагаў можа настрапаліць бойка паміж сваімі. Яны не сталі б чакаць канца ўнутранай вайны, пакуль вы тут змагаліся б за князёўну, яны захапілі б нашы княствы. Калі б яны на нас навaліліся, то забралі б і ваш Слуцк, і Капыль, і Біржай, а там далей і сам Копысь, з-за якога ўсё заварылася. Не давайце чужым жартаваць над сабой, вы толькі пляснiце ў далоні, і ўсё само сабой утрасецца. Хай сабе вы — евангелісты, яны — каталікі, у вас свая дарога, у іх — свая, калі ж давядзецца ваяваць з сапраўдным ворагам, то будзем рабіць гэта разам, у згодзе.

— Складна кажаш, — азваўся ваявода, — адно шкада, што ўсё гэта — нязбытныя мары. І як укласці ўсё гэта ў іхныя галовы, каб папісты былі папістамі, а мы змаглі жыць па-свойму! Дык не, ім хочацца выглядаць вар'ятамі! І да таго даходзіць, што не бачаць уласнай слепаты. Я не такі ўжо незгаворлівы і ўпарты, якім мяне лічаць мае нядобразычліўцы. Хадкевічы зрабілі мне нямала зла, аднак жа, калі будуць слушныя прапановы міру з іх боку, я падам ім руку, хай толькі зробяць тое, што я хачу!

— Гэта штука простая! На такія ўмовы, пан ваявода, кожны згодзіцца! Хто не захоча ні ў чым не саступіць і прыйсці да згоды!

Маршалак зарагатаў на ўсё горла.

— Я не магу ні ў чым адступіцца ад свайго! — уставіў Радзівіл.

— Так, княжа, нічога зрабіць не ўдасца. Крыху з аднаго боку, крыху з другога, тут адняць, там адняць, толькі так і трэба шукаць згоды! Патрабаваць жа, каб нехта пастуціўся ўсім, а вы, ваявода, нічым, — гэта занадта. Хадкевічы прынялі б такое выйсце хіба што тады, калі вы прыставілі б ім нож да горла. Але давайце пагаворым пра гэта другім разам. Цяпер жа я ў вас не як пасол ад караля, а як ваш добры сябра і госць, дык ліха з імі, з тымі сваркамі! Вам трэба памірыцца! Сварыцца добра толькі з ворагам, а

са сваім — хоць косці поўныя злосці, а скончыць найлепей па-добраму. І патрэбна, вельмі патрэбна. І так яно станецца.

— Вы, барон, добры прарок.

— А вы, князь, не верыце ў дабро. Верце толькі ў добрае, яно і будзе ўсё добра. Хіба вы хочаце займець табун коней? Га? Вам патрэбна князёўна Соф'я ці яе княства? Напэўна, з добрага табуна тая князёўна, калі вы тузаеце адзін другога за чубы, рыхтуецеся схапіцца за шаблі, склікаеце войскі, нібыта збіраецеся заваяваць цэлую правінцыю! Выбачайце! Але я, далібог, не разумею, ці варта не за новае княства, не за старажытную карону, а за кавалак зямлі і яшчэ адну белавалосую, якіх, даруйце, па белым свеце тысячы, ліць столькі крыві, рабіць такі гармідар? Не, не варта!

— Як жа ты, пане маршалак, нізка нас ставіш!

— Прабач, вашамосць, старому ваяку, да вашай палітыкі не здатнаму. У мяне што ў галаве, тое і на языку, чыстая праўда! Як я падстаўляю грудзі ворагу на вайне, гэтак жа я ўсю душу адкрываю сябру. А навошта ж нам прыхарошваць тое, што і так прыгожае? Вы толькі, пане, на мяне не крыўдуйце.

— У мяне няма крыўды ні ў галаве, ні ў сэрцы, — запэўніў ваявода, — але мне ўсё ж прыкра, што вы, ваша мосць, так лёгка вырашаеце нашу спрэчку. Ды воля ваша — кожнаму бачыцца па-свойму.

— І вам самому, княжа, — дадаў маршалак, — убачыцца інакш, калі вы ўзважыце ўсё халодным розумам. Дальбог жа, вам стане ясна, што біцца няма за што!

Ваявода змоўк, а маршалак падышоў да акна. Нейкую хвіліну ён пазіраў на вуліцу, а потым здзіўлена ўсклікнуў:

— Чыстай турэцкай крыві! Сапраўдны турак!

— Што такое? Хто? — спытаў ваявода і ўстаў.

— Я тут угледзеў турка, сіўку, ён тут каля вашых варот, хачу даведацца, чый ён.

Ваявода таксама глянуў у акно.

— Дык гэта ж ваш, уласны, — спакойна прамовіў ён.

— Мажа, ваш, ваявода?

— Не, ваш, пане маршалак!

— Мой? У мяне такога няма! Паверце мне, такога няма ні тут, ні ў маёй дарагастайскай стайні, ні ў табуне! Ён іншай масці і іншай крыві.

— Але гэта ваш конь, — стаяў на сваім ваявода.

— Даруйце мне, я лепей ведаю, што гэта не мой, — упіраўся маршалак.

— Выбачайце, але ён ваш, уласны!

— Жарцікі з мяне строіце, пан ваявода!

— Сапраўды, ваш, бо я дару яго вам. Хіба не прымеце?

Маршалак задумаўся.

— Калі настануць мір і згода, а я болей не буду паслом караля да вас, то прыму такі цудоўны падарунак. А цяпер — дурні будуць звягаць, што вы мяне падкупілі.

— Адным канём! — засмяяўся ваявода. — Загадайце адвесці яго ў вашу стайню. Такая дробязь нікому не кінецца ў вочы! А мне прыемна падараваць такому знаўцу коней сапраўднага турка.

Дарагастайскі ўзяў шапку і падаўся да дзвярэй.

— Сардэчна дзякую! Дазвольце мне зараз жа абмацаць яго, мяне аж сверб бярэ паглядзець на гэтага сіўку, не магу болей трываць.

Ваявода паклікаў канюшага, і маршалак разам з ім пайшоў да лесвіцы, забыўшыся ў гэтыя хвіліны пра ўсё: пра каралеўскія лісты, сваё пасольства і сварку Хадкевічаў з Радзівіламі.

А мы зірнём яшчэ, што робіцца ў паноў Завішаў у іх палацы на Бакшце.

Іх дом быў мураваны, невялікі, стаяў упрытык да высокай гары, з двух бакоў яго абступалі дамы гараджан, выглядаў ён нібы пастаялы двор. Перад ім стаялі вазы, адны яшчэ гружаныя, другія пустыя, каля іх завіхалася прыслуга, якой было цесна на панадворку. Усе коні не змясціліся ў стайні, стаялі, накрытыя папонамі, каля ясляў і каля плота, за вазамі. Воддаль ад сцяны на панадворку было нават раскладзена вогнішча, каля яго сядзелі і ляжалі фурманы і слугі.

Чатыры самыя лепшыя пакоі зверху займалі браты, Ян і Андрэй Завішы. Жылі яны тут сціпла, хаця па шляхецкай завядзёнцы вазілі ўсё з сабой, таму ў іх было чым і падлогу заслаць, і сцены абвешаць.

Дываны з залатым і сярэбраным узорамі развесілі па яшчэ вільготных сценах, на падлогу, выкладзеную толькі цэглай, таксама ляглі цвёрдыя турэцкія і персідскія

дываны. Невялікія рознакаляровыя дываны пакрывалі і простыя, зробленыя мясцовымі цеслярамі лавы, сасновыя сталы заслалі вышытымі настольнікамі, што спадалі да самага долу. Цяпер пакоі, яшчэ нядаўна голыя, выглядалі даволі ўтульна, і толькі столь нагадвала, якімі яны былі яшчэ ўчора. У двух кутніх пакоях кожнаму з братоў падрыхтавалі пасцелі. З правага боку — старэйшаму, Яну, з левага — Андрэю, абодва спалі на пазалочаных ложках, якія былі ўсланы сенам і накрыты мядзведжымі шкурамі. Пад галавой — падушкі, таксама са шкур, а зверху — футравае пакрывала.

У камінах і печах палаў агонь, саграваў настылыя сцены. Два сярэднія пакоі прызначаліся для абедаў і прыёму гасцей. Апошні быў больш старанна ўпрыгожаны.

Калі ўзышло сонца, засвяціла ў вокны дома на Бакшце, ваявода з падскарбіем ужо былі на нагах. Яны засяроджана маліліся, па даўнейшай звычцы пачынаючы дзень з ранішніх малітваў і псалмоў. Некаторыя са старшых слуг у ніжніх пакоях таксама з ружанцам у руках прысвячалі Богу першыя хвіліны новага дня. Толькі слугі і прыслуга ўжо раней хуценька памаліліся і шчыравалі ў доме і на падворку. Калі час малітвы скончыўся, падскарбій зайшоў да брата, потым абодва адправіліся снедаць, а затым яны збіраліся схадзіць у касцёл бернардзінцаў на імшу. За снеданнем яны крыху пагаварылі пра справы.

— Дарагі браце, як думаеш, выйдзе ў нас што ці не?

— Можа, і не, хоць нас паслаў сам кароль. Што ж, будзем рабіць усё, што можам, астатняе ў волі Божай, — сказаў старэйшы брат, віцебскі ваявода Андрэй. — Да нас учора забягаў наш агульны знаёмы — езуіт, айцец Брызій. Ты ўжо спаў або замкнуў дзверы і маліўся. Было позна, і я прыняў яго сам.

— Што ён расказаў?

— Многа страшнага, а галоўнае — калі яму верыць, то няма ніякай надзеі на тое, што мы тут нечым паможам. Ва ўсіх столькі злосці, што вось-вось выбухне вайна.

Ян пахітаў галавой. Тут увайшоў прыдворны і паведаміў, што прыйшоў брэсцкі ваявода Крыштаф Зяновіч*.

— Так рана! — усклікнуў Андрэй і выйшаў сустрэць госця.

Неўзабаве ўваліўся ў пакой і сам госць, тоўсты, румяны, засопшыся, абапіраючыся на кій з пазалочанай макаўкай.

Зяновіч — чалавек гаваркі, рухавы, дзейны, але сёння на ягоным твары адбівалася няўпэўненасць, і гэта псавала яго звыклы выраз. Ён і сапраўды звычайна бываў такім, аднак раннія адведзіны і думка пра тое, як яго прымуць і сустрэнуць (а яго ведалі як вялікага прыхільніка Радзівілаў), азмрочвалі яго, таму на гэты раз ваявода быў у такім нязвыклым для яго замяшанні.

Аднак ледзь толькі Зяновіч паказаўся ў дзвярах і вымавіў першыя словы, як па сваёй прыроднай даверлівасці забыўся на трывогі і загаварыў весела, вольна і нязмушана.

— Вітаю паслоў міру і згоды! Вітаю жаданых гасцей у нашай сталіцы! Сэрцам і душой прымаем вас, мы чакалі вашага прыезду, як птушка каня дажджу! Вітаю вас, пан ваявода віцебскі, і вас, пан падскарбій! Як даехалі, як спалася? — салаўём рассыпаўся Зяновіч.

— Цудоўна! — адказалі браты.

— Мне дужа трэба было прывітаць вашых мосцяў, таму я, хоць на гадзінніку яшчэ, мабыць, толькі восем і не наступіў яшчэ час для адведзін, пасяшаўся ўбачыць дарагіх гасцей.

— Мы вельмі рады вам. Сядайце, пан ваявода!

— Сеў бы, нават калі б не запрасілі, бо захакаўся, пакуль узбягаў па прыступках. Што там новага ў Варшаве, як кароль?

— Дзякуй богу, здаровы.

— Пан Маціёўскі *in partibus* — у будучым — віленскі біскуп?

— Ён ужо адрокся ад біскупства.

— У спадзяванні на кракаўскае?

— Магчыма.

— Добрая замена! Ну, а ці будзе ў нас мір?

— Спадзяёмся, — адказаў Андрэй Завіша. — Каралеўскія лісты...

— Усе іх паважаюць, але мала хто іх слухаецца! — перабіў яго Зяновіч. — Вось у чым уся бяда! Больш надзей на вашы ўгаворы, на сяброўскае пасрэдніцтва. Хадкевічы зусім з глузду з'ехалі! Як яны толькі адважваюцца, як пнуцца барукацца з Радзівіламі! Не тыя сілы, не тое ў іх

багацце! Зруйнуюць іх, зруйнуюць краіну, а ўсё гэта падасць прыклад фатальны, няшчасны, жахлівы!

— Але ж не яны ўсю гэтую кашу заварылі?

— А навошта было парушаць дагавор?

— Дык, можа, той дагавор несправядлівы?

— Справядлівасць можна разумець па-рознаму. Такое часта бывае. Навошта тады было абяцаць, калі яны ведалі, што дагавор несправядлівы?

— Яны вінаватыя ў гэтым, але і Радзівілы таксама: навошта раззлавалі іх той судовай справай, давялі да крайнасці?

— Цяпер ужо няма іншага выйсця апрача добрага канца, бо вайны дапусціць нельга. Вайна канчаткова загубіць краіну! — усклікнуў Зяновіч. — Памірацца яны ці не, абы толькі не ваявалі!

— Мне здаецца, што да гэтага не дойдзе, — сказаў віцебскі ваявода. — Дзеля гэтага мы і прыехалі, каб не дапусціць горшага. І мы спадзяёмся, што хаця яны і далёка зайшлі ў сваіх спрэчках, але ўрэшце адумаюцца, зразумеюць, што яны давядуць да ўнутранай вайны. Можа, іх ахалодзяць лісты ад караля і ўгаворы сяброў.

— Дай жа Божа! — прамовіў Зяновіч і ўздыхнуў, але гэта можна было вытлумачыць і пачуццямі, і высокай лесвіцай у доме на Бакшце.

## Паздзел 8

## ВАЕННЫЯ ПРЫГАТАВАННІ. КНЯЗЁЎНА

Першага лютага Вільня і яе ваколіцы нагадвалі ваенны лагер. Калі б нехта прыехаў здалёку, не ведаючы, у чым справа, то мог бы падумаць, што столькі войска сабралі, каб адбіць напад няверных язычнікаў або суседзяў з Русі. У прадмесце натоўпамі сцякаліся ўсё новыя атрады, развяваліся сцягі, гарцавалі гарачыя коні, прыходзілі салдаты з Курляндыі, Падолля, Літвы, Русі, Польшчы — усе яны былі па-рознаму апранутыя і гаварылі на розных мовах.

У самім горадзе бадай што ўсе пастаялыя двары займалі кіроўцы: ротмістры, палкоўнікі, іх акружэнне. Бразгалі

шаблі, бухалі барабаны, чуліся ваенныя песні, якія павінны былі ўзняць баявы дух. Аднак на гэты раз спевакі павінны былі тварыць цуды, каб падладзіцца да акалічнасцей, таму што ў песнях тых часоў або праклiналі туркаў, або лаялі маскавітаў, але не было напагатове ніводнай, якая клікала б на бой за Хадкевічаў або, наадварот, за іх ворагаў. Дух войскаў з іншых краёў падтрымлівалі двухрадковыя абразлівыя прыпеўкі пра жмудзінаў, ліцвінаў, мазураў, рускіх і іншых. І сам выгляд гэтых войскаў, якія месціліся пераважна на Лукішках, а таксама па ваколіцах і прадмесцях, быў дзівосны! Народ — як на падбор, але ўсе былі з розных месцаў, кожны апрануты па-свойму, у кожнага свая зброя, нават свой дух. Узяць хаця б тое, што ў войску Радзівілаў было нямала католікаў. Яны ішлі ціха, апусціўшы галовы, самі не ведаючы, як спалучыць сумленне з уласнымі інтарэсамі, калі таварышы па вайсковай выправе бралі іх з сабой, і яны абавязаны былі падпарадкавацца, але яны лічылі гэтую вайну выгаднай канфедэрацыі і ўспрымалі яе як помсту католікам за іх прыцясненне разнаверцаў.

Войска Радзівілаў складалася з разнастайных атрадаў, галоўная частка іх была з Русі, каля чатырох тысяч ваяроў прыслалі Астрожскія; яны размяшчаліся па ваколіцах, прадмесці, сцякаліся пад Вільню не ўсе разам, а па частках і ў розны час: ад апошніх дзён студзеня да першых лютаўскіх. Горад напоўніўся пярэстымі натоўпамі людзей, ажыў, але толькі самыя смелыя гараджане адважваліся паказвацца на вуліцах і на шумных рынках, астатнія ў трывозе і страху пахаваліся ў дамах. Магістрат і рада пасля няўдалага пасольства да ваяводы не спрабавалі выступіць другі раз. Яны дазволілі войску займаць пастаялыя двары і больш не азваліся ні словам. Аднак трэба зазначыць, што, акрамя выпадковых здарэнняў, ніякіх непрыемнасцей гараджане не мелі; ваявода добра карміў усю плойму войска і наказаў салдатам абыходзіцца з жыхарамі прыстойна і ветліва. Але мала хто з іх верыў ягоным абяцанням пра недатыкальнасць іх жытла, уласнасці: купцы, пераважна католікі, ад вялікага страху пазамыкалі склады і крамы, пахавалі тавары, заклалі дзверы цяжкімі засаўкамі і спадзяваліся на прыхільнікаў Хадкевіча як на збавіцеляў. Ды іх яшчэ не было, чакалі з дня на дзень. Для іх былі

ўжо загадзя падрыхтаваны, заказаны месцы пастою ў самім горадзе паблізу ад камяніцы жмудскага старасты, іх ахвотней саступалі, бо салдаты-католікі здаваліся ім надзейнай абаронай супраць страшных для многіх гараджан ерэтыкоў.

У камяніцы Хадкевічаў падрыхтоўка да вайны была ўжо скончана: байніцы прароблены, вароты ўмацаваны, слабыя сцены падвоены, вокны забіты, месцы, вызначаныя для гармат, падрыхтаваны, ачышчаны пляцоўкі для салдат, якіх збіраліся размясціць пераважна ў крэпасці. Падумалі нават і пра тое, каб закупіць запасы жыўнасці, пра ваду на выпадак аблогі, бо на штурм з-за вузкіх вуліц не спадзяваліся. Пан Барб'е ўсё гэта агледзеў, прыкінуў, ці надоўга хопіць запасаў і зброі падчас аблогі Радзівілаў, і з усмешкай сказаў, што са сцен камяніцы ён гарматамі ўмомант змяце ўсіх пратэстантаў, хай толькі сунуцца.

Але ўся гэтая падрыхтоўка ў вачах нават тых, хто ёю займаўся, хто звыкся з думкай пра непазбежнасць вайны, выглядала дзіўнай, а разважлівым людзям яна ўвогуле нагадвала кашмарны сон. Гэта было не проста здарэнне, а вялікае дзіва, многія проста не верылі ў рэальнасць вайны. Нават для віленскага простанароддзя, якое ўжо не адзін раз бачыла сутычкі, малую вайну ў горадзе, такі вялікі наплыў войска быў незвычайным, яму не было прыкладаў у мінулым, да таго ж не было і важкай прычыны. А таму, нягледзячы на такую вялікую падрыхтоўку, на відавочную пагрозу зацятай вайны двух лагераў, многія яшчэ не верылі і не хацелі верыць у грамадзянскую вайну.

— Можна сварыцца, ад веку і да канца свету звады не скончацца, хто ведае, ці не пачаліся яны з даліны Іёсафацкай*, там таксама спрачаліся, але, каб ваяваць, такога не можа быць! — казалі недаверлівыя.

3 лютага віленскаму кашталяну стала вядома, што Ян Караль з гарматамі і войскам праз дзень будзе ў Вільні. Гэтую вестку прынёс маршалак двара Мікалай Хамец, які прыехаў разам з любімым прыдворным Яна Караля Тамашом з Дамбровы. Кашталян аддаў свой дом пад пастой салдатам, якія вось-вось прыбудуць, а сам перабраўся ў камяніцу Хадкевічаў на Замкавай вуліцы. Тут цяпер жыў і брат Караля Аляксандр, у той час ён быў барысаўскім старастам (пазней — троцкім ваяводам). Самае лепшае

памяшканне аддалі сандамірскаму ваяводу Іосіфу Мнішку, яго запрасілі Хадкевічы, і ён не адмовіўся, прыехаў, праўда, амаль без світы, у суправаджэнні некалькіх прыдворных.

Князёўну Соф'ю дзеля бяспекі перавялі ў пакоі ў глыбіні дома, адтуль яна ўжо нічога не магла бачыць, толькі чула вялікі рух у доме. Ведала яна пра падрыхтоўку да вайны і вельмі непакоілася. Лёгка зразумець, што адчувала князёўна: яна не ведала як след, што робіцца, што за падзеі адбываюцца, была поўная змрочных думак і здагадак. Пры ёй і каля яе ўсё маўчала, усе пабойваліся яе, на яе глядзелі як на прычыну ўсіх непрыемнасцей, нават самі Хадкевічы ў душы міжволі адчувалі насцярожанасць да сіраты, апека над якой аказалася такой цяжкай. Самай блізкай для князёўны была ахмістрыня, пані Влодская, жанчына цвёрдая, халодная, непадступная, яна часцей за ўсё толькі загадвала; ад яе нельга было пачуць ласкавага слова. Яна паслухмяна выконвала тое, чаму служыла, была суровай і строгай, баялася на валасок адступіць ад сваіх паўнамоцтваў, вельмі даражыла сваім месцам, баялася страціць яго. Служанкі панны былі маладыя, баязлівыя, аддаленыя ад яе сваім становішчам, яны нават не спрабавалі стаць сяброўкамі. Напаўдзіця, яна заставалася сам-насам са сваімі думкамі, страхамі, цярплівасцю, без радасцей, без сяброў, без навін пра падзеі за сценамі камяніцы, жыла замкнутым жыццём, якое пры іншых акалічнасцях магло быць шчаслівым, на самай справе аказалася пакутлівым.

Ад рання — малітвы, потым невясёлы шпацыр па пакоі, кароткія размовы з пані Влодскай, абед, праца за кроснамі, зноў малітва — і доўгі вечар, і доўгая бяссонная ноч.

А над усім гэтым прывід вайны, забойстваў — яны не давалі спакою сірочаму сэрцу, бо вайна магла пачацца з-за яе, яна штодня набліжалася, і пачаткам яе меўся стаць дзень нараджэння князёўны! Соф'і здавалася, што кожны стук варот, кожны шоргат бруска па шаблі, кожнае бразгатанне зброі, гучны гук набліжаюць гэтую жахлівую вайну. Калі яна бачыла на замкавым двары салдат, іх клопаты пра абарону, умацаванне камяніцы, адразу ж перапаўнялася страхам, гневам і трывогай, а з вокнаў свайго новага пакоя

больш нічога ёй не было відаць. Часта дзяўчына прачыналася сярод ночы, разбуджаная тупатам салдат, галасамі варты, яе сэрца пачынала біцца часцей, яна прыціскала да грудзей крыж сваёй маці і цэлымі гадзінамі чакала, што вось-вось прагучыць стрэл — ёй, беднай, здавалася, што ён абавязкова павінен прагучаць.

У такой вось няпэўнасці і страху жыла князёўна; калі ж ці падарункам, ці ласкавым словам яна ўпрошвала ахмістрыню расказаць ёй, што робіцца за сценамі камяніцы, то часцей за ўсё чула пра розныя жахі, якія злавалі яе, яна не магла ім верыць, бо, несумненна, яны былі выдуманымі і разлічанымі на тое, каб загасіць у яе сэрцы вядомую ўсім прыязнасць да князя Януша.

Віленскі кашталян рэдка паказваўся ў князёўны; пасля апошняй размовы завітваў, мабыць, пару разоў, ды і то ненадоўга. Але 3 лютага ён паабяцаў увечары праведаць яе.

Князёўна чакала яго ў трывозе, малілася ў душы і гадала, што ён скажа. Прайшло паўгадзіны ў доўгім нецярплівым чаканні, нарэшце кашталян зайшоў. У яго быў лагодны твар, ніякага напружання, быццам назаўтра чакалася свята, а не пачатак вайны. Ён ласкава прывітаў яе, з трывогай папытаўся, як здароўе, бо выгляд у яе быў хваравіты.

Соф'я трымалася смела і мужна.

— Дзядзечка, не пытайцеся ў мяне пра здароўе, лепш скажыце, ці варта мне жыць?

— Як гэта? Што ты гаворыш? Ты яшчэ так мала пажыла!

— Але ж цяжка, дужа цяжка мне! Падумайце, як гэта штодня, штогадзінна быць пад наглядам, калі чужое вока пранікае, здаецца, нават у думкі. Кругом вайна, зброя, страх! Куды ні глянь — салдаты, войска, гарматы, даносяцца жахлівыя чуткі! Скажыце мне, дзядзька, як жа я магу быць шчаслівай, спакойнай, якое тут можа быць здароўе? А яшчэ як падумаю, што гэта я — прычына ўсёй гэтай калатнечы! Ох, дзядзька, перажыць гэта, далібог, няма сіл!

— Князёўна, не трэба так палохацца. Вам нічога не пагражае.

— Ды хіба я за сябе трывожуся? — адказала Соф'я. — Але ж гэта вайна, гэта вайна!

— Яна яшчэ не пачалася, і мы не будзем пачынаць яе.

— Навошта ж тады вы так узброіліся?

— На ўсякі выпадак, — адказаў кашталян, — дзеля абароны. Мы бачым, што Вільню акружаюць войскі Радзівілаў, як нам у такім разе не падумаць пра сябе?

Князёўна змоўкла, правяла рукой па лбе і апусціла вочы.

— Вы памятаеце нашу апошнюю размову? — спытаў кашталян.

— Так. Калі вы хочаце, то працягнем яе, — адказала князёўна.

— Мне болей няма пра што пытацца ў вас, няма аб чым прасіць, няма патрэбы прымушаць нешта рабіць, я хачу толькі ў вашых жа інтарэсах яшчэ раз растлумачыць тое-сёе, а вы рабіце так, як вам падкажа ваша сумленне. Я ўжо не цікаўлюся, што вы адкажаце, калі да вас прыйдуць спытаць, якое будзе ваша слова. На тое ваша воля, князёўна, вы ўжо не дзіця, вось-вось будзеце паўналетняй, у вас ёсць свой розум. Рабіце тое, што вам даспадобы. І ўсё ж пакуль што я — ваш апякун, а першы клопат апекуна — сумленне, першая думка — засцерагчы ад граху. Таму хачу вас папярэдзіць. Дамоўлены шлюб ваш з князем Янушам без спецыяльнага дазволу главы каталіцкага касцёла*, Папы, які ён дае, а таксама без яго благаславення (слухайце мяне ўважліва), будзе грахоўным, ён забаронены рэлігійнымі законамі, а нашым літоўскім правам прызнаецца як несапраўдны. Вы, напэўна, чулі пра гэта, мой абавязак яшчэ раз напомніць. Я нічога не загадваю, ні пра што не пытаюся, але ці захочаш ты сама, без дазволу Папы, згадзіцца на такі шлюб, калі дойдзе да размоў пра яго, да неабходнасці вырашаць?

Князёўна не прымусіла чакаць з адказам.

— Без дазволу — ніколі! Аднак жа, — дадала яна, — дазвол можна атрымаць.

Кашталян міжволі перасмыкнуў плячыма.

— Дазвол, але не благаславенне.

Князёўна апусціла галаву. Нехта пастукаў у дзверы.

— Гэта наш святы айцец, архімандрыт манастыра Святой Тройцы Вельямін Руцкі*, ён вам усё падрабязна растлумачыць і пацвердзіць тое, што казаў я.

Князёўна зірнула ў бок прыадчыненых дзвярэй. Праз іх увайшоў бледнатвары мніх у сутане ордэна Святога Базыля*. Гэта і быў дастаслаўны Вельямін Руцкі.

Князёўна падышла і пацалавала яму руку, ён моўчкі благаславіў яе, потым сеў.

— Я паклікаў вас, ойча, — прамовіў кашталян, — каб вы пацвердзілі перад князёўнай мае словы. Я патлумачыў ёй, што яе шлюб з князем Янушам будзе незаконным згодна з касцельным і дзяржаўным правам, якое не прызнае шлюбаў паміж родзічамі.

— Сапраўды, так, — адказаў святар. — А той, хто заключае такі шлюб, пападае пад суровае асуджэнне касцёла, нават калі вянчаць вас будзе асоба самага высокага духоўнага звання.

— Але... — пачала князёўна, не асмельваючыся пярэчыць.

— Але ў пэўных выпадках, — адгадаўшы яе думкі, прадоўжыў за яе Вельямін Руцкі, — Папа Рымскі дазваляе такія шлюбы, хаця і не благаслаўляе іх.

— Не благаслаўляе! — паўтарыла за ім князёўна і апусціла вочы долу.

Кашталян і святар тлумачылі ёй нешта яшчэ, але Соф'я вачэй больш не ўзнімала, не глядзела на іх, не прамовіла ні слова, яна была ўся ў сваіх невясёлых думках; моўчкі пацалавала руку кашталяну, пакланілася Руцкаму і развіталася з імі.

Ледзь толькі за імі зачыніліся дзверы, яна ўпала на крэсла і залілася слязамі.

— Ніколі нам не быць разам, не мець Божага благаславення, не быць шчаслівымі! Нават калі б нас і звёў лёс, злучыў, наша каханне Богу не будзе ўгодным, кожная хвіліна нашага жыцця будзе атручана гэтым! Вось так: засталася сіроткай, мне дазволілі пакахаць таго, каго пабяцалі з дзяцінства зрабіць мужам, а цяпер кажуць, што гэтае каханне — грэшнае, шлюб — святатацтва.

Яна ўпала на калені і пачала горача маліцца. Потым устала з сухімі вачыма, спакойным тварам і ціха прамовіла:

— Так хацеў Бог, хай будзе благаслаўлёна Імя Яго. Нядоўга мне засталося цярпець, пайду да цябе, мамачка, хоць я цябе не ведала, і да цябе, татуля, якога я не бачыла, пайду да вас!

## Паздзел 9

## ЖМУДСКІ СТАРАСТА Ў ВІЛЬНІ

4 лютага новы ганец прыехаў у Вільню і паведаміў, што войска пад кіраўніцтвам Яна Караля спынілася на начлег на адлегласці адной мілі ад горада і павінна заўтра ўвайсці ў горад. Вестка імгненна разнеслася паміж жыхарамі, і натоўпы цікаўных сабраліся на Медніцкім тракце, па якім меўся ўступіць у горад Ян Караль. Былі сярод іх і людзі Радзівіла. Яны ўліліся ў натоўп, каб прасачыць, што за войска ідзе на падмогу Хадкевічам, колькі яго будзе, ці многа яно мае гармат і марцір, а потым дакладна паведаміць пра ўсё князю-ваяводу. Ад самага паўдня ў горадзе быў незвычайны рух: самыя цікаўныя ўскараскаліся на дахі камяніц, на сцены і вежы, абы толькі лепш разгледзець войска. На ўсіх галерэях ратушы было поўна народу, нават на званіцах касцёлаў тырчалі галовы, павернутыя ў бок Медніцкага тракту. Вострае прадмесце таксама было ўсеяна людзьмі, яны таўкліся там ад самага рання. Стаяў прыгожы зімовы дзень, быў лёгкі марозік, сонца свяціла на чыстым небе, іскрылася ў снягах, у паветры разлягалася ціша.

Пасля паўдня на гасцінцы ўдалечыні нешта зачарнелася. Так, па ім рухалася войска — гэта яно і чарнела на снезе. Натоўп замітусіўся: адны праціскаліся ўперад, каб лепей разгледзець, другія лезлі вышэй, трэція яшчэ толькі падбягалі. І ўсе паўтаралі: "Ідуць! Ужо ідуць!"

Тым часам рацfolk падышла да горада. Над ёй развяваліся харугвы, бухалі бубны, тонкімі галаскамі гучалі пішчалкі. Усё бліжэй, усё бліжэй падступала войска, нарэшце першы атрад увайшоў у горад, і ўвесь люд аціх, узіраючыся, поўны цікаўнасці. Уперадзе павольна, спакойна рухалася конніца. На чале яе з некалькімі начальнікамі ехаў сам Ян Караль, жмудскі стараста, на вараным кані ў прыгожай збруі, асядланым па-турэцку, сам ён быў у аксамітным кармазынавым футры, падбітым сабалямі, з залацістымі петлямі; на галаве — сабаліная шапка, упрыгожаная пяром чаплі. З-пад футра выглядала апраўленая ў серабро выгнутая шабля ў похвах з шчыгрынавай скуры. На твары

Яна Караля не было нават следу заклапочанасці, толькі зухаваты выгляд першага на чале вялікага атрада, толькі горда сціснутыя вусны і натапыраныя вусы. Адной рукой ён злёгку кіраваў жвавым канём, другой падпёр бок. Ззаду ехалі некалькі ротмістраў, а далей усе астатнія вершнікі, усе, як на падбор, — чалавек у чалавека, на дужых невысокіх конях. Над галовамі ў іх развіналіся прапары і блішчалі наканечнікі дзідаў. Ехалі яны вольна, па пяць чалавек у рад, спакойна, моўчкі. Адразу ж за вершнікамі везлі гарматы і марціры, досыць многа. Цікаўныя налічылі аж дваццаць чатыры. За гарматамі зноў ехалі вершнікі, па-рознаму апранутыя і ўзброеныя, але зноў усе — як на падбор.

Тут не было відаць такіх ваяроў, як у войску Радзівілаў, карліка побач з волатам, грузнага немца побач з танклявым салдацікам-ліцвінам, усе — нібыта адной крыві, аднаго роду, сілы і гадоў. Гэта адразу кінулася ў вочы тым, хто назіраў, як праходзіла войска.

Здавалася, нават самым цікаўным не пад сілу злічыць, колькі ж войска прыбыло, — яно ўсё ішло і ішло, а на гасцінцы аж да самых гор усё яшчэ не канчаўся, віўся доўгі ланцуг. Ужо цямнела, калі ўся кавалерыя ўвайшла ў горад, а потым пачала рухацца пяхота. Яна ішла аж да цёмнай начы.

Стомленыя і ўражаныя разыходзіліся па дамах гараджане. Многім цікаўным не хапіла цярпення, да таго ж ноччу цяжка было нешта разгледзець. У пераказах сілы Хадкевічаў перабольшваліся па сама менш — утрая і выглядалі незлічонымі.

Войска ўсё яшчэ ішло, а Ян Караль ужо даўно быў у сваёй камяніцы, падрыхтаванай да ягонага вяртання, пачалі размяшчацца і новапрыбыўшыя атрады. Адны, не злазячы з коней, завозілі ўнутр гарматы, другія спыніліся пад сценамі палаца. Частка атрадаў так і засталася на вуліцах пад сценамі як варта, іншых жа размяшчаў за сценамі пан Барб'е, які са сваёй нязменнай шпагай, пры капелюшы голасна распараджаўся, дзе каму ўладкавацца на пастой. Большыя і меншыя гарматы і марціры занялі прызначаныя ім месцы і ваяўніча разяўлялі ў байніцах свае чорныя пашчы з усіх чатырох бакоў палаца.

Тут жа, каля іх, ужо ляжалі ядры і іншае патрэбнае начынне.

Ян Караль не злез з каня, аж пакуль не размясціў усіх сваіх салдат, пакуль усім не распарадзіўся. Абоз ён паставіў на дзядзінцы, яго запаланілі салдаты, запалалі вогнішчы, уздоўж сцен да загадзя падрыхтаваных конавязяў з яслямі паставілі коней. Гоман, смех, брэх сабак, іржанне коней, шум і галас, крыкі разносіліся па ўсёй камяніцы беспierастанна. Адны ішлі, каб паглядзець на вызначанае ім для бою месца на сцяне, другія дапамагалі ўсцягваць гарматы, трэція здымалі і расстаўлялі зброю там, дзе ім было сказана. Военачальнік стараўся паспець усюды: там паглядзець, тут нешта загадаць, а дзе і проста моўчкі праехаць. Ён распарадзіўся пра ахову, даручыў яе маршалку двара Мікалаю Хамцу, а сам злез з каня і пайшоў да кашталяна.

Тут яго ўжо даўно чакалі. Ваявода Мнішак, барысаўскі стараста, кашталян і яшчэ некалькі чалавек з ліку прыхільнікаў католікаў сабраліся ў пакоі, вокны якога выходзілі на дзядзінец. У каміне шугаў агонь, на стале стыла некранутая вячэра.

Усе ўсталі і прывіталі жмудскага старасту.

— Вітаем нашага героя! — усклікнуў Мнішак. — Вітаем вас! Нарэшце вы скончылі свае справы, аддалі ўсе загады, адпачніце цяпер з намі!

— Пасля цяжкага дня нарэшце хоць хвілінку адпачну, — сказаў Ян Караль, здымаючы з сябе цяжкае футра. — Нялёгка кіраваць гэтым нашым неўтаймаваным і пярэстым войскам, ох нялёгка! Можа, дасць Бог, некалі мы завядзём і сваё. А то ці не падумаюць паны Радзівілы, што супраць іх безлічы ваяроў мы не можам выставіць і дзесятка салдат. Але хоць нашых і мала, гэтыя нямногія варты тысяч іхніх. Я добра ведаю сваіх салдат, яны не падвядуць мяне, калі тут што распачнецца.

Кажучы гэта, Ян Караль абыходзіў прысутных і вітаўся з усімі за руку.

— Ці ўсё ў нас гатова? — спытаў кашталян.

— Усё, — адказаў жмудскі стараста. — Князёўна тут, дагавор на стале, войскі і гарматы стаяць з усіх бакоў, тэрмін набліжаецца. Засталося чакаць паноў Радзівілаў.

— А вы ведаеце, што прыехалі паслы ад яго вялікасці караля? — спытаў Аляксандр Хадкевіч.

— Яшчэ ўчора я прачытаў вашу паперчыну. Але ж, панове, паслы прыехалі да Радзівілаў, а не да нас, мы ж першымі вайну не пачнём.

— Гэта так, — адказаў кашталян. — Аднак, калі нас зачэпяць, мы мусім бараніцца.

— Колькі войска ў Радзівілаў? — спытаў Ян Караль. — Ці многа яны іх там назбіралі? І што думаюць рабіць?

— Хто што гаворыць, — адказаў Аляксандр. — Самыя пэўныя звесткі нам паведамілі людзі з ліку прыдворных князя-ваяводы: у іх каля шасці тысяч войска. Гэта калі не лічыць дробных груп шляхты і асобных людзей, а таксама прыдворных салдат ваяводы. Тры князі Астрожскія далі па шэсцьсот конных і семсот гайдукоў, пяцьдзесят конных прывёў Абрамовіч, Нарушэвіч — сто вершнікаў, а яшчэ сто гайдукоў, Замойскі з Падолля — дзвесце коннікаў пад апекай ротмістра Пятра Збарымскага, дзвесце рэйтараў даў князь курляндскі, яны для застрашэння стаяць на дзядзінцы кардыналіі, а яшчэ дзве сотні мазырскага старасты. Вось і ўсё. З такой сілай можна было б заваяваць цэлае княства.

— І што ж яны будуць рабіць з такім войскам? — сказаў Ян Караль і ўсміхнуўся. — Дастаткова зірнуць па баках, каб зразумець, што нават трэцяя частка іх войска будзе ціснуцца, як селядцы ў бочцы, калі ўздумае пачаць аблогу маёй камяніцы, ды і то не змесціцца, а то яшчэ патрапіць пад агонь гармат, які змяце іх, нібы мух! У поле яны нас не выманяць, на штурм не адважацца, хіба што пачнуць разбураць навакольныя дамы, але ў гэта цяжка паверыць. Дык навошта гэта ўсё ім, дзеля чаго? Каб паказаць, на што здольныя Радзівілы?

— Вашамосць, пане стараста, вы так упэўнены ў сваёй камяніцы? — спытаў Мнішак.

— Тут не трэба нават дужа разбірацца ў вайсковай справе і многа думаць, — адказаў Ян Караль, — каб умацаваць наш дом, які і так вельмі выгадна размешчаны. Падступы да яго з усіх бакоў загароджаны другімі дамамі, прылеглыя вуліцы цесныя. Самая шырокая з іх, тая, што перад Замкавай, ужо напалову занятая нашымі атрадамі і вартай. З якога боку ім падступіцца? Дзе яны паставяць

войскі і па кім будуць страляць? Нашы схаваюцца за сценамі, адмыслова ўмацаванымі, зверху яны могуць бесперапынна страляць з ручной зброі, гакаўніц і марцір, будуць спакойна сядзець сабе і нічога не баяцца. Як у бога за пазухай, калі гаварыць коратка. А што, каралеўскія лісты перадалі ўжо? — спытаў ён, хвіліну памаўчаўшы.

— Яшчэ не, — адказаў кашталян. — Напэўна, чакалі вас, каб уручыць усім адразу.

— Сенатарам далі строгі наказ ад яго вялікасці караля нс дапусціць вайны і сутыкнення.

— Я сумняваюся, што загады могуць неяк падзейнічаць на канфедэратаў, — адказаў Ян Караль. — Але пажывём — убачым. А што робіць князёўна?

— Учора я праведаў яе, — прамовіў кашталян. — Яна баіцца, трывожыцца, вядома — жанчына.

— Вы даведаліся, пра што яна думае?

— Усё пра тое ж!

— Яна хацела б, — запальчыва ўсклікнуў Ян Караль, — стаць на іх бок, быць таго не можа!

— Пасля нядаўняй гутаркі з ёй я думаю іначай, — спакойна адказаў кашталян. — Я прыходзіў да яе з айцом Руцкім, і ён пераканаўча растлумачыў ёй, якім грэшным і незаконным будзе іх шлюб.

— А яна згадзілася?

— Я не сумняваюся ў гэтым. Яна па-ранейшаму кахае князя Януша, але набожнасць будзе ўтаймоўваць яе пачуцці. Сапраўды, нават каб яе і аддалі замуж за князя, усё роўна давялося б прасіць дазволу ў Рыме.

Ян Караль задумаўся, нешта насцярожыла яго. У гэтую хвіліну прыдворны абвясціў, што прыйшлі князь Мельхіор Гедройц, маршалак Дарагастайскі і абодва Завішы.

Ян Караль пайшоў сустракаць іх да лесвіцы, кашталян стаў каля дзвярэй пакоя. Першы ўвайшоў біскуп, на ягоным лагодным твары свяцілася ўсмешка, за ім ішлі астатнія паслы. Пасля звычайных прывітанняў і агульных слоў яны падалі лісты ад караля. Жмудскі біскуп, уручаючы лісты Хадкевічам, ад імя караля і дзяржавы прасіў і ўгаворваў іх не пачынаць вайны.

— Гэта быў бы першы і страшэнна жахлівы выпадак у нас, і хто можа прадказаць яго вынікі? Цяжкі груз ляжа на

сумленне таго, хто дзеля дробнай спрэчкі ўздыме зброю на брата.

— З гэтым, вашамосць, вам трэба звяртацца не да нас, — нецярпліва перапыніў біскупа Ян Караль. — Мы не пачынаем вайны, смуткуем з прычыны прыкрага непаразумення, але што ж нам — здацца, не абараняючыся?

— А вы першыя падайце прыклад падпарадкавання яго каралеўскай вялікасці, згаджайцеся на мір!

— На мір! — усклікнуў жмудскі стараста. — Гэта было б для нас найбольшай ганьбай — першым падаць ім руку!

— Гэта было б прыкладам сапраўды высакароднага хрысціянскага ўчынку! — запярэчыў Ян Завіша.

— Ну, ну! Цяжэй за ўсё спадзявацца на анёльскую дабрачыннасць людзей з плоці і косці, — прамовіў Дарагастайскі, які з самага пачатку не верыў, што жмудскі стараста паддасца на ўгаворы.

— Можам мы хаця б выкласці вам нашы ўмовы? — спытаў Гедройц.

— Мы з пашанай прымем іх, калі яны зыходзяць ад караля, з удзячнасцю — ад вас, але падумайце спачатку, ці не прынізяць яны нас. Гэта была б вялікая ганьба, калі б нас западозрылі ў тым, што мы вагаемся ці надта ўжо спяшаемся мірыцца.

— Чаго ж вы, пане кашталян, і вы, пане стараста, жадаеце?

— Вядома ж, справядлівасці, што тут доўга тлумачыць, — адказаў Ян Караль. — Што да ўмовы наконт выдання князёўны, то хай яна сама вырашае, хоча яна выйсці замуж за князя Януша ці не. Мы ні прымушаць, ні ўгаворваць яе не будзем. Яна ўжо дарослая, яе воля рашаць. Але ж калі яна і згадзіцца выйсці замуж, іх шлюб усё роўна будзе незаконным і не можа адбыцца без спецыяльнага дазволу. Што да нас, то вы самі бачыце, да чаго нас давялі паны Радзівілы. Да даўгоў і закладу бацькоўскіх маёнткаў, да найму вялікага войска, незлічоных выдаткаў, да гэтай вайны. Усе суды і сам Трыбунал у руках ваяводы, усюды нас судзяць як хочуць — не дзеля справядлівасці, а дзеля сваёй патрэбы, спаганяюць з нас нейкія даўгі, велізарныя сумы, хочуць адабраць нашы маёнткі, пагражаюць баніцыяй. Які ж тут можа быць мір пасля ўсяго гэтага? Ці можам мы ва ўсім саступіць ім і нават слова не сказаць?

— Праўда ваша, — прамовіў Ян Завіша, — ніхто і не патрабуе ад вас, каб вы занядбалі свае інтарэсы, але ж хіба нельга паставіць праз пасрэдніцтва ўмовы, якія Радзівілы маглі б прыняць і якія задаволілі б вас?

— Спачатку мы паглядзім, чаго хочуць ад нас князь-ваявода з сынам.

— А вы падайце прыклад, — перапыніў біскуп, — пакажыце ім, што вы найперш думаеце пра спакой для краіны, а потым пра ўласныя інтарэсы. А якія ў вас умовы?

— Нашы ўмовы не могуць быць нічым іншым, як толькі адказам на іх патрабаванні, — зазначыў Ян Караль. — Мы ім неаднойчы паўтаралі тое, што толькі што сказалі вам. Пра лёс князёўны: яна павінна вырашыць яго сваёй воляй. А з намі хай скасуюць і спыняць усе судовыя справы, знімуць прэтэнзіі, адменяць праследаванне, заплацяць за панесеныя страты, спрэчку ж мы вырашым палюбоўна.

— Я так думаю, — прамовіў Дарагастайскі, — паны Радзівілы перш за ўсё захочуць упэўніцца, што вы аддасцё князёўну Соф'ю за князя Януша, а тады ўжо, мабыць, згодзяцца і на вашы ўмовы. Вось у чым павінна быць поўная яснасць.

— Калі князёўна захоча сама, а Папа дазволіць, то калі ласка! — сказаў кашталян і зірнуў на Яна Караля.

— Вось тады яе можна будзе выдаць замуж, — дадаў жмудскі староста.

— Князь-ваявода тым не менш хацеў бы споўніць шлюбны абрад у тэрмін, вызначаны вашай дамовай, — зноў азваўся Дарагастайскі. — Рэлігійныя пастановы яго не цікавяць.

— А законы дзяржавы?

— Яго каралеўская вялікасць зробіць выключэнне для паноў Радзівілаў і дасць спецыяльны дазвол.

— Але ж яго яшчэ няма?

Дарагастайскі нічога не адказаў.

— А пакуль давядзецца чакаць дазволу з Рыма, вы дазволіце князю Янушу бываць у князёўны Соф'і? — асцярожна спытаў біскуп.

— Наконт гэтага яны ўжо прысылалі цэлае пасольства, — паведаміў кашталян. — Мы сказалі тады і паўтараем цяпер: адкладзём да паўналецця і да канца гэтай справы. Пабачым: дойдзе да шлюбу, дык дойдзе, а цяпер — навошта гэта? Больш шкоды, чым толку.

— Ваявода вельмі сумняваецца, як бы нейкі выпадак не стаў прычынай адкладу таго шлюбу, але ён, як і раней, будзе абавязкова патрабаваць дазволу для Януша праведваць Соф'ю, я з ім нядаўна гутарыў пра гэта, — перапыніў кашталяна Дарагастайскі.

Хадкевічы маўчалі, пазіраючы адзін на аднаго.

Сандамірскі ваявода падышоў да кашталяна і зашаптаў яму на вуха:

— Што вам перашкаджае дазволіць, калі яны будуць сустракацца ў прысутнасці каго-небудзь з вас? Калі вы не згаджаецеся нават на гэта, то будзьце ўпэўнены, што яны не прымуць і іншых умоў. Дазвольце. З вашага боку гэта не будзе прыніжэннем, а для міру гэта добрая падстава.

— Я не баюся і вайны, — адгукнуўся кашталян.

— А яна вам патрэбна? — спытаў Мнішак. — Пэўна, што не. Зрабіце тое, што вам дазваляе ваша годнасць, і ніхто вас за тое не папракне.

Пакуль сандамірскі ваявода ўгаворваў кашталяна, падобнымі словамі і аргументамі стараліся пераканаць Яна Караля сівы біскуп разам з Янам Завішам.

Потым паслы раіліся між сабой, а кашталян пашаптаўся з Янам Каралем.

Праз якую хвіліну яны прынялі ўмову.

— Мы згодны, — сказаў жмудскі стараста. — Мы пагаджаемся на тое, каб князь Януш праведваў князёўну ў нашай прысутнасці і з нашага ведама. Спадзяёмся, што большай уступкі вы ад нас не запатрабуеце. А нашы ўмовы такія. Ваявода верне нам усе распіскі і заклады, скасуе іх па закону і адмовіцца ад іх, не будзе судзіцца, не запатрабуе ад нас ніякіх выплат, спыніць цяжбу за Копысь, заплаціць нам за нанесеную ім шкоду. Князь Януш можа наведваць князёўну ў нашай прысутнасці, калі ж будзе атрыманы дазвол ад Папы Рымскага і князёўна сама згадзіцца на шлюб, тады мы аддамо яе за князя Януша.

Пакуль Ян Караль пералічваў умовы, Завіша старанна запісваў. Паслы болей ні пра што не загаворвалі і праз хвіліну пайшлі. Стаяў позні вечар, калі за імі зачыніліся вароты камяніцы Хадкевічаў.

Канец 2-га тома

## ТОМ 3

### Паздзел 1

### ПЯТАГА ЛЮТАГА

Назаўтра ўранку біскуп з абодвума Завішамі і маршалкам Дарагастайскім падаліся да Радзівіла. Ваявода прыняў іх з належнай пашанай, але адчувалася і нейкая халаднаватасць. Лісты ад караля ён адразу ж прачытаў і звярнуўся да біскупа:

— Яго каралеўская вялікасць сваёй вялікай ласкай хоча дапамагчы нам, хоча, каб мы прыйшлі да згоды; аднак жа гэта не тая справа, якую можна вырашыць загадам, толькі мы лепей за ўсіх ведаем, як яе скончыць. Чужая рана нікому не баліць, хоць так і хочацца загадаць, каб хворы не енчыў. А хіба гэтым яго вылечыш?

— Князь-ваявода, — паважна і лагодна адказваў біскуп, — яго вялікасць кароль ведае пра вашы раны, і ён пакуль што не загадвае, а просіць вас зрабіць усё магчымае, каб з асабістай справы не разгарэлася ў краіне грамадзянская вайна. На вас мы асабліва спадзяёмся, таму што вы, пане ваявода, першы пачалі сцягваць войскі, падалі дрэнны прыклад.

Ваявода перапыніў яго.

— Гэта мая справа, і я нікому не дазволю ўмешвацца ў яе, — амаль катэгарычна сказаў ён. — Парады яго вялікасці караля я з удзячнасцю прымаю, але што рабіць далей, мне прадыктуе мой абражаны гонар, толькі яго я і паслухаюся.

— Паслухайце, аднак, і тых, хто жадае вашай мосці дабра, — прамовіў Дарагастайскі. — Справа зусім не ў тым, каб некага прынізіць, ніхто гэтага і думаць не думае. Тое, што робіцца, робіцца толькі дзеля таго, каб, як кажуць, і козы былі сытыя, і сена цэлае. Можна ж урэшце знайсці такое выйсце, якое задаволіла б і вас, і Хадкевічаў, дазвольце нам хаця б паспрабаваць, вы ад гэтага нічога не страціце.

— Сапраўды, вас ніхто ні да чога не прымушае і нікуды вас сілай не цягнуць, — дадаў Завіша. — Тое, што вам прапануюць, вы павінны прыняць толькі па добрай ахвоце.

Аднак жа вы, пане ваявода, нават не хочаце паспрабаваць прыйсці да згоды!

— Я ўсёй душой хачу гэтага! — усклікнуў Радзівіл. — Я таго і сам жадаю, але згаджуся на тых умовах, якія прапаную я сам, калі іх не выканаюць, то вы, васпане, нічога не даможацеся.

— Дазвольце даведацца, — спытаў біскуп, — якія вашы ўмовы?

— Няма сэнсу раскрываць іх, — горда адказаў ваявода, — бо Хадкевічы не прымуць іх. Гэта яны, толькі яны адны далей за ўсіх стаяць ад паразумення і міру; яны адны толькі шукаюць прычыну для вайны, нават калі мы ім у нечым уступім, яны не будуць гэтаму рады і ўсё роўна прымусяць нас увязацца ў гэтую няшчасную вайну! Так-так! Бо чаму ж яны ўвесь час адмаўляюць нам, чаму мая апошняя спроба, калі я папрасіў дванаццаць паноў сенатараў быць пасрэднікамі паміж намі, каб яны прыслухаліся да нашых прапаноў і просьбаў, нічога не дала, яны пагардліва адштурхнулі працягнутую ім руку. Не ўгаворвайце мяне паўтарыць гэтую спробу, я болей не зраблю ніводнага кроку насустрач ім.

— А калі б яны цяпер зрабілі нейкія крокі насустрач вам, князь-ваявода? — спытаў Ян Завіша.

— Яны? Яны не зробяць гэтага! — запэўніў князь Януш.

— Вы іх, відаць, яшчэ мала ведаеце, — памяркоўна прамовіў біскуп. — А мы якраз і прынеслі прапановы ад іх, прапановы слушныя і памяркоўныя, на якія нельга не згадзіцца, — яны вас не прынізяць, не пакрыўдзяць, калі вы захочаце іх прыняць.

Ваявода пераглянуўся з сынам, яны абодва не маглі паверыць словам біскупа, на іх тварах чыталася здзіўленне з адценнем пагарды. Яны моўчкі чакалі, пакуль абяцаныя прапановы пакладуць на стол.

— Што б тое значыла, што Хадкевічы пайшлі нам насустрач?! — горда прамовіў ваявода, пазіраючы на пасланцоў караля.

Ян Завіша дастаў паперыну і падаў яе князю Радзівілу.

Той прагна схапіў яе, пачаў чытаць, князь Януш стаяў ззаду і таксама прабягаў вачыма напісанае. Па іх тварах

лёгка было зразумець, як яны ўспрымаюць зробленую ім прапанову прымірэння. Ваявода варушыў бровамі, жмурыў вочы, торгаў плячом, у яго нават задрыжалі вусны. На твары сына адбівалася не столькі абурэнне, колькі гордасць.

Бацька прачытаў паперу і перадаў сыну, сказаўшы з усмешкай:

— Вазьмі, зірні на гэты ходкевічаўскі трактат! Сапраўды, дзівосныя рэчы! Але які з яго толк, дзе тут прапановы, дзе тут нешта слушнае? Толькі тое, што яны літасціва дазваляюць князю Янушу бачыцца з князёўнай Соф'яй, а яшчэ нядаўна мы не маглі гэтага дапрасіцца. Ну, хай сабе, мы рады і гэтаму. Але ж усё астатняе — адна насмешка! Аддаць ім распіскі і дагаворы, скасаваць працэс, перадаць справу таварыству, паверыць у іх добрыя намеры, пакласці галаву пад меч, калі мы і самі здатныя дамагчыся справядлівасці! Ды яшчэ чакаць дазволу Папы Рымскага! Для мяне ваш Папа нічога не значыць, мне ягоны дазвол не патрэбны, прабачце, пане ксёнжа!

Гедройц стаяў моўчкі, апусціўшы галаву, здавалася, што ён у думках просіць Бога абразуміць вар'ятаў. Толькі Ян Завіша падаў голас:

— Перадаць справу таварыству, нам здаецца, не так ужо дзіўна і страшна, як вам, пане княжа. Што ж да справядлівасці, якую вы хочаце ўстанавіць самі, то паверце мне — яшчэ не было на зямлі такога анёла, які мог бы насуперак уласнаму сумленню быць суддзёй самому сабе. Я кажу гэта вам, пане ваявода, бо жадаю вам дабра.

Ваявода скрывіўся.

— А паколькі я жадаю вам дабра, — не зважаючы на грымасу ваяводы, працягваў Завіша, — я і сам сабе не раіў бы быць суддзёй у гневе, калі не ў ладах са сваімі ворагамі. Тым болей калі рассудзіць вас павінны меч і вайна?

— Вы ўвесь час талдоніце нам пра гэтую вайну, — перапыніў яго Радзівіл, — але ж нас да яе падбухторваюць, і яшчэ невядома, ці пачнём мы яе. Ні сабе, ні Літве, нікому я не жадаў бы яе.

— Дык дайце ж доказ вашым словам, — прамовіў біскуп, — дакажыце хаця б тое, што можна прыйсці да згоды, пакажыце сцежку да яе.

— Хай ён споўніць тое, што занатавана ў ягоных распісках і дамовах, і тут жа настануць мір і спакой, — сказаў

ваявода. — Мы тут жа іх знішчым, скасуем працэс, і па ўсім!

— А што, калі яны не могуць пайсці супраць свайго сумлення і выканаць гэтыя дамовы, бо лічаць іх несправядлівымі? — спытаў Завіша.

— Тады навошта жмудскі стараста і кашталян пісалі іх? — запярэчыў князь Януш. — Усё гэта было па добрай згодзе.

Памаўчалі. Потым загаварыў Гедройц:

— Значыць, вы нізавошта не прымеце гэтых прапаноў, князь-ваявода?

— Дык гэта ж насмешка, а не прапановы! — адразу ж адказаў Радзівіл. — Калі яны іх падавалі, загадзя ведалі, што мы іх не прымем. Мы бачым тут толькі дазвол князю Янушу бачыцца з князёўнай Соф'яй, на які яны хочуць злавіць нас, як на прыманку. Усё астатняе мог бы прыняць пераможаны, а не той, хто мае надзею перамагчы.

— Тады пашліце ім свой ультыматум, — прапанаваў Завіша і падступіў бліжэй да князя.

— А які з гэтага толк? — усумніўся ваявода.

— Паспрабуйце ўсё ж, — далучыўся да размовы Дарагастайскі.

— Дзеля дабра краіны і спакою ў ёй зрабіце гэта, мы просім вас, — прамовіў біскуп. — Пашліце свае прапановы. Вас гэта ні да чога не абавязвае, вы першы атрымалі ад паноў Хадкевічаў іх умовы, цяпер вы можаце паставіць свае.

Радзівілы пераглянуліся, затым ваявода пайшоў параіцца з сынам і брэсцкім ваяводам Зяновічам. Да гэтай рады далучыліся таксама смаленскі ваявода Абрамовіч і Леў Сапега. Паслы ў гэты час моўчкі чакалі.

Леў Сапега па сваёй схільнасці да прымірэння і згоды горача ўгаворваў цесця даць слушныя прапановы, не ўхіляцца ад міру, калі яго можна дасягнуць.

Нарэшце ваявода выйшаў да пасланцоў караля са сваімі прапановамі і сказаў ім:

— Вось вам мой ультыматум, які вы хацелі атрымаць. Калі вы як след падумаеце над ім, то мусіце згадзіцца, што ў маіх прапановах больш розуму і жадання прыйсці да згоды. З усім слушным я згаджаюся, усё слушнае выращу нават са шкодай для сябе. Верце мне, панове, я хачу міру,

а не вайны, але міру без уніжэння, міру без шкоды! Вось яны, мае прапановы:

"Калі кашталян адчувае і лічыць, што я абразіў яго асобу, калі так лічаць і нашы агульныя сябры, то я гатовы як мага больш урачыста, з захаваннем годнасці свайго роду і сваёй асабістай, ахвотна прызнаць гэта. Што ж да той шкоды і страт, якія панеслі паны Хадкевічы, калі наймалі салдат, судзіліся, то я магу па справядлівасці аплаціць іх, зраблю ўсё, што ў маіх сілах, каб гэтая справа была завершана. Калі маіх слова і абяцання будзе недастаткова, я прашу для большай пэўнасці свайго цесця князя-ваяводу кіеўскага і швагра князя-кашталяна кракаўскага паручыцца за мяне ў тым, што я стрымаю сваё слова".

— Калі яны згодзяцца на гэтыя прапановы, то хай не цягнуць з вяселлем! — дадаў ён і зірнуў на біскупа, які выслухаў яго спакойна і без здзіўлення.

— Дзякуем вам, вашамосць, за вашу памяркоўнасць, за тое, што зрабілі так, як мы прасілі, — сказаў біскуп. — Мы занясём вашы прапановы панам Хадкевічам і прыкладзём усе нашы намаганні для таго, каб яны іх прынялі. Не будзем утойваць, што мы не зусім упэўнены ў поспеху. А пакуль што яшчэ раз сардэчна дзякуем пану ваяводу.

Радзівіл пры гэтых словах схіліў галаву.

— Хіба з мяне гэтага яшчэ замала? — спытаў ён. — Удумайцеся ў тое, на што я іду, у маё становішча, бо я ўпэўнены ў сваёй праваце, і тады вы зразумееце, што я зрабіў вельмі многа.

Ніхто яму не запярэчыў, толькі Ян Завіша падышоў да яго з лістом у руцэ.

— Каб зблізіць вашу мосць з панамі Хадкевічамі, мала думак і прапаноў, пададзеных з абодвух бакоў, ніхто з вас не жадае саступіць, і хаця вы на словах выказваеце памяркоўнасць, але ўсё роўна стаіце на сваім. Дазвольце, вашамосць, нам, якія выступаюць тут ад імя яго каралеўскай вялікасці, падаць нашы прапановы, якія могуць быць прыняты каралём. Пра іх яшчэ не ведаюць паны Хадкевічы, мы іх ім не паказвалі, мы хочам, каб вы, ваша мосць, першым пазнаёміліся з імі і памеркавалі, ці зможаце іх прыняць. Мы падаём гэтыя прапановы вам першаму, як паслы паводле дадзенага нам права, падаём іх вашай мосці не ад Хадкевічаў, не ад сябе, а ад імя яго вялікасці караля.

— Ад яго вялікасці караля! — паўтарыў Радзівіл і дадаў: — Гэта тое самае, што і ад Хадкевічаў, бо мы ж ведаем, што яго сэрца належыць ім.

— Гэтак жа, як і ўсім іншым, — прамовіў біскуп. — У вачах і сэрцы караля ўсе яго падданыя роўныя між сабой.

— Роўныя! — зноў паўтарыў Радзівіл. — Каб жа так! Уся бяда ў тым, што не роўныя. Яго каралеўская вялікасць хоча, каб усе яго дзеці аднолькава маліліся, шанавалі пятніцу і суботу!

— А што ў гэтым дрэннага ці дзіўнага! — падхапіў Завіша. — Кожны лічыць сваю веру самай лепшай, без гэтага ніхто б не верыў. А раз ён так лічыць, то са шчырым парываннем хоча і ўсіх астатніх накіраваць на самы лепшы шлях.

Ваявода ўсміхнуўся.

— Чытайце сваё пасланне, — паблажліва сказаў ён.

Завіша прачытаў:

— "Гэтая справа павінна быць завершана на сейме. На сейме павінны быць вызначаны дзень і месца, прызначана пэўная колькасць асоб, каб яны выслухалі ўсе ўзаемныя прэтэнзіі, крыўды, спрэчныя справы дзеля таго, каб хоць часова памірыць абодва бакі. Калі ж сейм не здолее часова прымірыць іх, тады яго вялікасць кароль, як найвышэйшы арбітр, у іх прысутнасці вырашыць гэтую справу. Пры гэтым абодва бакі павінны з'явіцца перад каралём. А перад тым скласці зброю і спакойна разысціся, не спрабуючы распачаць вайну. Аднак сейм не будзе вырашаць, каму кашталян павінен аддаць руку князёўны, нікому яе не паабяцае, што да князя Януша, то яму будзе дазволена наведваць яе".

— З некаторымі пунктамі, так, толькі з некаторымі, я мог бы пагадзіцца, — тут жа азваўся ваявода, — але з усімі — наўрад. Асабліва вось з гэтым: каб свае справы аддаў на вырашэнне таварыству або каралю. Каралю, які ўсім сэрцам і душой на баку Хадкевічаў і будзе судзіць на іх карысць. Таварыству, якое не перажыло таго, што перажыў я, якому прымірэнне здаецца лёгкім, бо яму не баліць так, як мне. Ніколі! Ніколі я на такое не пайду! Лепей ужо на нешта іншае, чым на такія ўмовы, якія звязалі б мне рукі, вырвалі з іх меч і безабароннага аддалі на немінучую расправу і знішчэнне.

Прысутныя не асмельваліся нічога сказаць, а ваявода толькі трос паперай і паўтараў:

— "Ніколі! Ніколі!"

Пасланцы зразумелі, што толку ад далейшых размоў не будзе, і пайшлі. Яны ўзялі з сабой ліст з прапановамі ваяводы і з ім падаліся зноў да Хадкевічаў.

Князь Гедройц не даваў сабе ні хвіліны спачыну, пакуль яшчэ была надзея ўсталяваць мір і сваім пасрэдніцтвам хаця б прадухіліць пачатак міжусобіцы. Ён спяшаўся, таму што бачыў: заўтра Радзівілы могуць распачаць вайну, якую потым нічым не ўдасца спыніць, а шкода ўсёй краіне можа быць вялікая.

І як было не хвалявацца, калі дастаткова было зазірнуць у дварышча Радзівіла, каб зразумець, што там усё дыхае вайной, усё грыміць зброяй: кардыналія аж кішэла ад салдат, ротмістраў, палкоўнікаў, дварышча было завалена штабялямі рознай зброі і ваеннага рыштунку. У кожным кутку шапталіся і раіліся. Час ад часу спрабавалі віжаваць, падкрадаліся да камяніцы Хадкевічаў, назіралі, выведвалі, вярталіся назад, каб расказаць, што там дзеецца.

А вось у Хадкевічаў наадварот: як толькі размясцілі гарматы і войска, усё змоўкла і заціхла. Вароты ўвесь дзень былі на замку, абаронцы палаца спакойна адпачывалі. Толькі зрэдку нейкі шум ці крык далятаў да вуліцы. Усе, хто праходзіў каля камяніцы, здзіўляліся такому спакою напярэдадні вайны, пра якую тут нішто не нагадвала, хіба што некалькі гармат, якія стаялі на вуліцы каля варот, пры іх тапталіся некалькі салдат-ахоўнікаў.

Паслы тым часам выйшлі з кардыналіі і зноў вярнуліся да Хадкевічаў. Яны неслі ім двайныя прапановы — свае і Радзівілавы. Іх прынялі і правялі да кашталяна, у якога ў гэты час былі жмудскі і барысаўскі старасты і ваявода Мнішак.

Адказ Радзівілаў Хадкевічы ўспрынялі з прахалодай.

— Мы ведалі, што так і будзе, — сказаў кашталян. — Не хочам мы такога міру, хай жа на тое будзе воля Боская.

— Воля Боская не на тое, каб ваяваць, — зазначыў біскуп. — Дзеля ўсяго святога злітуйцеся над краінай, пастарайцеся не дапусціць вайны. Падумайце, можа, усё ж вы прымеце прапановы Радзівілаў? Няўжо яны здаюцца вам непрымальнымі?

— Мы не можам іх прыняць, — падаў голас Ян Караль, — ні ў якім разе.

— Чаму? — спыталі Завішы і Дарагастайскі. — Ваявода ж абяцае пакрыць усе выдаткі, калі ж ягонага слова вам мала, то ён дае заруку.

— Ён ведаў, што мы яму не паверым! — дадаў кашталян. — Але ўсё гэта без толку. Хай аддасць распіскі і дагаворы, спыніць судовую справу, аплоціць выдаткі.

— Усяго гэтага нельга зрабіць так хутка, — паспрабаваў пераканаць Дарагастайскі.

— Можна, яшчэ як можна, — не згадзіўся кашталян. — Абы толькі ваявода захацеў быць шчырым. Але ўсё гэта — толькі для віду, Радзівілы прагнуць вайны, дзеля чаго ж яны сцягнулі шэсць тысяч войска; яны хочуць смуты, хочуць адным махам вырашыць і свае справы, і справы канфедэрацыі. Гэта ж ясна як дзень.

— Тым больш трэба пазбегнуць вайны, — прамовіў біскуп. — У нас ёсць прапановы ад паноў пасланнікаў да караля. З імі ўжо знаёмы ваявода Радзівіл. Паглядзіце і вы.

Пасля таго як Хадкевічы пазнаёміліся з прапановамі пасрэднікаў, Ян Караль сказаў:

— Мы ахвотна згадзіліся б на суд яго каралеўскай вялікасці, але ж нашы ворагі адразу ж папракнуць, што мы сумысля звярнуліся да суддзі, які мае да нас большую прыхільнасць, чым да іх. Што да суда выбраных асоб, то наўрад ці здолеюць яны рассудзіць нас: яны не ведаюць і не могуць ведаць, што нас падзяляе, чым мы абураемся. Мы не будзем і не хочам гаварыць з імі пра свае крыўды, пра сваё доўгацярпенне. Хай нас рассудзіць меч, як было даўней. Гэта будзе самы лепшы Божы суд!

Дарэмна паслы некалькі гадзін угаворвалі, настойвалі, прасілі, дарэмна спрабавалі пераканаць кожнага паасобку.

Хадкевічы цвёрда стаялі на сваім, а Ян Караль усё паўтараў:

— Хочуць яны вайны, хай вайну і пачынаюць, кроў ляжа на іх душы, мы за яе не будзем адказваць перад Богам. Мы пакрыўджаны несправядлівым судом, прыцягнуты да Трыбунала, нас вымушаюць выплаціць штраф, нам пагражаюць баніцыяй. Бог бачыць, што мы перацярпелі, і Бог будзе за нас.

— Князь-ваявода хоча памірыцца з вамі, хоча аплаціць вашы выдаткі!

— Але як памірыцца? — усклікнуў Ян Караль. — Сказаць нам: "Прабачце"? Кіўне галавой — і па ўсім? Ён павінен прасіць у нас прабачэння на каленях.

— Пан староста, трэба па-хрысціянску дараваць вінаватаму.

— Я дарую яму перад Богам, але не дарую перад людзьмі. Што б гэта рабілася далей, каб было дазволена халодным паклонам пакончыць з усімі правіннасцямі? Што засталося б ад нашай годнасці? Гэта ж абраза нашых родаў і імён! Нашы дзеці сароме́ліся б насіць імя, апаганенае сорамам такога прыніжэння. Настаў бы час, і пра нас сказалі б, што мы прынялі тое, што нам кінулі з літасці, таму што спалохаліся. Але ж не, нікога, апрача аднаго Бога, мы не баімся! Хочуць вайны, то і мы не будзем дрыжаць, адплацім панам канфедэратам як належыць.

Да позняй ночы цягнуліся марныя ўгаворы і просьбы. Паслы караля дарэмна стараліся дамагчыся міру перад самым вызначаным тэрмінам, дарэмна спрабавалі скарыстаць самыя розныя спосабы, кашталян і Ян Караль заставаліся няўмольнымі.

Біскуп Гедройц пакідаў камяніцу Хадкевічаў не ў лепшым настроі.

— Мы зрабілі ўсё, што маглі, — сказаў ён Завішу, — і ўсё дарэмна. Заўтра можа быць страшны дзень, і наша месца — каля ваяводы, каб не даць яму ўзняць меч. Калі будзе трэба — грудзьмі станем перад іх гарматамі, і хай страляюць, калі хочуць. Хіба ж мы можам дазволіць пачаць такую смуту ў краіне, даць такі згубны прыклад?

— Не павінны дазволіць, — адказаў Завіша, — але я сумняваюся, што яны нас паслухаюць.

— Пра гэта лепш не думаць, — перапыніў яго біскуп. — Пойдзем заўтра зранку да ваяводы і будзем у яго ўвесь дзень, кроку ступіць не дамо без нас. Імем караля забаронім яму брацца за зброю, ні на крок не адступім ад яго, можа, тады яго пройме выратавальны сорам.

— Каб даў Бог! — згадзіўся Дарагастайскі. — Абодва бакі настолькі раз'юшаны, што ўжо болей няма на што спадзявацца. Але што будзе, тое і будзе!

З гэтым і разышліся.

Паздзел 2

## У КАРЧМЕ МАЛЬХЕРА

Якраз насупраць камяніцы Хадкевічаў стаяў шынок пана Мальхера — адзін з самых вядомых у горадзе. Тут гандлявалі віном і медавухай. Усе гэтыя дні ён быў набіты людзьмі самага рознага роду і звання; цесната і гоман — несусветныя, усе памяшканні занятыя, да сталоў не працісьнуцца, усе лаўкі, зэдлі і ўслончыкі разабраныя; праз натоўп не прабіцца, з-за гоману нічога не чуваць. У адным кутку ўжо наспявае бойка, хапаюцца за шаблі, ссоўваюць набакір шапкі, падкручваюць вусы, грозна стаяць адзін супраць аднаго. А ў другім — замілаванае дружбацтва, гарачыя абдымкі, расчуленыя слёзы над збанком віна. Дзесьці яшчэ — патаемныя перашэптванні, і з усіх бакоў чуюцца крыкі:

— Пан Мальхер, бутлю ковенскага мёду!

— Падайце сюды віна!

— Два кубкі для нас!

— Чорнага з карэньчыкам сюды!

— Вы наступілі мне на крысо!

— Не тыкайце мне, васпане!

— Пазыч мне сто тысяч, а не то замалюю па лбе!

І гэтак далей...

Пасярод аднаго з пакояў каля шырокага каміна, у якім шугаў агонь, стоўпіліся салдаты і са смехам і крыкамі гулялі ў косці. Воддаль ад іх спрачаліся карцёжнікі з плоймай гледачоў, на покуці нехта штосьці весела расказваў — каля яго таксама сабралася купка цікаўных.

У самым цёмным кутку сядзеў пан Брожак. Звесіўшы галаву над кубкам кісленькага вінца, ён увесь час уздыхаў — ніяк не мог забыцца пра таго духа, які наваражыў яму смерць, і стараўся ўтапіць гэты ўспамін у віне.

"Навошта паміраць і дзеля чаго паміраць? — пытаў ён самога сябе. — Ці так ужо я зажыўся на гэтым свеце, ці так нагуляўся, ці так награшыў? Як быццам бы не. Дык навошта я так спатрэбіўся таму свету, хіба я на гэтым ужо ні да чога не здатны? Дальбог жа, не разумею".

Па меры таго як пусцеў кубак, ён суцяшаў сябе, паддаваў сабе смеласці:

"Быць таго не можа, каб я ды памёр! Я так добра пачуваю сябе. Я дужы і здаровы. І зусім неабавязкова таму духу было прарочыць мне смерць. Можа, гэта была перасцярога, а можа, і зусім усё гэта мне выдалася, бо ўсе кажуць, што я пляту лухту, мне ніхто не дае веры. І ўсё ж я духа бачыў, прычым п'яны не быў, гэта святая праўда".

Так ён сядзеў і размаўляў сам з сабой, як раптам у дзвярах карчмы ўбачыў Тамілу. Брожак усміхнуўся, устаў з зэдліка, паклікаў яго да сябе:

— Прывітанне! Я вас чакаю!

— Сам Бог мне вас паслаў! — адказаў Таміла. — Я якраз шукаў вас, каб сустрэцца і пагутарыць. Вы мне, васпане, вельмі патрэбны.

— Навошта? — спытаў Брожак. — Калі наконт таго, каб пазычыць грошай, то адразу скажу як на духу: ні шэлега пры душы няма. Апошні талер нядаўна аддаў на імшу, а платы за службу яшчэ не хутка дачакаюся, цяпер яе патрэбна плаціць войску, прыдворныя мусяць пачакаць.

— О, справа зусім не ў пазыцы! — запэўніў Таміла. — Вось толькі не ведаю, як бы мне вам растлумачыць...

— А што такое? Што вы ўжо такое мудрае хочаце расказаць?

Таміла памаўчаў, потым прапанаваў:

— А ці не замачыць нам спачатку гэтую справу? Віно развяжа мне язык і раскрые ваша сэрца.

— А што, — спытаў Брожак, — для гэтай справы патрэбна і сэрца?

— Крыху, — з усмешкай шапнуў Таміла і паклікаў гаспадара: — Пане Мальхер, кварту добрага віна!

— Нясу, нясу! Зараз.

Праз хвіліну ўжо стаяла на стале віно.

Таміла падпаіў Брожака і пачаў тлумачыць яму сваю справу:

— Вось што я вам скажу: ці не хочаце вы зарабіць крыху чырвоных венгерскіх злотых?

— З вялікай ахвотай! — усклікнуў Брожак. — У кішэні пуста, локці на будзённай апранасе выцерліся. Але хацелася б і зарабіць добра і не ісці супраць сумлення.

— Сумленне вашай мосці нават не будзе нічога ведаць пра той заробак, — запэўніў Таміла. — Справа ў тым...

— Кажыце хутчэй, не цягніце!

— Справа ў тым, што мне трэба з вашай дапамогай трапіць у камяніцу Хадкевічаў, а потым выйсці з яе.

— Што? Што? — перапытаў Брожак, бо не пачуў ціхага шэпту Тамілы. — Як гэта? Навошта?

— Ні навошта, ні як, я не скажу, бо вам не трэба таго ведаць. Зробіце або не?

Брожак так задумаўся, што забыўся пра недапіты кубак.

— Эге ж! А ці не пахне тут здрадай? — загаварыў ён нарэшце. — Скажыце мне, пане, хто вы? Дагэтуль я не пытаўся, думаў, што вы проста цудоўны хлопец, ды і ўсё тут. Але зараз вам трэба сказаць, хто вы і навошта вам трэба патрапіць у нашу камяніцу?

— А ці так ужо вам трэба гэта ведаць? — спытаў Таміла.

— Я абавязаны даведацца, — настойваў Брожак.

— Вып'ем яшчэ, а тады я вам усё чыста раскажу.

— Сапраўды, вып'ем.

— Раскажу ўсё, толькі сачыце, каб нас ніхто не падслухаў. За вас, пане Брожак!

— Ваша здароўе!

— Я небагаты сваяк, далёкая радня пану канцлеру.

— Што вы кажаце?

— Шчырая праўда, — запэўніў Таміла. — Пры ягоным двары я досыць значная асоба.

— Ваш канцлер супраць нас! — перапыніў яго Брожак. — Ён зяць ваяводы.

— Але ж ён каталік.

— Ну, каталік. Гэта праўда. А навошта вам трэба ў камяніцу?

— Сказаць вам усю праўду?

— Якраз гэтага я і хачу.

— За вас, пане Брожак.

— Ваша здароўе! А як вас клічуць?

— Мяне? — спытаў Таміла.

— Вас.

— Клічце мяне... Але выпіце яшчэ, вы не дапілі свайго кубка.

— Вы сабе яшчэ ні разу не падлівалі... а мне — двойчы. Дык як жа вас клічуць, скажыце нарэшце.

— Клічце мяне... — Таміла ніяк не мог падабраць сабе імя. — Я завуся Ян.

— Ян? А прозвішча?

— Грачына. ("Няхай будзе так",— падумаў Таміла.) Толькі не называйце майго прозвішча ў карчме, — ціхім голасам дадаў ён.

— Так-так, я пастараюся, пане Грачына. Дык што ў вас за інтарэс да нашай камяніцы?

Таміла нахіліўся і прашаптаў яму на вуха:

— Чорныя вочы!

— Што? Вочы? Як гэта — вочы?

— Я кахаю адну дзяўчыну з акружэння князёўны і хацеў бы ўбачыць яе.

— Скажыце мне толькі — якую, — зацікавіўся Брожак.— Я іх там усіх ведаю. Князёўна раз-пораз пасылае мяне ў горад то за тым, то за гэтым. Як яе імя?

— Імя? — задумаўся Таміла, чухаючы патыліцу. — Хіба вы не вып'еце яшчэ, пане Брожак? За вас!

— Ваша здароўе, пане Грачына!

— Цішэй, ніякіх імён!

— О, я й забыўся! Дык як яе імя?

— А вы ўгадайце!

— Але ж іх там цэлы тузін, тых паненак, і ўсе — як лялькі. Хто тут угадае, якая з іх прыйшлася пану даспадобы.

— А вы ўсё ж паспрабуйце.

— Можа, панна Малгажата, высокая брунетка? Толькі яна занадта бледная.

— Не, не яна.

— Вясёлая Ульяна?

— ?

— Яна тоўсценькая такая, маленькая бландзіначка.

— Угадалі.

— Няўжо?

— Навошта ж мне маніць, я сапраўды хачу ўбачыць яе хаця б здалёку, а дзеля гэтага мне трэба пракрасціся разам з вамі ў камяніцу.

— Вам не ўдасца сустрэцца з ёй, там іх строга пільнуе ахмістрыня!

— Я выведаў бы, дзе цяпер жыве князёўна разам з імі, — сказаў Таміла, — бо іх перавялі некуды ва ўнутраныя пакоі.

— Я вас правёў бы, — пасля хвіліннага роздуму прамовіў Брожак, — але ж сторaж каля варот кожны раз пытаецца, хто ідзе.

— А вас ён ведае?

— А як жа. Каб і не ведаў, то па прыдворным адзенні пазнае і пусціць.

— А ведаеце што? — усклікнуў Таміла.

— Ну?

— Дайце мне ваша адзенне, я на хвілінку туды зазірну і тут жа назад.

— Эге! А што, як да вас загаворыць нехта з прыдворных як да свайго, а вы не зможаце выкруціцца? Ён вас схопіць, трапіце ў бяду, а з вамі і я.

— За гэта можаце не хвалявацца, — адказаў Таміла. — Я змагу даць рады. Цяпер цёмна, наўрад ці хто будзе прыглядацца да майго носа, калі ж зачэпіць, нашто ў мяне галава на плячах?

— Я ўсё ж баюся, каб хаця чаго не здарылася.

— Ваш кубак поўны! — здзівіўся Таміла. — Нешта вы сёння зусім не п'яце.

— Ды што вы, у мяне ўжо аж галава кругам ідзе.

— За вас, пане Брожак! Ну дык што, дасце вы мне на паўгадзінкі сваё адзенне?

— Страшна, халера на яго.

— Чаго вам баяцца, я ж пайду, а не вы. Прытым я вам абяцаю, што праз паўгадзіны вярнуся.

— І што вам так карціць сустрэцца з той Ульянай? Можа стацца так, што вы яе і не ўбачыце.

— Пойдзем і памяняемся адзеннем. А потым я вам пастаўлю яшчэ адну кварту, і пяць чырвоных злотых будзеце мець.

Пан Брожак хаця і быў зусім п'яны, але ўвесь час адчуваў, што робіць нешта дрэннае. І ўсё ж ён не змог не паддацца на ўгаворы, пайшоў у бакоўку, зняў там сваё адзенне і перадаў яго Тамілу, а сам апрануў ягоную апанчу. Потым ён зноў усеўся за сталом, трымаючы кубак у адной руцэ, а другой намацваючы злотыя ў кішэні.

Таміла не забавіўся ў бакоўцы. тут жа выбег, але хутка вярнуўся.

— У вас там ёсць нейкі пароль? — спытаў ён у Брожака. — Скажыце мнс яго. каб я мог прайсці праз вароты.

— Белая царква, — прашаптаў яму на вуха п'янтос і прыклаў палец да вуснаў.

Таміла хутчэй здагадаўся, чым даслухаў, ён дужа спяшаўся, праз хвіліну зноў быў на вуліцы і шпарка пашыбаваў да камяніцы Хадкевічаў. Ён ішоў так упэўнена і смела, што вартавыя толькі глянулі на ягонае адзенне і без слоў прапусцілі яго. Аднак вартаўнік праз акенца ў браме спытаў у яго пароль.

— Белая царква! — смела адказаў Таміла і ступіў на дварышча. Тут ён разгледзеўся па баках, а потым спехам пайшоў уздоўж сцяны, не мінаючы ніводнага куточка. Дзёрзка і адважна праціскаўся ён сярод салдат і коней, якіх было біткам набіта ў двары, мінаў складзеную ў кучы зброю. Ніхто яго не закрануў, і ён нікога. Так ён абышоў абодва дварышчы, паглядзеў, дзе расстаўлены гарматы, дзе падрыхтаваны месцы для салдат на сценах, і рашыў, што пара вяртацца назад да варот з боку Замкавай вуліцы. На гэты раз ён пайшоў ужо напрасткі, пільным вокам пазіраючы на высокія сцены, на салдат, якія снавалі туды-сюды. Ягонае вока не мінула нічога з таго, што ён яшчэ не бачыў, праходзячы ўздоўж сцяны. Таміла выйшаў гэтак жа, як і ўвайшоў, толькі яшчэ раз паўтарыў пароль, выскачыў на вуліцу і паспяшаўся ў карчму Мальхера, дзе пан Брожак яшчэ пацягваў віно з кубка, баючыся дапіваць, каб знянацку не аказацца без галавы.

— Ужо вярнуўся? — усклікнуў ён, убачыўшы Тамілу. — Так хутка? Убачыў яе?

— Убачыў, — адказаў Таміла. — Бог аддзячыць табе за гэтую паслугу. Убачыў, што хацеў, а цяпер забірай свае лахманы і бывай здаровы.

— Навошта так спяшацца?

— У мяне няма часу.

Ён пераапрануўся, накінуў на плечы сваю апанчу і пабег да князя Януша, які і пасылаў яго.

Малады князь якраз у гэты час трымаў раду з палкоўнікамі і ротмістрамі, з панам Збарынскім і іншымі, як раніцой браць штурмам камяніцу, а тут пастукаў у дзверы і ўвайшоў Таміла.

— Што новага прынёс? — спытаў князь. — Можа, пра штосьці дачуўся?

— Нічога новага я не пачуў, але пабываў у камяніцы Хадкевічаў.

— Як ты туды прабраўся?

— Ну вось, прабраўся, княжа, — адказаў Таміла. — Галоўнае, што я там быў і, як змог, разгледзеў, што там робіцца. Прабег па абодвух дварышчах, паглядзеў, якія і дзе стаяць гарматы, дзе будуць пастаўлены салдаты.

— Ну і зух жа ты, Таміла! — усклікнуў князь. — Гэтай тваёй паслугі я ніколі не забуду. А цяпер хутчэй расказвай, нам гэтыя твае звесткі зараз самыя важныя.

— Войска ў камяніцы напхана многа, я ледзь прабраўся праз гушчу салдат, коней, кучы складзенай зброі. На сцены паўсцягвалі гарматы і рушніцы, нацэлілі іх на вуліцы, найбольш на прылеглыя, менш з боку царквы, там, здаецца, стаяць усяго тры гарматы; самая моцная абарона з боку Замкавай і Савіч. Добрыя ўмацаванні і ад плошчы і пабудоў князёў Астрожскіх. Пароблены скрытыя пляцоўкі для салдат, а таксама байніцы — такія, што ўзяць іх можна толькі тады, калі абваліцца сцяна, яны ж могуць беспакарана страляць у нас. Каля варот нацягнуты моцныя ланцугі, ляжаць жалезныя краты для таго, каб ахоўваць вароты нават тады, калі яны будуць разбітыя.

На дварышчах і каля сцен ляжаць горы ядраў і пораху, апроч таго, падрыхтавана шмат камення. Я думаю, што нездарма пастаўлены ў дварышчах і вялікія катлы — не інакш як на нашы галовы яны рыхтуюцца ліць вар.

Князь Януш пераглянуўся з іншымі.

— Каб гэта было ў полі, — прамовіў Збарымскі, — то там бы мы ім далі рады, хай бы выйшлі хоць бы за Вілію, а тут, у гэтай лісінай яме, іх ніякі чорт не возьме!

— Сапраўды, выкурыць іх адтуль будзе цяжка, — згадзіўся Таміла.

— Нічога страшнага! — супакойваў князь. — Разбурым дашчэнту пабудову, зробім пралом у сцяне і ўварвёмся праз яго!

— Прашу вас, пане, прабачыць, — запярэчыў Таміла, — тут нязручна рабіць пралом. Я невялікі ваяка і не дужа разбіраюся ў гэтых справах, але ж няма месца, дзе можна было б падступіцца да сцен. На вуліцах цесна, як у гарляку, калі п'еш. Нават калі мы і праб'ём дзірку, то не праб'ёмся ўнутр, бо і адтуль, і зверху на нас нападуць абаронцы.

— Раскладзём агонь і задушым іх дымам! — усклікнуў князь Януш і стукнуў кулаком па стале.

— Яны і агню не збаяцца! — прамовіў Таміла. — У іх ёсць чым яго пагасіць. Ды і не возьме іх агонь. А сядзець яны ў гэтай яме будуць да апошняга, іх нс так лсгка будзе выкурыць адтуль.

Князь паморшчыўся.

— Пачакаем да заўтра, а там пабачым, — сказаў ён. — Я схаджу да князя-ваяводы. А вас, панове, дзеля ўсяго святога, прашу стаяць напагатове са сваімі палкамі і аховай, кожнага на сваім месцы, чакаць загаду. Вам усім будзе своечасова сказана, што рабіць. Не давайце салдатам разыходзіцца па горадзе. Я ведаю, што ім зараз цяжка, хай жа будуць спакойныя і не крыўдзяць гараджан, бо і так цяпер на нашым сумленні і подзе будзе любая скарга жыхароў горада, якім даводзіцца перажываць цяжкую часіну.

Князь Януш кіўнуў галавой і подбегам пашыбаваў да бацькі.

Ваявода таксама раіўся з некалькімі сваімі прыхільнікамі наконт таго, што рабіць, бо заўтра спаўняўся тэрмін дамовы. Размова была гарачай. Прысутныя даводзілі, што лепей мір, чым вайна. Ваявода злаваў і нерваваўся. Па ўсім было відаць, што ў душы ён не толькі не хацеў вырашаць гэтую справу сілай зброі, але, даведзены да адчаю, ішоў на гэта супраць сваёй волі, а таму злаваў на самога сябе і быў усім незадаволсны. Ён баяўся пацярпець няўдачу з першых крокаў. У душы спрачаўся сам з сабой, баяўся ганьбы, не хацеў вайны, не ведаў, з чаго пачаць, але на словах выступаў за вайну і пагражаў ёю.

Князь Януш увайшоў якраз тады, калі ваявода адказваў Дарагастайскаму:

— Калі вы хочаце міру, то пакажыце мне шлях да яго! Угаварыце Хадкевічаў...

— Нават не думайце пра гэта! — з парога запярэчыў Януш. — Я толькі што атрымаў адтуль свежыя звесткі. Яны ўмацаваліся нібыта ад нападу татар. З усіх бакоў наставілі гармат, наносілі пад сцсны камення, перагарадзілі вароты ланцугамі і кратамі, збіраюцца ліць на нас вар! І народу ў камяніцы, нібы маку.

Ваявода незадаволена слухаў тое, што расказваў сын, яму хацелася лёгкай перамогі, яго злавала сама думка пра

доўгае супраціўленне, зацяжную вайну. Ён затросся, паціснуў плячыма і ўсклікнуў:

— Мы яшчэ паглядзім. колькі ім удасца пратрымацца! Заўтра ўбачым! Вы аддалі загад людзям? Яны будуць гатовы?

— Ім сказана чакаць загаду заўтра ўранні.

— Яшчэ раз напомніце ўсім, каб не бадзяліся абы-дзе, сабраліся на Лукішках, былі гатовыя па загаду выступіць на горад. Раз яны падрыхтаваліся, то і мы не праспім свой час, — дадаў ён, усё болей распаляючыся. — Калі ж пачнецца вайна, калі яна разгарыцца, тады сцеражыцеся, паны Хадксвічы. вы і ўсе іншыя. бо нікому не будзе даравана, не будзе літасці, і бяда вам, калі прайграеце!

## Паздзед 3

## ШОСТАГА ЛЮТАГА

Назаўтра яшчэ не развіднела, а па ўсім горадзе ўжо запаліліся агні, пачаўся нязвыклы рух, усё гэта азначала нешта незвычайнае. Тут і там па вуліцах ішлі вялікія атрады салдат, быў чутны грукат молата, гэта недзе спешна зачынялі вароты. У дамах, што стаялі паблізу ад верагодных ваенных дзеянняў, былі нават пазабіваны верхнія і ніжнія вокны, у больш аддаленых яны былі толькі знутры закладзены дошкамі. З камяніц, што стаялі паблізу дома Хадкевічаў, некаторыя жыхары нават выселіліся, пакінулі іх пустымі. Усё было падрыхтавана да штурму і баёў у горадзе.

Калі развіднела, вуліцы аказаліся зусім пустыя. Усё маўчала, ніхто не выходзіў з дамоў, ніхто не падаваў ніякіх прыкмет жыцця, толькі ў касцёлах і цэрквах, як штодня, азваліся званы, але на гэты раз яны дарэмна заклікалі да малітвы. Дзверы касцёлаў стаялі адчыненыя, але ніхто не прыходзіў, лаўкі пуставалі, і ксяндзы адпраўлялі імшу дзядам толькі з-пад бабінца*.

Што рабілася ўнутры дамоў і камяніц, цяжка апісаць; ноч прайшла без сну, дзень наступаў у страху і трывозе. Жыхары выглядалі праз шчыліны закладзеных дошкамі

вокнаў, каб убачыць, што робіцца на вуліцах, прыслухоўваліся, ці не чутно нечага такога, што сведчыла б пра пачатак вайны. Але ад самага рання было ціха, нічога надзвычайнага не дзеялася, толькі а дзевятай гадзіне, рана для гэтай пары, войска Радзівілаў з тупатам уступіла ў горад, заняло Сенатарскую і Святадухаўскую вуліцы, невялікі пляц перад царквой Багародзіцы, а таксама каля касцёла Святога Яна і пад замкам. Тупат нязвыкла гучаў у глыбокай цішыні, ён палохаў гараджан.

— Ну, усё, зараз пачнецца бітва! Ужо ідуць войскі Радзівіла! Ужо ідуць, ужо акружаюць камяніцу, — палохаліся жыхары.

Смялейшыя асцярожна выйшлі разведаць і пацвердзілі здагадкі. Войска ўжо стаяла ў горадзе.

А тым часам пасланцы ад караля спяшаліся да ваяводы. Біскуп Гедройц вырашыў не адступацца і лепей ахвяраваць у гэты дзень сваёй галавой, чым дазволіць узяцца за зброю. Стары ксёндз паклікаў абодвух Завішаў і разам з імі прыйшоў у кардыналію. Тут яны засталі вялікую раду, якая думала не пра захаванне міру, а пра тое, як лаўчэй падступіцца да нападу і штурму. Кожны прапаноўваў сваё, кожны разумеў гэтую справу па-свойму, але ўсе парады і прапановы здаваліся ваяводу непрыдатнымі. Ен хацеў адным махам напасці, разбіць, знішчыць, паланіць, перамагчы і ўвечары ўжо справіць вяселле. І ўсе цяпер дарэмна намагаліся давесці яму, што гэта немагчыма.

— З такім войскам, як наша, ды не змесці гэтую жменьку! — бушаваў ён.

— Ім дужа зручна абараняцца, а нам цяжка нападаць, — тлумачыў яму Дарагастайскі. — Што вы, вашамосць, тут зробіце, калі нават палова войска не змесціцца пад камяніцай, а для штурму і ўвогуле месца няма. Толькі нейкая тысяча зможа там падступіцца да сцен. А што там рабіць кавалерыі? З ёй добра развінуцца ў полі, а тут яна не пройдзе, на сцены не ўскараскаецца, няма каго ёй страляць і секчы.

— Першым чынам трэба высадзіць вароты! — выгукнуў ваявода.

— Вароты ахоўваюцца гарматамі, — заўважыў нехта. — Каля кожных штук па пяць. Мы не падступімся да

іх, многіх загубім. Яны пачнуць зверху з гармат, а як падыдзем бліжэй, то і зусім змятуць з ружжаў.

— А што, калі пачаць штурм з боку царквы, яны там больш за ўсё слабыя, — прапанаваў князь.

— З царкоўнага двара? — удакладніў Збарынскі. — Святары сказалі, што на дзядзінец яны нас не пусцяць, таму што як толькі з таго боку пачнуць страляць з гармат, то абавязкова пашкодзяць царкву, а яна пад апекай канфедэрацыі, вашамосць, напэўна, не захоча, каб яе знішчылі. Дах яе толькі нядаўна пакрылі гонтай, ледзь што — адразу пажар.

Князь Канстанцін Астрожскі, кіеўскі ваявода, пацвердзіў:

— Мніхі прыходзілі ўжо з гэтым да мяне, прасілі *saecuritatem* — недатыкальнасці — для дома Божага. І я паабяцаў, калі, не дай бог, дойдзе да вайны, то буду старацца, каб царкву ні ў якім выпадку не пашкодзілі. І гэта будзе справядліва, бо ў цэркваў і так столькі адабралі, а тут яшчэ і мы наробім шкоды. Я аддаў загад ротмістрам, каб царкву зберaглі.

— Мабыць, Хадкевічы ведалі гэта, таму і не ставілі там гармат! — зазначыў ваявода. — Да чаго ж разумныя! Тады, вашамосць, дайце параду, з чаго пачаць.

— Калі мы збіраемся пачынаць, — падаў голас вайскавод князя Астрожскага, — то трэба паспрабаваць узяць штурмам вароты з боку вуліцы Савіч. Так, мы страцім многа людзей, не без таго, можа, іх там паляжа дужа многа, але к вечару вароты ўзяць можна. Можа, калі яны ўбачаць, што мы ўзялі вароты, то выйдуць біцца з намі, а тады, калі бой завяжацца ў двары, нашы сілы зраўняюцца.

— Яны не выйдуць, бо пабаяцца, каб мы іх не акружылі, — прамовіў Збарымскі. — Жмудскі стараста не дасца так лёгка. Яны толькі дарэмна страцілі б многа людзей, бо мы з нашай сілай хутка адсеклі б іх і ўзялі ў "мяшок".

— Дык што вашамосць парадзіць? — спытаў у Збарымскага ваявода.

— Калі ўжо дойдзе да справы, — адказаў Збарымскі, — то трэба ісці на прыступ з усіх бакоў адначасна — і на вароты, і на ўсе сцены.

— Толькі загубім людзей, а нічога не зробім, — прамовіў нехта. — Усю сілу ў адно месца...

— А што ж, калі не толькі ўсімі сіламі ніяк не пойдзеш, а нават частку ў адным месцы не змясціць. Цесна, войску няма дзе развінуцца, будуць душыць адзін аднаго, у гэткай гламаздзе свой свайго не пазнае. А стоўпімся вось гэтак, і яны лёгка пераб'юць нас — дадуць некалькі стрэлаў, і мы ўсе паляжам, як снапы.

— А можа, усё ж парашым на тым, што пачнём атаку з боку царквы? — пасля хвіліны маўчання загаварыў адзін з вайскаводаў. — Там у іх самы слабы бок, яны кінуцца абараняцца туды, а ў гэты час другі атрад авалодае варотамі з боку вуліцы Савіч.

— Вы думаеце, што ў іх так мала людзей, што яны пабягуць абараняцца з боку царквы і нікога не пакінуць каля варот? Салдат у іх хапае, аж занадта, для абароны ўсяго дома.

Усе змоўклі. А потым зноў пасыпаліся розныя прапановы, але ні адна не давала пэўнасці ў тым, што камяніца будзе ўзята без вялікай страты людзей і доўгага бою. Ваявода губляў цярпенне, за размовамі ішоў час, сонца паднімалася ўсё вышэй, а яшчэ нічога не было вырашана. Войскі ў гэты час стаялі вялікай грамадой, чакалі загаду, ды яго ўсё не было і не было.

А ў камяніцы Хадкевічаў, здавалася, усё вымерла — панавала глыбокае маўчанне. Вароты былі зачыненыя, веснічкі закладзеныя, вокны пазабіваныя. На сценах зрэдзь часу паказвалася галава ў шышаку* або ў шлеме і тут жа знікшіа. Знутры не было чуваць ні бразгату зброі, ні конскага тупату. Ніхто не выходзіў у горад, і з горада ніхто не заходзіў унутр.

Але, нягледзячы на такую цішыню і маўклівасць, усё было ў гатоўнасці: салдаты стаялі на сценах, зброя зараджана, запалены кнаты для гармат. Сам Ян Караль у бліскучай іспанскай кірасе, па-мастацку аздобленай, пазалочанай, пахаджваў туды-сюды, аглядаў пазіцыі, правeрыў паробленыя спераду заслоны, паглядзеў, ці добра пастаўлены гарматы. З высокай вежы, збудаванай на рагу камяніцы, ён мог добра разгледзець падцягнутыя да яе войскі Радзівіла, якія займалі ладную прастору вакол. Разгледзеў і моўчкі спусціўся ўніз.

Пан Барб'е і Томаш Дамброва пасміхаліся:

— Вялікае, мабыць, замяшанне зараз у кардыналіі, бо не ведаюць, адкуль пачаць. Цвёрды ім дастаўся арэшак!

Заклапочаны жмудскі стараста нічога не адказаў на гэта, ён не звяртаў увап на француза, які крок у крок ступаў услед за ім і зазіраў у вочы.

Ён абышоў дварышча. яшчэ раз акінуў вокам сваіх людзей, што рыхтаваліся да бою; іх было поўна ўсюды, усе былі ўзброеныя, кожны нёс меч або цягнуў нейкі ваенны рыштунак, прыпасы.

Потым ён падаўся да брата і кашталяна, якія, як і ён, былі ў даспехах, пры шаблях, сядзелі і чакалі пачатку бітвы, сігналу брацца за зброю. Толькі сандамірскі ваявода як пасрэднік быў няўзброены, спакойпы і нс выглядаў гатовым да блізкага бою. Наморшчыўшы лоб, ён сядзеў воддаль ад іншых. абапёршыся на вялікую кнігу.

А князёўна? О! Для яе гэта быў жахлівы дзень. У жалобным строі яна ад самага рання стаяла на каленях перад абразом Маці Божай і малілася. Яе вочы пачырванелі ад слёз, яна ледзьве магла разгледзець ікону і лампаду пад ёй, заламваючы рукі, выпусціла малітоўнік, і ён упаў на падлогу. Яна хацела маліцца і далей, але ўжо не мела сіл, сто разоў пачынала і сто разоў бегла да акна, як толькі чула бразгат зброі, нейкі шум, глядзела, прыслухоўвалася, вяргалася. зноў укленчвала, зноў пачынала малітву, і зноў яе перапыняў грукат зброі.

Такі быў для яе. беднай сіраты, гэты дзень, пятнаццатая гадавіна з той хвіліны, калі яна прыйшла на свет.

Яе малітвы і жахлівае чаканне на нейкі момант перапынілі кашталян з ягонымі абодвума братамі — яны з'явіліся, холадна павіталіся з ёй і тут жа выйшлі. Князёўна зноў засталася адна перад іконай Маці Божай, зноў заламвала рукі і плакала. Гадзіны ішлі адна за адной, як стагоддзі, хвіліны цягнуліся бясконца, а над усім былі чаканне, няпэўнасць, страх. І ніхто не прыйшоў суцешыць яе, ніхто не абнадзеіў, ніхто нават не падзяляў яе трывогу і страх. З ёй маліліся яе служанкі, часам праз прыадчыненыя дзверы асцярожна зазірала пані Влодская.

А тым часам на радзе ў палацы Радзівілаў таксама ішлі гадзіны, заставалася нейкая рэшта кароткага зімовага дня, а шгурм усё не пачынаўся, войскі не зрушыліся з месца,

не наступалі. З вяршыні вежы некалькі разоў паглядаў Ян Караль і кожны раз бачыў іх на тых жа месцах.

— Што б гэта азначала? — пыталіся ў палацы Хадкевічаў.

— Што б гэта азначала? — шапталіся па горадзе.

— Будуць мірыцца, — пачыналі прадказваць тыя, хто заўжды спяшаецца вылезці ўперад са здагадкамі, апераджаючы падзеі.

Што ж было на самай справе? На радзе ніяк не маглі вызначыць, якім спосабам браць камяніцу, недаступную па сваім размяшчэнні ў цесным горадзе. Дарэмна ваявода націскаў, абураўся і прыспешваў. У марных спрэчках губляўся час. Біскуп скарыстаў зручную хвіліну і нагадаў, што, можа, увогуле не варта пачынаць вайны, не спытаўшы хаця б для праформы ў паноў Хадкевічаў, ці не задаволяць яны зробленыя раней дамовы. Яму хацелася выйграць час, ён бачыў, што рада не можа прыйсці да згоды, сутыкнуўшыся з цяжкасцямі ў самым пачатку вайны, абмеркаванне зацягваецца, урэшце можа скончыцца нічым і давядзецца разыходзіцца.

Ваявода падтрымаў біскупа і папрасіў некалькі прыдворных, каб яны схадзілі да Хадкевічаў і спыталі, ці выдадуць яны князёўну за князя Януша ў той дзень, які быў вызначаны даўняй дамовай. У гэтае пасольства ўвайшлі Крыштаф Зяновіч, Леў Сапега, львоўскі пісар Сташэўскі і Красіцкі.

Яны выйшлі з кардыналіі і пайшлі наўпрост да брамкі на Замкавай вуліцы, пан Сташэўскі пастукаўся. Але ўнутры панавала маўчанне, ахоўнікі паспяшаліся да жмудскага старасты з весткай, што з кардыналіі прыйшлі паслы і просяцца ўвайсці. Яны стукаліся яшчэ і яшчэ, чакалі досыць доўга, нарэшце староста выйшаў, брамка адчынілася, краты і ланцугі разгарадзілі. Пакуль займаліся гэтым, да варот падышлі таксама віленскі кашталян, пан Аляксандр Хадкевіч і сандамірскі ваявода. Ян Караль пасля таго, як загадаў адчыніць, пакінуў дзядзьку і вярнуўся ў дом. Паслы ўвайшлі праз браму, холадна прывіталіся, віленскі кашталян павёў іх направа да невялікага памяшкання, напаўсхаванага ў зямлі, з адным невялікім акенцам і прыступкамі, што вялі ўніз. Паслоў правялі сюды, каб

яны не хадзілі праз дварышча і не бачылі таго, што было зроблена для абароны.

— Мы не можам правесці вас далей, — сказаў кашталян, — таму прабачце, што прымаем вас так, але гэта не наша віна.

Пан Зяновіч і Леў Сапега моўчкі згадзіліся з ім. Потым канцлер загаварыў:

— Нас паслаў сюды князь-ваявода, які хоча яшчэ раз даведацца ад вас, пане кашталян, ці будзеце вы прытрымлівацца дадзенага слова і ранейшай дамовы. Ці хочаце вы выдаць князёўну сёння ж, зараз, за князя Януша?

— У гэтым — сэнс нашага пасольства, і мы чакаем вашага адказу, — дадаў Зяновіч.

— Адказ наш той самы, як і раней, — адразу ж пачаў тлумачыць кашталян. — Нядаўна мы вам, пане канцлер, гаварылі і сёння яшчэ раз паўтараем: час пакажа, хто і як трымаецца дамоўленасцей. Мы ад сваіх не адступаемся, чакаем князя Януша са сватамі. Паставім перад ім князёўну, здаровую целам і духам, без усялякага прымусу да шлюбу, хай яна сама скажа, ці па сэрцы ёй князь Януш. Вось так, мы трымаемся дамоў і распісак. А што да мяне, — дадаў ён, — шчыра скажу вашым мосцям, што я зусім не ведаю, нават не здагадваюся, што можа адказаць князёўна, бо я не пытаўся ў яе пра гэта.

Паслы здзіўлена пераглянуліся, яны чакалі зусім іншага адказу. Не ведалі яны, аб чым цяпер яшчэ гаварыць, чаго яшчэ дамагацца, кашталян на ўсё даў адказ.

— Паколькі я з'яўляюся апекуном, — дадаў ён, — і маю над ёй уладу, я мог бы прымусіць князёўну, але я не хачу гэтага рабіць, не хачу ёй нічога раіць, каб не браць грэх на душу, хай яна сама вызначыць сваю будучыню. Калі вы, панове ваявода і канцлер, хочаце, то схадзіце самі да князёўны і спытайцеся ў яе, што яна скажа пра князя Януша і шлюб.

— Нас паслалі не да князёўны, — прамовіў канцлер, — а толькі да вас, таму нам хопіць таго, што вы сказалі, з гэтым мы і паспяшаемся да князя-ваяводы.

Яны перакінуліся яшчэ парай слоў, развіталіся і выйшлі, з цікавасцю пазіраючы на перапоўненую салдатамі камяніцу.

— Што вы пра ўсё гэта думаеце? — спытаў Зяновіч у канцлера, калі яны выйшлі на вуліцу. — Што азначае такі адказ?

— Тое, што князёўна абавязкова адмовіць свайму нарачонаму, — ціха адказаў канцлер. — Іначай я нічога не разумею. Хіба магчыма так лёгка прыйсці да згоды?

З гэтымі словамі яны ўвайшлі ў кардыналію, дзе іх з нецярплівасцю чакалі.

## Паздзел 4

## МІР АБО ВАЙНА?

Паслы ўвайшлі, ваявода кінуў на іх позірк, нібы хацеў спытаць, але пабаяўся, і моўчкі чакаў, што яны самі скажуць. А князь Януш нават не павярнуўся да іх, ён быў упэўнены, што паслоў або не пусцілі ўнутр, альбо адмовілі ім.

Усе, хто быў у пакоі, акружылі паслоў, на твары кожнага адбівалася цікаўнасць, усе ціха пыталіся:

— Што прыпеслі?

— З чым вярнуліся?

Канцлер ступіў колькі крокаў да ваяводы, хацеў нешта сказаць, але Зяновіч апярэдзіў яго.

— Вось дык неспадзяванка! — усклікнуў ён. — Паны Хадкевічы...

— Не пусцілі вас? — з хваляваннем у голасе спытаў ваявода.

— Зусім наадварот — мы былі ў камяніцы, — казаў далей Зяновіч, — хоць не адразу туды дастукаліся. Да нас выйшаў кашталян разам з сандамірскім ваяводам і барысаўскім старастам. На наша пытанне, ці збіраюцца яны спаўняць дамову, адказалі...

— Што адказалі? — у нецярпенні перапыніў ваявода.

— А тое, што яны чакаюць князя Януша са сватамі, паставяць перад імі князёўну, якая сама, будучы ў поўным розуме, скажа тое, што будзе ёй падказана Богам, ніхто яе не будзе прымушаць і ўгаворваць. Нас саміх хацелі

правесці да князёўны, каб яна сказала ўсё гэта перад намі, кашталян запэўніў пас, што і не пытаўся і нават не ведае, якая будзе яе воля.

— Дык чаго ж можна больш жадаць? — прамовіў біскуп Гедройц. — Хай князь Януш ідзе да іх.

Насуплены ваявода маўчаў.

— Ага! Ісці да іх! — выгукнуў князь Януш. — Хіба вы не разумееце, што яны робяць выгляд, нібыта спаўняюць дамову, а самі рыхтуюць нам новы здзек! Яны прымусілі князёўну, каб яна мне адмовіла. Ім толькі гэтага і трэба цяпер: каб я схадзіў спытацца ў яе, а яна пад прымусам адкажа, што не пойдзе за мяне. І тады ўся справа будзе вырашана, гэта ім выгадна, бо перад людзьмі яны будуць выглядаць справядлівымі і сумленнымі. Але я не магу пайсці да іх, ясна ж, што кашталян са сваім пляменнікам у змове супраць мяне, там у іх ужо ўсё зладжана, каб пакрыць мяне ганьбай. Пайсці туды і вярнуцца з адмовай, з ганьбай! Не. гэтага не будзе.

— Вы ж бачыце, — казаў ён далей, — ужо і князёўна з імі! Ужо і яе здолелі ўгаварыць.

— Кашталян ручаўся, — спакойна прамовіў Сапега, — што з князёўнай ён не гаварыў пра гэта, не пытаўся і не ведае, што яна думае.

— Можа, сам кашталян гэтым і не займаўся, — адказаў яму ваявода. — Але ён мог каго-небудзь паслаць, хто здолеў пераканаць слабы жаночы розум. Каб яны не былі ўпэўненымі, што будзе па-іхняму, то зараз нс ставілі б умову, якой рансй не надавалі ніякай увагі.

— Яе здолелі настроіць супраць нас, з яе зрабілі зброю супраць нас! — у адчаі крычаў Януш. — Але не, не, яны самі вінаватыя, дамова нічога не вартая! Князёўна ў іх ва ўладзе, яна скажа тое, што ёй загадалі. Калі яна будзе вольнай, адказ будзе іншы. Перш, чым мы яе распытаем, яе трэба вызваліць.

Ваявода трымаўся такой самай думкі, бо паўтарыў услед за сынам:

— Усё гэта толькі пастка для нас, каб скончыць нічым, ад усяго адрачыся двума словамі князёўны: "Не хачу". Аднак жа так, як яны хочуць, не будзе. Мы не пойдзем пытацца ў яе цяпер, бо кашталян павінен грымаць сваё

слова, ніякіх змоў супраць нас ён ладзіць не можа, бо ён са сваімі пляменнікамі даў абяцанне, тут жа мы бачым відавочны падман, відавочную хітрасць.

— Камандуй, сын, — звярнуўся ён да Януша, — каб войска акружала камяніцу, і хай збудзецца воля Божая.

Пасля гэтых слоў, сказаных ваяводам, князь Януш пайшоў да дзвярэй, але яго затрымаў Завіша. А біскуп Гедройц падступіў да ваяводы Радзівіла.

— Княжа! — закрычаў ён. — Адумайся, што ты кажаш, ты ж падаеш сігнал да бітвы, а ці лёгка ў цябе на душы? Ці зможаш ты потым апраўдацца хаця б перад сабой? Адумайся, адмяні загад. Паны Хадкевічы не адмаўляюцца ад сваіх слоў, кашталян ручаецца, што не ведае пра волю і схільнасць князёўны, кліча вас, каб яна сама рассудзіла вас. А вы ў адказ аддаеце загад войску ісці на прыступ. Дзеля ўсяго святога, ваявода, апамятайцеся! Чаго вы хочаце? Жонкі для сына? А ці варта пагражаць усёй краіне жахам грамадзянскай вайны, абы толькі паставіць на сваім? Вы ж тут не чужы, вы самі — сын той краіны, якой пагражаеце. Дык выбірайце ж між дабром для аднаго чалавека і дабром для ўсёй краіны. Ды ці можна хоць на хвіліну сумнявацца ў тым, які тут павінен быць выбар? Усё можна прывесці да ладу. Пamірым вас, вы паразумеецеся, дык не спяшайцеся вымаць меч з похваў, каб потым не шкадаваць!

Тут і ўсе іншыя падступіліся да Радзівіла.

— Паслухайцеся таго, у чым вас пераконваюць! — усклікнуў канцлер Сапега. — Будучыня аддасць вам належнае, уся краіна будзе дзякаваць вам, калі вы ўсё зладзіце мірам, у імя Бога забудзецеся на крыўды, не будзеце прагнуць помсты, якая можа ўпасці і на нявінныя галовы.

— У імя ўсёй Літвы заклінаю вас, княжа! — услед за ім падаў голас Дарагастайскі. — Вы хочаце, каб усе ўведалі, што вы — прычына бед і незлічоных ахвяр для краіны, прычым толькі дзеля ўласнай выгоды, а лепш сказаць — з-за адной толькі запальчывасці ў гневе. Князь! Усе ведаюць вас як зусім іншага чалавека. Мы ўсё ўладзім, скончым мірам, адпусціцеся, паслухайцеся таго, што вам кажуць!

Пакуль усе, абступіўшы ваяводу, спрабавалі ўгаварыць яго не пачынаць вайны, князь Януш стаяў у дзвярах, ахоплены гневам, разззлаваны затрымкай, ён прагнуў вайны, на паспяховае завяршэнне якой не спадзяваўся, хацеў толькі

наталіць прагу помсты. Аднак ён не мог выйсці і аддаць загад, стаяў і глядзеў на бацькаў твар, на якім адбіваліся супярэчлівыя пачуцці. То загараліся іскры ў вачах і дрыжалі вусны, то ён зноў бляднеў, згасаў, вочы апускаліся долу, князь адкрываў рот, нібы хацеў нешта сказаць, але маўчаў, зноў загараўся гневам і трывогай.

Да Гедройца і Завішаў далучыліся канцлер Сапега, князі Астрожскія, Абрамовіч, пляменнік ваяводы, ягоны швагер Нарушэвіч, Зяновіч, брэсцкі ваявода — усе абступілі князя Радзівіла, прасілі, настойвалі, заклiналі, каб ён не аддаваў злавеснага загаду пачаць грамадзянскую вайну, каб стрымаўся, падумаў і адклаў гэтае непапраўнае рашэнне.

— Ваяваць ніколі не позна, — даводзіў Сапега, — але калі ўжо выцягнеш з похваў шаблю, то так проста не схаваеш яе зноў. Калі да жалеза прыліпне кропля братняй крыві, яна будзе заклікаць да помсты, а там — помста за помсту, і не будзе канца калатнечы, сутычкам, войнам.

— Не, не! — выгукнуў ваявода, у якога нарэшце прарэзаўся голас. — Гэтая кроў падзе на іх галовы, я не вінаваты ў ёй, я не прагну яе, я да апошняга ўгаворваў іх, ішоў на прыніжэнне, хацеў згоды, міру.

— Дык пакажыце, што вы засталіся такім, якім былі, — слабым голасам прамовіў біскуп Гедройц. — Не аддавайце гэтую справу сляпому лёсу вайны. Калі да вас падступіць смерць, каля вашага ложка стануць цені забітых брацціяў і не дадуць вам спакойна памерці. Ды і за што ваяваць? Дзеля чаго ўся гэтая вайна? Дзеля гонару свайго імя, дзеля жанчыны! Сорам, ганьба! Ці ёсць дзеля чаго заядацца, ліць кроў? Ці ёсць дзеля чаго распачынаць вайну са сваімі брацціямі? Увесь свет зверне на нас увагу, на нас будуць паказваць пальцамі. Мы ж акружаны з усіх бакоў ворагамі, і нават каб у нас было ў сто разоў болей зброі і людзей, то і іх не хапіла б для таго, каб даць адпор націску нашых адвечных ворагаў, каб у нас было ў сто разоў болей крыві і жыццяў, мы маглі б лепей распарадзіцца імі, калі б сцяной сталі супраць суседзяў. Дык навошта ж наклікаць ворагаў, якія тут жа скарыстаюць гэтую міжусобіцу? Князь! Дайце сябе ўгаварыць, упрасіць. У імя міру для дзяржавы, у імя яго вялікасці караля, усіх нас, жыхароў княства, у імя вашых продкаў, ніводзін з якіх не праліў ні кроплі братняй крыві, заклінаем цябе, ваявода, перадай гэтую справу найвышэйшаму суддзі!

— Якому? — перапыніў яго князь. — Каралю?

— Богу! Толькі ён — найвышэйшы арбітр! — скончыў біскуп.

— І час, — дадаў Сапега.

Акрамя той буры, якая бушавала ў душы Радзівіла, у яе неўпрыкмет украдаўся страх за наступствы такога неабдуманага кроку. Ваявода не наўтарыў адцадзенага сыну загаду, панура стаяў і маўчаў. Потым упаў у крэсла, апусціў галаву і задумаўся. Цяпер некаторыя загаварылі з князем Янушам, даводзілі яму, пераконвалі, якой нечуванай і недарэчнай справай было б дабівацца жонкі зброяй, калі гэтага можна дамагчыся і бсз праліцця крыві. А ваявода маўчаў, думаў. Януш адышоўся ад дзвярэй, аднак ягоны твар усё яшчэ палаў, сэрца моцна грукала ў грудзях. І пе дзіва: ён жа быў яшчэ зусім маладым, пачуцці бралі верх над розумам.

Праз колькі хвілін усе зноў павярнуліся да ваяводы, які ўсё гэтак жа моўчкі сядзеў, не маючы сіл вымавіць хоць бы слова.

— Ахвяруйце сабой, — прамовіў Гедройц, — а Бог; кароль і краіна будуць удзячнымі вам на гэтым і на тым свеце! Адно ваша слова можа аказацца згубным для ўсёй краіны, можа наклікаць на вашу галаву праклёны і скаргі мноства сем'яў, дык парайцеся з вашым сумленнем, перш чым рашаць.

Ваявода ўстаў і ўзяў Гедройца за руку. Ён быў усхваляваны — і немужчынская сляза, можа, упершыню за некалькі дзесяткаў гадоў, выбліснула з-пад павека.

— Я не скажу гэтага слова, — прамовіў ён, — лепей я саступлю, лепей паддамся, але не вазьму граху на душу. Вы мяне пераканалі. Дзякуй вам! Я не хачу вайны, ва ўсякім выпадку — зараз. Ахвярую сабой, бо я сапраўды паддаўся гневу і запальчывасці з-за абразы, з-за крыўды.

— Распусціць людзей, адправіць на пастой! — загадаў ён сыну.

Князь Януш пастаяў крыху, не ведаючы, канчатковы гэта загад або не, але тут усе падаліся да дзвярэй, і праз колькі хвілін каля дваццаці пасыльных перадалі войску на ўсіх вуліцах загад вяртацца на пастой.

Сенатары дзякавалі князю, ён зноў маўчаў. На ягоным твары адбіліся сляды тых душэўных пакут, якіх каштавала яму ягоная ахвяра. Князь зноў сеў і задумаўся.

Сонца заходзіла, яго апошнія промні блішчалі на вок-

нах вежаў, на крыжах і шпіцах касцёлаў, калі атрады войска Радзівілаў выступілі з горада, павярнулі назад.

З вежы на камяніцы Хадкевічаў за ўсім гэтым назіраў Ян Караль і не разумеў, што гэта магло б значыць. Спачатку яму здалося, што яны пачынаюць аблогу. Нават калі вуліца апусцела, ён падумаў, ці не заходзіць войска з тылу, каб напасці знянацку. Ен аддаў загад, салдаты занялі свае месцы на сценах. Пачакалі. Але войска Радзівілаў знікла і болей не паказвалася. Сонца села, пачаў насоўвацца змрок, і было ўжо няўсцерп цэлы дзень чакаць у такім напружанні. Ян Караль спусціўся з вежы і пайшоў да кашталяна.

— Нейкія дзівосы творацца, — сказаў ён, уваходзячы. — Войска Радзівілаў адступае, адыходзіць.

— Што б гэта магло значыць? — спытаў Мнішак.

— Відаць, не знайшлі выйсця. Цэлы дзень раіліся, як наступаць, што рабіць з гэткім войскам, а цяпер адступаюць — баяцца нас зачапіць, — патлумачыў Ян Караль.

— Можа, гэта толькі падманнае адступленне, — выказаў здагадку кашталян, — а ноччу, у самую сабачую пару, яны збіраюцца захапіць нас спадцішка.

— Салдаты будуць вартаваць на сценах! — адказаў Ян Караль. — Будзьце спакойнымі, я сваё войска на пастой не адпраўлю.

— А тым часам трэба паслаць каго-небудзь на разведку, — прапанаваў Аляксандр Хадкевіч.

— Адзін пайшоў ужо, — адказаў Ян Караль, — ды нешта ён доўга не вяртаецца. Як толькі войска рушыла назад, я паслаў яго здабыць языка сярод католікаў, якія ў іх шэрагах служаць пад прымусам, а ў душы з намі.

## Паздзел 5

## ЧАКАЛІ ДА ПОЎНАЧЫ

Набліжалася поўнач. Вялікая зала ў кардыналіі была перапоўнена людзьмі. Пасярод стаяў вялікі стол, засланы дарагім абрусам. На ім гарэлі васковыя свечкі, а пасярод ляжалі крыж і кніга.

20. Зак. 2198.

З двух бакоў каля стала моўчкі стаялі святары: евангельскі пастар і рускі мніх. Яны нібыта нечага чакалі. Крыху воддаль рыхтаваліся выканаць свае абавязкі два трыбунальскія возныя*, высокія і худыя, з выцягнутымі шыямі і натапыранымі вусамі, яны пазіралі то на людзей, то на сябе.

Вялізны гданьскі гадзіннік у шкляной скрынцы ў гэты момант паказваў, што праз дзесяць хвілін ён праб'е поўнач.

З усіх бакоў стол акружалі людзі, яны перашэптваліся. Асабліва ўрачыста выглядалі багата апранутыя князь-ваявода і ягоны сын Януш, іхнія белыя атласныя жупаны і пунсовыя кунтушы былі бачны здалёку. Абодва застылі ў панурым маўчанні. Ваявода пазіраў на гадзіннік.

Прайшло яшчэ пяць хвілін — усё тое ж глыбокае маўчанне. Толькі той-сёй паціху перагаворваўся.

Нарэшце гадзіннік пачаў павольна адбіваць час, і як толькі дванаццаты ўдар разлёгся па зале, ваявода стаў на ўзвышэнне і пачаў гаварыць:

— Сведчу перад усімі тут прысутнымі, што я нічым не парушыў вызначанага тэрміну, дамоўленага з панамі Хадкевічамі. Мы запрасілі іх сюды, чакалі ўвесь дзень, былі гатовы заключыць саюз паміж прысутным тут маім сынам Янушам і князёўнай Соф'яй Слуцкай. Гэты тэрмін скончыўся, дамова засталася нявыкананай, але не па нашай віне.

Амаль тое самае выразна і гучна паўтарылі з ужываннем спецыяльных тэрмінаў на лацінскай мове абодва возныя. Князь саступіў з узвышэння, крыж і свечкі вынеслі, дзверы расчынілі насцеж, і ваявода запрасіў усіх шматлікіх гасцей у другую залу, у якой іх чакала хоць і позняя, але багатая вячэра.

Мы не будзем апісваць банкет, якім скончыўся гэты страшны дзень. Разгарачаныя віном госці не раз са злосцю згадвалі Хадкевічаў, гучалі пагрозы і папрокі, раты не закрываліся. Адзін толькі ваявода маўчаў, яго дарэмна стараліся развесяліць прыяцелі і падліпалы, але колькі яны ні злоснічалі, ён нічога не гаварыў.

Позна ноччу ўсе разышліся.

А ў камяніцы Хадкевічаў усё рыхтаваліся, гэтак жа як і ўдзень, адбіваць напад. Перагукваліся салдаты, палілі агні, хадзіла стража, сам Мікалай Хадкевіч у кірасе, з шышаком у руцэ, мячом ля пояса абходзіў вартавых, будзіў тых, хто

заснуў, настаўляў вуха на кожны пошум з вуліцы. Кашталян з Янам Каралем і Аляксандрам сядзелі ў сваім пакоі. Князёўна Соф'я ўсё гэтак жа малілася перад абразом Маці Божай.

Так у неспакойным чаканні прайшла ўся ноч, наступіў дзень. Адчынілі брамкі, паслалі на разведку людзей. Неўзабаве ад Завішаў прынеслі дакладныя звесткі пра тое, што адбылося ў Радзівілаў за ўчарашні дзень.

Хадкевічы дужа здзівіліся той падатлівасці, якую праявіў ваявода пад націскам сваіх прыхільнікаў, не разумелі яе, тлумачылі сабе толькі тым, што камяніцу цяжка было ўзяць прыступам, бо яны ведалі пра нараду вайскаводаў, якія шукалі найлепшага шляху да перамогі і нічога не змаглі прыдумаць і не знайшлі адзінага рашэння, як узяць камяніцу.

Перад полуднем прыйшлі біскуп Гедройц з панамі Завішамі, яны зноў намагаліся дабіцца прымірэння. Але яны дарэмна спрабавалі розныя спосабы, бо Ян Караль, нібыта асмялеўшы пасля ўчарашніх ваганняў ваяводы, не дазволіў кашталяну згадзіцца на штосьці. Кашталян гэтак жа, як і ўчора, усё ўскладаў на князёўну. Цэлы дзень ішлі ўзаемныя перамовы, але ўсё марна. Было не так лёгка зблізіць Хадкевічаў і Радзівілаў, прывесці іх да згоды. Аднак было відавочным і тое, што абодва бакі стаміліся ад нянавісці і нервовага напружання і хацелі спакою і міру, хаця б нават часовага.

* * *

У чэрвені 1600 года ў Вільні засядаў Трыбунал. Туды зноў паклікалі Хадкевічаў, каб, з аднаго боку, пастрашыць іх магчымымі карамі, а з другога — прапанаваць умовы міру. Паклікалі аднадумцаў, арбітраў у спрэчцы. Стомлены доўгай барацьбой кашталян астыў, браты дарэмна настройвалі яго ў лістах, прасілі, каб ён без іх нічога не вырашаў. Кашталян, па ўсім было відаць, схіляўся да прымірэння, у душы ўжо быў за гэта.

Пагадненне штодзень рабілася больш верагодным. Нарэшце на з'ездзе Трыбунала, з усіх бакоў абкружаны пасрэднікамі і прыхільнікамі, угавораны імі, ды яшчэ пад страхам баніцыі, якую ўсё яшчэ трымалі ў запасе для пагрозы, кашталян нарэшце ўступіў.

Ен згадзіўся аддаць князёўну за князя Януша (атрымаўшы яе згоду на гэта), але для заспакаення свайго сумлення паставіў умову, каб быў атрыманы дазвол з Рыма; судовыя справы былі скасаваны.

Шлюб адбыўся ў Брэсце 1 кастрычніка таго самага года. Князёўна ішла пад вянец па дарожцы, высланай сукном, у суправаджэнні шматлікіх прыдворных і запрошаных. З ёй ішоў кашталян. З другога боку, паводле звычаю, ехала світа Радзівілаў. Усе на конях з багатай збруяй і шыкоўнымі сёдламі, самі аж ззялі ад золата і каштоўных каменняў.

Пасля вянчання маладая пара прайшла да палаца кашталяна, дзе пачалося вялікае і пышнае застолле, яно цягнулася аж да рання. Раз'ехаліся ўжо завідна. Увечары з не меншай пышнасцю балявалі ў князя-ваяводы, вяселле доўжылася цэлы тыдзень.

## Паздзел 6

## ПРАЗ ДЗЕВЯЦЬ ГАДОЎ

Гэта было ў 1609 годзе, у адзін з невясёлых асенніх дзён. У нясвіжскім замку ў пакоі, далёкім ад знадворнага гоману і шуму, з завешанымі зялёнымі адамашкавымі фіранкамі вокнамі, на ложку пад зялёным балдахінам з залатымі шнурамі і махрамі ляжала яшчэ маладая, але бледная і схуднелая жанчына. Яе чорныя распушчаныя валасы раскінуліся па белай падушцы, адной рукой яна нацягвала на сябе падбітую футрам коўдру, другой трымала хусцінку каля сініх сасмяглых вуснаў.

Каля яе ног сядзела гэткая ж маладая, як і яна, і таксама прывялая жанчына і нявесела пазірала ёй у вочы. Яны маўчалі, глядзелі адна на адну і адна адну разумелі.

У пакоі панавала цішыня, яе парушаў толькі гадзіннік, які аднастайна мераў час, ды трэск паленняў у каміне.

— Тэрэза! — паклікала жанчына, якая ляжала на пасцелі. — Падкінь яшчэ дроў, мне ўвесь час холадна, я ўся дрыжу.

Жанчына, якая сядзела ў яе ў нагах, устала і пачала моўчкі падкладваць дровы, потым вярнулася да ложка і ўкрыла сваю гаспадыню яшчэ адной коўдрай.

— Усё яшчэ холадна, княгіня? — спытала яна.

— Не яшчэ, а ўвесь час! — адказала хворая. — Толькі зрэдку падступае гарачыня, пачынае спапяляць нейкі ўнутраны агонь, полымя ахоплівае галаву, слепіць вочы; гараць разгарачаныя далоні. Потым зноў падступае смяртэльны холад. Так холадна, так жудасна холадна! Дай мне папіць!

Служанка падала княгіні кубак з падрыхтаваным пітвом, хворая паднесла яго да вуснаў, скрывілася і аддала назад.

— Дай мне вады, — ціха прашаптала яна. — Гэтае пітво не наталяе смагу, калі мне хочацца піць, толькі больш распаляе яе. Мне пасля робіцца толькі горш. Глянь на мае сасмяглыя вусны, яны нібы высахлі. Дай мне вады.

— Лекар забараніў, — адказала служанка.

— Лекар! Навошта ж яго слухацца? — загаварыла хворая і паднялася. — Лекары толькі мучаюць мяне і забіраюць рэшткі здароўя, напэўна, адбяруць і жыццё. Злітуйся нада мной, дай мне вады! Я і так не буду жыць. Хіба мне можа зашкодзіць нешта яшчэ, калі ўжо нішто не дапамагае. Тэрэза, тваім вечным збавеннем заклінаю цябе, дай мне вады!

І Тэрэза са слязамі на вачах спачатку павагалася, а потым выйшла праз дзверы і хутка вярнулася, падала княгіні кубак з вадой, які тая адразу ж выпіла. Потым упала на падушку і зноў пачала дрыжаць, зноў пацягнула на сябе ўсё, што было, каб сагрэцца.

— О, як цяжка чакаць смерці! Як доўга трэба маліцца, каб яна прыйшла, як доўга цярпець, як доўга выглядаць, калі ж яна нарэшце прыйдзе! Мой ты Божа, чаму ж я не памерла маладой, калі яшчэ была шчаслівай ад надзеі? Але Бог загадаў жыць, цярпець!

— Навошта ж, пані, вы мучаеце сябе такімі думкамі? — усклікнула Тэрэза. — Бог дасць вам здароўе і сілу. Благое мінецца, прыйдзе добрае. Пан доктар штодня запэўнівае, што вашай мосці будзе лепей.

— А я адчуваю сябе ўсё горш, усё бліжэй да труны. Ніхто лепш за мяне не ведае, што са мной робіцца. Я памру, хутка памру, Тэрэза, і гэтым я суцяшаюся.

— Хіба ж вам, пані, няма для каго жыць!

— Для каго! Ці ж ёсць у мяне хто, каб любіў мяне, каму б я дачкой была, роднай! Родныя не прызнаюць мяне, а муж...

— Як бы хто не падслухаў! — спалохалася Тэрэза.

— Хай слухае, гэта не таямніца. Муж мой не са мной ажаніўся.

— Як гэта, княгіня? — усклікнула Тэрэза.

— О! Усе ведаюць, чаму хацелі ваяваць за мяне, — прамовіла Соф'я. — Не дзеля мяне зусім, а дзеля тых маёнткаў, якія атрымалі ў пасаг. Я хутка адчула над сваёй галавой Божае неблагаславенне. Колішняя дзіцячая прывязанасць князя Януша змянілася на нешта адваротнае. Ён зноў пачаў ваяваць з Хадкевічамі за староства, за каралеўскую ласку, пакінуў мяне, забыў. Калі ж часам прылятаў сюды, хіба сказаў ён мне добрае слова, паказаў, што кахае мяне? У яго на душы першая думка і найпершае жаданне — як бы ўзвысіцца, а ўсё астатняе потым ужо. Я спачатку не верыла ў свой нешчаслівы лёс, хаця заўжды прадчувала яго; я шукала ў Янушы сябра сваіх дзіцячых гадоў, майго брэсцкага Яся, а ён так хутка стаў другім! Кожны дзень мае надзеі на будучае, на шчасце ападалі, як пялёсткі кветкі. І хутка я засталася ўдавой, не стаўшы маці, бо калі ж я магу бачыць яго? Як я яго ўбачу, Тэрэза, калі ён вернецца з вайны са світай сяброў і цэлымі тыднямі сядзіць з імі, раз ці два пакажацца, і ўсё! О, лепей памерці, ды і пара ўжо ўміраць. Дзядзька нездарма казаў, што Бог не благаславіць наш шлюб. Гэта вісіць над маёй галавой.

Тэрэза нічога не адказала на гэтыя скаргі, моўчкі слухала, падпёршы галаву рукамі, сваю пані, і толькі слёзы стаялі ў яе вачах.

— Хай бы хоць дзеля ўцехі Бог даў мне дзіця! — казала княгіня. — Але не, дзеці — гэта Божае благаславенне, а над маёй галавой неблагаславенне. Ксёндз павянчаў нас, але не благаславіў, ён запрысяжыў вусны, а не душы, я прысягала, плачучы, бо прадчувала сваё будучае.

— Скажы мне, Тэрэза, — зноў загаварыла яна, крыху памаўчаўшы, — ці ўсе людзі гэтак мяняюцца на працягу жыцця і так псуюцца, ці ўсе так забываюць?!

— Можа, вы, пані, занадта ўзялі да сэрца і свае няшчасці, і каханне мужа, — пераконвала служанка. — Мужчына павінен служыць дзяржаве, павінен ісці на вайну,

павінен ваяваць, павінен праводзіць больш часу недзе ў свеце, не тое што мы, дома, у спакоі, пры кроснах.

— Ах, я ўсё гэта ведаю, — перапыніла яе княгіня Соф'я, — але навошта мужчынам сеяць смуту і на сваю галаву распачынаць войны, а на краіну наклікаць беды? А потым — хіба, седзячы тут, ён не мог успомніць мінулае, хоць адным словам, адным позіркам, асабліва цяпер, калі я кожную хвіліну чакаю смерці? Хіба не мог бы ён даць мне асалоду, пабыць са мной хаця б некалькі гадзін?

— Княгіня...

— Дарэмна ты абараняеш князя. Ты проста хочаш суцешыць мяне. А я не хачу маны! Я ведаю, як яно ёсць на самай справе, я ведаю пра ўсё! Ён не кахаў мяне, не пра мяне быў ягоны клопат, а пра мой пасаг. Я была нічым у іх вачах, ва ўсіх іх! Цяпер я гэта ведаю. І разумею: так хацеў Бог.

Яна зноў уся затрымцела і пачала хутацца.

— Хоць бы памерці, хоць бы хутчэй памерці! — галасіла яна. — Такое жыццё — гэта павольная смерць, гэта пакута.

Яна малілася і плакала.

Тут адчыніліся дзверы пакоя і ўвайшоў мужчына, ужо сівы, згорблены, з кійком у руцэ, у чорным нянаскім адзенні. Гэта быў прыдворны лекар князя.

Глянуўшы на яго, можна было лёгка прачытаць па твары ягоны характар. Скрыўлены твар яго ўздоўж і ўпоперак быў скрэслены маршчынамі і пабіты чырвонымі плямамі, сінімі гузакамі, белымі шрамамі. З-пад абвіслых павек няўлоўна пазіралі светлыя, амаль белыя вочы, вусны, скрыўленыя на адзін бок, надавалі яму выгляд дзівака. Нізкі лоб амаль да броваў закрывалі сіва-брудныя валасы, вышэй галава была амаль што лысай, і толькі з бакоў яе там-сям закрывалі валасы таго ж колеру. Згорблены і кульгавы на адну нагу, ён абапіраўся на кій з пазалочанай ручкай. Гэта быў чужынец, які ўжо нямала гадоў пражыў у краіне, ведаў мясцовую мову, народныя звычаі, дух народа. Паслужлівы, подлы, ён падлізваўся да кожнага, рассцілаўся перад кожным, ад каго мог мець карысць. Такі быў Фрызіюш — прыдворны лекар князя.

Княгіня яго не любіла; ён лячыў яе з двухгадовага ўзросту і кожны раз абяцаў, што ёй палепшае. Цяпер жа яе здароўе ўвачавідкі пагаршалася. Вось і зараз ён прыйшоў са сваёй звыклай усмешкай, з паклонам, са звыклымі абяцаннямі.

— Пані княгіня крыху паздаравела, гарачка ўжо меншая, пульс лепшы, скура чысцейшая! Хвала Богу! Хвала Богу! Фрызіюш рады! Фрызіюш вітае васпані!

— Няма чаму радавацца, няма з чым віншаваць, — рахмана адказала княгіня. — Мне ўсё горш, усё горш...

— Што? Горш?! — усклікнуў лекар. — Горш! Ха, ха! Гэта вам, пані, са страху так здаецца, але Фрызіюш кажа праўду, яму трэба верыць, Фрызіюш у гэтым разбіраецца. Трэба толькі быць спакойнай, трэба верыць, трэба піць лякарства, а не плакаць, не мучыць сябе рознымі думкамі. Навошта гэтыя думкі і домыслы? Толькі спакой! Фрызіюш дае слова, што вылечыць пані.

Княгіня памаўчала, потым прамовіла:

— Пане мой, ці не дазволілі б вы мне піць ваду, ад вашага лекавання мне блага, пячэ ўнутры!

— Ваду! — з абурэннем у голасе ўсклікнуў лекар. — Вада — гэта гібель для пані. Трэба піць лякарства. Толькі лякарства! Фрызіюш дае слова! Я сам рабіў яго з вядомых мне траў і дзейсных інгрэдыентаў. Дарагое і бясцэннае лякарства!

Княгіня зноў змоўкла.

Доктар зірнуў на бутэлечкі, якія стаялі на стале, пашаптаў нешта на вуха служанцы і сабраўся ісці.

— Пані можа быць спакойнай. Фрызіюш ручаецца, што палепшае. Што далей, то будзе лепей. Дабранач, пані!

— Ці былі вы ў князя? — слабым голасам спытала хворая.

— Быў. Ён здаровы і вясёлы, бавіцца са сваімі сябрамі і родзічамі. Хай Бог дае яму здароўя на многа гадоў! Фрызіюш мае з ягонай ласкі кавалак хлеба.

— Не пытаўся пра мяне?

— Ён спадзяецца на Фрызіюша і добра робіць, — адказаў лекар. — Гэта я і вам раю. Дабранач! А лякарства трэба піць! Тады здароўе вернецца.

Дзверы зачыніліся.

— Я піла б, каб ведала, што яно мяне хутчэй загубіць, — ціха азвалася княгіня, — але ж яно толькі доўжыць пакуты! Тэрэза, станавіся на калені і ўголас чытай вячэрнюю малітву, а я ў душы буду маліцца разам з табой!

## Паздзел 7

# ЛОЖА СМЕРЦІ

А ў другім канцы замка, у вялікай зале, ішоў вясёлы баль. Там сабраліся прыяцелі князя Януша, ягоныя слугі, шляхта, якая служыла яму і іх роду; стаяў накрыты стол, застаўлены місамі і кубкамі, шумела вясёлая гамонка, чуліся смех, крыкі.

Вячэра ўжо скончылася, ужо амаль да дна была выпіта акутая серабром бочка, што стаяла на каміне, лысіны ўспацелі, твары расчырванеліся, языкі развязаліся, прамаўлялі ўсё новыя і новыя віваты — хвалу і гонар князю.

Князь усміхаўся, пагардліва пазіраў на п'яную кампанію, у душы насміхаючыся з іх, тым не менш кланяўся ім і сардэчна, як братоў, абдымаў.

Шляхта не бачыла насмешкі ў вачах князя, не заўважала пагарды ў ягоных словах, п'яная шляхта гатова была ісці за ім у агонь і ваду, бо ён яе карміў, паіў, абдымаў і называў сваімі братамі.

— Загадвай, княжа, шляхце! — крычаў лідскі суддзя. — Загадвай, і мы пасячом, як капусту, дэпутатаў Хадкевічаў на сейміку! За свайго князя мы гатовы хоць зарэзацца!

— Дзякую вам, браты шляхта! — усклікнуў князь Януш. — Гэй, напоўніце кубкі! За здароўе шляхты! Падаць віна!

Князь выпіў за іх здароўе, а яны ўкленчылі і так, на каленях, пілі за князя, падкідваючы шапкі, крычалі на ўсё горла:

— Віват! Кашталян! Віват!

Князь дзякаваў.

— Вяльможны князь! — закрычаў на ўсю моц шляхціц з Наваградка. — Усе мы — твае, пойдзем, куды ты скажаш! Загадаеш забіць сябра — заб'ём, загадаеш ісці за сабой — пойдзем хоць на арабаў, загадаеш секчы на сейміках — пасячом, судзіць — засудзім! Шляхта — твая!

І зноў кубкі, і зноў віваты радзівілаўскаму роду! Дарагой шляхце! Пад вокнамі стаяць мажджэры*, страляй з мажджэраў, бі ў барабаны — віват!

Стралялі.

Хворая княгіня спрасонку ўсхапілася з ложка.

21. Зак. 2198.

— Што гэта? — закрычала яна. — Страляюць! Б'юцца! Хадкевічаў бяруць прыступам, ліецца кроў, вайна паміж братамі! Божа мой! Я таму прычынай! За мяне б'юцца!

— Княгіня! — супакойвала Тэрэза. — Гэта толькі страшны сон. Ніхто не б'ецца.

— Але ж я чую стрэлы!

Якраз у гэтую хвіліну даляцела водгулле яшчэ аднаго стрэлу.

— Што гэта? Бітва? — дрыжучы і заламваючы рукі, ціха, дрыготкім голасам зноў і зноў пытала Соф'я. — Што гэта?

— Гэта страляюць з мажджэраў на віват, — растлумачыла Тэрэза. — У князя баль, запрошана шляхта. Хутка сеймік.

Княгіня зноў адхінулася на падушку.

— Страляюць і весяляцца! — прамовіла яна сама сабе. — Ён там весяліцца, калі я паміраю! О, хоць бы хутчэй памерці! Каб нічога гэтага не бачыць, не чуць, не ведаць...

У начной цішыні крыкі п'янай шляхты даляталі да вокнаў княгіні, біліся ў іх прыглушаным шумам.

— Весяляцца! Весяляцца! — усклікнула яна. — Пацяшаюцца! І сам князь таксама з імі. Не мог прыйсці да жончынай пасцелі, бо там жа яго чакае шляхта, там баль. Лепей пасядзець за сталом з кубкам віна, чым каля ложа хворай.

Яна склала рукі, павяла затуманенымі вачыма па пакоі, апусціла галаву.

Тэрэза сядзела ў нагах і плакала, крадком выціраючы слёзы.

— Чым мой род так правініўся перад Богам, што Бог так сурова пакараў апошнюю з усіх? — шаптала княгіня. — Такім жыццём, такой смерцю? О! Мае дзяды не змаглі ў нябёсах выпрасіць свайму дзіцятку лепшага жыцця і лягчэйшай смерці. І нават тыя нямногія начныя гадзіны, калі рэдкі сон Бог пасылае мне на вочы, перарывае шум вясёлага балю князя Януша! Хто б мог некалькі гадоў таму ўгадаць, які будзе зараз мой канец? Правільна казаў мой дзядзька — над нашымі галовамі тое, што Бог нас не благаславіў! Тэрэза, чытай малітвы, я таксама буду маліцца з табой.

У дзверы пастукалі.

— Напэўна, Фрызіюш, — сказала княгіня.

Сапраўды, прыйшоў Фрызіюш. Ён зазірнуў паглядзець, як пачуваецца хворая, і, як заўседы, паўтарыў:

— Пані княгіні ўжо лепей — крыху паспала.

— Я ледзь паспела заплюшчыць вочы, — адказала яна, — як мяне разбудзілі праклятыя стрэлы.

— Так, так! Гэта князь балюе! — прамовіў лекар. — Дай яму Бог здароўя, добраму пану! Ён весяліцца са шляхтай.

Лекар падышоў да ложка, памацаў пульс, паглядзеў на твар княгіні, паківаў галавой; больш ён не гаварыў пра тое, што будзе лепей, толькі наказаў піць лякарства і пайшоў. Мінуў два пакоі, зноў паківаў галавой, пастаяў, падумаў, а потым хуткім крокам пашыбаваў паўз шэраг пакояў, праз ганкі і падворак у залу, дзе баляваў князь Януш.

Непрыкметна праслізнуўшы праз тлумны натоўп, лекар падышоў да князя і пакланіўся яму.

— Фрызіюш хацеў бы мець шчасце сказаць ягамосці князю два словы.

— Што ў цябе? Гавары, Фрызіюш.

— Пані княгіня адчувае сябе дужа дрэнна, дужа дрэнна, — зашаптаў лекар. — Я не ведаю, ці памогуць мае пілюлі і настой. Хвароба не праходзіць.

— Памірае! — усклікнуў Януш і ўскочыў.

— Не, яшчэ не, — паспешна адказаў немец і нізка пакланіўся. — Але я не магу паручыцца, не магу. Пані княгіні дужа дрэнна, Фрызіюш у адчаі! Яна заснула на хвілінку, страляніна разбудзіла яе, напалохала. Прачнулася і адчувае сябе яшчэ горш. Фрызіюш са смуткам палічыў абавязкам паведаміць пра гэта вашай мосці.

Князь задумаўся. Потым паклаў руку на плячо аднаму са сваіх улюбёнцаў:

— Пабудзь тут за гаспадара, Пяткевіч, мне трэба выйсці.

Януш непрыкметна выйшаў, паклікаўшы яшчэ двух чалавек з бяседнай залы. Усе разам прыйшлі ў пакой князя.

— Чакаем загаду!

— Сядай і пішы, пане Астрамецкі, — сказаў князь, — сядай і пішы зараз жа дарчую ад княгіні слуцкай і капыльскай мне на перадачу ўсіх правоў і тытулаў, зразумеў?

— Зразумеў, яснавяльможны пане, — сказаў худы і высахлы Астрамецкі. — Пісаць зараз?

— Зараз жа. Парайся пра фармальнасці з чыноўнікамі, якія тут ёсць, і да рання як след падрыхтуй акт.

— Я прасіў бы вас даць мне паперу.

— У архіве. Папрасі, каб табе выдалі, — распарадзіўся князь. — А ты, вашамосць, — звярнуўся ён да другога, — едзь па айца Пракопа.

— Зараз?

— У гэтую самую хвіліну.

Ён аддаў загады, адправіў каго куды, а сам сеў пісаць. Але праз некалькі хвілін, відаць, моцна ўсхваляваны, ён выскачыў з пакоя, прабег каля замкавай залы і спыніўся пад дзвярыма жончынай спальні.

Януш прыставіў вуха і пачуў голас Тэрэзы, якая чытала малітву, княгіня павольна паўтарала за ёй слабым, ціхім голасам.

— Памолімся за ворагаў нашых... — чытала Тэрэза. — І за тых, хто нас пакрыўдзіў.

— І за тых, — паўтарала княгіня, — хто здрадзіў нам, хто спакусіў. Прабач ім, Божа. Прабач яму!

Яна змоўкла.

— Хопіць, Тэрэза, хопіць, я аслабла, не магу гаварыць, можа, засну.

Князь загадаў пакаёўцы паклікаць Тэрэзу.

— Княгіні пагоршала? — строга запытаў ён.

— Усё горш і горш, — адказала яна і ўздыхнула. — Сёння блага, як ніколі раней, яе напалохала страляніна з мажджэраў. Засне і ўсхопліваецца, пачынае ад гарачкі спрасонку крычаць.

— А што, можа так здарыцца, што яна не дажыве да раніцы? — холадна спытаў князь.

— Хай Бог бароніць нас ад такога няшчасця! — закрыўшы твар рукамі, усклікнула служанка. — Хіба я ведаю!

Яна пачала плакаць. Князь паглядзеў на яе, паціснуў плячыма і пайшоў; праходзячы па пустых пакоях, ён казаў сам сабе:

— Хаця б не памерла! Без завяшчання, без апошняй волі! Навошта было цягнуць і адкладваць да апошняй хвіліны, сам не ведаю. Пра гэта трэба было падумаць многа раней.

Ён вярнуўся, стаў каля дзвярэй, слухаў. Але нічога не было чутно акрамя трэску паленняў у каміне і павольнага ходу гадзінніка. Устрывожаны князь пайшоў да сябе ў пакой. Калі настала ранне, ён некалькі разоў пасылаў даведацца, ці састаўлена завяшчанне, ці прыехаў айцец

Ракоп, ці здаровая княгіня і што яна робіць. Толькі пасля гэтага ён крыху задрамаў.

Калі князь прачнуўся, яго ўжо чакаў у пярэднім пакоі пан Астрамецкі з пачкам папер, а айцец Пракоп чытаў ранішнія малітвы.

— Як там княгіня? — занепакоена спытаў Януш.

— Гэтак жа, як і ўчора.

— Паклікаць Фрызіюша!

Фрызіюш аціраўся сярод тых, хто чакаў у пярэднім пакоі, і таму вельмі хутка праслізнуў да князя.

— Ты быў у яе сёння?

— Быў. Быў! Фрызіюш плача! Мае веды ўжо непатрэбныя! Жыццё скончана! Дрэнна! Дрэнна! Не магу нічым апраўдацца перад вашай княжацкай мосцю! Рабіў усё што мог!

— Колькі яшчэ яна можа пражыць? — запытаў князь.

— Ад сілы дзень, — паківаўшы галавой, адказаў лекар, — *praeter, propter* — прыблізна — да вечара.

— Ты ўпэўнены?

— Усё ў руках Божых, Фрызіюш не можа ручацца.

— Паклікаць Астрамецкага!

Князь адвярнуўся ад лекара, той выйшаў.

— Завяшчанне гатова?

— Гатова. Мы параіліся *ad format* — для парадку — з панам наваградскім суддзёй і панам дэпутатам Чарвяковічам, паказалі ім той акт, які я склаў. Завяшчанне ахоплівае *generaliter* — увогуле — увесь пасаг княгіні, княства Слуцкае і Капыльскае, *cum attinentiis* — акрамя таго — розную маёмасць, рухомую і нерухомую *etc. etc. etc.* — і гэтак далей, нічога не выключаючы і не пакідаючы каму іншаму.

— Гэтае завяшчанне можа быць аспрэчана ці скасавана? — спытаў князь. — Я ўпэўнены, што Хадкевічы заявяць пратэст і будуць судзіцца са мной. Патрэбна зрабіць усё па закону, каб дакумент меў каштоўнасць.

— Усё зроблена па форме, — адказаў Астрамецкі. — За гэта вы, вашамосць, можаце не хвалявацца.

— Айца Пракопа сюды!

Адчыніліся дзверы, праз іх выйшаў, паціраючы рукі, Астрамецкі, і з нізкім паклонам увайшоў мніх. Ужо немалады, крыху прыгорблены, высокага росту, айцец Пракоп

выглядаў як святар-рыцар. Высокі лоб, гордыя вусны, арліны нос, вялікія жывыя вочы, праўда, усё ў акружэнні маршчын. У духоўным аблачэнні ён выглядаў няўклюдна, нібыта яно было не па ягонай паставе, апранута дзеля забавы.

На нізкі паклон айца Пракопа князь толькі кіўнуў галавой.

— Княгіня, мая жонка, дрэнна сябе адчувае, — загаварыў ён. — Я хачу паведаміць ёй, што вы прыехалі, а вы яе праведаеце. Пастарайцеся падрыхтаваць яе да афармлення дакумента, які патрэбны на ўсякі выпадак, ён не мае на мэце нічога благога і будзе толькі перасцярогай.

— Я ўсё разумею і зраблю так, як вы загадваеце, — адказаў айцец Пракоп.

— Калі вам падасца, што княгіня будзе вас аб нечым прасіць, дайце знаць мне.

— Іду па вашым загаду. — Айцец Пракоп адразу ж выйшаў з пакоя.

Малады слуга князя праводзіў святара да аддаленых пакояў княгіні. Але ён зайшоў не адразу, а пагаварыў спачатку з Тэрэзай, якая павінна была падрыхтаваць Соф'ю.

— Айцец Пракоп прыехаў, — ціха паведаміла Тэрэза, сядаючы каля ног княгіні. — Ен тут, у замку.

— Па яго пасылалі? — запытала княгіня.

— Не. Не ведаю, — адказала Тэрэза.

— Напэўна ж, пасылалі. Ён недзе тут, недалёка. Скажы яму, хай зойдзе.

Тэрэза выйшла і прывяла айца Пракопа.

— Слава Ісусу Хрысту! — абвясціў ён, увайшоўшы.

— На векі вякоў, — прашаптала княгіня. — Сядайце, ойча. Дзякуй вам, што прыехалі сюды, я і сама збіралася прасіць, каб па вас паслалі. Я выпраўляюся ў далёкую дарогу, і мне патрэбна ваша благаславенне на супакой душы.

— Благаславенне, споведзь — усё гэта можна, — адказаў святар, — але, спадзяюся, не на шляху да вечнасці. Ваша княская мосць не павінна думаць пра смерць. Бог можа даць здароўе нават у самы неспадзяваны час, абы толькі была на тое Ягоная святая воля. Вы, пані, пры сваёй маладосці можаце спадзявацца на яшчэ доўгае жыццё ў славу Боскую.

— Ах! Я не хачу жыць, ойча! — адказала княгіня. — Зусім не хачу! Паспрабую дажыць. Смерць мне не страшная.

— Ніводнаму добраму хрысціяніну смерць не можа быць страшнай, — адказаў айцец Пракоп. — Хто ў жыцці не меў згрызот сумлення, той пры смерці не палохаецца вечнасці.

Айцец Пракоп гаварыў яшчэ доўга, а княгіня маўчала. Потым загадала Тэрэзе выйсці і паспавядалася.

— Ойча! — спакойна сказала яна пасля. — Дайце мне апошняе памазанне.

— Але, можа...

— Дайце мне яго, — паўтарыла Соф'я. — Я адчуваю сваю смерць і так спакойней памру.

Гэты абрад быў споўнены ў прысутнасці толькі некалькіх слуг. Княгіня спакойна і набожна яго прыняла, на яе твары не было відаць таго страху, які нараджае часам думка пра смерць і абрады, што згадваюць пра яе; яна прыняла апошняе памазанне з малітвай, так, нібы прагнула і чакала канца жыцця і збавення ад пакут. Яна яшчэ доўга са слязамі ад усяго сэрца малілася.

— А цяпер, калі ўсё ўжо я як святар споўніў, — загаварыў айцец Пракоп, — то дзеля спакою вашага сумлення мушу напомніць вам, што, падумаўшы загадзя пра сваю несмяротную душу, хрысціянін павінен таксама, пакідаючы на зямлі родных, сяброў і ворагаў, распарадзіцца сваёй маёмасцю, каб яна потым не стала прычынай сварак, спрэчак і крыўд; ён павінен пакінуць усё так, каб паміраць са спакоем на сумленні і душы. Я кажу гэта не таму, што баюся за ваша жыццё, якое, я спадзяюся, будзе яшчэ доўгім і шчаслівым, але такі ўжо заведзены ўсеагульны парадак, а таму я як ахоўнік сумлення абавязаны...

Княгіня слухала, і лёгкая з'едлівая ўсмешка блукала на яе вуснах.

— Рабіце тое, што патрэбна, — адказала яна. — Я не забудуся і пра ваш слуцкі храм. Маліцеся за маю душу, за душы маіх дзядоў, усіх родных!

Айцец Пракоп выканаў свой абавязак пры хворай і сабраўся пайсці.

— Будзеце ў князя, майго мужа? — спытала Соф'я.

— Іду да яго.

— Папрасіце яго ад мяне, каб ён пабачыўся са мной, скажыце, што мне дрэнна, што я адчуваю сябе ўсё горш. Жыццё сплывае, хай ён прыйдзе хоць на хвілінку, хай прыйдзе. Скажыце яму, што я яго прасіла.

— Спяшаюся споўніць вашу волю, — адказаў айцец Пракоп і пайшоў да князя Януша.

Князь чакаў яго, ён быў устрывожаны.

— Усё споўніў, — сказаў святар. — Пані княгіня ўзорна і набожна паспавядалася, прыняла прычасце, сказала, што адчувае сябе ўсё горш, хаця я не бачу асаблівага пагаршэння з таго часу, як я тут быў апошні раз. Яна перадае праз мяне, што просіць вас, каб вы...

— Што мне трэба зрабіць?

— Прыйсці да яе, праведаць яе.

— Я збіраюся ісці да яе! — адказаў Януш. — Астрамецкі, дзе паперы?

— Вось яны, ляжаць перад вамі.

— Папрасіце за сведкаў двух паноў, лепш суседзяў, можна і болей, каб запісаць іх у акт, паставіць пячаці.

— Раз трэба, то знойдзем.

Пасля гэтых халодных слоў князь выйшаў са свайго пакоя і падаўся да жонкі. Ён падышоў да дзвярэй, спыніўся на хвіліну, нібы збіраючыся з думкамі, потым адчыніў дзверы і ўвайшоў.

На бледным твары Соф'і праступіў румянец, яна села на ложку і ласкава прывіталася з ім, як быццам бы нічым не магла папракнуць яго. Князь Януш збянтэжыўся і сказаў ёй толькі некалькі слоў у прывітанне. Па ягоным твары было відаць, што ён усхваляваны, не можа гаварыць, не ведае, што сказаць; відаць, яго ўразіў выгляд хворай. Здавалася, што яго грызе сумленне.

Пасля доўгага маўчання Соф'я загаварыла:

— Дзякуй табе, што праведаў хворую. Мне хацелася ўбачыць цябе. Мне дужа блага, я адчуваю, што смерць мая ўжо блізка, і хачу развітацца.

Яна працягнула да яго высахлыя рукі, Януш моўчкі пацалаваў іх.

— Я хацела бы, пакуль ёсць час, — казала далей яна, — распарадзіцца маёй маёмасцю, якую я аддаю табе, адпісваю ўсю, якая ёсць. Маліся толькі за душу Соф'і!

Князь пачырванеў і паварушыўся на крэсле; можа, яму ўспомніліся маладыя гады і маладое каханне, прыгадаліся хвіліны дзяцінства, праведзеныя з Соф'яй, якую яму давядзецца навекі страціць.

— Дай мне тое завяшчанне, якое было падрыхтавана, я падпішу яго, пакуль ёсць сілы.

Януш ускочыў з крэсла.

— Айцец Пракоп гаварыў табе пра завяшчанне? — усклікнуў ён. — Ты пра яго ведаеш?

— Ведаю, але не ад айца Пракопа, — адказала яна. — Чула, што павінен быць падрыхтаваны такі акт. Дай мне яго. Ён жа ў цябе з сабой.

Здзіўлены князь дастаў паперы, Тэрэза па загаду пані падала пяро, і Соф'я падпісала іх. Потым упала на падушку і ўздыхнула.

— Выйдзі, Тэрэза, — сказала яна, — пакінь нас адных.

— Князь, — загаварыла Соф'я, калі яны засталіся самнасам, — напэўна, гэта апошнія хвіліны разам, апошнія мае з табой хвіліны! Я сёння памру! Ноччу да мяне прыходзілі духі таты і мамы ў белым адзенні, яны гаварылі са мной, клікалі да сябе.

— Гэта сон, — сказаў князь.

— Гэта быў знак з неба! — прамовіла Соф'я. — Не думай, што я палохаюся смерці.

Яна зноў падала яму руку.

— Вось нават і зараз, — працягвала яна, — нават зараз ты не можаш пасядзець каля мяне, не пагаворыш са мной, як раней... Заўсёды халодны Януш... Твая душа ўвесь час у іншым месцы...

Гэты папрок, першы ў іх жыцці, расхваляваў Януша, ён задрыжаў; гэтак жа як хвіліну таму выгляд Соф'і ўразіў яго, так цяпер гэтыя некалькі слоў, сказаных так ласкава, гэты дотык дайшлі да глыбіні яго душы. Ганарлівасць, прагнасць на хвіліну пакінулі ягонае сэрца, ён забыўся, чаго прыйшоў, ён бачыў перад сабой Соф'ю свайго дзяцінства, Соф'ю, якую любіў братнім сэрцам, перш чым там пасяліліся пачуцці і выцеснілі былое прыцягненне, загадалі забыць каханне нарачонага і дружбу брата.

Ён укленчыў перад ёй, узяў яе руку ў сваю і заплакаў.

Соф'я ўбачыла гэта, заззяла радасцю, расцвіла, яна не верыла сваім вачам.

— О, як жа я несправядліва наракала на лёс! — усклікнула яна. — Які добры Бог, ён падарыў мне перад смерцю такія хвіліны, які добры ты, што ўспомніў пра Соф'ю, ты яшчэ не зусім забыўся пра мяне! Дзякуй табе, Божа! Дзякуй!

Мне будзе соладка паміраць, Януш, ты яшчэ памятаеш пра Соф'ю, ты, мажа, не забудзеш пра яе ў сваіх малітвах!

— Ніколі! — усклікнуў Януш.

— Ніколі! — паўтарыла княгіня. — Так ты гаварыў і раней, калі прысягаў каля алтара, а ўсё ж... Як усё перамянілася! Пры смерці, у часіну канання я не хачу дакараць цябе, але куды падзеліся мае надзеі, куды падзелася маё шчасце? Ці быў ты для мяне такім, як абяцаў? Ты ўзяў Соф'ю і пакінуў яе цярпець на адзіноце, не сказаў ніводнага добрага слова, не ўсміхнуўся. Ты забыўся пра яе, ты быў прычынай таго, што я верыла, нібыта Бог не даў нам свайго благаславення! А! Хай Бог табе даруе ўсё, як я ўсё даравала і на ўсё забылася ў гэтыя хвіліны.

— Соф'я, ты мяне вінавааціш... — загаварыў яшчэ больш усхваляваны князь.

— Не, не! Я пра ўсё забылася, не вінавачу цябе, прабачаю табе маё цярпенне і дзевяць самотных гадоў! Ты ж мусіў служыць дзяржаве і забывацца пра жонку, але ж, мой Яне, ты яшчэ малады, калі Бог дасць табе другую Соф'ю, якую ты, напэўна, хутка знойдзеш, ты ж яе таксама не пакахаеш, ты ж зноў не будзеш уважлівы да яе. Ты возьмеш яе як маці для маленькіх Радзівілаў, а не як жонку! Ты не можаш мець жонкі! Жонка — гэта другая палова душы мужа, гэта яго цень; ёй патрэбна ўвага, ёй трэба сонца для таго, каб яна жыла! Яе сонца — муж і гаспадар, якога яна выбрала, якому прысягнула, дзеля якога пакінула родзічаў і адраклася ад іх, ад дому, забылася пра свой род. Ты не можаш мець жонку, вазьмі толькі маці Радзівілам, не абяцай ёй увагі, бо не вытрываеш і заб'еш яе, як мяне...

Сказаўшы гэта, яна закрыла твар рукамі і заплакала. Князь таксама плакаў і маўчаў. Ён адчуваў сваю віну і не пасмеў апраўдвацца.

— Я пра ўсё забылася, усё даравала, і адна хвіліна, адна твая слязіна заплаціла за дзевяць гадоў маіх слёз! Я цябе не вінавачу. Ты быў сапраўдным Радзівілам, а не мужам, табе была патрэбна спажыва для душы, для славы, багацця, поспеху, ты гэтым жывеш. Вазьмі за жонку такую, якой хапіла б для жыцця славы, хвалы, раскошы, для якой шчасцем былі бы ўжо сам тытул і саноўнасць. І ты будзеш шчаслівы. Гэта мая апошняя парада табе, Януш, і развітанне з табой. Забудзься на мой дакор, прабач, як я прабачыла табе, прашу цябе, прабач усё грэшніцы, якая ідзе ў леп-

шы свет... Загадай маліцца за маю душу, за душы бацькі, маці і дзядоў! А калі можаш, то і сам памаліся за мяне...

— Ты не памрэш, Соф'я! — усклікнуў князь у роспачы.

— О, памру, памру! Я адчуваю набліжэнне смерці і не баюся яе. Цені таты і мамы клічуць мяне да сябе, час і мне ісці да іх, жыві здаровы, даруй мне ўсё.

Яна змоўкла, знясіленая доўгай размовай, слёзы стаялі ў яе вачах, цяжкі паспешлівы ўздых прыўзняў яе высахлыя грудзі, у якіх чуўся перадсмяротны хрып.

Князь зірнуў на яе, ён быў бледны, заплаканы. Хацеў устаць, але яна яго затрымала:

— Пабудзь са мной, пакуль я не памру! Падаруй мне яшчэ колькі хвілін. Маліцеся, бо жыццё пакідае мяне...

Тэрэза ўкленчыла каля ложка і, плачучы, гучна чытала малітвы над Соф'яй. Княгіня ляжала бледная, з заплюшчанымі вачыма і не адпускала руку мужа, які стаяў каля яе маркотны, змрочны, маўклівы.

## Паздзел 8

## СЛУЦКІЯ КНЯЗІ

Надвячоркам ва ўсіх цэрквах і касцёлах горада і навакольных вёсак білі званы; іх водгалас разлягаўся ў паветры разам з шумам асенняга ветру. Княгіня Соф'я Алелькавіч памерла. У замкавай капліцы стаяла яе труна, навокал гарэлі свечкі, перад труной стаяла харугва з літоўскай Пагоняй і арлом Радзівілаў, спявалі святары, гудзелі званы. Муж два дні плакаў у сваім пакоі, справіў пышныя хаўтуры. А неўзабаве ён ажаніўся з Соф'яй Альжбетай, князёўнай брандэнбургскай.

* * *

У гэты самы год узімку двое падарожных раніцой зайшлі ў праваслаўную царкву ў Слуцку*. Адзін з іх быў стары, згорблены часам, другі — яшчэ бадзёры і малады. Апрануты яны былі сціпла і чыста, з пачуццём меры. Стары быў укрыты лісіным футрам, малады апрануты ў сівую баранову бекешу. Яны сталі на калені перад

алтаром і доўга маліліся, потым стары акінуў паглядам сцены царквы, убачыў надмагільную пліту, на якой былі нядаўна выразаны пазалочаныя літары, павольна прачытаў іх.

Надмагільны надпіс быў такі:

D. O. M. S.
Magnorum Litvanlac Dynaslarum
Propagini.
Ex Illustrisslma Slucij ac Kopyli
Ducum familia, Eheu ultimae
Zophiae Olelkoviciae
Patre, Avo, Proavo, Georgio
Abavo, Simone, Atavo Michaële
In Slucko et Kopyle Ducibus
Tritavo Olelkone.
Jagellonis Poloniae Regis Fratre

Olgerdi Magni Lithvaniae Ducis Nepote
Gedimini Pronepote
Vitonij Abnepote,
Matre vero
Barbara ex Illustri Priscarum Familia
Prognatae.
JANUSSIUS RADZIWIL.
Birzarum ac Dubincarum
In Slucko et Kopyle Dux
Supremus Pocillator ctc. Etc.
Moestissimus Conjunx Conjugi dcsideratisslime
Faeminae et genere et forma, nec non
Virtute aevo suo clarissimae
Non absque lachrymis posuit.
Vixit Annos XXV.

*Богу Найсвяцейшаму Найвышняму Глыбокашаноўнаму.*

*Спадчынніцы*
*Вялікіх князёў Літвы*
*Са слаўнага роду*
*Слуцкіх і капыльскіх князёў,*
*На жаль, апошняй у ім —*
*Соф'і Алелькавіч,*
*Што паходзіць*

*Ад бацькі, дзеда і прадзеда Юрыяў,*
*Прапрадзеда Сямёна,*
*Прапрапрадзеда Міхаіла,*
*Ад прашчура Алелькі*
*Са славутага княжацкага роду,*
*Па брату родзічцы польскага караля Ягайлы,*
*Па праўнуку родзічцы Альгерда,*
*Вялікага князя літоўскага,*
*Па прапраўнуку — Гедыміна і*
*Па прапрапраўнуку — Віценя,*
*Па маці народжанай ад Барбары*
*Са слаўнага роду Прыскаў.*
*Януш Радзівіл,*
*Князь Біржаў і Дубровы,*
*Слуцкі і капыльскі,*
*Вялікі падчашы і г.д., і г.д.,*
*Самотны муж*
*Любімай жонцы,*
*Жанчыне, праслаўленай і родам, і красой, і асабліва*
*Дабрачыннасцю ў сваім жыцці,*
*Надмагільны помнік*
*Паставіў, плачучы.*
*Пражыла 25 гадоў.*

Стары прачытаў надпіс і павярнуўся да другой надмагільнай пліты, якая ляжала побач, там надпіс быў зроблены па-руску. Яна пакрывала прах князя Юрыя, бацькі Соф'і. Стары прачытаў надпіс, апусціўся на калені і доўга маліўся.

Тут якраз скончылася літургія, адзін са святароў выйшаў і ўбачыў старога, які плакаў над магільнай плітой. Ён падышоў, спыніўся; з пачцівасцю адносячыся да малітвы і слёз, чакаў, не распытваў старога, пакуль той не ўстаў з дапамогай свайго маладога таварыша. Тады мніх прывітаўся і спытаў:

— Вы ведалі таго, хто ляжыць пад гэтым каменем?

— Гэта быў мой гаспадар, хай пухам яму зямля будзе, — пачціва адказаў стары. — Юрый Алелькавіч, князь слуцкі! Сканаў на маіх руках, з ягонай ласкі маю хлеб для сябе і дзяцей, таму я са слязамі маліўся за яго.

— Ці не зайшлі б вы ў манастыр? — прапанаваў святар. — Вы стаміліся ў дарозе, дык не адмаўляйцеся ад гасціннасці манахаў.

— Дзякую, — адказаў стары, — але тут мне так яскрава ўспамінаюцца даўнія часы, маладосць, пражытая з панам князем, што цяпер, калі гэты род згас, праз многа гадоў, я не магу без слёз глядзець на руіны, і каб пажыў тут даўжэй, то, напэўна, і сам лёг бы тут, каля свайго старога пана. Пакуль чалавек не бачыць, пакуль толькі ўспамінае, то яшчэ можа цярпець; але вось магіла бацькі і побач магіла ягонай беднай дачкі, якая памерла такой маладой, — гэта не пад сілу вынесці! Трэба ж было такому стацца, што я прыходжу да іх магіл, я, старац!

Зморансы стары сеў на цвінтары на камень, мніх — каля яго, а малады хлопец стаяў за імі ззаду.

— Так, няма ўжо князёў слуцкіх, — працягваў стары, — няма іх; апошнюю княгіню пахавалі бяздзетнай. Можа, гэта і добра, бо многія вялікія людзі змізарнелі, і было б лепей, каб іх род назусім згас. А вы ведаеце, ойча, які гэта быў род і якая кроў?

— Чуў, — адказаў мніх, — але не дужа многа, пра гэта казалі ў развітальных словах над трунай.

— Нават на магільнай пліце напісана, — перапыніў стары, — але генеалогію там крыху сказілі, шаноўны ойча. Нехта не дужа дасведчаны пісаў. Я-то ведаю іх гісторыю, бо і наслухаўся, і начытаўся па хроніках.

— Надпіс на пліце рабіў айцец Пракоп.

— Як напісаў, так ужо і будзе, хай Бог яму даруе.

— Як яму сказалі.

— Хто ён, ваш айцец Пракоп?

— Гэта я, шаноўны пане.

— Вы?

— Так. І таму зараз я быў бы рады, каб вы расказалі мне тое, што ведаеце пра князёў слуцкіх, каб я, складаючы памінанне за ўпакой, мог паправіць.

— Буду ад усёй душы рады расказаць, што ведаю*, — прамовіў стары. — Але мая галава стала ўжо дзіравая, з яе павылятала многа важнага, збольшага нешта яшчэ трымаецца, таму вы, можа, дзе-небудзь падлатаеце, ведаючы па кніжках...

— Расказвайце, заўсёды нешта ды ўспомніцца.

— Вы, няйначай, ведаеце ўжо, — нагадаў стары, — што Алелькавічы паходзяць ад Уладзіміра Альгердавіча, кіеўскага князя, якога вялікі князь літоўскі Вітаўт выжыў з ягоных уладанняў, адабраў у яго Жытомір, Оўруч і іншыя гарады, але потым па волі ягонага брата Ягайлы ўзамен

Кіева Алелькавічу былі дадзены трыццаць міль земляў у Літве з горадам Капыль. Тут ён заснаваў горад Слуцк, вось гэты, дзе мы цяпер знаходзімся.

У таго Уладзіміра быў сын Аляксандр, па-руску яго звалі Алька, ад яго і пайшлі Алелькавічы, а па Слуцку іх пачалі называць князямі слуцкімі. Алелька праславіўся ў паходах супраць Масквы, у якіх ён узначальваў кіяўлян. Пасля смерці Вітаўта ліцвіны нават хацелі прасіць Ягайлу паставіць яго кіраваць Вялікім Княствам Літоўскім, але калі гэта месца заняў Жыгімонт, то па падазрэнні ў нейкай змове нават адабраў у яго Слуцк і Капыль, яго самога зняволіў у Кернове, а жонку з дзецьмі ва Уцяне і доўга трымаў, аж пакуль не вызваліла іх раптоўная смерць Жыгімонта. Пасля гэтага некаторыя паны зноў хацелі ўзвесці на Вялікае княства Алельку, але лёс так распарадзіўся, што ён не стаў на чале яго; праўда, яму было вернута Кіеўскае княства, якое было ў яго яшчэ гадоў дванаццаць. У яго была жонка — маскоўская князёўна, унучка Вітаўта, ад яе — два сыны: кіеўскі князь Сямён і Міхаіл Слуцкі. Яны заспрачаліся аб падзеле бацькоўскай спадчыны, і кароль Казімір падзяліў яе між імі так, што Сямёну дасталася Кіеўскае княства, а Міхаілу — Капыльскае.

Я не буду расказваць далей пра ўвесь іх род, бо ён з той пары дзяліўся на дзве галіны, але пра самыя значныя імёны ўспомню.

Сямён Алелькавіч яшчэ ў васемнаццаць гадоў, ледзь увайшоўшы ва ўзрост, са сваім спешна сабраным атрадам пабіў дванаццаць тысяч татараў пад Гроднам і тым самым здабыў сабе такую славу, што яго, гэтак жа, як калісьці бацьку, хацелі паставіць на чале Вялікага Княства Літоўскага, многія падгрымлівалі яго ў гэтым. Асабліва стараўся ягоны свёкар — Ян Гаштольд, але кароль Казімір баяўся падзелу краіны і не дазволіў, хаця ліцвіны на адным з сеймаў казалі яму пра гэта. Перад смерцю Сямён, паводле падання, паслаў каралю свайго белага каня і лук, з якімі неаднойчы выступаў супраць татараў, і аддаў яму ў апеку сына Васіля і дачку Аляксандру, пазней яна стала жонкай князя Астрожскага. Тады якраз і Кіеўскае княства, што пераўтварылася ў правінцыю, было забрана ў іх, засталіся толькі Слуцк і Капыль. Нямала было славутых багатыроў сярод Алелькавічаў, і кожны з іх, калі была патрэба, выходзіў на бітву

са сваімі атрадамі. Узяць хаця б трох Юрыяў ці Сямёнаў. Адзін ваяваў пад Лебядзёвам пры апошнім з Ягайлаў, вёў на бітву дзве тысячы дзвесце сваіх вояў, другія ішлі на шведаў, калі было трэба, і ніводзін не шкадаваў ні крыві, ні жыцця.

Ад князя Міхаіла капыльскага пайшоў цэлы шэраг багатыроў. Ягонага сына Сямёна таксама клікалі на Вялікае княства, але тады выбралі Аляксандра. Сямён ушчэнт разбіў татараў пад Ушай, але яны атрымалі падмогу і асадзілі яго ў Слуцку, там ён ужо не змог перамагчы. Памёр, але ягоная душа засталася жыць у жонцы і сыне. Анастасія праславілася дзякуючы свайму шлюбу, вельмі шчасліваму, — гэта рэдкасць для жанчыны. Сын Юрый яшчэ шаснаццацігадовым падлеткам мераўся сілай з Глінскім, потым, як і ягоныя продкі, хадзіў на татараў, якіх аднойчы разбіў аж восем тысяч, а потым яшчэ чатырыста пабіў, калі тыя вярталіся са здабычай з Літвы, скрышыў іх, а трох вайскаводаў узяў у палон. Немалую долю славы прыдала яму памятная перамога пад Оршай; потым у бітве з татарамі пад Лапушнам, пад Гальшаніцай, у Чаркасах — усюды ён перамагаў.

І што ж засталося пасля гэтых славутых людзей? — працягваў стары, ківаючы галавой. — Некалькі спісаных золатам камянёў, жменька попелу і касцей ды крыху людской памяці...

— А хіба гэтага мала? — спытаў айцец Пракоп. — Хіба мала адной памяці, калі яна падаўжае жыццё таму, каго не стала? Чаго вы хочаце большага ад нашага свету, і што болыпае ён можа даць?

— Вечны ім спачын і найвялікшая вячыстая святасць у тым лепшым свеце! — сказаў стары і ўстаў з каменя.

— Амін! — ціха дадаў мніх.

Канец трэцяга і апошняга тома

# КАМЕНТАРЫ

## КАРОЛЬ У КЯСВІЖЫ. 1784

*На беларускай мове аповесць друкуецца ўпершыню. На польскай упершыню друкавалася ў 1887 г.*

* *Ваявода-князь Радзівіл Пане Каханку* — галоўны герой аповесці. Караль II Станіслаў Радзівіл (Пане Каханку) (1734—1790) — быў у 1762—1764 і ў 1768—1790 гг. віленскім ваяводам. Сын гетмана Міхала Радзівіла Рыбанькі і Францішкі Урсулы, апошняй з князёў Вішнявецкіх.

Пане Каханку — мянушка, дадзеная князю, яна звязана з ягонай звычкай часта ўжываць у гаворцы зварот "пане каханку". Многія з Радзівілаў мелі такія мянушкі, якія дадаваліся да іх прозвішчаў, па іх князёў Радзівілаў адрознівалі аднаго ад другога. Звязана гэта з тым, што ў родзе Радзівілаў была традыцыя даваць першынцу ў сям'і імя Мікалай. Так сталася, што ў іх генеалогіі было некалькі Мікалаяў Радзівілаў, таму кожны атрымаў нейкую мянушку: Чорны, Руды, Сіротка, Пярун... Потым мянушку атрымалі ўжо не Мікалай, а Міхал, празваны Рыбанька, і Караль Станіслаў.

* *Кальтэшаль — (ням.* — халодная страва) — ахаладжваючы напітак.

* *"... караля... не шкодзіла б запрасіць... "* — Радзівіл вядзе гаворку пра паездку на сейм у Гомель у 1784 г. апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764—1798). Панятоўскі нарадзіўся ў маентку Волчын пад Брэстам, паходзіў з літоўскай шляхты, з 1755 г. меў званне стольніка Вялікага Княства Літоўскага. У 1764 г. абраны каралём пры падтрымцы расійскай імператрыцы Кацярыны II. Радзівілы былі супраць абрання Панятоўскага каралем, стаялі ў апазіцыі да яго.

У праграму паездкі караля ўваходзіў агляд канала на Піншчыне (Вялікі Пінскі канал, канал Агінскага), які злучыў рэкі Ясельду і Шчару. Канал будаваўся з 1765 г. на сродкі магната Міхала Казіміра Агінскага. Па шляху кароль спыняўся на начлег у маёнтках мясцовай шляхты.

* *Асіндзей* — ветлівы зварот у старапольскай мове.

* *Аканомчык* — у вуснах Радзівіла — абразлівая мянушка Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Панятоўскі паходзіў з роду на той час небагатай

шляхты і стараўся схаваць гэта; хадзіла нават легенда пра італьянскае паходжанне Панятоўскіх ад роду Тарэлі. Радзівіл гэтай мянушкай намякае на тое, што нехта з Панятоўскіх быў аканомам.

* *Фінфа (пол.)* — злы жарт.

* *Эстка* — сярод прыдворных мастакоў у Нясвіжы былі бацькі і сын Гескія. Бацька — Ксаверы Дамінік. Сын — Юзаф Ксавэры, які напісаў шэраг партрэтаў для Нясвіжскага замка, а таксама партрэт Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Ён, відаць, і з'яўляецца правобразам прыдворнага мастака, выведзенага пад прозвішчам Эсткі.

* *Сінекура* — у пераносным сэнсе — пасада, якая ні да чаго не абавязвае, алс прыносіць добры прыбытак.

* *Князь Альберціні* — заснавальнік бібліятэкі і калекцыі карцін у Вене.

* *Бачыярэлі* — Марчэла Бачыярэлі (1731—1818) — прыдворны мастак і саветнік караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, аўтар шматлікіх партрэтаў, роспісаў у Варшаўскім замку, Лазенках і ў іншых месцах. Распісваў капліцу ў Шчорсах для Іахіма Храптовіча.

* *Смуглевіч* — Францішак Смуглевіч (1745—1807) — вядомы тагачасны мастак, графік, педагог. Прафесар малюнка і жывапісу ў Віленскім універсітэце. Выконваў заказы па размалёўцы цэркваў і касцёлаў у храмах Беларусі, Літвы і Польшчы. Ствараў алегарычныя і міфалагічныя кампазіцыі.

* *Алегорыя* — у сярэднявечным жывапісе выява адцягнутай ідэі ў выглядзе канкрэтнага вобраза. Далей у творы будуць згадвацца алегорыі Зайздрасці, Чысціні і Мудрасці.

* *Геніі* — алегарычныя фігуры міфалогіі: духі — апекуны чалавека, а таксама ўвасабленне дабра, зла і г. д.

* *Трубы* — сімвал славы. Уваходзілі ў герб Радзівілаў.

* *Эстка Фапрэста* — мянушка, складзеная з двух музычных тэрмінаў — фа (нота) і прэста (хутка).

* *"... падобным да той, якая ўсклала... карону"* — намёк на рускую царыцу Кацярыну II, дзякуючы якой Панятоўскі быў абраны каралём.

* *Ардынацыя (лац.)* — упарадкаванне — непадзельная і неадчужальная ўласнасць пэўнага магнацкага роду. Тут — уладанні Радзівілаў.

* *Знак Шаляў* — адзін са знакаў задыяку, дзеянне яго доўжыцца ад 24 верасня да 23 кастрычніка. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі прыязджаў у Нясвіж у верасні.

* *Узяцце Гібралтара...* — У 1704 г. англічане гвалтоўна штурмам захапілі гішпанскую крэпасць Гібралтар. Гэтая падзея ў свой час мела шырокі розгалас.

* *Барк* — марскі парусны карабель.

* *Судны дзень* — Паводле Бібліі — дзень Сграшнага суда. Тут — як сінонім мітусні, тлуму, неразбярыхі.

* *Цівунуўна* — мянушка, звязаная з назвай службовай асобы ў Расіі ў X—XVII стст. Цівунамі называлі наглядчыкаў за працай сялян у памешчыка ў часы прыгону.

* *Шамбелян* — камергер.

* *Віваты* — польскі звычай страляць з гармат у час абвяшчэння тостаў на балі. Дзеля гэтага ў магнацкіх дварах трымалі спецыяльныя гарматы.

* *Картана* — старадаўняя крэпасная гармата.

* *...спадчыннік Харобрых і Крывавустых.* Інакш кажучы — спадчыннік каралёў. Баляслаў Харобры — польскі кароль у 992—1025 гг. Баляслаў III Крывавусты — польскі кароль у 1102—1138 гг.

* *Буздыган* — булава.

* *Навіцыят (царк.)* — паслушэнства. У пераносным сэнсе — выпрабавальны тэрмін.

* *Кусташ* — захавальнік музея, бібліятэкі і інш.

* *Кардэгардыя* — памяшканне для варты і ўтрымання арыштаваных.

* *Сагайдак* — калчан для стрэл.

* *Канчар* — меч, старажытнаруская і ўсходняя зброя конніка.

* *Мацей Радзівіл* (1749—1800) — брат Радзівіла (Пане Каханку), аўтар лібрэта аперэт, якія ставіліся ў Нясвіжы на сцэне прыдворнага тэатра. У час прыезду Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў тэатры ставіліся аперэта "Агатка", лібрэта якой напісаў Мацей Радзівіл, а таксама балет "Арфей у пекле", лібрэта якога было напісана запрошаным з Італіі балетмайстрам Ф. Касэлі, і балет "Пігмаліён", харэаграфія якога належала прыдворным балетмайстрам італьянцу Гаэтану Пецінеці і былому прыгоннаму Антону Лойка. Мацей Радзівіл стварыў у 1786 г. оперу "Войт Альбянскага паселішча", сам быў аўтарам слоў і музыкі і нават некалькі разоў сыграў галоўную ролю ў спектаклі.

* *Ксёндз Альбертандзі* — біскуп, вучоны, каралеўскі бібліятэкар у часы Станіслава Аўгуста. Аўтар кніг па гісторыі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, сярод якіх "Гісторыя каралёў", "Дваццаць шэсць гадоў уладарання Уладзіслава Ягайлы".

* *Гарадзельская унія* — Саюз Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай, заключаны ў 1413 г.

* *Норблін* — французскі мастак Іаан Норблін, запрошаны ў Варшаву вучыць мясцовых мастакоў жывапісу.

* *Бушэ і Вато* — французскія мастакі, якія малявалі карціны на сюжэты так званых пастараляў.

* *Лазенкі,* — паркава-палацавы комплекс у Варшаве.

* *Капуцын* — каталіцкі святар, які належаў да манаскага ордэна францысканцаў — капуцынаў.

* *Староства* — частка памежных зямель з умацаваным замкам у цэнтры, якая давалася польскім каралём у пажыццёвае ўладанне радавітаму шляхціцу.

## АПОШНЯЯ СА СЛУЦКІХ КНЯЗЁЎ

*На беларускай мове аповесць друкуецца ўпершыню. На польскай упершыню была надрукавана ў 1848 г.*

### ТОМ 1

* "*Адаму Завадскаму*" — аўтар прысвяціў гэтую кнігу віленскаму кнігавыдаўцу Адаму Завадскаму.

* *Жыгімонт III Ваза* — польскі кароль у 1587—1632 гг.

* *Жыгімонт II Аўгуст* — польскі кароль у 1548—1572 гг.

* *Стэфан Баторый* — польскі кароль у 1575—1586 гг.

* "*... прывічей Жыгімонта III*" — выдадзены ў 1588 г. прывілей, які зацвярджаў Статут Вялікага Княства Літоўскага.

* *Езуіты* — члены каталіцкага манаскага ордэна, створанага ў 1534 г. іспанскім дваранінам Ігнацыем Лаёлам для барацьбы з Рэфармацыяй і ўмацавання каталіцызму. У Польшчы ў 1555 г., у Вялікім Княстве Літоўскім — з 1569 г., задачай ордэна было акаталічванне праваслаўнага насельніцтва. Для дасягнення сваіх мэт езуіты прымянялі самыя розныя, у тым

ліку і гвалтоўныя, сродкі. Езуіты карысталіся падтрымкай польскіх каралёў, у тым ліку і Жыгімонта III.

* *Рэфарматары* — тут: аб'яднанне некаталіцкіх рэлігійных канфесій з мэтай барацьбы супраць экспансіі каталіцкай веры.

* *Унія* — тут: Брэсцкая царкоўная унія, мэтай якой было паступовае аб'яднанне каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў. Унія была абвешчана на саборы ў Брэсце ў 1596 г. Паводле яе ўмоў, праваслаўная царква падпарадкоўвалася Ватыкану і прымала каталіцкія дагматы, але захоўвала праваслаўную абраднасць. Пад выглядам уніі Ватыкан імкнуўся пашырыць сваю экспансію на праваслаўны Усход, а польскія феадалы з яе дапамогай хацелі замацаваць сваё панаванне на беларускіх і ўкраінскіх землях. Крашэўскі ў аповесці праўдзіва паказвае абставіны, звязаныя з прыняццем уніі.

* *Евангелісты* альбо евангельскія хрысціяне — паслядоўнікі адной з плыняў пратэстантызму.

* *Арыяне* — паслядоўнікі плыні ў хрысціянстве, якая ўзнікла ў пачатку IV ст. ва Усходняй Рымскай імперыі.

* *Трыбунал* — вышэйшая судовая ўстанова ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім. Пасяджэнні Трыбунала праводзіліся ў Вільні.

* *Рускі, русіны* — тут: частка мясцовае насельніцтва.

* *Магдэбургская юрысдыка* — адна з форм гарадскога самакіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім, калі жыхары пэўных раёнаў горада падпарадкоўваліся не магістрату, а буйным феадалам.

* *Статут* — Статут Вялікага Княства Літоўскага.

* *Крыштаф Радзівіл* — Крыштаф Мікалай Радзівіл Пярун (1547—1603) — у той час быў віленскім ваяводам, вялікім гетманам літоўскім. Прадстаўнік аднаго са старадаўніх беларускіх дваранскіх родаў, паводле легенды паходзіў ад святара Лаздзейкі. Ён растлумачыў Гедыміну ягоны сон пра жалезнага ваўка тым, што на месцы палявання трэба заснаваць горад (названы Вільняй). Нашчадкам Лаздзейкі, паводле легенды, было дадзена прозвішча Радзівіл, што расшыфроўвалася як "радзіў Вільню". У тыя часы, калі распачалася спрэчка з Хадкевічамі, Крыштаф Радзівіл быў кальвіністам, а не праваслаўным, як апісвае Крашэўскі. Аднак ён быў актыўным дзеячам Рэфармацыі, якую падтрымлівалі і праваслаўныя. Кальвінізм — адзін з накірункаў пратэстантызму, заснаваны Ж. Кальвіным у эпоху Рэфармацыі.

* *Геранім Хадкевіч* — жмудскі стараста, апякун Соф'і. У барацьбе супраць Радзівілаў удзельнічаў разам з братам Янам Каралем Хадкевічам, адным з выдатнейшых беларускіх палкаводцаў. У той час ён быў жамойцкім старастам, што раўнялася пасадзе ваяводы.

* *Нумы* — хаціны мясцовых жыхароў.

* *Стаўрапігіяльная царква* — праваслаўны манастыр, які падначальваецца не епархіяльнаму архірэю, а непасрэдна патрыярху або Святому Сіноду і карыстаецца асаблівымі прывілеямі.

* *Чарняцы* — тое самае, што і манахі.

* *Інфляндскі паход* — Інфляндыя (Лівонія) — Паўночная Эстонія. За яе вялася вайна са шведамі.

* *"...з кардыналіі"* — так у тыя часы жыхары Вільні называлі палац Радзівілаў, таму што там была хатняя малельня. Палац Хадкевічаў называўся кашталяніяй.

* *Двухгарнцовы* — гарнец — мера аб'ёму, роўная прыблізна 3,2 літра. Такім чынам, у збан Брожака можна было наліць больш за 6 літраў.

* *Чакан* — тут: самаробная зброя разбойнікаў — булава з шыпамі.

* "*Юрый... з роду Алелькавічаў...*" — Тут аўтар гістарычна дакладна ўзнаўляе ўсю гісторыю, звязаную з апекай над Соф'яй Алелькавіч, з прычынамі канфлікту.

* *Белы тыдзень* — першы тыдзень пасля Вялікадня ў каталікоў.

* *Дзень Божага Цела* — каталіцкае рэлігійнае свята, адзначаецца 22 чэрвеня.

* *Элекцыйны сейм* — сейм, на якім выбіралі караля.

* "*...славуты Леў Сапега*" — Леў Сапега (1557—1633) — вялікі канцлер літоўскі, вядомы дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, прадстаўнік старадаўняга беларускага дваранскага роду. Адзін з арганізатараў Літоўскага трыбуналу, пад яго кіраўніцтвам скончана складанне Статута Вялікага Княства Літоўскага.

* *Аргус* — у грэчаскай міфалогіі велікан, які ахоўваў каханку Зеўса Іо. У пераносным сэнсе — пільны ахоўнік.

* *Сіротка* — князь Мікалай Хрыстафор Радзівіл Сіротка (1549—1616) — віленскі ваявода, кальвініст, у 1567 г. перайшоў у каталіцтва.

* "*...хроніка Бельскага...*" — Іахім Бельскі (каля 1540—1599) — вядомы польскі храніст і пісьменнік, прадоўжыў "Хроніку Польшчы".

* "*... хроніка Мацея Стрыйкоўскага...*" — Мацей Стрыйкоўскі (1547?—1586?) — гісторык і паэт. Яго галоўны твор — "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяя Русі".

* "*...пропаведзі Скаргі...*" — Ксёндз Скарга (1536—1612), вядомы рэлігійны і палітычны дзеяч, актыўны прапаведнік Брэсцкай уніі, пачынальнік польскай палемічнай прозы.

* *Танзура* — выбрытае месца на макаўцы, знак прыналежнасці да каталіцкіх святароў.

* *Bannita (лац.)* — выгнанец.

## ТОМ 2

* *Гайдукі* — тут: пехацінцы ў войску.

* *Рэйтары* — від цяжкай кавалерыі ў еўрапейскіх арміях у XVI—XVII стст.

* *Інгібіцыя* — судовае спыненне справы, забарона чаго-небудзь.

* *Малітва Божага анёла* — малітва, якая чытаецца раніцой і ўвечары.

* *Абраз Вастрабрамскай Маці Божай* — ікона Віленскай Маці Божай Вастрабрамскай. Прывезена ў Вільню з Крыма вялікім князем літоўскім Альгердам. У 1431 г. была змешчана ў часоўні над Вострай Брамай. Свята іконы — 14 красавіка. Вастрабрамская ікона карыстаецца асаблівай пашанай у хрысціян-беларусаў, як праваслаўных, так і каталікоў.

* "*...да Генрыха*". — Маецца на ўвазе Генрых IV, кароль Францыі ў 1562—1610 гг.

* *Дарагастайскі* — Крыштаф Мікалай Дарагастайскі (1562—1615) — дзяржаўны дзеяч, аўтар першага ў Рэчы Паспалітай дапаможніка па конегадоўлі "Гіпіка". Кальвініст. Заснаваў у маёнтку Ашмяна Мураваная друкарню.

* "*...з дапамогай універсалаў...*" — У тагачаснай Польшчы універсаламі называліся дакументы, якія мелі характар маніфеста.

* *Зяновіч* — Крыштаф Зяновіч (каля 1540—1614) — брэсцкі ваявода, паходзіў са шляхсцкага роду Вялікага Княства Літоўскага. Апісаў сварку паміж Радзівіламі і Хадкевічамі ў рукапісным творы на польскай мовс "Трагедыя, або Пачатак значнага ўпадку ў доме княства Літоўскага".

* *Даліна Іёсафацкая* — месца, дзе, па Бібліі, будзе адбывацца Божы суд. "Хай паўстануць народы і сыдуць у даліну Іёсафата; бо там Я сяду, каб судзіць усе народы адусюль" (кніга прарока Іеіля, р. 3, в. 12).

* "*...без спецыяльнага дазволу главы каталіцкага касцёла...*" — Соф'я Алелькавіч была перакананай прыхільніцай праваслаўя, хацела вянчацца толькі па праваслаўнаму абраду.

* *Руцкі Іосіф Вельямін* — вядомы беларускі царкоўны дзеяч, пісьменнік. Першапачаткова быў хрышчоны ў праваслаўі, пазней перайшоў ва уніяцтва. Быў арганізатарам ордэна базыльян на Беларусі, але гэта адбылося пазней 1600 г. У манахі ён быў пастрыжаны ў 1608 г., архімандрытам Віленскага Троіцкага манастыра стаў у 1608 г. Тут, відаць, аўтар твора арыентаваўся на няправільныя звесткі.

* "*...мніх у сутане ордэна Святога Базыля...*" — У часы, апісваемыя Крашэўскім, уніяцкі ордэн базыльян яшчэ не распачынаў сваю дзейнасць на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага.

* "*Гармат і смігловіц...*" — Смігловіца — вялікая крапасная гармата з доўгім ствалом.

## ТОМ 3

* *Бабінец* — прыхожая ў касцёле, дзе маліліся жанчыны. Другая назва — крухта.

* *Шышак* — жалезны, выцягнуты ўгору шлем з навушнікамі і наноснікам.

* *Возны* — службовая асоба земскіх судоў у Вялікім Княстве Літоўскім.

* *Мажджэра* — гармата.

* *Праваслаўная царква ў Слуцку* — Свята-Троіцкая царква, якая існавала з канца XIV ст. У царкве былі пахаваны слуцкія князі. Там першапачаткова пахавалі і княгіню Соф'ю. Царква разбурана ў савецкія часы.

* "*Буду... рады расказаць. што ведаю...* " — у цэлым тут правільна, але фрагментарна пададзена гісторыя роду Алелькавічаў.